Голубеў В. Ф.

# Гісторыя Беларусі
## ад пачатку XIX ст. да 1945 г.

# РАЗДЗЕЛ 1.
# ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЕ І ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XVIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX ст.

1. *Змены ў становішчы беларускага насельніцтва пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі.*
2. *Беларусь у вайне 1812 г.*
3. *Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў першай палове XIX ст.*
   *Крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы.*
4. *Грамадска-палітычны рух на землях Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.*

**1. *Змены ў становішчы беларускага насельніцтва пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі.*** Пасля кожнага падзелу Рэчы Паспалітай на далучаных тэрыторыях уводзіўся новы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел на генерал-губернатарствы, губерні і паветы. У 1801 г. былі створаныя два генерал-губернатарствы, у якія ўваходзілі пяць беларускіх губерняў: *Літоўскае генерал-губернатарства* (Віленская, Гродзенская і Мінская губерні) і *Беларускае генерал-губернатарства* (Віцебская і Магілёўская губерні). У 1807 г. па ўмовах Тыльзіцкага міру французскі імператар Напалеон I перадаў Расіі Беласточчыну ўзамен за згоду далучыцца да кантынентальнай блакады Англіі. Такім чынам уся этнічная тэрыторыя Беларусі апынулася ў складзе Расійскай імперыі.

***Палітыка царскіх уладаў у адносінах да шляхты.*** За выключэннем сялянства, усё насельніцтва павінна было прысягнуць на вернасць Кацярыне II. Тыя, хто не хацеў прыносіць прысягу, у трохмесячны тэрмін маглі прадаць нерухомасць і пакінуць межы Расійскай імперыі. Калі прадаць маёмасць не ўдавалася, яна




*Беларуска-літоўскія губерні Расійскай імперыі*
*ў адносінах да сучасных межаў Беларусі.*

пераходзіла ва ўласнасць расійскага скарбу. Гэтыя землі, як і былыя сталовыя эканоміі, староствы і дзяржавы, раздаваліся ўрадам расійскім памешчыкам, у выніку чаго на тэрыторыі Беларусі насаджалася рускае землеўладанне.

Шляхта, якая прынесла прысягу, захавала свае маёнткі, але разам з тым была пазбаўленая некаторых правоў, якія мела ў Рэчы Паспалітай: права выбіраць манарха, мець замкі, трымаць узброеныя сілы для абароны сваіх вольнасцяў і інш. Але ідучы насустрач мясцовай шляхце, у якасці асноўнага закону на далучаных тэрыторыях расійскі ўрад захаваў Статут ВКЛ 1588 г.

У адносінах да шляхецкага саслоўя на землях Беларусі царскі ўрад праводзіў палітыку «разбору шляхты». У адпаведнасці з ёю, шляхцічы павінны былі прадставіць дакументы на пацвярджэнне дваранскага паходжання. Дробная шляхта, якая ў пераваж-

най большасці такіх дакументаў не мела, пераводзілася ў разрад сельскіх аднадворцаў або мяшчан. Гэтае мерапрыемства па «разбору» шляхецкага саслоўя на землях Беларусі некалькі разоў выкарыстоўвалася расійскім урадам як своеасаблівая карная палітыка, асабліва ў часы ўздыму нацыянальна-вызваленчага руху.

***Змены ў становішчы сялян і мяшчан.*** Пасля далучэння да Расійскай імперыі падаткі на насельніцтва ўзраслі ў 4–5 разоў; замест *падымнага* падатку, які збіраўся з гаспадаркі ў часы ВКЛ, быў уведзены *падушны*, якім абкладваліся асобы мужчынскага полу. У той час, як у Расіі падаткі збіраліся ў папяровых асігнацыях, беларускае насельніцтва абавязанае было плаціць іх у сярэбранай манеце (курс сярэбранага рубля і рубля асігнацыямі ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. суадносіўся як 1:6).

Былі ліквідаваныя катэгорыі вольных сялян (зямян і баяр), а асноўнай павіннасцю станавілася паншчына, памер якой дасягаў да шасці мужчынскіх і жаночых дзён на тыдзень. Акрамя таго, на сялян ускладалася рэкруцкая павіннасць, па якой у расійскую армію на 25-гадовую службу (з 1834 г. – 20-гадовую) сялянам неабходна было выправіць аднаго рэкрута ад 200 душ мужчынскага полу (з 1820 г. – ад 125 душ). Такім чынам, распаўсюджанне на землях Беларусі расійскай падатковай і павіннаснай сістэм прывяло да пагаршэння становішча асноўнай вытворчай сілы грамадства – сялянства.

Па расійскіх законах памешчыкі маглі караць сваіх прыгонных сялян, якія ў нечым правініліся, нават адпраўкай на катаргу. Сялянам, у тым ліку і дзяржаўным, забаранялася падаваць скаргі на землеўласнікаў. Любая скарга на памешчыка кваліфікавалася як ілжывы данос, яе падаўца мог быць пакараны высылкай у Сібір.

Падатковы ціск на гарадское насельніцтва таксама ўзрос: былі ўведзеныя падаткі на ўтрыманне чыноўніцтва, павялічаныя падаткі на права займацца рамяством і гандлем. У 1785 г. на беларускія гарады былі распаўсюджаныя прынцыпы, абвешчаныя Кацярынай II у так званай «Даравальнай грамаце гарадам». У адпаведнасці з ёй гарадское насельніцтва дзялілася на 6 разрадаў і на падставе маёмаснага цэнзу магло ўдзельнічаць у выбарах у гарадскую думу,

але ўсе важныя пытанні гарадскога жыцця вырашаліся выключна са згоды царскай адміністрацыі (губернатараў і гараднічых). Такім чынам, самакіраванне гарадоў (магдэбургскае права), якое мела на землях Беларусі больш як 400-гадовую гісторыю і спрыяла развіццю гарадоў, было ліквідавана.

***Абмежавальная палітыка ў адносінах да яўрэяў.*** Яўрэі ў Вялікім Княстве Літоўскім у цэлым і на землях Беларусі ў прыватнасці складалі значную частку насельніцтва. Яўрэям было забаронена валодаць зямлёй і працаваць на ёй, таму яны займаліся ў асноўным рамяством, гандлем, ліхвярствам. За выплату падаткаў і за выкананне яўрэямі павіннасцяў адказвала яўрэйская абшчына – *кагал.*

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай яўрэям было забаронена жыць на тэрыторыі Расіі. З 1794 г. згодна з указам Кацярыны II у Расійскай імперыі ўводзілася «мяжа яўрэйскай аселасці», якая амаль супала з межамі ВКЛ і Расіі на 1772 г. Яўрэі маглі жыць толькі на захад ад гэтай мяжы (фактычна на тэрыторыі Беларусі, Украіны і Літвы) толькі ў гарадах і мястэчках. Пры гэтым ім забаранялася трымаць шынкі, корчмы, заезныя двары ў вёсках, арандаваць маёнткі, пра-



Мяжа яўрэйскай аселасці.

мысловыя прадпрыемствы. Падаткі, што ўскладаліся на яўрэйскае насельніцтва, былі ў два разы большыя, чым тыя, што прызначаліся на хрысціян. Для тых яўрэяў, якія пераходзілі з іўдаізму ў праваслаўе, усе вышэйзгаданыя абмежаванні адмяняліся. У 1860-я гады на тэрыторыі Беларусі жыло каля 400 тыс. яўрэяў.

Такім чынам, пасля падзелаў Рэчы Паспалітай беларускія землі апынуліся ў складзе адной з далёка не перадавых на той час у эканамічным развіцці краін Еўропы. Пагаршэнне становішча людзей простага стану, страта шляхтай рэальнай улады ў краіне, абвастрэнне нацыянальнага і рэлігійнага пытанняў падштурхоўвалі насельніцтва ад адзінкавых пратэстаў у канцы XVIII ст. да масавага нацыянальна-вызваленчага руху ў XIX ст.

**2.** ***Беларусь у вайне 1812 г.*** Да 1812 г. французскі імператар Напалеон Банапарт падпарадкаваў сваёй уладзе амаль усе краіны Еўропы (апроч Англіі і Даніі) і наблізіўся да межаў Расійскай імперыі. Руска-французскія супярэчнасці асабліва абвастрыліся пасля Тыльзіцкага міру 1807 г., згодна з якім Расія вымушаная была далучыцца да кантынентальнай блакады Англіі. Такая палітыка была вельмі непапулярнай у Расіі, выклікала шырокую незадаволенасць у грамадстве і фактычна ўмовы кантынентальнай блакады не выконваліся. З 1809 г. Расія і Францыя пачалі рыхтавацца да вайны.

12 чэрвеня 1812 г. 448-тысячная французская армія (пазней павялічылася да 600 тыс.) пераправілася цераз Нёман у раёне Коўна і пачала рухацца па літоўскіх і беларускіх землях. 1-я і 2-я расійскія арміі пад кіраўніцтвам **Барклая де Толі** (120 тыс. чал., штаб-кватэра ў Вільні) і **П. І. Баграціёна** (49 тыс. чал., штаб-кватэра ў Ваўкавыску) не маглі супрацьстаяць французам і з баямі вымушаныя былі адыходзіць, каб злучыцца ў Смаленску. 3-я рэзервовая армія на чале з **А. П. Тармасавым** (44 тыс. чал., штаб-кватэра ў Луцку) на злучэнне з асноўнымі расійскімі ваеннымі сіламі не пайшла, а здзяйсняла ваенныя рэйды супраць напалеонаўскіх войск на Брэстчыне.

Французы 16 чэрвеня 1812 г. занялі Вільню, 24 чэрвеня – Мінск. З палітычных меркаванняў Напалеон дазволіў першым уступіць

у сталіцу ВКЛ 5-тысячнаму палку польскіх уланаў пад камандаваннем прадстаўніка адной з самых магутных і ўплывовых магнацкіх фамілій краіны – Дамініка Радзівіла.

Насельніцтва Беларусі, асабліва заходняй яе часткі, звязвала з Напалеонам надзеі на паляпшэнне свайго становішча:

• *шляхта,* якая страціла ў Расійскай імперыі свае палітычныя правы і ўплывы, спадзявалася на магчымасць аднаўлення ВКЛ, тым больш, што Напалеон пасля захопу Аўстрыі і Прусіі стварыў на акупаваных імі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай землях Варшаўскае Герцагства. Нягледзячы на тое, што Варшаўскае Герцагства знаходзілася пад пратэктаратам Францыі, на яго тэрыторыі былі абвешчаныя дэмакратычныя свабоды і ажыццяўлялася парламенцкая форма кіравання.

Першапачаткова частка беларускай і літоўскай шляхты мела надзею на аднаўленне аўтаномнага ВКЛ у складзе Расійскай імперыі. З гэтай нагоды ў 1811 г. ***Міхал Клеафас Агінскі*** падрыхтаваў і прапанаваў на разгляд Аляксандру І праект, па якому планавалася, што адроджанае ВКЛ будзе мець уласны ўрад, а ролю Канстытуцыі будзе выконваць Статут ВКЛ 1588 г. Гэты праект атрымаў назву «план Агінскага». Але супрацьдзеянне з боку кансерватыўнага расійскага дваранства і абвастрэнне руска-французскіх супярэчнасцяў не дазволілі гэтаму плану ажыццявіцца. Таму большасць беларуска-літоўскай шляхты ў 1812 г. звязвала надзеі на аднаўленне дзяржаўнасці менавіта з Напалеонам;

• *сяляне,* знясіленыя вялікімі падаткамі і павелічэннем паншчыны, чакалі ад Напалеона адмены прыгоннага права, якога ўжо не было ў Еўропе;

• *гараджане* спадзяваліся, што гарадам будзе вернутае магдэбургскае права.



*Міхал Клеафас Агінскі.*

Вышэйзгаданае тлумачыць, чаму на першым этапе вайны насельніцтва фактычна не аказвала значнага супраціўлення французскай арміі.

Французскі імператар не хацеў аднаўлення Рэчы Паспалітай, але быў не супраць таго, каб стварыць буфернае палітычнае ўтварэнне паміж Расіяй і Польшчай. Загадам Напалеона ад 1 ліпеня 1812 г. была ўтвораная Камісія Часовага ўрада ВКЛ на чале з мясцовым памешчыкам Станіславам Солтанам, якая павінна была дзейнічаць пад наглядам французскай адміністрацыі. Ураду падпарадкоўваліся Віленская, Гродзенская, Мінская губерні і Беластоцкая вобласць (Віцебская і Магілёўская губерні не ўваходзілі ў склад ВКЛ і падпарадкоўваліся непасрэдна французскім ваенным уладам).

Але пытанне аб існаванні беларуска-літоўскай дзяржавы вырашалася пераважна на палях бітваў. Магнаты і шляхта гарэлі жаданнем змагацца за сваю свабоду, а Напалеону былі патрэбныя салдаты. Менавіта абставінамі ваеннага часу, а не клопатам аб лёсе ВКЛ было выклікане жаданне французскага імператара сфармаваць армію Княства.

Аднак хутка стала зразумела, што створаная на акупаваных землях дзяржава з'яўляецца толькі інстытутам для больш лёгкага і добраахвотнага забеспячэння французскай арміі фуражом і правіянтам. Рэальная ўлада ў краіне належала французскім генералам, што ўзначальвалі адміністрацыйныя адзінкі – *дэпартаменты*, на якія паводле французскага ўзору была падзеленая тэрыторыя Беларусі. У вёсках і гарадах праходзілі *рэквізіцыі* на карысць французскай арміі. Акрамя таго, французскія ўлады абвясцілі рэкруцкі набор па расійскім узоры, чым канчаткова страцілі падтрымку мясцовага насельніцтва.

Рабаванне простага насельніцтва французскімі салдатамі, несправджаныя надзеі на аднаўленне ВКЛ і адмену прыгоннага права, якія звязваліся з Напалеонам, выклікалі ў значнай часткі грамадства незадавальненне, што хутка пачало перарастаць у адкрыты супраціў. У многіх мясцовасцях Беларусі ў другой палове 1812 г. разгарнуўся партызанскі рух з мэтай абароны ад рабаўніцтва з боку

французскіх войск. Вядомы імёны некаторых беларускіх партызан у гэтай вайне:

***Тарас Барысенка*** з в. Трасцянка Ігуменскага павета ўзначальваў партызанскі атрад аднавяскоўцаў, які рабіў напады на французскіх салдат і фуражыраў;

***Максім Маркаў*** з в. Жарцы, 22 селяніна з атрада якога пасля вайны былі ўзнагароджаныя расійскім урадам крыжамі;

***Фядора Міронава***, сялянка в. Пагуршчына Полацкага павета, якая стала разведчыцай авангарда рускага корпуса Вітгенштэйна. Яна хадзіла ў разведку ў заняты французамі Полацк, здабывала звесткі аб размяшчэнні французскіх войск. Указам Аляксандра I была ўзнагароджаная сярэбраным медалём, грашовай прэміяй, а ў 1820 г. разам з сям'ёй вызваленая ад прыгоннай залежнасці.

Антыфранцузскі супраціў дапоўніўся і антыфеадальнымі выступленнямі сялян, якія не падпарадкоўваліся памешчыкам, не адбывалі ніякіх работ і не выконвалі паншчыны.



*Петэр фон Гес «Пераправа цераз Бярэзіну».*

У такіх умовах пасля вымушанага адступлення з Масквы французская армія рушыла назад праз тэрыторыю Беларусі.

14–16 лістапада 1812 г. пры пераправе напалеонаўскай арміі цераз Бярэзіну каля вёскі Студзёнкі (15 км на поўнач ад Барысава) ад «Вялікай арміі» засталося толькі 60 тыс. чалавек.

У выніку вайны 1812 г. гаспадарка Беларусі зноў была разбураная. Па некаторых падліках, страты насельніцтва вызначаліся больш як у 25%, амаль напалову скарацілася колькасць жывёлы, зменшыліся пасяўныя плошчы.

Вясной 1813 г. паўсюдна была адноўленая расійская адміністрацыя. Зыходзячы з палітычных меркаванняў, урад Аляксандра I абвясціў амністыю той шляхце, якая ўдзельнічала ў вайне на баку Напалеона, але нічога не зрабіў для простага насельніцтва. Нягледзячы на ваенныя бедствы беларускія губерні ў 1813–1814 гг. не былі вызваленыя ад рэкруцкіх набораў і паставак на патрэбы расійскай арміі, якая працягвала паход на захад, а прыгон і свавольле памешчыкаў нават узмацніліся.

**3.** ***Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў першай палове XIX ст. Крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы.*** На пачатку XIX ст., калі ў вядучых краінах Еўропы адбываўся пераход да індустрыяльнай цывілізацыі, у Расійскай імперыі па-ранейшаму панавала феадальна-прыгонніцкая сістэма. Галоўнай галінай гаспадаркі на беларускіх землях з'яўлялася ворыўнае земляробства, якое вялося на аснове прыгонніцтва з выкарыстаннем *трохпольнай* сістэмы і пераважна прымітыўных прыладаў працы. Ад эканамічных рэформаў, якія праводзіліся на землях Беларусі ў другой палове XVIII ст. і былі накіраваныя на інтэнсіфікацыю сельскагаспадарчай вытворчасці пры паслабленні павіннаснага ціску сялян, засталіся толькі ўспаміны.

У першай палове XIX ст. Беларусь адносілася да рэгіёнаў, дзе панавала буйное дваранскае землеўладанне: 3,6% памешчыкаў, якія мелі больш за 500 душ прыгонных, валодалі амаль паловай сялян.

**Найбуйнейшыя гаспадаркі на беларускіх землях у першай палове XIX ст.**

| Уладальнік | Маёнтак | Колькасць фальваркаў | Колькасць прыгонных | Колькасць ворыўнай зямлі (дзесяціны) |
|---|---|---|---|---|
| Граф Румянцаў | Гомель | 13 | 28 000 | 60 000 |
| Князь Любамірскі | Дуброўна, Аршанскі павет | 15 | 11 000 | 22 000 |
| Памешчык Галынскі | Хоцімск, Клімавіцкі павет | 9 | 7 300 | 37 500 |
| Княгіня Замойская | Сялец, Гродзенская губерня | 6 | 8 000 | 30 000 |

Буйныя памешчыцкія гаспадаркі мелі пэўныя эканамічныя перавагі перад сярэднімі і дробнымі. У іх існавалі лепшыя магчымасці для стварэння шматгаліновай вытворчасці і павышэння таварнасці.

У першыя дзесяцігоддзі XIX ст. на гаспадарчае развіццё маёнткаў беларускіх памешчыкаў вызначальны ўплыў аказала кан'юнктура цэн на збожжа ў Заходняй Еўропе. Хуткае развіццё капіталізму ў эканоміцы Еўропы суправаджалася ростам колькасці насельніцтва і, адпаведна, павелічэннем попыту і росту цэнаў на збожжа. Гэтая сітуацыя была выкарыстаная беларускімі памешчыкамі. З мэтай павелічэння аб'ёмаў продажу зерня за мяжу пашыраліся плошчы панскага заворвання за кошт сялянскіх надзелаў і сенажацяў, але гэта прывяло да скарачэння колькасці жывёлы і адпаведна да пагаршэння ўгноенасці глебы.

Аднак спыніць пранікненне капіталістычных адносін у вёску было ўжо немагчыма. У сувязі з рыначнымі патрабаваннямі ў першай палове XIX ст. адбываецца *спецыялізацыя* сельскай гаспадаркі асобных рэгіёнаў Беларусі: у Віцебскай, а таксама ў паўночных паветах Мінскай і Магілёўскай губерняў развівалася льнаводства; у цэнтральных і паўднёвых частках Мінскай і Магілёўскай

губерняў – вырошчванне канопель і вытворчасць пянькі; у Гродзенскай губерні перавага аддавалася танкарунннай авечкагадоўлі. Ва ўсіх губернях была развіта вытворчасць збожжавых культур, з канца 30-х гадоў пачалі вырошчвацца цукровыя буракі. У Беларусі з'явіліся *прадпрымальніцкія гаспадаркі*, якія былі арыентаваны не толькі на вырошчванне сельскагаспадарчай сыравіны, а і на яе перапрацоўку. Шырока развівалася вінакурэнне.

Аднак адзінкавыя факты прымянення памешчыкамі ў сваіх маёнтках лепшай тэхнікі, наёмнай працы і шматпольных севазваротаў не маглі прывесці да істотных змен у арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці. Эканамічнае развіццё ў першай палове XIX ст. яскрава сведчыла, што спалучэнне прыгоннай працы з патрабаваннямі ўнутранага і знешняга рынкаў магло прынесці толькі часовыя прыбыткі. З цягам часу станавілася відавочным адначасовае збядненне як панскай, так і сялянскай гаспадарак. Гэта адбывалася з прычыны таго, што працаваць на ўласным надзеле пры паншчыне ў 12 дзён на тыдзень (6 мужчынскіх і 6 жаночых) у сялян не было часу, а праца на панскім ворыве была прымусовай і не выклікала ў селяніна зацікаўленасці ў яе выніках. Такім чынам, эканамічныя магчымасці феадальна-прыгонніцкай сістэмы былі вычарпаны, а формы яе арганізацыі і спосабы вядзення гаспадаркі не маглі канкурыраваць з капіталістычным спосабам вытворчасці.

***Рэформа П. Д. Кісялёва ў дзяржаўнай вёсцы***. Ва ўмовах крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы ўрад Мікалая I вымушаны быў шукаць выйсце з існуючага становішча. У 1837–1841 гг. у дзяржаўных уладаннях Беларусі быў праведзены шэраг мерапрыемстваў, якія ўвайшлі ў гісторыю пад назвай *рэформы Кісялёва*. Граф П. Д. Кісялёў быў міністрам дзяржаўных маёмасцяў, і распрацаваная ім рэформа тычылася толькі дзяржаўных сялян, якія складалі пятую частку ўсяго сельскага насельніцтва Беларусі. *Мэтай пераўтварэнняў* было павелічэнне дзяржаўных даходаў і спыненне працэсу збяднення сялянства.

Сярод асноўных мерапрыемстваў рэформы можна вылучыць наступныя:

1) ***змена кіравання дзяржаўнай вёскай***. Была ўсталявана трохярусная сістэма: губерня – акруга – сельскае ўпраўленне. Губернскія органы (*палаты дзяржаўных маёмасцяў*) адказвалі за правядзенне рэвізій, ахоўвалі грамадскі парадак, вырашалі пытанні харчовай і медыцынскай дапамогі. Адміністрацыя акругі займалася арганізацыяй сельскіх грамад, а сельскія ўпраўленні (*сельскія сходы і старасты*) праводзілі сялянскае землеўладкаванне, размеркаванне і збор падаткаў;

2) ***правядзенне люстрацыі***, падчас якой складаліся інвентары з падрабязным апісаннем усіх дзяржаўных маёнткаў і вызначэннем павіннасцяў сялян у залежнасці ад іх гаспадарчага становішча;

3) ***спыненне здачы дзяржаўных зямель у арэнду*** прыватным уласнікам, паколькі апошнія не дбалі аб захаванні гаспадарчага патэнцыялу ўладанняў, а клапаціліся толькі пра ўласную выгаду;

4) ***ліквідацыя фальваркаў***. Гэтае мерапрыемства было адным з самых эфектыўных, паколькі з ліквідацыяй фальваркаў адмянялася паншчына, сяляне пераводзіліся на чынш, што садзейнічала павелічэнню іх зацікаўленасці ў выніках сваёй працы. Да таго ж, была ўсталявана сярэдняя норма надзела на рэвізскую (мужчынскую) душу;

5) ***палітыка «апякунства»***, якая прадугледжвала стварэнне ў вёсках хлебных магазінаў (складаў), прыходскіх школ для навучання сялянскіх дзяцей, наяўнасць у вёсках фельчараў, а таксама правядзенне розных агранамічных мерапрыемстваў, добраўпарадкаванне сялянскіх сядзіб, развіццё сістэмы страхавання і інш.

Як бачна, рэформа П. Д. Кісялёва ў многім была падобнай на рэформу А. Тызенгаўза ў каралеўскіх сталовых эканоміях ВКЛ у другой палове XVIII ст. Мэты адной і другой рэформы амаль поўнасцю супадалі: павелічэнне даходаў скарбу, люстрацыя дзяржаўнай маёмасці, спыненне здачы дзяржаўных зямель у арэнду і ўвядзенне кіравання імі дзяржаўнай адміністрацыяй пры адначасовым павелічэнні ролі сялянскай абшчыны, стварэнне грамадскіх магазінаў (складаў), школ, наяўнасць фельчараў, удасканаленне форм і метадаў вядзення сельскай гаспадаркі. Але ў рэформах

мелася адно вельмі істотнае адрозненне: калі А. Тызенгаўз для павелічэння прыбыткаў скарбу аднавіў у эканоміях фальваркі і паншчыну, то ліквідацыя фальваркаў П. Д. Кісялёвым і перавод сялян на чынш з'явіліся яскравым сведчаннем разумення міністрам дзяржаўных маёмасцяў вычарпанасці рэсурсаў феадальна-прыгонніцкай сістэмы і немагчымасці прагрэсіўнага развіцця сельскай гаспадаркі пры захаванні прымусовай працы асноўнага вытворцы. Калі ў другой палове XVIII ст. сяляне не прынялі рэформу А. Тызенгаўза і адказалі на яе масавымі ўцёкамі з каралеўскіх эканомій, то рэформа П. Д. Кісялёва не выклікала сялянскіх пратэстаў, а, наадварот, прывяла да пэўнага павелічэння надзелаў дзяржаўных сялян (у беларускіх губернях у сярэднім на 45%), памяншэння іх павіннасцяў (у сярэднім на 56%), надання сялянам пэўнай эканамічнай свабоды, што, тым не менш, спрыяла павелічэнню ўраджайнасці і дзяржаўных даходаў.

***Інвентарная рэформа***. Становішча насельніцтва ў прыватнаўласніцкіх маёнтках таксама выклікала занепакоенасць уладаў. Неабходна адзначыць, што на землях Беларусі прыватнаўласніцкія сяляне складалі абсалютную большасць: 79,8% у 1812 г. і 64,6% у 1845 г. Аднак, нягледзячы на станоўчыя вынікі рэформы П. Д. Кісялёва, яна не стала прыкладам для памешчыкаў. Кансерватыўныя памешчыкі працягвалі весці гаспадарку старым «дзедаўскім» спосабам і нічога не хацелі мяняць. У 40-я г. XIX ст. Мікалай І некалькі разоў ствараў сакрэтныя камітэты з мэтай распрацоўкі мерапрыемстваў па сялянскаму пытанню, але, баючыся страціць падтрымку дваранства, на рашучыя меры, якія б закраналі асновы феадальна-прыгонніцкай сістэмы, царскі ўрад не ішоў.

Становішча сялян у прыватнаўласніцкіх маёнтках было вельмі цяжкім: вялікі памер паншчыны пры ўстанаўленні так званых *урокаў* – нормаў дзённага вырабатку, вялікія дадатковыя павіннасці (будаўніцтва ў панскім фальварку, дарожныя работы, вартавыя абавязкі), *згоны* – прыцягненне сялян да тэрміновых сельскагаспадарчых работ, праца сялян у падрадчыкаў на кантрактных умовах на сплаўных і будаўнічых работах і інш. Сяляне часта не ведалі дакладна ўсіх сваіх павіннасцяў і выконвалі іх па загаду ўласніка.

Усё гэта выклікала сацыяльныя пратэсты сялян, якія праяўляліся, у першую чаргу, у масавых уцёках з маёнткаў.

З мэтай рэгулявання адносін паміж памешчыкамі і сялянамі і зняцця сацыяльнай напружанасці ў прыватнаўласніцкай вёсцы П.Д. Кісялёў у 1840 г. прапанаваў увесці на тэрыторыі Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны абавязковыя *інвентары*, у якіх былі б зафіксаваны памеры сялянскіх надзелаў і вызначаны дакладныя нормы павіннасцяў. Нягледзячы на тое, што прапанаванае мерапрыемства, якое атрымала назву *інвентарная рэформа*, не закранала асноў феадальна-прыгонніцкай сістэмы, яно выклікала рэзкае непрыняцце з боку памешчыкаў. Складанне інвентароў, якое было ініцыіравана дзяржавай, прыватныя ўласнікі расцанілі як умяшальніцтва ўрада ў іх асабістыя справы і наступленне на іх правы. «У сваіх маёнтках робім, што хочам» – такі быў адказ памешчыкаў на рэформу.

Інвентарная рэформа ў памешчыцкай вёсцы правалілася, а сама памешчыцкая гаспадарка ўступіла ў паласу глыбокага крызісу, які праяўляўся ў рэзкім зніжэнні даходаў, у росце запазычанасці крэдытным установам, у фінансавых банкруцтвах і распродажы маёнткаў з аўкцыёнаў. Такім чынам, крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы паглыбляўся.

***Прамысловасць і гарады ў першай палове XIX ст.*** Прамысловасць у сваім развіцці праходзіць тры стадыі: 1) рамесная вытворчасць; 2) мануфактура; 3) фабрычна-заводская прамысловасць. У першай палове XIX ст. аснову прамысловасці Беларусі складала рамесная і мануфактурная вытворчасць. Значную ролю адыгрывала *вотчынная прамысловасць* памешчыкаў. Як правіла, вотчынныя мануфактуры перапрацоўвалі мясцовую сыравіну і былі заснаваны на бясплатнай працы прыгонных сялян. Памешчыкі ў пачатку XIX ст. з'яўляліся галоўнымі ўласнікамі капіталу і менавіта ў іх уладаннях былі заснаваны першыя на землях Беларусі прадпрыемствы фабрычнага тыпу: у 20-я г. XIX ст. памешчык Пуслоўскі пабудаваў у мястэчках Хомск (Кобрынскі павет) і Касава (Слонімскі павет) дзве суконныя фабрыкі, на якіх выкарыстоўваліся паравыя рухавікі.



*Косава. Замак Пуслоўскіх – стваральнікаў першых фабрык на тэрыторыі Беларусі (праект рэстаўрацыі).*

У гарадах і мястэчках былі распаўсюджаны пераважна рамесныя майстэрні, але змены ў іх арганізацыі сведчылі аб пачатку фарміравання капіталістычных адносін: былі ліквідаваны самастойнасць і замкнутасць цэхаў, узрасла колькасць рамесных спецыяльнасцяў. Пры гэтым гарадская прамысловасць на пачатку XIX ст. не магла канкурыраваць з вотчыннай, паколькі выдаткі на яе арганізацыю былі значна большымі з-за неабходнасці аплачваць зямельныя ўчасткі, закупку сыравіны і працу наёмных рабочых. Існавала і яшчэ адна перашкода на шляху эфектыўнага развіцця гарадской прамысловасці – наяўнасць феадальна-прыгонніцкай сістэмы рабіла немагчымым стварэнне рынку свабоднай рабочай сілы. Таму са 140 мануфактур на землях Беларусі ў 1860 г. купцам і мяшчанам належалі толькі 3, а астатнія – памешчыкам.

У другой чвэрці XIX ст. на тэрыторыі Беларусі назіраўся рост гарадоў і колькасці гарадскога насельніцтва. Працэс урбанізацыі ў гэты час быў звязаны не з развіццём прамысловасці і гандлю, а ў першую чаргу з існаваннем «мяжы яўрэйскай аселасці» і перасяленнем яўрэяў з сельскай мясцовасці ў гарады і мястэчкі, прычым колькасць апошніх у першай палове XIX ст. значна павялічылася. Гэта тлумачылася тым, што памешчыкі сталі актыўна дабівацца пераводу сваіх буйных вёсак у разрад мястэчак, паколькі ў такім

выпадку яны атрымлівалі права адкрываць корчмы для продажу гарэлкі, што пры распаўсюджанасці вінакурэння значна павялічвала прыбытковасць іх маёнткаў.

Паступова таварна-грашовыя адносіны ўсё больш уваходзілі ў жыццё насельніцтва. Для развіцця гандлю ў першай палове XIX ст. надавалася ўвага паляпшэнню шляхоў зносін: будаваліся паштовыя тракты, рэканструяваліся водныя каналы (Аўгустоўскі, Бярэзінскі, канал Агінскага і інш.). Важную ролю ў пашырэнні гандлю адыгрывалі кірмашы, якія праводзіліся ў час рэлігійных святаў. У Беларусі дзейнічала каля 270 кірмашоў, найбольш вядомымі з якіх былі *Кантрактавы* кірмаш у Мінску, *Троіцкі ў* Гомелі, *Зэльвенскі* і *Свіслацкі ў* Гродзенскай губерні, *Любавіцкі* – у Магілёўскай, *Асвейскі* і *Бешанковіцкі* – у Віцебскай губерні. Але з цягам часу павялічвалася роля стацыянарнага гандлю ў крамах гарадоў і мястэчак.

Такім чынам, у сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі першая палова XIX ст. характарызавалася крызісам феадальна-прыгонніцкай сістэмы, які выявіўся ў памяншэнні даходаў уласнікаў зямлі, павелічэнні павіннаснага ўціску сялян, што таксама з’яўлялася вялікай перашкодай на шляху развіцця гарадской прамысловасці.

**4. *Грамадска-палітычны рух на землях Беларусі.*** На развіццё грамадскага руху ў Беларусі ў першай палове XIX ст. аказаў уплыў шэраг падзей: падзелы Рэчы Паспалітай і ліквідацыя дзяржаўнасці ВКЛ і Польшчы, Вялікая Французская рэвалюцыя з яе дэмакратычнымі ідэямі, якія знайшлі ўвасабленне ў лозунгу «Свабода. Роўнасць. Братэрства», вайна 1812 г. і ўключэнне Царства Польскага ў склад Расійскай імперыі. Арганізатарамі і ўдзельнікамі нацыянальна-вызваленчага руху былі ў першую чаргу шляхецкая інтэлігенцыя і студэнты. У сваёй барацьбе за незалежнасць яны падтрымлівалі сувязі з перадавымі людзьмі Польшчы і Расіі. Асяродкам выспявання ідэй вальнадумства і аб’яднання іх прыхільнікаў у розныя арганізацыі ў першай палове XIX ст. стаў Віленскі ўніверсітэт.

***Тайныя таварыствы.*** У 1817 г. студэнты Віленскага ўнівер-

сітэта ўтварылі тайнае патрыятычнае згуртаванне, якое назвалі «*Таварыства філаматаў*» (аматараў ведаў). У яго ўвайшлі таленавітыя маладыя людзі, імёны якіх пазней стануць вядомыя ва ўсім свеце. Найперш, паэт з сусветным імем *Адам Міцкевіч*, пачынальнік новай беларускай літаратуры і фальклярыст *Ян Чачот*, таленавіты паэт і грамадскі дзеяч *Тамаш Зан*, вялікі вучоны і асветнік *Ігнат Дамейка* і інш. Старшынёй Таварыства быў выхадзец з Украіны *Язэп Яжоўскі*.



*Тамаш Зан.*

Таварыства філаматаў мела аддзяленні ў Свіслацкай гімназіі, Полацкім піярскім вучылішчы і іншых навучальных установах. З мэтай пашырэння свайго ўплыву Таварыства ў 1819 г. стварыла шэраг структур – «*Таварыства сяброў*», «*Таварыства філарэтаў*» (аматараў дабрачыннасці), «*Саюз прамяністых*», «*Таварыства літаратараў*».

Філаматы трактавалі веды і навуку як найвышэйшыя каштоўнасці чалавека, выступалі супраць афіцыйнай палітыкі ў галіне адукацыі, асуджалі прыгонніцтва і феадальна-абсалютысцкія парадкі. Галоўная мэта, якую ставілі перад сабой філаматы і іншыя суполкі – развіццё асветы ў родным краі. Яны вывучалі прыроду, гаспадарку, этнаграфію, фальклор, мову Беларусі. Ставілі задачу падрыхтаваць моладзь да рознабаковай дзейнасці на карысць Айчыны, пад якой разумелася былое Вялікае Княства Літоўскае.



*В. Ваньковіч.*
*Партрэт А. Міцкевіча*

У 1823 г. «Таварыства філаматаў» было раскрытае ўладамі і многія яго ўдзельнікі падвергнутыя рэпрэсіям праз турэмнае зняволенне і высылку за межы Бацькаўшчыны. Былі звольненыя з працы прафесары Віленскага ўніверсітэта М. Баброўскі, І. Даніловіч, І. Лялевель, пайшоў у адстаўку кіраўнік Віленскай навучальнай акругі князь А. Чартарыйскі. Але нягледзячы на гэта менавіта дзякуючы філаматам і іх выхавальнікам у Віленскім універсітэце пачала кшталтавацца беларуская нацыянальная ідэя.

Прадстаўнікі «Таварыства філаматаў» мелі кантакты з членамі тайных арганізацый расійскіх *дваранскіх рэвалюцыянераў-дзекабрыстаў*, якія выступалі за знішчэнне самадзяржаўя, нацыяналізацыю часткі памешчыцкіх зямель, скасаванне прыгоннага права з надзяленнем сялян зямлёй. Пранікненне ідэй дзекабрыстаў на беларускія землі было звязана з пераводам у Беларусь з Пецярбурга гвардзейскага корпуса, у якім служылі сябры «Паўночнага таварыства» дзекабрыстаў. У 1823 г. яны нават распрацоўвалі план арышту цара і яго світы ў Бабруйску падчас агляду войска. З гэтай падзеяй звязвалася паўстанне ў Пецярбургу і абвяшчэнне Расіі рэспублікай. Аднак план не быў ажыццёўлены.

Ідэі дзекабрыстаў падзяляла арганізаванае былым філаматаўцам М. Рукевічам сумесна з афіцэрамі Літоўскага асобнага корпуса К. Ігельстромам і А. Вягеліным «*Таварыства ваенных сяброў*», якое налічвала 45 чалавек. Мэтай гэтай арганізацыі было абвешчана «ўсеагульнае дабро», што прадугледжвала ліквідацыю самадзяржаўя і феадальна-прыгонніцкай сістэмы. Удзельнікі «*Таварыства ваенных сяброў*» у снежні 1825 г. спрабавалі ўзняць паўстанне ў падтрымку выступлення дзекабрыстаў у Пецярбургу, але пацярпелі няўдачу.

***Паўстанне 1830–1831 гг.*** У лістападзе 1830 г. у Варшаве пачалося нацыянальна-вызваленчае паўстанне супраць царскай Расіі.

У стане паўстанцаў існавала дзве плыні:

1) *рэвалюцыйная* на чале з Я. Лялевелем, якая выступала за надзяленне сялян зямлёй (з кампенсацыяй страт памешчыкам) і сумесную з расійскім народам барацьбу супраць царызму «*за нашу і вашу свабоду*»;



*Князь Адам Чартарыйскі.*



*Эмілія Плятэр.*

2) *арыстакратычна-кансерватыўная*, на чале з князем А. Чартарыйскім, прыхільнікі якой галоўнай мэтай лічылі аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г.

Для падрыхтоўкі паўстання ў Беларусі і Літве ў студзені-лютым 1831 г. быў створаны *Віленскі цэнтральны паўстанцкі камітэт*, які складаўся пераважна з прадстаўнікоў кансерватыўнага лагера. Ён не змог забяспечыць адначасовае выступленне паўстанцкіх сіл і каардынацыю іх дзеянняў у розных раёнах. Паўстанне пачыналася ізалявана па асобных паветах. Найбольш актыўная барацьба разгарнулася на Віленшчыне, у Ашмянскім, Браслаўскім, Вілейскім паветах. На памежжы Віцебскай і Віленскай губерняў дзейнічаў атрад, створаны графіняй Эміліяй Плятэр – паэткай і збіральніцай беларускага фальклору, якая атрымала званне капітана і была прызначаная ганаровым камандзірам роты паўстанцкага атрада.

Неарганізаванасць кіраўніцтва паўстаннем зводзіла на нішто патрыятычныя памкненні шляхты і простага насельніцтва. У выніку 19 чэрвеня 1831 г. паўстанцы пацярпелі паражэнне ад 26-тысячнага расійскага войска ў бітве пад Вільняй. У ліпені 1831 г. паўстанне перакінулася на Мазырскі, Рэчыцкі і Пінскі паветы, але да канца

жніўня 1831 г. яно было падаўленае расійскім войскам, а яго ўдзельнікі былі падвергнутыя рэпрэсіям.

***Змены ў палітыцы царызму пасля паўстання***. Нацыянальна-вызваленчае паўстанне 1830–1831 гг. паказала, што палітыка царскага ўрада канца XVIII – пачатку XIX ст. у адносінах да мясцовай шляхты не прынесла плёну – шляхта так і не стала апорай самадзяржаўя, а, наадварот, актыўна ўдзельнічала ў антыўрадавых выступленнях. Таму пасля падаўлення паўстання палітыка царызму на землях Беларусі і Літвы рэзка змянілася – быў узяты курс на аслабленне шляхты, выкараненне паланізацыі і паслядоўную русіфікацыю краю.

Маёнткі памешчыкаў, якія ўдзельнічалі ў паўстанні, канфіскоўваліся і перадаваліся ў казну. Усяго ў пяці заходніх губернях і Беластоцкай вобласці было канфіскавана 217 маёнткаў, у якіх налічвалася 72,5 тыс. прыгонных.

З мэтай аслаблення пазіцый шляхты згодна з царскім указам ад 14 кастрычніка 1831 г. на беларускіх і літоўскіх землях узмацніўся «разбор шляхты», у выніку якога больш за 10 тысяч прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя былі пазбаўлены права прыналежнасці да яго.

На землях Беларусі на змену паланізацыі прыйшоў перыяд адкрытай русіфікацыі краю. У 1832 г. з мэтай распрацоўкі і ажыццяўлення мерапрыемстваў па русіфікацыі краю быў створаны *Камітэт па справах заходніх губерняў*. У гэтым жа годзе быў зачынены Віленскі ўніверсітэт. У 30-я гг. XIX ст. на беларускіх землях праводзілася звальненне з дзяржаўных устаноў, органаў суда, асветы і культуры чыноўнікаў «польскага паходжання», а з 1836 г. было забаронена вывучэнне польскай мовы ў школах. Вялася актыўная праца па змяншэнню ўплыву каталіцкай царквы на грамадскую думку. Зачыняліся каталіцкія манастыры, а маёнткі, якія ім належалі, пераводзіліся ў разрад казённых. Канфіскаваныя прыватнаўласніцкія, дзяржаўныя і манастырскія землі перадаваліся расійскім памешчыкам у арэнду на сто гадоў. Справаводства ў дзяржаўных установах і навучанне ў школах пераводзілася на рускую мову.

У 1839 г. у Полацку быў арганізаваны сабор уніяцкіх мітрапалітаў, на якім было прынята рашэнне аб далучэнні ўніяцкай царквы да праваслаўнай. Гэтая акцыя суправаджалася спальваннем уніяцкіх рэлігійных і вучэбных кніг, знішчэннем царкоўных інтэр'ераў, якія не адпавядалі праваслаўным канонам. Такім чынам, была ліквідавана адзіная ўстанова, якая ў сваёй дзейнасці карысталася беларускай мовай.

У 1830 і 1831 гг. царскім указам была адменена дзейнасць Статута ВКЛ 1588 г. у Віцебскай і Магілёўскай губернях, а ў 1840 г. – на астатняй тэрыторыі Беларусі і Літвы. На гэтых землях былі ўведзены расійскія законы. Паводле ўказа Мікалая I ад 18 чэрвеня 1840 г. у афіцыйных дакументах замест назваў «Беларусь» і «Літва» былі ўведзены тэрміны «*Западнорусские губернии*» ці «*Северо-Западный край*».

Аднак рэпрэсіі і прымусовая русіфікацыя не спынілі развіцця нацыянальнага руху. Працягвалі дзейнічаць тайныя арганізацыі: «*Дэмакратычнае таварыства*», заснаванае ў 1836 г. у Вільні Францам Савічам, «*Саюз свабодных братоў*», які дзейнічаў у 1846–1849 гг. у Вільні, Гродне, Мінску, Лідзе і іншых гарадах. У рукапісных спісах па тэрыторыі Беларусі распаўсюджваліся напісаныя па-беларуску паэмы «*Тарас на Парнасе*» і «*Энеіда навыварат*». Не толькі сяляне, але і шляхта ўсё больш актыўна карысталася беларускай мовай у паўсядзённым жыцці. Па-беларуску пісалі Я. Чачот, П. Багрым, В. Дунін-Марцінкевіч.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Дваранскія рэвалюцыянеры*** – удзельнікі дваранскага апазіцыйнага руху ў Расійскай імперыі ў 1825–1861 гг.

***Дзекабрысты*** – дваране, члены тайных таварystваў другой паловы 1810-х – першай паловы 1820-х, якія арганізавалі ў Санкт-Пецярбургу 14 снежня 1825 г. антыўрадавае паўстанне.

***Інвентарная рэформа*** – назва рэформы памешчыцкай вёскі, якая праводзілася ў Беларусі ў 40–50-я гады XIX ст.

***Мяжа яўрэйскай аселасці*** – назва тэрыторыі заходніх губерняў Расій-

скай імперыі (беларускія, украінскія, прыбалтыйскія), дзе яўрэям дазвалялася пастаяннае пражыванне.

***Разбор шляхты*** – праверка дакументаў на права шляхецтва; комплекс мерапрыемстваў, праведзеных уладамі Расійскай імперыі, накіраваны на змяншэнне колькасці шляхецкага саслоўя на далучаных землях былога ВКЛ. Праводзіўся падчас падзелаў Рэчы Паспалітай і пасля буйных антырасійскіх паўстанняў.

***Рэквізіцыя*** – прымусовае адабранне дзяржавай маёмасці ва ўласніка пры надзвычайных абставінах.

***Рэкруцкая павіннасць*** – павіннасць, звязаная з абавязкам для сялян і мяшчан выдзяляць мужчын на 20-гадовую службу ў расійскую армію; уведзеная на беларускіх землях пасля далучэння іх да Расійскай імперыі.

***Секвестр*** – забарона ці абмежаванне, якое накладваецца дзяржавай на карыстанне якой-небудзь маёмасцю.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1811–1812 гг.*** – князь М. К. Агінскі разам з князем Ф. К. Любецкім і графам Л. Плятэрам распрацаваў праект «Палажэння аб праўленні аўтаномным Вялікім княствам Літоўскім» у складзе Расійскай імперыі, так званы *План Агінскага.*

***12 чэрвеня 1812 г.*** – пераправа французскай арміі Напалеона цераз Нёман, *пачатак руска-французскай вайны*.

***1 ліпеня 1812 г.*** – стварэнне Часовага ўрада ВКЛ.

***1817 г.*** – стварэнне Таварыства філаматаў.

***1830–1831 гг.*** – нацыянальна-вызваленчае паўстанне на тэрыторыі Польшчы, Беларусі і Літвы.

***1 студзеня 1831 г.*** – спыненне дзеяння Статута ВКЛ 1588 г. у Віцебскай і Магілёўскай губернях.

***1837–1841 гг.*** – рэформа П. Д. Кісялёва ў дзяржаўнай вёсцы.

***1844–1857 гг.*** – правядзенне інвентарнай рэформы ў памешчыцкай вёсцы.

***25 чэрвеня 1840 г.*** – спыненне дзеяння Статута ВКЛ 1588 г. у Гродзенскай, Віленскай і Мінскай губернях.

## ЛІТАРАТУРА

1. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.). – Мінск, 2005. – С. 49–157.
2. *Лютый А. М.* Социально-экономическое развитие городов Белоруссии (вторая половина XVIII – первая половина XIX в.). – Минск, 1987.
3. *Лютый А. М.* Генезис капитализма в промышленности Белоруссии (вторая половина XVIII – первая половина XIX в.). – Минск, 1991.
4. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Ч. 1. – Мінск, 1994.
5. *Чепко В. В.* Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX в. – Минск, 1966.
6. *Чепко В. В.* Города Белоруссии в первой половине XIX в. Экономическое развитие. – Минск, 1981.
7. *Швед В.*, *Данскіх С.* Заходні рэгіён Беларусі ў часы напалеонаўскіх войнаў. 1805–1815 гады. – Гродна, 2006.
8. *Шыбека З.* Гарады Беларусі (60-я гады XIX ст. – пачатак XX ст.). – Мінск, 1997.
9. *Шыбека З.* Нарыс гісторыі Беларусі (1795 – 2002). – Мінск, 2003.

# РАЗДЗЕЛ 2.
# КАНФЕСІЙНЫЯ АДНОСІНЫ, АДУКАЦЫЯ, НАВУКА І КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XVIII – СЯРЭДЗІНЕ XIX ст.

1. *Канфесійныя адносіны ў канцы XVIII – сярэдзіне XIX ст.*
2. *Культурнае развіццё. Змены ў сістэме адукацыі. Навука.*
3. *Літаратура і мастацтва.*
4. *Тэатр і музыка.*
5. *Архітэктура.*

**1. *Канфесійныя адносіны ў канцы XVIII – сярэдзіне XIX ст.*** У час падзелаў Рэчы Паспалітай хрысціянскае насельніцтва Беларусі падзялялася на праваслаўных, католікаў, уніятаў і пратэстантаў. Прадстаўнікоў апошняй канфесіі было найменш. У канцы XVIII ст. найбольшую колькасць вернікаў на тэрыторыі Беларусі складалі ўніяты – каля 80%. Гэта былі ў асноўным сяляне, мяшчане і дробная шляхта.

Шляхта ў пераважнай большасці была каталіцкага веравызнання, і таму, каб не згубіць яе падтрымкі, расійскі ўрад напачатку дазволіў свабоднае выкананне каталіцкіх абрадаў, а таксама захаваў за касцёламі іх маёмасць. Але пры гэтым жорстка забаранялася схіляць у каталіцкую веру праваслаўнае насельніцтва.

Праваслаўная царква, якая цярпела ўціск у Рэчы Паспалітай, атрымала дзяржаўную падтрымку, у Расійскай імперыі ёй надаваліся землі і багацці.

Кацярына II пасля таго, як папа рымскі ў 1773 г. расфарміраваў ордэн езуітаў, дазволіла яго дзейнасць у Расійскай імперыі. Своеасаблівай сталіцай ордэна езутаў стаў Полацк, дзе дзейнічаў езуіцкі калегіум (з 1812 г. – акадэмія з правамі ўніверсітэта). Пры калегіуме была аптэка, бібліятэка (больш за 50 тысяч кніг), друкарня, дзейнічаў школьны тэатр.



*Полацкая езуіцкая акадэмія. Малюнак Напалеона Орды.*

У 1814 г. папа Пій VII аднавіў у правах ордэн езуітаў і кіраўніцтва ордэнам ізноў стала ажыццяўляцца з Рыма. Расійскія ўлады баяліся заходніх уплываў і імператар Аляксандр І заявіў, што езуіты спрабуюць парушыць праваслаўную веру. У 1820 г. яны былі высланы з Расійскай імперыі, была ліквідавана і Полацкая езуіцкая акадэмія.

Пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг. пачалося адкрытае праследаванне каталіцкай і ўніяцкай цэркваў, іерархі якіх у сваёй большасці выступілі на баку ўдзельнікаў руху за аднаўленне Рэчы Паспалітай. Закрываліся ўсе школы, што дзейнічалі пры каталіцкіх і ўніяцкіх манастырах, а ў 1832 г. выйшаў указ аб ліквідацыі каталіцкіх манастыроў, якія не мелі поўнага складу манахаў і аб пераводзе іх зямельных уладанняў у склад дзяржаўных. Выкарыстоўваліся любыя падставы для таго, каб скараціць колькасць каталіцкага духавенства і зменшыць уласнасць каталіцкай царквы. Да сярэдзіны 1840-х гг. ад каталіцкай царквы была адабрана асноўная маса яе зямельных уладанняў і яна страціла сваё становішча буйнога землеўласніка. У выніку гэтых мерапрыемстваў значна ўзрасла залежнасць каталіцкай царквы ад расійскіх уладаў.

Узмацніўся наступ і на ўніяцкую царкву. На працягу 1833–1839 гг. праводзілася палітыка па падрыхтоўцы злучэння ўніяцкай царквы з праваслаўнай. У пачатку 1839 г. царом Мікалаем I быў створаны *Сакрэтны камітэт па ўніяцкіх справах*, які падрыхтаваў праект

дакумента аб аб’яднанні ўніятаў Літвы і Беларусі з праваслаўнымі вернікамі Маскоўскай мітраполіі. Каля паловы ўніяцкіх святароў пад уціскам з боку ўладаў, далі падпіску, што яны згодны далучыцца да праваслаўя.

12 лютага 1839 г. на царкоўным саборы ў Полацку вышэйшае ўніяцкае духавенства на чале з мітрапалітам І. Сямашкам падпісала падрыхтаваны ў Пецярбургу дакумент аб «аб’яднанні» ўніяцкай царквы з праваслаўнай. Баючыся людскіх пратэстаў супраць гэтага акта, у раёны, дзе пераважалі ўніяты, былі накіраваныя вайсковыя каманды. Але масавых пратэстаў не адбылося, праўніяцкія лозунгі з’явіліся пазней, падчас паўстання пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага.

У выніку скасавання ўніяцкай царквы і пераводу паўтара мільёна уніятаў у праваслаўе, абсалютную большасць вернікаў на тэрыторыі Беларусі пачалі складаць праваслаўныя.

У адносінах да яўрэйскага насельніцтва праводзілася палітыка, якая стымулявала іх пераход з іўдаізму ў праваслаўе: новаахрышчаныя валодалі фактычна тымі ж правамі, што і астатняе праваслаўнае насельніцтва.

**2. *Культурнае развіццё. Змены ў сістэме адукацыі. Навука.*** Як і на ўсе галіны жыцця беларускага грамадства, вызначальны ўплыў на адукацыю, культуру і навуку аказала ўключэнне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі. Вектар развіцця беларускай культуры і адукацыі вызначаўся расійскімі ўладамі, іх палітычнымі інтарэсамі.

У першай палове XIX ст. у палітыцы царызму на тэрыторыі Беларусі панавала тэорыя «*заходнерусізму*», згодна з якой беларусы не лічыліся самастойным этнасам, а разглядаліся як неад’емная частка рускага народа. Натуральна, што ім адмаўлялася ў праве мець свае мову і культуру.

Умоўна ў развіцці культуры Беларусі ў XIX ст. можна вылучыць тры этапы:

1) *канец XVIII ст. – 1830–1831 гг.* У першыя дзесяцігоддзі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай уплывам пры расійскім імператарскім двары карысталася апалячаная шляхта былога ВКЛ. Дзеля паразу-

мення з яе прадстаўнікамі царскія ўлады дазволілі праводзіць адукацыю на польскай мове, што прывяло да паглыблення працэсаў *паланізацыі*;

2) *1830–1831 гг. – 1863–1864 гг.* Перыяд характарызаваўся ўзмоцненай *русіфікацыяй* у сувязі з тым, што шляхта не спраўдзіла надзей на супрацоўніцтва і не стала апорай царскага рэжыму, а арганізавала і правяла два вызваленчыя паўстанні за аднаўленне незалежнасці Рэчы Паспалітай;

3) *1863–1864 гг. – пачатак XX ст.* У гэты час насуперак палітыцы русіфікацыі адбывалася станаўленне беларускай нацыянальнай ідэі і фарміраванне беларускай нацыі.

***Змены ў сістэме адукацыі.*** У 1803–1804 гг. у Расійскай імперыі была праведзеная рэформа сістэмы адукацыі. Мэта рэформы – увядзенне ў адукацыю прынцыпаў усесаслоўнасці і свецкасці. Было створана міністэрства народнай асветы і шэсць навучальных акруг, кожная на чале з універсітэтам. Навучальныя ўстановы Беларусі ўваходзілі ў Віленскую навучальную акругу, папячыцелем (кіраўніком) якой быў князь Адам Чартарыйскі. Цэнтрам Віленскай навучальнай акругі быў *Віленскі ўніверсітэт, створаны ў 1803 г. на базе Галоўнай Віленскай школы.* Выкладанне ва ўніверсітэце вялося на польскай мове. У 1812 г. статус акадэміі з правамі і прывілеямі ўніверсітэта атрымаў і *Полацкі езуіцкі калегіум*. Такім чынам, на



*Астранамічная абсерваторыя Віленскага ўніверсітэта*

тэрыторыі Беларусі некаторы час дзейнічалі дзве вышэйшыя навучальныя ўстановы, прычым Віленскаму ўніверсітэту быў уласцівы дух рамантызму і непакорлівасці (яго выпускнікі, студэнты і выкладчыкі з'яўляліся ўдзельнікамі паўстання 1830–1831 гг.), а Полацкая акадэмія стала сапраўднай сталіцай езуітаў, дзе вучыліся дзеці кансерватыўна настроенай шляхты.

Паводле школьнага статута 1828 г. адукацыя была *саслоўнай*:

– *прыходскія вучылішчы* (1 год) – для дзяцей «самых нізкіх саслоўяў»;

– *павятовыя вучылішчы* (3 гады) – для дзяцей купцоў, рамеснікаў і іншых катэгорый заможных грамадзян;

– *гімназіі* (4 гады) – для дзяцей шляхты і чыноўнікаў;

– *універсітэты* (5 гадоў) – вышэйшая ступень адукацыі для дзяцей шляхты і чыноўнікаў.

У 1820-я гг. пачалося распаўсюджванне *ланкастэрскіх школ* для небагатых вучняў. Гэтыя школы ўзніклі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. у розных краінах у выніку грамадскага руху за танны і хуткі спосаб атрымання адукацыі. Паводле ланкастэрскай сістэмы (ад імя англійскага педагога Дж. Ланкастэра) адбывалася навучанне дзяцей і дарослых больш падрыхтаванымі вучнямі пад кіраўніцтвам настаўніка. Першая ў Расійскай імперыі школа ўзаемнага навучання была адкрыта ў 1819 г. у Гомелі, маёнтку графа М. Румянцава. У 1840-я гг. сталі адкрывацца пачатковыя школы для дзяржаўных сялян, настаўнікамі ў якіх часцей за ўсё былі мясцовыя святары.

У 1840 г. пачала дзейнічаць *Горы-Горацкая земляробчая школа*, пераўтвораная ў 1848 г. у земляробчы інстытут – першую ў Расійскай імперыі вышэйшую аграномічную навучальную ўстанову.

***Навука.*** У пачатку XIX ст. пачалося навуковае даследаванне Беларусі. Адбылося станаўленне *беларусазнаўства* – навукі, якая вывучае гісторыю, культуру, традыцыі і адметныя рысы жыцця беларусаў. Беларускія традыцыі вывучаліся выкладчыкамі Віленскага ўніверсітэта – Міхаілам Баброўскім, Ігнатам Даніловічам, Тэадорам Нарбутам. Сярод этнографаў, археолагаў і фалькларыстаў, якія вывучалі мінулае Беларусі і Літвы, былі таксама

*З. Даленга-Хадакоўскі, А. Кіркор, Е. Раманаў, П. Шпілеўскі* і інш. Сабраны імі этнаграфічны матэрыял, насуперак панаваўшай теорыі заходнерусізму, сведчыў аб існаванні самастойнага беларускага этнасу.

Адным з першых пачаў збіраць беларускі фальклор *Ян Чачот.* За ўдзел у Таварыстве філаматаў ён быў высланы з радзімы на 10-гадоў. Вярнуўшыся з высылкі, ён сабраў і выдаў на польскай і, часткова, беларускай мовах 6 фальклорных зборнікаў пад назвай «Вясковыя песні».



*Адам Кіркор.*

*Павел Шпілеўскі* апублікаваў кнігу нарысаў «Падарожжа па Палессі і беларускім краі», *Іван Грыгаровіч* выдаваў гістарычныя крыніцы – чатырохтомны «Беларускі архіў старажытных грамат» і «Акты Заходняй Расіі» ў 5-ці тамах.

Вялікі ўнёсак у развіццё ведаў аб Беларусі, у вывучэнне беларускай гісторыі і культуры зрабілі *браты Тышкевічы: Канстанцін і Яўстафій.* Граф Канстанцін Тышкевіч скончыў Віленскі ўніверсітэт, займаўся археалагічнымі раскопкамі і нумізматычнымі пошукамі. У 1842 г. ён стварыў у родавым маёнтку Лагойску першы на тэрыторыі Беларусі гістарычны музей. Па ініцыятыве Яўстафія Тышкевіча ў 1855 г. быў створаны Віленскі музей старажытнасцяў, у якім захоўвалася шмат помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі. Я. Тышкевіч вядомы таксама як аўтар «Апісання Барысаўскага павета», а Канстанцін – краязнаўчай манаграфіі «Вілія і яе берагі».

Уздым цікавасці да гістарычнага мінулага беларускага народа сведчыў пра новы ўздым развіцця беларускага этнасу. Дзеячы навукі і культуры не толькі вывучалі мінулае, але, выкарыстоўваючы нацыянальную памяць і гістарычныя традыцыі, займаліся адукацыяй і асветай народа.

**3. *Літаратура і мастацтва.*** Насуперак паланізацыі і русіфікацыі, адметнай рысай культурнага жыцця Беларусі ў першай палове XIX ст. стала станаўленне новай беларускай літаратуры, якая ў сваім развіцці абапіралася на народныя традыцыі і фальклор. Галоўным героем літаратурных твораў у акрэслены перыяд быў беларускі селянін з яго турботамі, цяжкай штодзённай працай і павагай да роднай зямлі.



*Ян Баршчэўскі.*



*Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч.*

Ля вытокаў нацыянальна-культурнага адраджэння стаялі такія знакамітыя пісьменнікі, як *Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Ян Баршчэўскі, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Уладзіслаў Сыракомля* і інш. Так, Я. Чачот у сваіх «Вясковых песнях з-над Нёмана і Дзвіны» змясціў каля 30 сваіх вершаў, напісаных на беларускай мове. На аснове беларускіх народных казак і паданняў, але па-польску, Ян Баршчэўскі напісаў твор «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях». Вядомы таксама тры вершаваныя творы Яна Баршчэўскага, напісаныя на беларускай мове.

Вялікуюспадчынупакінуўпершы класік новай беларускай літаратуры Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, творчая тэматыка якога была вельмі разнастайная – ён пісаў пра жыццё сялян, шляхты, а таксама выдаваў працы на гістарычныя тэмы. Сярод яго асноўных твораў можна вылучыць наступныя: «Сялянка», «Пінская шляхта», «Гапон», «Славяне ў XIX стагоддзі», «Купала».

Уладзіслаў Сыракомля праславіўся як польскі паэт, але пісаў і па-беларуску. У сваіх творах звяртаўся да гісторыі Беларусі, народных вераванняў, звычаяў, вуснай паэзіі беларускага народу. У 1844 г. на фальклорнай аснове напісаў верш «Паштальён». У. Сыракомля аўтар гісторыка-краязнаўчых прац «Кароткае дасьледаванне мовы і характару паэзіі русінаў Менскай правінцыі», «Вандроўкі па маіх былых ваколіцах», «Нёман ад вытокаў да вусьця».

Адам Міцкевіч – класік польскай літаратуры. Ёсць звесткі, што ён пісаў і па-беларуску, але гэтыя творы пакуль невядомыя. Нарадзіўся ў фальварку Завоссе Наваградскага павета. Скончыў Віленскі ўніверсітэт, быў сябрам таварыства філаматаў. Найбольш вядомыя яго творы драма «Дзяды», паэтычная эпапэя «Пан Тадэвуш», паэмы «Конрад Валенрод» і «Гражына».

Творчасць А. Міцкевіча, У. Сыракомлі, Я. Баршчэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча была прыкладам стылю *рамантызму*, які панаваў у еўрапейскай літаратуры і мастацтве ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.




*Першае выданне паэмы «Конрад Валенрод» А. Міцкевіча.*



*І. Аляшкевіч «Партрэт Марціна Пачобут-Адляніцкага».*



*В. Ваньковіч «Аўтапартрэт».*

Першая палова XIX ст. была часам фарміравання і развіцця агульнанацыянальнай літаратурнай мовы. У яе аснову ляглі гаворкі Цэнтральнай Беларусі. Выдатнымі ўзорамі твораў на беларускай літаратурнай мове першай паловы XIX ст. з'яўляюцца ананімныя паэмы «*Тарас на Парнасе*» і «*Энэіда навыварат*».

Прыкметна, што аўтары ў залежнасці ад паходжання і культуры выхавання выкарыстоўвалі розны алфавіт пры пісанні па-беларуску: ці лацінскі (беларуская лацінка), ці кірылічны.

***Мастацтва.*** У выяўленчым мастацтве ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. спалучаліся рысы *класіцызму і рамантызму.* Асноўнымі жанрамі выяўленчага мастацтва сталі гістарычны і партрэтны. Разам з тым, усё большае распаўсюджанне сталі набываць пейзажны і бытавы жанры.

Агульнапрызнаным майстрам партрэтнага жанру быў *Іосіф Аляшкевіч***,** выпускнік факультэта жывапісу Віленскага ўніверсітэта. Найбольш значны твор І. Аляшкевіча – «Групавы партрэт». Пэндзлю І. Аляшкевіча належаць партрэты беларускіх дзяржаўных і палітычных дзеячаў – Адама Чартарыйскага, Лявона Сапегі, Мікалая Радзівіла.

*Валенцій Ваньковіч* скончыў Пецярбургскую акадэмію мастацтваў. Працаваў у жанры гістарычнага жывапісу. Аўтар карцін «Подзвіг маладога кіяўляніна пры аблозе Кіева печанегамі ў 968 годзе», «Напалеон каля вогнішча». Адна з яго лепшых карцін «А. Міцкевіч на скале Аюдаг».

*Ян Дамель* скончыў Віленскі ўніверсітэт. Яго карціны маюць пераважна гістарычныя сюжэты: «Смерць князя Панятоўскага», «Хрышчэнне славян», «Вызваленне Т. Касцюшкі з цямніцы», «Смерць магістра крыжаносцаў Ульрыха фон Юнгінгена ў бітве пад Грунвальдам». Пісаў таксама партрэты (І. Храптовіча, К. Тышкевіча і інш.), займаўся пейзажным жывапісам.

*Іван Хруцкі* скончыў Пецярбургскую акадэмію мастацтваў. З 1845 г. жыў у маёнтку Захарнічы Полацкага павета. У гісторыю беларускага і рускага жывапісу І. Ф. Хруцкі ўвайшоў, перш за ўсё, як майстар нацюрморта, хаця мастак стварыў нямала партрэтаў, пейзажаў, інтэр'ераў, пісаў іконы.

Найбольш вядомыя яго палотны: «Кветкі і плады», «Старая, якая вяжа панчоху», «Нацюрморт з біноклем», «Плады і дыня», «Кветкі і садавіна», «Ружы і плады», «Бітая дзічына, гародніна і грыбы».



*Ян Дамель «Адступленне французаў праз Вільню».*



*І. Хруцкі «Партрэт жонкі з кветкамі і садавінай».*

Значная роля ў партрэтах І. Хруцкага таксама адводзілася нацюрморту («Партрэт невядомай», «Партрэт жонкі з кветкамі і садавінай»). Пісаў ён і партрэты знакамітых асоб свайго часу: «Партрэт Іасафата Булгака», «Партрэт І. І. Глазунова», «Мітрапаліт Іосіф Сямашка слухае ў сваім кабінеце даклад сакратара».

**4. *Тэатр і музыка.*** У ХІХ ст. у развіцці тэатра і музыкі адбыўся якасна новы этап. На пачатку ХІХ ст. стацыянарныя тэатры з прафесійнымі тэатральнымі трупамі дзейнічалі ў Вільні, Гродне, Мінску. Яны ставілі спектаклі не толькі ў сваіх гарадах, але і перыядычна гастраліравалі па бліжэйшых гарадах і мястэчках. Рэпертуар тэатраў быў даволі вялікім і ўключаў спектаклі па творах Шэкспіра, Мальера, Шылера, Гогаля, Пушкіна і інш. У 30-я г. ХІХ ст. тэатры з'явіліся ў многіх гарадах Беларусі.

Пасля правядзення ўрадам у 1846–1846 гг. тэатральнай рэформы ўсе вандроўныя тэатры былі забаронены, а ў губернскіх гарадах ствараліся руска-польскія тэатры, якія і мелі манапольнае права на выступленне ў гарадах губерні. Але рэформа не была здзейснена ў поўнай меры.

У музычна-тэатральнай культуры канца XVIII – першай паловы XIX ст. вылучаецца сваёй адметнасцю прыгонны тэатр. Гэты тэатр меў змешаныя оперна-драматычныя трупы, у якіх адны і тыя ж акцёры выконвалі ролі ў оперы, драме, камедыі. Найбольш вядомыя прыгонныя тэатры – Зорыча ў Шклове, Радзівілаў у Нясвіжы, Агінскіх у Слоніме, Сапегаў у Ружанах, Тызенгаўза ў Гродне і інш. Оперы ставілі ў Нясвіжскім і Слуцкім тэатрах Радзівілаў, Ружанскім і Дзярэчынскім тэатрах Сапегаў і інш. Значную частку рэпертуару Гродзенскага, Слонімскага і Шклоўскага тэатраў складалі балеты. Пры некаторых магнацкіх тэатрах існавалі балетныя школы. Высокае прафесійнае майстэрства беларускіх артыстаў балета пацвярджаецца тым, што яны папаўнялі трупы варшаўскіх і пецярбургскіх тэатраў. У 1785 г. гродзенская трупа стала асновай польскага «Таварыства танцораў Яго Каралеўскай Вялікасці», а 14 прыгонных танцораў Шклоўскага тэатра графа С. Зорыча ўвайшлі ў склад пецярбургскіх тэатраў.

Прыватныя магнацкія тэатры дзейнічалі таксама і ў іншых гарадах і мястэчках Беларусі: В. Тышкевіча – у Свіслачы і Плешчаніцах, Л. Ракіцкага – у Гарадзішчы пад Мінскам, А. Буйніцкага – у Забор’і, А. Галіцына – у Віцебску, З. Чарнышова – у Чачэрску і Магілёве. Пры многіх магнацкіх тэатрах, у панскіх сядзібах існавалі аркестры, харавыя капэлы і іншыя музычныя калектывы. Напрыклад, маёнтак Гарадзец у Магілёўскай губерні, які належаў рускаму арыстакрату, кампазітару-аматару У. Р. Кастрыёту-Скандэрбеку, сябру М. І. Глінкі і А. С. Даргамыжскага, славіўся адным з лепшых у Расійскай імперыі прыгонным квартэтам.



*Станіслаў Манюшка.*

Самай значнай фігурай не толькі ў літаратуры, але і ў сцэнічным мастацтве Беларусі быў у першай палове XIX ст. *В. Дунін-Марцінкевіч*. Першым яго драматычным творам была

п’еса «Рэкруцкі яўрэйскі набор», пастаўленая як аперэта ў Мінску ў 1841 г. Музыку для яе напісалі *С. Манюшка* і *К. Крыжаноўскі.*

Таленавітым беларускім кампазітарам быў *Антон Абрамовіч.* Яму належаць першыя спробы стварэння музычных твораў на аснове беларускіх народных песень і танцаў. Сярод іх: праграмная 8-частковая паэма «Беларускае вяселле», п’есы «Беларускія мелодыі», «Зачараваная дуда» для фартэпіяна, песні «Дзеванька» і «Гарэліца» на словы Я. Баршчэўскага.

**5. *Архітэктура.*** У архітэктуры ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. панаваў стыль *класіцызму.* У архітэктуры Беларусі класіцызм праявіўся ў сістэме забудовы, якая прадугледжвала сіметрычнае размяшчэнне кварталаў, прамалінейнасць вуліц і плошчаў. Архітэктары паступова адмаўляліся ад празмернай складанасці і заблытанасці архітэктурных форм, характэрных для стыляў барока і ракако.

Станаўленне класіцызму найперш было звязана з інтэнсіўным развіццём будаўніцтва ў гарадах. У беларускіх гарадах пачалі з’яўляцца новыя тыпы жылых і грамадскіх будынкаў (канцылярыі, бальніцы, гімназіі), якія вылучаліся на фоне сярэдневяковай забудовы сваімі правільнымі абрысамі. Упершыню горадабудаўніцтва стала разглядацца як адзіная прасторавая сістэма, спланаваная на рацыянальных пачатках. Горадабудаўніцтва станавілася дзяржаўнай справай. У першай палове XIX ст. былі распрацаваны планы забудовы звыш 40 беларускіх гарадоў.

Узровень беларускай архітэктуры першай паловы XIX ст. вызначалі палацы, адміністрацыйныя будынкі і храмы. Да найбольш адметных пабудоў беларускага класіцызму першай паловы XIX ст. адносяцца палац-сядзіба графа П. А. Румянцава ў Гомелі, палацавы комплекс у Снове (каля Нясвіжа), палац Булгакаў у вёсцы Жылічы, палацы генерал-губернатара ў Віцебску і віцэгубернатара ў Гродне.

Дыяпазон палацава-сядзібнага будаўніцтва быў вельмі шырокі – ад невялікіх сядзіб дробнай шляхты да манументальных пабудоў буйных магнатаў.



*М. Залескі «Палац Румянцавых у Гомелі».*

Найбольш значныя культавыя пабудовы эпохі класіцызму ў Беларусі: сабор Святых Пятра і Паўла ў Гомелі, сабор Святога Іосіфа ў Магілёве, касцёлы ў вёсках Мамаі і Мосар, Іосіфаўскі касцёл піяраў у Лідзе і інш. Гэтыя культавыя будынкі з'яўляюцца сведчаннем таго, што ідэі класіцызму атрымалі перавагу над тымі традыцыямі будаўніцтва храмаў, якія дагэтуль існавалі на працягу стагоддзяў. Выкарыстанне тыповых прыёмаў класіцызму пры будаўніцтве сабора ў Гомелі дазволіла стварыць велічную прынцыпова новую архітэктурную пабудову.

Да архітэктуры класіцызму адносяцца і крэпасці, пабудаваныя ў першай палове XIX ст. у Брэсце і Бабруйску.

Класіцызм панаваў у архітэктуры Беларусі да сярэдзіны XIX ст. Альтэрнатывай класіцызму ў архітэктуры выступаў рамантызм, які праявіўся пераважна ў пейзажна-паркавым мастацтве. У стылі класіцызму пры палацах ствараліся вялікія пейзажныя паркі з распланаванымі алеямі, сцежкамі, палянамі. Рамантычныя ж пейзажныя паркі ствараліся па прынцыпе свабоднай кампазіцыі, аздабляліся штучнымі гротамі, сажалкамі, вадаспадамі і пабудаванымі ў іх альтанкамі, павільёнамі, маляўнічымі руінамі.

Такім чынам, культура беларускага народа ў першай палове XIX ст. развівалася ва ўмовах агульнадзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі. Разам з тым, яна захоўвала сваю асаблівасць, заснаваную на нацыянальнай мове, нацыянальных традыцыях. Адбываўся своеасаблівы нацыянальны ўздым, які найбольш

праявіўся ў фарміраванні адзінай літаратурнай беларускай мовы і пашырэнні прац, створаных на ёй, а таксама ў росце цікаўнасці да мінулага беларускага народа, што знайшло сваё адлюстраванне ў стварэнні новага навуковага кірунку – беларусазнаўства. Развіццё культуры на землях Беларусі ў першай палове XIX ст. выразна сведчыла аб пачатку працэсу нацыянальнага адраджэння.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Асіміляцыя*** – працэс знішчэння нацыянальных асаблівасцяў і свядомасці народа, зліццё яго з іншым народам, якое суправаджаецца засваеннем чужой мовы, культуры і звычаяў.

***Беларусазнаўства*** – навука, якая вывучае гісторыю, культуру, традыцыі, адметнасць і агульнасць беларусаў, іх узаемаадносіны з суседзямі, ролю і месца ў міжнароднай супольнасці народаў.

***Заходнерусізм*** – накірунак грамадска-палітычнай думкі, канцэпцыя, якая існавала ў XIX – пачатку XX ст. і грунтавалася на адмаўленні гістарычнасці беларусаў як самастойнага і самабытнага этнасу, атаясамліванні іх з велікарускім этнасам.

***Класіцызм*** – мастацкі стыль і эстэтычны напрамак у еўрапейскім мастацтве XVII–XIX стст. у аснове якога ляжаць ідэі рацыяналізму. Мастацкі твор, з пункту гледжання класіцызму, павінен будавацца на падставе строгіх канонаў, вызначаючы ў кожнай з’яве толькі істотныя, тыпалагічныя рысы, адкідаючы выпадковыя індывідуальныя прыкметы.

***Ланкастэрскія школы*** – назва пачатковых школ узаемнага навучання, што існавалі ў Беларусі ў першай палове XIX ст.

***Нацынальная самасвядомасць*** – адна з галоўных прыкмет нацыі – усведамленне свайго адрознення ад прадстаўнікоў іншых народаў і прыналежнасці да таго народа, які па многіх прыкметах прызнаецца сваім, родным.

***Рамантызм*** – кірунак у мастацкай культуры ў канцы XVIII – першай палове XIX ст., для якога былі характэрнымі ўвага да ўнутранага свету чалавека, ідэалізацыя навакольнай рэчаіснасці, паэтызацыя гераічных асоб.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1819 г.*** – адкрыццё ў г. Гомелі, маёнтку графа М. П. Румянцава, першай у Расійскай імперыі *ланкастэрскай школы* – школы ўзаемнага навучання.

***1832 г.*** – закрыццё Віленскага ўніверсітэта.

***1836 г.*** – Указ аб увядзенні выкладання на рускай мове ва ўсіх навучальных установах Беларусі.

***12 лютага 1839 г.*** – Полацкі царкоўны сабор, далучэнне ўніятаў да Рускай праваслаўнай царквы.

***Жнівень 1840 г.*** – пачатак працы Горы-Горацкай земляробчай школы.

***1840 г.*** – указы Мікалая І аб забароне дзейнасці ў Заходніх губернях Статута ВКЛ і забароне ўжывання ў афіцыйных дакументах назваў «Беларусь» і «Літва».

***1848 г.*** – адкрыццё Горы-Горацкага земляробчага інстытута – першай у Расійскай імперыі вышэйшай навучальнай установы, дзе рыхтаваліся агрatomы і заатэхнікі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі са старажытных часоў да 1917 г. – Мінск, 1985.
2. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.). – Мінск, 2005. – С. 137–157.
3. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX с.). – Мінск, 1998 г.
4. *Лыч Л., Навіцкі У.* Гісторыя культуры Беларусі. – Мінск, 1997.
5. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Ч. 1. – Мінск, 1994.
6. *Филатова Е. Н.* Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси. 1772–1860 гг. – Минск, 2006.
7. *Швед В.В.* Паміж Польшчай і Расіяй: грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.). – Гародня, 2001.
8. *Шыбека З.* Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002). – Мінск, 2003.

# РАЗДЗЕЛ 3.
# БЕЛАРУСЬ У ПЕРЫЯД СТАНАЎЛЕННЯ БУРЖУАЗНАГА ГРАМАДСТВА (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX ст.)

1. *Сялянская рэформа 1861 г.*
2. *Асаблівасці дзяржаўных ліберальных рэформ 1860–1870-х гг. у Беларусі.*
3. *Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы Беларусі ў паслярэформенны перыяд.*
4. *Прамысловасць Беларусі ў другой палове XIX ст. Шляхі зносін. Гандаль.*

Наяўнасць феадальна-прыгонніцкай сістэмы ў Расійскай імперыі абумовіла эканамічную і ваенна-тэхнічную адсталасць дзяржавы ў параўнанні з высокаразвітымі краінамі Заходняй Еўропы, у першую чаргу, Англіяй і Францыяй. Найбольш яскрава гэта праявілася ў Крымскай вайне 1853–1856 гг., у якой Расія не магла супрацьстаяць тэхнічнай магутнасці вышэйзгаданых дзяржаваў і згубіла свае пазіцыі на Чорным моры. Разам з тым на рубяжы 50–60-х г. XIX ст. актывізаваўся сялянскі рух за адмену прыгоннага права і бязвыплатную перадачу ім надзелаў ва ўласнасць. У такіх умовах расійскі імператар Аляксандр II вырашыў адмяніць прыгоннае права «зверху» – шляхам рэформы, не чакаючы, калі сяляне адменяць яго «знізу» – шляхам рэвалюцыі.

**1. *Сялянская рэформа 1861 г.*** Яшчэ падчас каранацыі Аляксандра II у 1856 г. прадстаўнікі памешчыкаў Заходняй Беларусі і Літвы далі згоду на прадастаўленне сялянам асабістай свабоды, але без зямлі. Іх гатоўнасць добраахвотна адмовіцца ад бясплатнай рабочай сілы прыгонных сялян тлумачыцца наступнымі фактарамі:



БОЖІЕЮ МИЛОСТІЮ
МЫ, АЛЕКСАНДРЪ ВТОРЫЙ,
ИМПЕРАТОРЪ И САМОДЕРЖЕЦЪ
ВСЕРОССІЙСКІЙ,
ЦАРЬ ПОЛЬСКІЙ, ВЕЛИКІЙ КНЯЗЬ ФИНЛЯНДСКІЙ,
и прочая, и прочая, и прочая.

1



«АЛЕКСАНДРЪ.»

*Першая і апошняя старонкі Маніфеста аб адмене прыгоннага права.*

1) большай уцягнутасцю памешчыцкіх гаспадарак гэтага рэгіёну ў сферу таварна-грашовага абарачэння; 2) блізкасцю заходніх рынкаў; 3) наяўнасцю прадпрымальніцкіх гаспадарак; 4) больш актыўнымі выступленнямі сялян у губернях, якія межавалі з Польшчай, дзе ўжо было адменена прыгоннае права.

На імя віленскага генерал-губернатара *У. І. Назімава* 20 лістапада 1857 г. быў накіраваны *рэскрыпт*, згодна з якім у Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губернях прапаноўвалася стварыць *дваранскія камітэты*, а потым заснаваць агульную камісію ў Вільні з мэтай распрацоўкі праекта па адмене прыгоннага права. Наступным крокам было стварэнне ў сакавіку 1859 г. *рэдакцыйных камісій* для разгляду праектаў дваранскіх камітэтаў і выпрацоўкі агульных палажэнняў.

Афіцыйна рэформа распачалася 19 лютага 1861 г. з падпісання Аляксандрам ІІ *Маніфеста* аб адмене прыгоннага права і *Палажэнняў* аб сялянах, якія выходзілі з прыгоннай залежнасці. Палажэнняў было тры віды – Агульнае, некалькі мясцовых і дадатковыя правілы для асобных груп насельніцтва.

Асноўны змест рэформы:

1) сяляне атрымлівалі асабістую свабоду і некаторыя грамадзянскія правы: самастойна распараджацца сваёй маёмасцю, звяртацца ў суд і іншыя дзяржаўныя ўстановы, набываць ва ўласнасць і прадаваць рухомую і нерухомую маёмасць, паступаць на службу, атрымліваць адукацыю і інш.;

2) уся зямля абвяшчалася ўласнасцю памешчыка, частку якой ён павінен быў адвесці для сялянскіх надзелаў, якія даваліся за выкуп;

3) адносіны паміж памешчыкам і сялянамі ў канкрэтнай вёсцы рэгуляваліся спецыяльнымі дакументамі, якія мелі назву *«ўстаўныя граматы»*. Яны складаліся памешчыкамі, а зацвярджаліся і ўводзіліся ў дзеянне *міравымі пасярэднікамі* – урадавымі чыноўнікамі, прызначанымі губернатарам. Устаўныя граматы вызначалі памер сялянскага надзелу, павіннасці за карыстанне ім, тэрмін пераходу сялян з паншчыны на чынш і інш.;

4) быў вызначаны *мінімум* зямлі на рэвізскую душу, і калі дарэформенны надзел быў большы за ўстаноўлены мінімум, то памешчык меў права лішак яе адрэзаць. Такія землі атрымалі назву *адрэзкаў*. Памер мінімальнага надзелу на мужчынскую душу вагаўся ў залежнасці ад якасці зямлі і не быў аднолькавым для розных мясцовасцяў. У адпаведнасці з гэтым на тэрыторыі Беларусі дзейнічала два «*Мясцовыя палажэнні*»: адно – для Віцебскай і Магілёўскай губерняў, дзе памеры сялянскіх надзелаў хісталіся ад 5,5 да 1 д зесяціны на душу; другое – для Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў, дзе за сялянамі замацоўваліся дарэформенныя надзелы, а адрэзкі дапускаліся, калі ў памешчыка заставалася менш за 1/3 яго зямель. Увогуле адмовіцца ад надзела селянін не мог;

5) каб не пакінуць памешчыка адразу без працоўных рук, сяляне на працягу 9 гадоў лічыліся *часоваабавязанымі*, гэта значыць, што яны павінны былі выконваць усе павіннасці і плаціць падаткі, як у дарэформенны перыяд. Гэты тэрмін даваўся для адаптацыі памешчыкаў да новых умоваў гаспадарання: за вызначаны час яны павінны былі або навучыцца весці гаспадарку з ужываннем наёмнай працоўнай сілы, выкарыстаннем тэхнікі, увядзеннем прагрэ-

сіўных агранамічных мерапрыемстваў і г. д., або прадаць сваю зямлю больш удачлівым асобам ці дзяржаве;

6) зямля ва ўласнасць селяніну магла перайсці толькі шляхам выкупу. *Выкупны плацёж* за зямлю быў роўны 6% капіталізацыі гадавога аброку з надзела. Калі, напрыклад, гадавы аброк з сялянскага надзела складаў 9 рублёў, то, правёўшы 6%-ную капіталізацыю (*9 руб. – 6%, выкупны плацёж – 100% = 9×100/6*), атрымаецца агульная сума выкупу 150 рублёў. Паколькі сяляне такіх сродкаў не мелі, то абавязаны былі выплаціць памешчыку толькі 20%. Астатнія 80% за селяніна памешчыку выплачвала дзяржава, даючы такім чынам сялянам крэдыт на 49 гадоў пад 6% гадавых. У выніку памешчыкі атрымалі сродкі для прыстасавання да новых умоваў жыцця;

7) у сувязі з тым, што памешчыкі страцілі ўладу над сялянамі, павялічылася роля сялянскай абшчыны. Уводзіліся выбарныя органы сялянскага самакіравання – *сельскія старасты* і *валасныя праўленні*. Яны адказвалі за збор падаткаў, кантралявалі выкананне сялянамі павіннасцяў, якія па-ранейшаму выконваліся на аснове прынцыпу *кругавой парукі*.



*Зачытванне Маніфеста аб адмене прыгоннага права ў вёсцы.*

Натуральна, што асноўныя палажэнні рэформы выклікалі незадаволенасць сялянства, паколькі ў выніку іх рэалізацыі сялянскія надзелы зменшыліся амаль на 1/3, а павіннасці павялічыліся. У адказ на рэформу ў 1861 г. на тэрыторыі Беларусі было зафіксавана 441 сялянскае хваляванне. Многія з іх былі падаўлены пры дапамозе войска, якое царскі ўрад прадбачліва размясціў на землях Беларусі напярэдадні рэформы. Свой супраціў сяляне выказвалі таксама нежаданнем падпісваць устаўныя граматы (да 1863 г. каля 80% беларускіх сялян іх не падпісалі) і адмаўляліся выконваць павіннасці.

Рэформа на тэрыторыі Беларусі мела свае асаблівасці. Здарылася так, што яе правядзенне супала па часу з актывізацыяй нацыянальна-вызваленчага руху і паўстаннем 1863–1864 гг. Каб прадухіліць удзел сялян у паўстанні, расійскі ўрад вымушаны быў пайсці на прадастаўленне ім пэўных льгот:

• царскім указам ад 1 сакавіка 1863 г. быў ліквідаваны часоваабавязаны стан і ўводзіўся абавязковы выкуп сялянскіх надзелаў, а ў 1867 г. на абавязковы выкуп былі пераведзены і дзяржаўныя сяляне Беларусі;

• у сярэднім на 20% былі зменшаны выкупныя плацяжы;

• за сялянамі захавалася *сервітутнае* права – права абмежаванага карыстання ўласнасцю памешчыка: пашамі, сенажацямі, ляснымі ўгоддзямі, рыбнымі ловамі і інш.

Пералічаныя льготы былі ўрадавай саступкай толькі для сялян Беларусі і Літвы і не распаўсюджваліся на іншыя тэрыторыі Расійскай імперыі.

***Вынікі рэформы.*** Ініцыіраваная «зверху» рэформа была праведзена ў інтарэсах пануючага саслоўя і захавала буйное памешчыцкае землеўладанне. Разам з тым рэформа не стымулявала памешчыкаў да хуткага пераходу на новыя формы гаспадарання. Выкарыстанне сельскагаспадарчай тэхнікі было ўскладнена наяўнасцю *цераспалосіцы*. Яна ўтварылася ў выніку таго, што памешчыкі пакідалі за сабой лепшыя землі ў розных месцах свайго ўладання, а таксама «адразалі» ад сялянскіх надзелаў больш якасныя землі, калі іх памер быў большы за ўстаноўлены рэфор-

май мінімум. На тэрыторыі Беларусі цераспалосіца практыкавалася значна часцей, чым у цэнтральных раёнах Расіі. Так, у 1880-х г. яна існавала ў 42% памешчыцкіх гаспадарак Гродзенскай і ў 51% гаспадарак Віленскай губерняў.



*Памятны медаль аб адмене прыгоннага права.*

Нягледзячы на атрыманне сялянамі асабістай свабоды, яны па-ранейшаму эканамічна залежалі ад памешчыка, паколькі вызначанага мінімальнага надзела часта было недастаткова для простага ўзнаўлення гаспадаркі, улічваючы, што пры павелічэнні сям'і надзел заставаўся нязменным. Да таго ж, з асабістай залежнасці ад памешчыка сяляне трапілі ў фінансавую залежнасць ад дзяржавы, паколькі выплачаныя са скарбу грошы (80% агульнай платы за зямлю) лічыліся сялянскім доўгам, які неабходна было выплаціць на працягу 49 гадоў пры 6% гадавых. Па падліках гісторыкаў, у выніку сяляне павінны былі заплаціць у 3,3 разы больш, чым зямля каштавала на рынку.

Малазямелле сялян і іх павіннасны ўціск прывялі да шырокага распаўсюджання на тэрыторыі Беларусі сістэмы *адпрацовак*. Адпрацоўкі – форма працы сялян з уласным інвентаром і цяглай жывёлай у гаспадарцы памешчыка або заможнага селяніна, якая ажыццяўлялася ў якасці аплаты за арандаваную зямлю, пазычаныя грошы, збожжа, будаўнічы і інш. Наяўнасць адпрацовак, аплата за якія была значна меншай, чым пры вольным найме, не стымулявала павышэння агратэхнікі, прымянення машын і ўвогуле не садзейнічала інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі.

Аднак, нягледзячы на захаванне пэўных феадальных перажыткаў, рэформа была значным крокам наперад у развіцці эканомікі Расійскай імперыі і Беларусі ў яе складзе. Пачыналася новая эпоха капіталістычных адносін.

**2.** ***Асаблівасці дзяржаўных ліберальных рэформ 1860–1870-х гг. у Беларусі.*** Адмена прыгоннага права прымусіла царскія ўлады правесці шэраг рэформ дзяржаўна-палітычнага ладу.

***Земская рэформа.*** 1 студзеня 1864 г. у Расійскай імперыі пачалася рэформа органаў мясцовага самакіравання. Былі ўтвораны *земствы*, выбары ў якія ажыццяўляліся на падставе саслоўнага і маёмаснага цэнзу, што забяспечвала пануючае становішча ў іх памешчыкаў. Земствы займаліся мясцовымі гаспадарчымі справамі і былі падкантрольныя губернатару. Земствы не атрымлівалі фінансавых сродкаў са скарбу, а асновай іх бюджэту было абкладанне падаткамі нерухомай маёмасці: зямель, дамоў, фабрычна-заводскіх прадпрыемстваў, гандлёвых устаноў. На атрыманыя сродкі яны адкрывалі школы, бальніцы, праводзілі агранамічныя мерапрыемствы, займаліся статыстыкай і ўвогуле садзейнічалі развіццю мясцовай ініцыятывы, гаспадаркі і культуры.

Размах нацыянальна-вызваленчага руху на тэрыторыі Літвы і Беларусі напалохаў царскі ўрад, які разумеў, што ў выпадку правядзення на гэтых тэрыторыях выбараў у земствы пераважную большасць галасоў атрымалі б памешчыкі, якія з'яўляліся ўдзельнікамі ці прыхільнікамі паўстання 1863–1864 гг. Па гэтай прычыне земская рэформа ў Беларусі і Літве была адкладзена і пачалася толькі ў 1911 г. Але і тады органы мясцовага самакіравання былі створаны толькі ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях (у 25 беларускіх паветах з 35). На захадзе Беларусі, дзе апазіцыя ўрадавай палітыцы была найбольш моцнай, земствы так і не былі ўтвораны.

***Судовая рэформа.*** З адменай прыгоннага права ўзнікла неабходнасць рэфармавання і феадальна-саслоўнай судовай сістэмы. З 1864 г. у Расіі ўводзіліся агульныя і мясцовыя судовыя ўстановы. Агульнымі былі *акружныя суды* (на адну губерню), *судовыя палаты* (адна на некалькі губерняў) і *Сенат*. Мясцовыя суды складаліся з *міравых судоў і павятовых з'ездаў* міравых суддзяў. Суд станавіўся ўсесаслоўным, адкрытым, галосным, быў створаны інстытут *адвакатаў*, а таксама *прысяжных засядацеляў*.

Аднак на тэрыторыі Беларусі правядзенне і гэтай рэформы было прыпынена. Міравыя суды былі ўведзены толькі ў 1872 г., а міравыя

суддзі не выбіраліся земствамі, як гэта было ў Расіі, а прызначаліся міністрам юстыцыі па рэкамендацыі мясцовай адміністрацыі.

***Гарадская рэформа***. У адпаведнасці з ёй з 1870 г. у гарадах Расіі ствараліся *гарадскія думы* і *гарадскія ўправы* – усесаслоўныя органы грамадскага кіравання, якія выбіраліся на падставе маёмаснага цэнзу. Выбарчыя правы надаваліся купцам, прамыслоўцам і ўладальнікам нерухомай маёмасці ў межах дадзенага горада. Дзейнасць гарадскога самакіравання абмяжоўвалася вырашэннем гаспадарчых пытанняў, арганізацыяй медыцынскага абслугоўвання і народнай адукацыі. У гарадах Беларусі і Літвы рэформа пачала дзейнічаць толькі з 1875 г.

***Школьная рэформа*** 1864 г. фармальна ўвяла прынцып усесаслоўнай адукацыі, аднак атрымаць яе па-ранейшаму маглі не ўсе, паколькі плата за навучанне была дастаткова высокай. На тэрыторыі Беларусі не было земскіх школ, і школьная справа кіравалася ўрадавымі чыноўнікамі. Мовай навучання была руская. Навучальныя ўстановы на землях Беларусі давалі адукацыю двух узроўняў: пачатковую – *народныя вучылішчы*, колькасць якіх у час рэформы была павялічана, і сярэднюю – *рэальныя* і *класічныя гімназіі*. Пасля закрыцця ў 1832 г. Віленскага ўніверсітэта, а ў 1864 г. – Горы-Горацкага земляробчага інстытута ў другой палове XIX ст. атрымаць вышэйшую адукацыю на тэрыторыі Беларусі ўвогуле было немагчыма. Але ў цэлым рэформа садзейнічала пашырэнню асветы сярод насельніцтва.

***Цэнзурная рэформа*** 1865 г., у выніку якой некалькі пашырыліся магчымасці друку. Творы вялікіх аб'ёмаў, якія не чытала простае насельніцтва, маглі друкавацца без папярэдняй цэнзуры, а невялікія выданні, у тым ліку перыядычныя, абавязкова павінны былі яе праходзіць. Захаваліся абмежаванні на адкрыццё новых перыядычных органаў друку. Выданне літаратуры на беларускай, польскай і яўрэйскай мовах у Беларусі не дазвалялася.

***Ваенная рэформа***, якая ў 1874 г. увяла замест рэкруцкіх набораў усеагульную воінскую павіннасць для мужчынскага насельніцтва з 21-гадовага ўзросту. Тэрмін службы ў сухапутных войсках складаў 6 гадоў, на флоце – 7.

Такім чынам, нягледзячы на тое, што рэформы 60–70-х гг. XIX ст. былі дастаткова абмежаванымі, усё ж іх ажыццяўленне было значным крокам наперад на шляху ператварэння Расійскай імперыі з феадальнай манархіі ў буржуазную. Але адносіны царскага ўрада да зямель Беларусі і Літвы падчас правядзення рэформ выявілі сутнасць палітыкі самадзяржаўя ў заходніх губернях. Тры важныя рэформы, якія давалі пэўную самастойнасць у некаторых справах на месцах – *земская*, *судовая* і *гарадская*, былі ажыццёўлены на тэрыторыі Беларусі са значным спазненнем. Забраныя падчас падзелаў Рэчы Паспалітай землі былога ВКЛ стваралі нямала клопату расійскім уладам на працягу XIX ст. Таму вышэйпералічаныя рэформы ўводзіліся з вялікай асцярожнасцю і значнымі абмежаваннямі.

**3.** ***Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы Беларусі ў пасляэформенны перыяд.*** Адмена прыгоннага права спрыяла паступоваму пераходу ад феадальнага да буржуазнага ладу ў Расійскай імперыі і стварала магчымасці для развіцця *капіталізму* ў эканоміцы, у тым ліку і ў Беларусі.

***Капіталізм*** – спосаб вытворчасці, заснаваны на прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці і прымяненні наёмнай працы. Развітому капіталізму папярэднічаў этап першапачатковага назапашвання капіталу, які вёў да хуткага пашырэння ўнутранага рынку. Для капіталізму ўласцівы наступныя рысы:

• наяўнасць дзвюх асноўных груп насельніцтва – *буржуазіі* (уладальнікаў капіталу) і *наёмных рабочых*;

• ператварэнне рабочай сілы ў *тавар*;

• канцэнтрацыя вытворчасці;

• стварэнне ў працэсе вытворчасці *прыбавачнай вартасці* і прысвойванне яе ўладальнікамі капіталу;

• панаванне таварна-грашовай гаспадаркі, якая яскрава была прадстаўлена ў формуле «тавар–грошы–тавар»;

• наяўнасць развітога грамадскага падзелу працы;

• хуткае развіццё тэхнікі.

***Сельская гаспадарка***. Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадар-

цы магло адбывацца двума шляхамі: «*амерыканскім*» (фермерскім) і «*прускім*» (юнкерскім ці памешчыцкім). Для «амерыканскага» шляху было характэрна хуткае ўкараненне капіталістычных адносін. Гэты шлях быў *інтэнсіўным*, развіццё адбывалася за кошт паляпшэння якасці апрацоўкі глебы, выкарыстання аплачваемай наёмнай працы, ужывання шматпольнага севазвароту, лепшых сартоў насення, правядзення агратэхнічных мерапрыемстваў і інш. Уласнік зямлі – фермер сам яе і апрацоўваў, што абумоўлівала яго матэрыяльную зацікаўленасць у выніках працы.

«Прускі» шлях развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы быў больш марудны, бо пры ім укараненне капіталістычных адносін стрымлівалася існаваннем феадальных перажыткаў. Менавіта такі шлях быў уласцівы расійскай эканоміцы. Такімі рудыментамі феадалізму ў беларускай вёсцы другой паловы XIX ст. заставаліся:

• буйное, *латыфундыяльнае* памешчыцкае землеўладанне, якое пры адсутнасці рынку свабоднай працоўнай сілы не магло хутка ператварыцца ў гаспадаркі капіталістычнага тыпу;

• малазямелле сялян і наяўнасць у сувязі з гэтым сістэмы *адпрацовак*, пры якой вяскоўцы не былі зацікаўленыя ў выніках сваёй працы;

• захаванне і нават павелічэнне ролі *сялянскай абшчыны*, якая была не толькі органам сялянскага самакіравання, але і адказвала за збор падаткаў і выкананне павіннасцяў на аснове *кругавой парукі* (калектыўнай адказнасці). Нягледзячы на дэкларацыю сялянам асабістай свабоды, яны не маглі ёю рэальна карыстацца, не маглі адмовіцца ад надзела, выдзеленага па рэформе 1861 г., не маглі без дазволу абшчыны пакінуць вёску і інш.

Разам з тым нават пры існаванні феадальных перажыткаў капіталістычныя адносіны ў вёсцы развіваліся. Усё больш з'яўлялася *прадпрымальніцкіх гаспадарак*, у якіх выкарыстоўвалася праца наёмных рабочых (падзённых, сезонных, гадавых), зямля апрацоўвалася інвентаром і цяглавай жывёлай уладальніка, а гаспадарка мела ярка выражаны таварны характар.

Паглыблялася сельскагаспадарчая спецыялізацыя раёнаў. У 80-я гг. XIX ст. вытворчасць збожжа, якая была важнай тавар-

най галіной памешчыцкай і сялянскай гаспадарак, саступіла месца *малочнай жывёлагадоўлі* і *вінакурэнню*. Гэта было звязана з працяглым збожжавым крызісам, калі на рынкі Заходняй Еўропы трапіла таннае і высакаякаснае збожжа з Амерыкі, Аргенціны і Аўстраліі. Немагчымасць канкурыраваць на збожжавым рынку прымусіла памешчыкаў да пераарыентацыі накірунку сельскагаспадарчай вытворчасці. Хуткае рэагаванне сельскай гаспадаркі на змены рыначнай кан’юнктуры таксама з’яўлялася адным з доказаў развіцця капіталізму ў вёсцы.

З пачатку 80-х гг. XIX ст. усё больш актыўна адбывалася расслаенне сялянства. З аднаго боку, гэтаму працэсу садзейнічала заснаванне ўрадам Сялянскага пазямельнага банка, які даваў пазыкі сялянам пад заклад зямлі. На атрыманыя грошы сяляне маглі купляць зямлю і павялічваць свае надзелы. Гісторыкі падлічылі, што да пачатку XX ст. колькасць сельскай буржуазіі на тэрыторыі Беларусі павялічылася на 10%. З другога боку, адбываўся працэс збяднення вялікай колькасці сялян у выніку натуральнага прыросту ў сем’ях і неабходнасці драблення надзелаў.

***4. Прамысловасць Беларусі ў другой палове XIX ст. Шляхі зносін. Гандаль.*** У сваім развіцці прамысловасць праходзіць тры асноўныя стадыі ў арганізацыі вытворчасці:

1) *дробнатаварную* (рамесную), якая была заснавана на ручной працы пры адсутнасці падзелу працы;

2) *мануфактурную*, заснаваную на ручной працы, але пры наяўнасці яе падзелу і выкарыстанні наёмных рабочых;

3) *фабрычную* (заводскую), асновай якой быў падзел працы і замена ручной працы машыннай.

У другой палове XIX ст. у Беларусі тры пералічаныя формы суіснавалі разам, аднак на працягу першых двух дзесяцігоддзяў пасля рэформы 1861 г. прамысловы рост на тэрыторыі Беларусі ішоў павольна і па-ранейшаму пераважала дробная і мануфактурная вытворчасць.

Хуткі рост фабрычна-заводскай прамысловасці стрымліваўся, у першую чаргу, адсутнасцю шырокага рынку свабоднай працоўнай



*Адзін з будынкаў папяровай фабрыкі ў Добрушы.*

сілы, а таксама нізкай пакупной здольнасцю сялян, якія вялі пераважна натуральную гаспадарку і самі выраблялі неабходныя прамысловыя рэчы (палатно, сукно, абутак і г. д.). Разам з тым колькасць заводскіх прадпрыемстваў няўхільна павялічвалася: калі ў сярэдзіне XIX ст. іх на тэрыторыі Беларусі налічвалася каля 80, то ў канцы XIX ст. – 1137. Сярод найбольш значных прадпрыемстваў, пабудаваных у гэты перыяд, можна вызначыць тытунёвую фабрыку ў Гродне (1862 г.), папяровую фабрыку ў Добрушы (1871 г.), запалкавыя фабрыкі ў Барысаве (1881 г.) і Пінску (1882 г.) і інш. Фабрычна-заводская прамысловасць няўхільна заваёўвала дамінуючыя пазіцыі.

Спецыялізацыя беларускай прамысловасці ў другой палове XIX ст. па-ранейшаму вызначалася выкарыстаннем і перапрацоўкай прыродных рэсурсаў (лясных багаццяў) і прадукцыі сельскай гаспадаркі. Таму асноўнымі галінамі прамысловасці з’яўляліся *харчовая, тэкстыльная, гарбарная, дрэваапрацоўчая,* а таксама *бравarніцтва.*

Пераход да капіталістычнага спосабу вытворчасці ў прамысловасці выявіўся ў яе паступовай *мадэрнізацыі* – увядзенні ўдаска-

наленняў, якія адпавядалі тэхнічным патрабаванням таго часу. Мадэрнізацыя прамысловасці паслярэформеннага перыяду характарызавалася пашырэннем *індустрыялізацыі* – пераходу ад ручной працы да машыннай і фарміраванню прамысловай буржуазіі і фабрычнага пралетарыяту. Гэты працэс атрымаў назву *прамысловага перавароту* або *прамысловай рэвалюцыі*. У выніку прамысловага перавароту, які завяршыўся да 90-х г. XIX ст., сфарміраваўся клас *прамысловай буржуазіі* і *наёмных рабочых.* Буржуазія фарміравалася з памешчыкаў-прадпрымальнікаў, купцоў, мяшчан, рамеснікаў. Крыніцай папаўнення класа наёмных рабочых былі сялянская беднata, дробныя рамеснікі і гандляры.

***Шляхі зносін.*** Капіталістычны рынак патрабаваў больш дасканалых шляхоў зносін. Транспартная сетка ў гэты перыяд складалася з *водных шляхоў, сухапутных дарог, чыгунак.*

Развіццю прамысловасці, росту гарадоў, пашырэнню ўнутранага рынку і замежных гандлёвых сувязяў у другой палове XIX ст. найбольш спрыяла будаўніцтва чыгунак. Чыгуначнае будаўніцтва ў Расійскай імперыі пачалося ў 1860–1870-я гг., яно праследавала як гандлёвыя, так і ваенныя (для больш хуткага перамяшчэння войскаў) мэты. Яго вынікамі стала: паскарэнне развіцця прамысловасці; пашырэнне гандлю; рост таварнасці сельскай гаспадаркі; пашырэнне тэхнічнага прагрэсу; паскарэнне спецыялізацыі эканомікі асобных рэгіёнаў; фарміраванне




*Схема чыгуначных шляхоў на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст.*

ўсерасійскага і мясцовых рынкаў; пашырэнне грамадскага падзелу працы; паскарэнне міграцыйных працэсаў; рост гарадоў і інш.

Першая *Пецярбургска-Варшаўская чыгуначная магістраль* прайшла праз тэрыторыю Беларусі ў 1862 г. і злучыла Вільню, Гродна, Беласток. Але яна мела другараднае эканамічнае значэнне.

У 1866 г. праз Дзвінск, Полацк, Віцебск і Смаленск прайшла *Рыга-Арлоўская чыгунка*, а ў 70-я гг. XIX ст. *Маскоўска-Брэсцкая чыгунка* злучыла Смаленск, Оршу, Мінск, Баранавічы, Брэст. Гэтая чыгунка была найбольш важная ў ваенных і эканамічных адносінах. Таксама былі пабудаваныя тры лініі мясцовых чыгунак, якія атрымалі назву *Палескія*: Бранск – Гомель – Пінск – Жабінка; Беласток – Баранавічы; Вільня – Баранавічы – Роўна. *Лібава-Роменская чыгунка* (1871–1874 гг.) прайшла праз Вільню, Маладзечна, Мінск, Асіповічы, Бабруйск, Жлобін. *Пецярбургска-Адэская чыгунка* (да 1902 г.) прайшла праз Віцебск, Оршу, Магілёў, Жлобін.

Чыгункі будаваліся прыватнымі кампаніямі і таварыствамі, а потым выкупляліся ўрадам. У пачатку XX ст. Беларусь была на адным з першых месцаў па насычанасці чыгункамі ў Расійскай імперыі. Узніклі буйныя чыгуначныя вузлы: Мінск, Віцебск, Гомель, Жлобін, Лунінец, Брэст, Баранавічы.

Водныя шляхі зносін мелі другараднае значэнне. Тым не менш грузапаток на іх таксама павялічваўся. Па Прыпяці, Бярэзіне, Сожы хадзілі ў 1900 г. 310 непаравых і 23 паравыя судны. Суднаходства развівалася таксама па Нёмане і Заходняй Дзвіне.

На тэрыторыі Беларусі існавала таксама дастаткова разгалінаваная сістэма водных каналаў, а з 1880-х гг. актывізавалася будаўніцтва і шашэйных дарог.

Такім чынам, развіццё транспартных шляхоў у другой палове XIX ст. спрыяла развіццю гандлю і камунікацыі, аб'яднанню беларускіх зямель у адзіны эканамічны арганізм і ўцягванню іх у агульнарасійскі рынак.

***Гандаль.*** У другой палове XIX ст. на беларускіх землях назіраліся відавочныя змены ў структуры ўнутранага гандлю – пры хуткім падзенні значэння кірмашоў значна пашыраўся рознічны гандаль. Гэты працэс быў выкліканы, па першае, з'яўленнем сеткі




*Трамвай у Віцебску.*

чыгунак і магчымасцю весці гандаль на працягу года, а не прыстасоўвацца да пэўных святаў. Па-другое, ростам фабрычна-заводскай прамысловасці, які прывёў да выхаду на рынак вялікіх аб'ёмаў прадукцыі. Па-трэцяе, павелічэннем колькасці гарадскога насельніцтва, якое мела патрэбу ў куплі тавараў (харчовых – у першую чаргу). У выніку ў канцы XIX ст. на беларускіх землях асноўны аб'ём унутранага гарадскога гандлю быў сканцэнтраваны ў крамах.

Істотных змен у знешнім гандлі не назіралася. Па-ранейшаму асноўным экспартным таварам з беларускіх губерняў з'яўлялася сельскагаспадарчая і прыродная сыравіна: каноплі, лён, прадукцыя жывёлагадоўлі, лес. Некалькі павялічылася доля гатовай прадукцыі, сярод якой былі спірт, папера, запалкі, тытунёвыя вырабы, будаўнічыя матэрыялы.

У другой палове XIX ст. у Расійскай імперыі пачала стварацца банкаўская сістэма, якая складалася з Дзяржаўнага банка (1860 г. ), аддзяленні якога былі адкрыты ва ўсіх беларускіх губернскіх гарадах, Сялянскага пазямельнага банка, Дваранскага зямельнага банка, а таксама шэрагу прыватных банкаў.

Развіццю гандлю садзейнічала правядзенне ў 1895–1897 гг. расійскім міністрам фінансаў С. Ю. Вітэ грашовай рэформы, дзя-

куючы якой адбылася стабілізацыя рубля і актывізаваўся прыток замежнага капіталу ў эканоміку, у тым ліку і на землях Беларусі.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Выкупныя плацяжы*** – памер платы за сялянскі надзел, атрыманы па рэформе 1861 г., роўны 6% капіталізацыі гадавога аброку з надзела.

***Дзесяціна*** – мера зямлі ў Расійскай імперыі, роўная 1,45 га.

***Капіталізм*** – спосаб вытворчасці, заснаваны на прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці і прымяненні наёмнай працы.

***Прамысловы пераварот (прамысловая рэвалюцыя)*** – пераход ад ручной працы да машыннай, ад мануфактуры да фабрычна-заводскай вытворчасці.

***Сервітуты*** – абмежаванае права сялян карыстацца зямельнай уласнасцю памешчыка (выпасамі, лугамі, сенажацямі, ляснымі ўгоддзямі, рыбнымі ловамі).

***Тавар*** – прадукт працы, выраблены для продажу або абмену.

***Устаўныя граматы*** – дакументы, якія рэгулявалі адносіны часоваабавязаных сялян з памешчыкамі паводле «Палажэнняў» аб адмене прыгоннага права 1861 г., вызначалі памеры сялянскіх паслярэформенных надзелаў і павіннасцяў за карыстанне імі.

***Цераспалосіца*** – раз’яднанасць і раздробленасць зямлі аднаго землекарыстальніка на некалькі адасобленых частак.

***Часоваабавязаныя сяляне*** – катэгорыя былых панскіх сялян, вызваленых ад прыгоннай залежнасці, але не пераведзеных на выкуп. За карыстанне зямлёй працягвалі плаціць дарэформенныя падаткі і выконваць павіннасці.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***Студзень 1857 г.*** – стварэнне Сакрэтнага камітэта для абмеркавання мер па ўладкаванні побыту памешчыцкіх сялян.

***20 лістапада 1857 г.*** – рэскрыпт імператара Аляксандра II віленскаму генерал-губернатару У. І. Назімаву аб падрыхтоўцы праектаў «паляпшэння быту памешчыцкіх сялян».

***19 лютага 1861 г.*** – абвяшчэнне Маніфеста і Палажэнняў аб адмене прыгоннага права.

***1862 г.*** – праз Беларусь прайшла першая чыгунка, участак Пецярбургска-Варшаўскай магістралі (датай заснавання беларускай чыгункі прынята лічыць 29 лістапада 1871 г. – дзень уводу ў эксплуатацыю лініі Смаленск–Орша–Мінск–Брэст).

***1866 г.*** – пачала дзейнічаць Рыга–Арлоўская чыгунка (Дзвінск–Полацк–Віцебск).

***1860–1870-я гг.*** – правядзенне ліберальных (буржуазных) рэформ урадам Аляксандра II.

***1871–1874 гг.*** – пачала дзейнічаць Лібава-Роменская чыгунка (Вільня–Маладзечна–Мінск–Асіповічы–Бабруйск–Жлобін).

***1880-я гг.*** – пабудаваны *Палескія чыгункі* (Вільня–Баранавічы–Лунінец; Гомель–Лунінец–Пінск–Жабінка; Баранавічы–Слонім–Ваўкавыск–Беласток).

***1884 г.*** – здадзена ў эксплуатацыю чыгуначная лінія Вільня – Пінск.

***1880–1890 гг.*** – у Беларусі адбыўся пераход да машыннай вытворчасці.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Абезгауз З. Е.* Развитие промышленности и формирование пролетариата Белоруссии во второй половине XIX в. – Минск, 1971.
2. *Болбас М. Ф.* Промышленность Белоруссии. 1860–1900. – Минск, 1978.
3. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.). – Мінск, 2005. – С. 158–300.
4. *Крук У. П.* Сялянскі рух на Беларусі 1864–1900 гг. – Мінск, 1993.
5. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Ч. 1. – Мінск, 1994.
6. *Шыбека З.* Гарады Беларусі (60-я гады XIX ст. – пачатак XX ст.). – Мінск, 1997.
7. *Шыбека З.* Нарыс гісторыі Беларусі (1795 – 2002). – Мінск, 2003.

# РАЗДЗЕЛ 4.
# НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧЫ РУХ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX ст. ФОРМЫ САЦЫЯЛЬНАЙ БАРАЦЬБЫ. ПАЛІТЫЧНЫЯ ПАРТЫІ І РУХІ.

1. *Нацыянальна-вызваленчае паўстанне 1863–1864 гг. пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага.*
2. *Дзейнасць народнікаў.*
3. *Формы сацыяльнай барацьбы. Сялянскі і рабочы рух.*
4. *Палітычныя партыі і рухі.*
5. *Палітыка царскіх уладаў пасля паўстання 1863–1864 гг.*

**1.** ***Нацыянальна-вызваленчае паўстанне 1863–1864 гг. пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага.*** На нацыянальна-вызваленчы рух у беларуска-літоўскіх губернях у сярэдзіне XIX ст. значны ўплыў аказала барацьба за незалежнасць польскай шляхты, якая выступала за аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Увогуле ў расійскім вызваленчым руху ў канцы 1850-х – пачатку 1860-х гг. дваранскія рэвалюцыянеры саступілі месца *рэвалюцыйным дэмакратам,* якія прадстаўлялі інтарэсы сялян.

Вясной 1862 г. у Варшаве быў створаны падпольны *Цэнтральны нацыянальны камітэт* (ЦНК), які ставіў сваёй мэтай арганізацыю паўстання за аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. і дэмакратызацыю грамадскага ладу. Летам 1862 г. у Вільні ўтварыўся *Літоўскі правінцыяльны камітэт* (ЛПК), які фармальна падпарадкоўваўся ЦНК. Масавы ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні паўстання прыняла шляхта, сярод якой, аднак, не было адзінства. Па пытанні аб шляхах дасягнення пастаўленай мэты ў паўстанцкім руху вызначыліся дзве плыні:



*Кастусь Каліноўскі.*

• *«белыя»* (кансерватыўная плынь) былі прадстаўлены пераважна буйной і сярэдняй шляхтай. Іх галоўнай мэтай было аднаўленне Рэчы Паспалітай не як федэратыўнай дзяржавы, якая складалася з раўнапраўных Польскай Кароны і ВКЛ, а як унітарнай (адзінай і непадзельнай) польскай дзяржавы, згодна з Канстытуцыяй 3 мая 1791 г. «Белыя» выступалі супраць рэвалюцыйных метадаў барацьбы і былі гатовыя да кампрамісу з царскім урадам;

• *«чырвоныя»* (радыкальная плынь) аб'ядноўвалі дробную і беззямельную шляхту, інтэлігенцыю, гарадскія нізы, студэнцтва і часткова сялянства. Яны выступалі за правядзенне ўзброенага паўстання супраць царызму пры падтрымцы сялян, за стварэнне незалежнай дэмакратычнай дзяржавы, нацыянальнае самавызначэнне беларусаў, літоўцаў і ўкраінцаў, вырашэнне аграрнага пытання і надзяленне сялян зямлёй.

Прыхільнікам «чырвоных» і старшынёй ЛПК быў шляхціц Гродзенскага павета ***Кастусь (Канстанцін Вікенцій Сямёнавіч) Каліноўскі*** (1838–1864), які адыграў вялікую ролю ў арганізацыі паўстання на тэрыторыі Беларусі і Літвы. Летам 1862 г. К. Каліноўскі разам са сваімі паплечнікамі ***Валерыем Урублеўскім*** і ***Феліксам Ражанскім*** пачалі выпуск першай рэвалюцыйна-дэмакратычнай газеты на землях Беларусі *«Мужыцкая праўда»*. Яна выдавалася на беларускай мове лацінскім шрыфтам (так званай *беларускай лацінкай*). Усяго выйшла 7 нумароў гэтай газеты. Большасць матэрыялаў «Мужыцкай праўды» напісаў сам К. Каліноўскі, які карыстаўся псеўданімам «Яська, гаспадар з-пад Вільні».

Паўстанне пачалося ў студзені 1863 г. у Варшаве, а 1 лютага ЛПК звярнуўся да насельніцтва Беларусі і Літвы з заклікам уздымацца на ўзброеную барацьбу. Паўстанне хутка ахапіла ўсю тэрыторыю

Беларусі, але «белым» удалося адхіліць К. Каліноўскага ад кіраўніцтва ЛПК за яго радыкальныя погляды. З прычыны слабасці нацыянальна-дэмакратычных сіл на тэрыторыі Беларусі і Літвы К. Каліноўскі вымушаны быў падпарадкавацца ЦНК, ён стаў паўстанцкім камісарам Гродзенскай губерні. Складанасць сітуацыі заключалася ў тым, што кіраўнікі паўстання не мелі адзінага плана баявых дзеянняў, а паўстанцы – зброі ў дастатковай колькасці, таму часта яны выкарыстоўвалі партызанскую тактыку.



*Валерый Урублеўскі.*

У дзейнасці К. Каліноўскага і яго паплечнікаў выразна прасочвалася ідэя народнай, сялянскай рэвалюцыі і ўсталяванне ў выніку яе ўлады народа. Вось як былі сфармуляваны пастулаты дэмакратычнай дзяржавы ў чацвёртым нумары газеты «Мужыцкая праўда»:



**Nr. 1. Mużyckaja prauda**

Dzieciuki!

Minuło uże toje, kali zdawało sia usim szto mużyckaja ruka zdasce tolki da sachi,—ciepier nastau taki czas, szto my sami możem pisaci, i to pisaci takuju praudu sprawiedliwu jak Boh na niebi. O, zahremić nasza prauda i jak małanka pieraleció pa świeci! Niechaj paznajuć szto my możem nie tolki karmić swaim chlebom, no jeszcze i uczyć swojej mużyckoj praudaj.

Pytali i pytajuć usie szto czuwaci na świeci, chto nam biednym mużykam daść wolność? No praudu skazawszy mało chto chocze skazaci tak jak sumlenie każe—pa sprawiedliwosci. My mużyki, braty waszyje, my wam budziem hawaryć całaju praudu, tolki słuchajcie nas!

Maskali, czynouniki i mnoho panou, buduć pierepyniać pismo nasze da was; no najduć sia ludzie i z mużykou razumniejszyje i z panskaho rodu i z miasteczkowych, szto chocziuć waszej swabody, waszaho szczascia—jony to wam heto pismo dawaci buduć, kab wy znali chto wasz prajaciel a chto wasz woroch.

Sześć let uże minało, jak paczali hawaryć a swabodzie mużyckoj. Hawaryli, talkawali i pisali mnoho, a niczoho nie zrabili. A hety manifest szto Car z Senatom i z panami dla nas napisau, to taki durny, szto czort wiedaje da czoho jon padobny,—ni jakoj u niom niema praudy, niema z jeho dla nas nijakoj karyści. Parabili Kancelaryi, zrabili sud, jakby heto nie usio rouno brać u sraku czy z sudom czy bez suda. Parabili Pisarou, Pasrednikou, a usio za mużyckije hroszy i wielikije hroszy—czort ich wiedaje na szto; dla toho chyba kab zapisywali kniżki, jak mnoho napiszuć na srakach mużyckich. A z hetoho to i widać, szto nam niczoho dobraho i nie dumali zrabici.

Prauda abiecaczali to kaliś dać nam wolność; no jak nam zdajeć sia na nasz mużycki rozum szto chocziuć aszukaci, bo kali praz sześć let niczoho nie zrabili, to czeraz rok peunie nie zrobiać. Możuć jeszcze napisaci i druhi manifest, jeszcze bolszyj ad hetaho, no i z hetaho druhoho manifestu niczoho dobraho jak i z pierszaho nie budzie.

Ad maskala i panou nie ma czeho spadziewaci sia; bo jony nie wolnosci a hłumu i zdzierstwa naszeho chocziuć. No nie doudo jony nas buduć abdziraci, bo my paznali hdzie siła i prauda i budziem wiedać jak rabić treba kab dastać ziemlu i swabodu. Waźmiem sia Dzieciuki za ruki i dziarżem sia razom! a kali pany chocziuć trymać z nami, tak niechaj że robiać po świętej sprawiedliwości: bo kali inaczej—tak czort ich pabiary! Mużyk pakul zduzaje trymaci kosu i sakieru, baranić swaho patrapić i u nikoho łaski prasić nie budzie.

Heta Mużyckuju Praudu napisau i znou pisaci budzie Jaśko haspadar z pad Wilni. Kasztuje hroszy 5.



N 3.

**MUŻYCKAJA PRAUDA.**

Dziaciuki!

Żywuczy pad rądom maskouskim kożny wiedaje szto jon nas abdziraje i błumiérno mało chto dobre padumau czy można ad jeho spadziewaci sia czeho leh dla nas, albo dla dzieciej naszych. Ja Dziaciuki lepsz znajuczy ad wsia [illegible] napisaci pismo [illegible] waszaho. Dla toho czytajcie z uwahaju, a jak pierečzytajecie dawajcie da druhoj wioski.

Czeławiek to takuju maje naturu, szto albo niczoho nie wiedaje i niczoho mieci nie chocze, albo kali dawiedajeć sia, to chocze zrazumieci dobre i dastaci usiéko szto jemu należyć. Heto wielikaja prauda. Ot jeszcze nie dauno hawaryli naszyje, szto jeny stworeny dla toho, kab służyli pańszczynu i byli niewolnikami, a hawaryli dla toho szto niczoho niewiedali i niczoho mieci niechacieli,—a czy siehodnia hetak skažuć, kali uże wiedajuć mnoho i mnoho chocziuć? Siehodnia usie uże pararumnieli, usie uże mużyki talkujuć, szto Boh stworyu czełowieka kab jon [illegible] mahli inak dumaci. Heto prawo szto narod robić sia razumniejszym, wychodzić ad samoho Boha, a chto jemu schocze sprecziulaci sia, taho albo sam Boh albo narod pa prykazu boskomu z ziemloju zmieszaje!

Wy Dziaciuki peunie wielmi ciekawyje skul że heto narod tak parazumnieu? Ja wam skažu skul heto.

Kali Prancuz pad Swiatopolom zusiem pabiu maskala, to dla toho kab maskal nie mieu siły i hroszy, prykazau narodowi dać wolność, niebraci rekrutou i wielikich padatkou. Maskal zhadzieu sia na heto, bo dumau szto narod durny i patrapić jeho aszukaci. Jon to chacieu adno pieremienić niawolu, no bacziu wielmi aszukau sia, bo chacia [illegible] rąd maskouski niczoho u sześć let nie zrabiu, no my jak paczali szto i mużyk może być wolny, tak paczali pytaci sia u ludziej razumniejszych i talkawaci pamież saboju, aż zrazumieli szto to wolność znaczyć. Ot skul heto uziało sia szto narod parazumnieu. My siehodnia usie uże wiedajem, szto czeławiek wolny heto kali maje kusok swajej ziemli, za katoru ani czynszu i abroku nie płacić, ani pańszczyny nie służyć,—kali płacić małyje padatki i to nie na carskije stajni, psiarni i kurwy, a na patrebu ca-

*Старонкі з 1-га і 3-га нумароў газеты «Мужыцкай праўды».*

«*І як добры слуга глядзіць худобы гаспадарскай і слухае свайго гаспадара, так добры ўрад глядзець павінен шчасця людзей, слухаць народу і рабіць так, як народу лепей. І не дзіва, бо* ***не народ зроблены для ўрада, а ўрад для народа***».

К. Каліноўскі – сапраўдны нацыянальны герой Беларусі, чалавек, які магчыма адным з першых сказаў пра беларусаў як нацыю, а пра Беларусь – як незалежную дзяржаву. К. Каліноўскі выказаўся пра тое, што будаваць беларускую дзяржаву трэба знізу, ад людзей, для народа і з дапамогай народа. Нават у апошнім сваім слове, напісаным за кратамі ў чаканні смяротнага пакарання і вядомым як «Лісты з-пад шыбеніцы», ён звяртаўся да беларускага народа: «Прыймі, народзе, па шчырасці маё слова прадсмертнае, бо яно як з таго свету толькі для дабра твайго напісана».

К. Каліноўскі не толькі зразумеў, што асноўным носьбітам беларускасці з'яўляецца сялянства, але і пачаў адкрыта гаварыць пра гэта. Менавіта К. Каліноўскі сказаў нашаму народу, што ён сам павінен ведаць, якая воля яму патрэбная і што народ сам павінен змагацца за гэтую волю. К. Каліноўскі сцвярджаў, што ў нас усе людзі роўныя. Як сведчыў тагачасны расійскі даследчык В. Ф. Ратч, К. Каліноўскі меркаваў абапірацца ў паўстанні галоўным чынам на сялянства, бо зразумеў неабходнасць перадачы зямлі ва ўласнасць сялянам і стварэння сялянскай рэвалюцыйнай арганізацыі.

Несумненнае дасягненне К. Каліноўскага – размова з народам на яго роднай мове. Выданне «Мужыцкай праўды» па-беларуску паказвае, што кіраўнік нацыянальна-вызваленчага паўстання добра разумеў, а магчыма і добра ведаў, што ні рускамоўныя, ні польскамоўныя звароты да сялянства даверам у апошніх карыстацца не будуць.

Пра тое, што сялянства разумела паўстанцаў, а паўстанцы мелі давер з боку насельніцтва, пра тое, што іх ідэі знаходзілі падтрымку ў сялянскім асяроддзі, выразна сведчыць шырокі ўдзел сялян у паўстанні. Нельга пагадзіцца з тымі крытыкамі, якія сцвярджаюць, што мала сялян прыняло ўдзел у паўстанні. Доля сялянства ў 18–20% ад агульнай колькасці актыўных удзельнікаў нацыянальна-вызваленчага паўстання 1863–1864 гг. – гэта вельмі высокі паказчык.

Асабліва калі ўлічыць агульную інэртнасць сельскага насельніцтва ва ўсе часы і ва ўсіх краінах, недастатковую інфармаванасць сялянства і моцную контрпрапаганду і контрагітацыю царскіх чыноўнікаў у 1863–1864 гг., а таксама тое, што нацыянальна-вызваленчы рух на тэрыторыі Беларусі і Літвы аб’ектыўна тармазіўся ходам сялянскай рэформы 1861 г.

Многія гісторыкі, у тым ліку і тагачасныя расійскія даследчыкі, звярталі ўвагу на тое, што К. Каліноўскі, як кіраўнік нацыянальна-вызваленчага паўстання, выступаў за самастойнасць, незалежнасць Беларусі і Літвы. Адназначна выказваючыся супраць улады рускага царызму, як акупацыйнай улады, К. Каліноўскі праводзіў ідэю самастойнасці Літвы і Беларусі.

Выказванні К. Каліноўскага пра самастойнасць Літвы і Беларусі, пра незалежнасць іх і ад Масквы, і ад Варшавы сведчаць пра высокі ўзровень нацыянальнай свядомасці ўдзельнікаў паўстання і, найперш, яго кіраўнікоў. Само ўжыванне кіраўнікамі паўстання тэрміна «Беларусь» у палітычным сэнсе, як самастойнай дзяржавы, паказвае, што яны, знаходзячыся ў складзе агульнадэмакратычнага руху, накіраванага супраць царскага самаўладдзя, не змешваліся ў ім поўнасцю ні з польскай, ні з рускай плынямі.

Выразным пацвярджэннем гэтага тэзісу з’яўляецца і ўжыванне паўстанцамі ў Вільні трохступеннага пароля: «Каго любіш?» – «Люблю Беларусь!» – «То ж узаемна!»



*Старонка з судовай справы К. Каліноўскага з паролем «Люблю Беларусь!»*

Царскі ўрад рабіў усё, каб хутка ліквідаваць паўстанне. Усе беларуска-літоўскія губерні былі абвешчаны на ваенным становішчы. Надзвычайныя паўнамоцтвы атрымаў віленскі генерал-губернатар М. Мураўёў, які за сваю жорсткасць атрымаў мянушку *«вешальнік»*. Акрамя выкарыстання арміі, расійскія ўлады праводзілі шэраг мерапрыемстваў з мэтай адцягнуць ад паўстання сялян. Так, спецыяльнымі ўказамі Аляксандра II на тэрыторыі Беларусі і Літвы на 20% былі зменшаны выкупныя плацяжы, быў уведзены абавязковы выкуп надзелаў, а таксама шэраг іншых ільгот для сялян.

Узброеная барацьба на тэрыторыі Беларусі спынілася ўвосень 1863 г. У студзені 1864 г. К. Каліноўскі быў арыштаваны, а ў сакавіку ў Вільні быў пакараны праз павешанне. Усяго было пакарана на смерць 128 чалавек, 850 чалавек былі высланы на катаргу, 12,5 тысяч паўстанцаў сасланы ў Сібір. У беларуска-літоўскіх губернях быў усталяваны рэжым выключных законаў, накіраваных на поўную русіфікацыю краю. Маёмасць і маёнткі паўстанцаў падлягалі канфіскацыі, усе памешчыкі былі абкладзены надзвычайным падаткам, насельніцтва каталіцкага веравызнання абмяжоўвалася ў правах. Была закрытая апошняя вышэйшая навучальная ўстанова на беларускіх землях – Горы-Горацкі земляробчы інстытут. Беларускія губерні не мелі права на выбарныя земствы, выбарныя міравыя суды і дваранскае самакіраванне. Усё гэта замаруджвала тэмпы развіцця капіталістычных адносін на тэрыторыі Беларусі.



58

Braty maje, muzyki rodnyje.
Z pad szubienicy maskouskoj
pryjchodzić mnie da was pisaci,
i może raz astatni. Horko
pakinuć ziemielku rodnuju
i Ciebie, darahi moj narodzie.
Hrudzi zastohnuć, zabolić
serce, — no nie żal zhinuć za
twaju prawdu...
Pryjmi narodzie paszczyraści
maje słowo predsmiert-
naje, bo jeno jak z taho świeta
tolko dla twaho dabra
napisano. — Bratki
Niemasz bolszaho szcza-
ścia na hetom świeci, jak kali

*Другі «Ліст з-пад шыбеніцы» К. Каліноўскага.*

Але, нягледзячы на падаўленне паўстання і жорсткую расправу над

яго ўдзельнікамі, паўстанне 1863 г. мае вялікае значэнне для гісторыі беларускага народа. Сучасныя даследчыкі сцвярджаюць, што думкі К. Каліноўскага, выказаныя ім у *«Лісце з-пад шыбеніцы»* пра неабходнасць змагання за незалежнасць сваёй Бацькаўшчыны, можна лічыць пачаткам афармлення *беларускай нацыянальнай ідэі*.

***2. Дзейнасць народнікаў.*** У другой палове XIX ст. найбольш актыўнымі прадстаўнікамі рэвалюцыйнага руху ў Расійскай імперыі з'яўляліся *народнікі*. Па свайму сацыяльнаму становішчу народнікі належалі да розных груп насельніцтва, таму іх называлі *разначынцамі*. Родапачынальнікамі народніцкай ідэі былі А. Герцэн, М. Чарнышэўскі, М. Бакунін. Ідэалогія народніцтва грунтавалася на веры ў своеасаблівы шлях сацыяльнай перабудовы Расіі – пераход да сацыялізму, праміная капіталізм. Сацыялізм – палітычнае вучэнне, мэтай якога была пабудова «справядлівага» грамадства, заснаванага на ліквідацыі прыватнай уласнасці і наяўнасці ўласнасці агульнай (грамадскай) і роўнасці правоў усіх грамадзян.

Асноўную рэвалюцыйную сілу народнікі бачылі ў сялянстве, дакладней – у наяўнасці сялянскай абшчыны і яе глыбокіх гістарычных каранях: ураўнальным землекарыстанні, перыядычных перадзелах зямлі, сялянскім самакіраванні і г.д. У абшчыне, сялянскіх арцелях і сялянскім побыце народнікі бачылі зародкі сацыялізму і лічылі сялян «сацыялістамі па інстынкце».

З мэтай мірнай прапаганды ідэй сацыялізму сярод сялян у 1874 г. прыхільнікі гэтай плыні «пайшлі ў народ». Аднак гэтае «хаджэнне ў народ» скончылася правалам, паколькі сяляне не прынялі сацыялістычных ідэй, а ўлады адказалі на гэтую акцыю масавымі рэпрэсіямі супраць прапагандыстаў. Народнікі вымушаны былі перайсці да новай тактыкі барацьбы.

Адзін з першых народніцкіх гурткоў у Беларусі ўтварыўся ў 1875 г. у Магілёве, затым – у Мінску, Віцебску, Слуцку і іншых гарадах. Паміж беларускімі і расійскімі народнікамі ўсталяваўся цесны кантакт, асабліва з арганізацыямі ў Пецярбургу і Маскве, дзе вучылася шмат беларускай моладзі, паколькі на тэрыторыі

Беларусі не засталося ніводнай вышэйшай навучальнай установы. Беларускія народнікі Мікалай Судзілоўскі, Сяргей Кавалік, Рыгор Ісаеў сталі віднымі дзеячамі народніцкага руху ў Расіі.

Беларускія народнікі ўваходзілі ў агульнарасійскія падпольныя арганізацыі: «*Зямля і воля*», а пасля яе расколу ў «*Народную волю*» і «*Чорны перадзел*». 1 сакавіка 1881 г. беларусам Ігнатам Грынявіцкім, студэнтам Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута, быў забіты Аляксандр II, паколькі народнікі лічылі, што буржуазныя рэформы, якія правёў расійскі цар у 1860–1870 гг., былі па сваёй сутнасці буржуазнымі і такім чынам штучна аддалялі Расію ад пабудовы сацыялістычнага грамадства.

Новы цар Аляксандр III абвясціў непахіснасць самадзяржаўя і пачаў праводзіць адкрыта рэакцыйны курс, накіраваны на згортванне ці абмежаванне рэформаў, праведзеных пасля 1861 г. Цэнтральныя арганізацыі «Народнай волі» былі разгромлены паліцыяй.

У 1884 г. беларусы, студэнты Пецярбургскага ўніверсітэта, утварылі беларускую сацыяльна-рэвалюцыйную групоўку ***«Гоман»***, якая выдавала аднайменны нелегальны часопіс. На яго старонках з рэвалюцыйна-дэмакратычных пазіцый абвяшчалася пра існаванне беларускай нацыі і гучала патрабаванне яе самастойнасці пасля звяржэння царызму.

З дзейнасцю рэвалюцыйных народнікаў звязаны пачатак распаўсюджання ў Беларусі марксізму і ўтварэння рабочых гурткоў.

***3. Формы сацыяльнай барацьбы. Сялянскі і рабочы рух.*** Рэформа 1861 г. не вырашыла аграрнага пытання. Да таго ж, правы сялян у Расійскай імперыі былі значна абмежаванымі ў параўнанні з іншымі саслоўямі. Пасля рэформы сяляне аказаліся прыпісанымі да пэўнай сялянскай абшчыны і звязанымі кругавой парукай па выплаце падаткаў і адбыванню павіннасцяў. Без дазволу грамады селянін не мог адлучыцца са сваёй вёскі больш чым на 1 год. Больш за тое, без згоды абшчыны ён не мог прадаць сваю зямлю, а значыць не меў права распараджацца ёю.

Празмерныя падаткі і павіннасці, абмежаванні ў правах, рэгла-

ментацыя сельскага жыцця абшчынаю, немагчымасць свабодна распараджацца зямлёй, свавольства чыноўнікаў і да т. п. прыводзілі да пагаршэння жыцця, збяднення сялянства. Гэта выклікала шматлікія сацыяльныя пратэсты .

Каб адстаяць свае правы сяляне выкарыстоўвалі *ўзброеныя і няўзброеныя формы барацьбы.* Да няўзброеных форм барацьбы адносіцца: падача скаргаў, адмова ад выканання павіннасцяў і выплаты падаткаў, патравы панскіх засеўкаў і сенажацяў, высечка лесу, падпалы маёмасці і да т. п. Узброеная барацьба праяўлялася ў выглядзе нападаў на панскія маёнткі, забойства ці замаху на забойства феадальных уласнікаў ці іх прадстаўнікоў (намеснікаў, упраўляючых, аканомаў), адмовы ад выканання судовых рашэнняў і пастаноў, сялянскіх выступленнях і паўстанняў. Вядома, што за 1864–1900 гг. на тэрыторыі Беларусі было зафіксавана 978 выступленняў сялян.

У паслярэформенны перыяд значна ўзрасла такая форма сацыяльнай барацьбы сялянства як самавольнае перасяленне ў Сібір, на Далёкі Ўсход і ў іншыя рэгіёны Расійскай імперыі.

Разам з тым, нягледзячы на колькасны рост сялянскіх пратэстаў, сялянскі рух быў стыхійны і неарганізаваны. Сялянства хаця і пратэставала супраць парадкаў, якія ўсталявала царскае самаўладдзе, але верыла ў «добрага цара».

***Рабочы рух.*** Пасля 19 лютага 1861 г. эканоміка Расійскай імперыі атрымала значныя магчымасці для развіцця на новай, капіталістычнай аснове. Сяляне, якія выкупілі сваю зямлю і выйшлі з абшчыны, атрымалі магчымасць выехаць у горад на пастаяннае жыццё ці на заробкі. Пачаў фарміравацца рынак свабоднай рабочай сілы, дзе значнае месца займала беззямельнае і малазямельнае сялянства.

Сяляне, якія пераехалі ў горад, прадстаўлялі сабой некваліфікаваную рабочую сілу і часта прайгравалі ў змаганні за працоўныя месцы з больш падрыхтаванымі работнікамі яўрэйскага паходжання, якімі былі перапоўнены беларускія гарады і мястэчкі. Многія беларусы выязджалі на заробкі за межы свайго краю – у Санкт-Пецярбург, Маскву, Адэсу, Рыгу, іншыя гарады.

Каб павялічыць свае прыбыткі, прадпрымальнікі часта наймалі на працу не мужчын, а жанчын і дзяцей, якім можна было менш плаціць за такую ж работу.

Становішча работнікаў ускладнялася тым, што ў Расійскай імперыі да 1880-х гадоў не было рабочага заканадаўства. А пры перапоўненым рынку рабочай сілы ўмовы дыктаваў капіталіст – той, хто даваў работу. Рабочы дзень доўжыўся ад 12 да 17–19 гадзін у суткі. Адсутнічала медыцынскае абслугоўванне, страхаванне і пенсійнае забеспячэнне. Хворых і пакалечаных проста звальнялі без якіх-небудзь выплат. За розныя правіннасці рабочых штрафавалі. Заработнай платы часта не хапала на ўтрыманне сям'і. У адрозненне ад сялян, якія мелі пэўную маёмасць і па сваёй сутнасці былі кансерватыўнымі (што даказаў правал «хаджэння ў народ»), рабочыя не мелі нічога, акрамя сваіх рабочых рук. Таму ў другой палове XIX ст. іх называлі *пралетарамі*, і яны сталі найбольш радыкальнай сілай, якая імкнулася змагацца за свае правы).

Натуральна, што такое становішча выклікала незадаволенасць у рабочых, імкненне адстаяць свае правы. Работнікі ўжывалі розныя формы барацьбы: ад падачы індывідуальных і калектыўных скаргаў на імя ўласніка майстэрні, завода ці фабрыкі да арганізаваных пратэстаў, звязаных са спыненнем працы.

Першыя пратэсты пралетарыяту Беларусі супраць цяжкіх і невыносных умоў працы адбыліся ў 1864–1875 гг. Рабочыя падавалі калектыўныя скаргі і петыцыі начальству, пакідалі працу на прадпрыемствах. Такія выступленні называліся *хваляваннямі*. Часта хваляванні суправаджаліся пашкоджаннем фабрычнай маёмасці, падпаламі, а то і забойствам найбольш ненавісных адміністратараў.

У 1870–1890-я гады ў Беларусі рабочыя сталі прымяняць больш эфектыўныя формы барацьбы – *стачкі і забастоўкі*. Стачка – калектыўнае кароткачасовае прыпыненне працы з патрабаваннямі рэгулярнай выплаты заработнай платы, змяншэння працягласці працоўнага дня і да т. п. Забастоўка – калектыўнае арганізаванае спыненне працы на прадпрыемстве з мэтай дабіцца ад працадаўцы ці ўладаў выканання якіх-небудзь прынцыповых патрабаванняў; адзін з відаў вырашэння працоўных спрэчак.

Капіталісты пачалі ў адказ прымяняць супраць працоўных сістэму лакаўтаў. *Лакаўт* – закрыццё прадпрыемства з аднachасовым масавым звальненнем рабочых, адна з форм класавай барацьбы буржуазіі супраць рабочага класа.

Найбольш актыўна ў рабочым руху на тэрыторыі Беларусі бралі ўдзел чыгуначнікі. Так, адбыліся хваляванні рабочых-землякопаў на будаўніцтве Лібава-Роменскай чыгункі ў Мінскім павеце, Дзвінска-Віцебскай чыгункі (Дрысенскі і Віцебскі паветы), Віленска-Ровенскай чыгункі (Лідскі павет), а таксама на цагельным заводзе ў Брэсцкай крэпасці. Акрамя таго, значныя стачкі былі арганізаваны рабочымі чыгуначных майстэрняў у Мінску, Гомелі, Пінску, Брэсце.

Стачка лічылася дзяржаўным злачынствам, за ўдзел у ёй рабочыя падпадалі пад крымінальны або адміністрацыйны пераслед.

Падчас спынення працы рабочыя не атрымлівалі заработнай платы і ім самім і іх сем'ям прыходзілася цярпець нястачу, часта нават галадаць. Гэта падштурхнула рабочых да таго, каб пачаць збіраць грошы для такіх выпадкаў у спецыяльныя фонды, якія набылі назву стачачных касаў. Першая ў Беларусі стачачная каса была створаная ў слясарных майстэрнях Мінска ў 1885–1887 гг.

Да сярэдзіны 1890-х гг. рабочы рух у Беларусі меў пераважна эканамічны, абарончы характар, амаль ва ўсіх выступленнях гэтага часу рабочыя пратэставалі супраць парушэння ўмоваў найму.

З другой паловы 1890-х гг. стачачны рух беларускіх рабочых стаў масавым. Ён захаваў эканамічны характар. Разам з тым, паступова адбываўся пераход ад абарончага, эканамічнага руху рабочых да свядомай палітычнай барацьбы. Летам 1898 г. у Віцебску адбылася першая вулічная дэманстрацыя працоўных супраць свавольства паліцыі. У верасні 1899 г. у Гродне адбыліся дзве масавыя дэманстрацыі супраць праследу ўладамі ўдзельнікаў эканамічнай забастоўкі на тытунёвай фабрыцы.

З сярэдзіны 1890-х гг. рабочыя Ашмян, Гомеля, Гродна, Брэста, Віцебска, Мінска, Смаргоні на тайных сходках пачалі адзначаць 1 мая як дзень міжнароднай салідарнасці працоўных. Першая вулічная дэманстрацыя, прысвечаная гэтаму дню, адбылася ў Мінску 1 мая 1890 г.

Такім чынам, у другой палове 1890-х гг. у Беларусі назіраўся значны ўздым рабочага руху. Напачатку ён насіў абарончы, эканамічны характар. Паступова, пад уплывам агітацыі і прапаганды сацыял-дэмакратаў, узрасла палітычная свядомасць і арганізаванасць рабочых, што знайшло сваё праяўленне ў з'яўленні першых палітычных выступленняў у форме стачак і палітычных дэманстрацый.

***4. Палітычныя партыі і рухі.*** Да сярэдзіны 1880-х гг. многія арганізацыі народнікаў у Расійскай імперыі былі ліквідаваны паліцыяй. Акрамя таго, стала зразумелым, што сяляне не ўспрымалі народніцкія ідэі сацыялізму і народніцкія прапановы аб пераходзе ад феадалізму праз сялянскую абшчыну да сацыялізму, прамінаючы капіталізм. Адбыўся ідэйны крызіс народніцтва: адна частка народнікаў перайшла на пазіцыі марксізму, другая – на пазіцыі ліберальныя, рэфармісцкія.

***Ліберальныя народнікі,*** спыніўшы рэвалюцыйную барацьбу, патрабавалі ад урада рэформаў, якія б прадухілілі збядненне сялян і рабочых. Ідэі ліберальных народнікаў у Беларусі прадстаўляла газета «Минский листок».

***Сацыял-дэмакратычныя гурткі.*** Ужо ў 1880-х гг. стала зразумелым, што рабочы рух мае свае, адрозныя ад сялянства, задачы і патрабаванні. Узніклі ўмовы для распаўсюджання *марксізму,* прыхільнікі якога пачалі называцца *сацыял-дэмакратамі.* Пачатак гэтага руху ў Беларусі звязаны з дзейнасцю групы Г. Пляханава «Вызваленне працы» і першай польскай сацыялістычнай партыі «Пралетарыят». У сярэдзіне 1880-х гг. у Мінску Э. Абрамовічам і І. Гурвічам былі створаны першыя групы, дзе рабочыя вывучалі марксізм.

У маі 1896 г. па ініцыятыве С. Трусевіча адбыўся з'езд прадстаўнікоў Мінскай, Віленскай і Смаргонскай рабочых арганізацый. На ім быў утвораны ***РСЛ*** *(Рабочы саюз Літвы)* – інтэрнацыянальная арганізацыя беларускіх, польскіх, яўрэйскіх і рускіх рабочых на тэрыторыі Віленшчыны, Гродзеншчыны і Міншчыны. Праграма РЛС прадугледжвала звяржэнне царызму, прыняцце канстытуцыі і вядзенне барацьбы за сацыялістычны лад.

У верасні 1897 г. у Вільні быў утвораны ***Бунд*** *(Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Польшчы і Расіі)* – самая ўплывовая рэвалюцыйная арганізацыя ў Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Быў створаны з мэтай арганізацыі барацьбы яўрэйскіх рабочых за паляпшэнне іх эканамічнага становішча.

На хвалі ўздыму рабочага і сацыял-дэмакратычнага руху ў Мінску ў пачатку сакавіка 1898 г. на I з'ездзе прадстаўнікоў шэрагу сацыял-дэмакратычных арганізацый (Пецярбургскага, Маскоўскага, Кіеўскага і Екацярынаслаўскага «Саюзаў барацьбы за вызваленне рабочага класа», кіеўскай «Рабочай газеты» і Бунда была ўтворана ***РСДРП*** *(Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя)*. Яе прыхільнікі стаялі на пазіцыях марксісцкага вучэння аб класавай барацьбе як рухаючай сіле гісторыі і рабілі стаўку на пралетарыят. У 1903 г. на II з'ездзе ў РСДРП вызначыліся дзве фракцыі: *бальшавікі*, якія выступалі за рэвалюцыйны шлях пабудовы сацыялізму, і *меншавікі*, мэтай якіх было паступовае рэфармаванне грамадства.

***5. Палітыка царскіх уладаў пасля паўстання 1863–1864 гг.*** Беларусь мела шмат асаблівасцяў сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця. Па-першае, царскі ўрад ніколі не забываў, што гэта не расійскія, а «навадалучаныя» пасля падзелаў Рэчы Паспалітай землі. Па-другое, людзі, якія жылі на гэтых тэрыторыях, не збіраліся падпарадкоўвацца новым уладам. Пра гэта сведчылі паўстанні 1794, 1830–1831, 1863–1864 гг., удзел многіх беларусаў у французска-рускай вайне 1812 г. на баку Напалеона. Па-трэцяе, нягледзячы на значную русіфікатарскую дзейнасць уладаў і прымусовы перавод уніятаў у праваслаўе, асноўная частка шляхты і простага насельніцтва беларускіх зямель зусім не лічылі сябе «рускімі», як таго хацелі ўлады. Больш за тое, вялікая колькасць насельніцтва спавядала каталіцызм, што ніяк не спалучалася з уладнымі ідэямі «рускасці». Па-чацвёртае, да 1870 г. на тэрыторыі Беларусі і Літвы захоўвалася ваеннае становішча, уведзенае ў адказ на паўстанне 1863–1864 гг.

Як адзначалася ў папярэднім параграфе, у Расійскай імперыі

на працягу 1860-1870-х гг. дзяржавай быў праведзены шэраг ліберальных рэформ. На тэрыторыі Беларусі яны былі ажыццёўлены некалькі пазней, бо пасля паўстання 1863–1864 гг. царызм баяўся новага выбуху тут нацыянальна-дэмакратычнага руху. Так, напрыклад, земская рэформа ў Расіі была праведзена ў 1864 г., у Беларусі ж яе часткова дазволілі толькі ў 1911 г.

Пасля паўстання дзейнічалі следчыя камісіі і палявыя суды, ажыццяўляліся рэпрэсіі – арышты ўдзельнікаў паўстання і тых, хто ім дапамагаў, адбіранне ў іх маёнткаў. Забаранялася жалоба па загінуўшых паўстанцах, выкарыстанне польскай мовы, нашэнне жалобнага адзення і да т. п. Аднавілася палітыка «разбору шляхты». Звальняліся са службы чыноўнікі-католікі, а на іх месцы прызначаліся праваслаўныя, выхадцы з цэнтральных губерняў Расіі. Працягвалася палітыка па насаджэнню рускага землеўладання.

Пасля таго, як 1 сакавіка 1881 г. цар Аляксандр II загінуў ад бомбы народавольцаў, наступіў перыяд контррэформаў, які суправаджаўся адкрытым наступам на іншадумцаў. У сярэдзіне 1860-х гг. улады паспрабавалі арганізаваць перавод часткі беларусаў-католікаў у праваслаўе, закрываліся каталіцкія касцёлы, частка якіх была ператвораная ў праваслаўныя цэрквы. Захоўвалася мяжа аселасці для яўрэяў.

19 жніўня 1881 г. цар Аляксандр III падпісаў «Палажэнне аб мерах для аховы дзяржаўнай бяспекі і грамадскага спакою», па якому мясцовыя губернатары і генерал-губернатары надзяляліся надзвычайнымі правамі ў барацьбе з іншадумствам і недазволенай палітычнай дзейнасцю. Адным з інструментаў кантролю за паводзінамі грамадзян стала выдача пасведчанняў аб палітычнай добранадзейнасці, без якіх нельга было паступіць на службу ці вучобу.

У сістэме народнай асветы адбыўся адкрыты паварот да клерыкалізму, засілля праваслаўнай царквы ў сферы народнай адукацыі. Паводле цыркуляра міністра асветы, выдадзенага ў 1887 г., забаранялася прымаць у гімназіі дзяцей кухарак, прачак, дробных гандляроў, іншых прадстаўнікоў ніжэйшых слаёў грамадства. Гэты закон атрымаў ганебную мянушку «Цыркуляр аб кухарчыных дзецях». Уводзіліся абмежаванні для навучання яўрэйскіх дзяцей –

для іх у гімназіях і вышэйшых навучальных установах уводзілася працэнтная норма, якую нельга было перавышаць.

Яўрэі і дробныя гарадскія ўласнікі страцілі права выбіраць сваіх прадстаўнікоў у гарадскія думы.

Падагульняючы, неабходна заўважыць, што XIX ст. у еўрапейскай гісторыі характарызавалася хуткім развіццём капіталістычных адносін і фарміраваннем нацый. У Беларусі, якая знаходзілася ў складзе Расійскай імперыі, гэты працэс быў запаволены. Панаванне феадальна-прыгонніцкай сістэмы тармазіла эканамічнае развіццё, як і праведзеная ў 1861 г. аграрная рэформа, якая захавала шэраг феадальных перажыткаў. Беларусь у Расійскай імперыі з'яўлялася раёнам буйнога памешчыцкага землеўладання, і гаспадарчае развіццё беларускіх зямель мела ярка выражаны аграрны характар.

Гэты перыяд быў вельмі складаным і неспрыяльным для фарміравання беларускай нацыі. Абсалютная большасць беларусаў былі жыхарамі сельскай мясцовасці і належалі да сялянскага саслоўя.

Важнай асаблівасцю беларускага этнасу быў падзел паводле веравызнання на праваслаўных і католікаў, што шырока выкарыстоўвалася ў мэтах спачатку паланізацыі, а потым русіфікацыі краю: католікаў запісвалі ў «палякі», а праваслаўных – у «рускія». Заможнае насельніцтва Беларусі, якое магло паспрыяць развіццю беларускай культуры і нацыі, не было беларусамі: памешчыкі паводле сваёй нацыянальнай самасвядомасці былі ў большасці сваёй палякамі ці рускімі, а ў гарадах і мястэчках пераважала яўрэйскае насельніцтва. У грамадска-палітычным і культурным жыцці дамінавала руская мова. Сацыяльнай апорай беларускага нацыянальнага руху былі нараджаючаяся нацыянальная інтэлігенцыя, сялянства, частка шляхты (пераважна дробнай і беззямельнай) і невялікая колькасць рабочых, якія карысталіся беларускай мовай.

Паводле перапісу 1897 г. сярод гарадскога насельніцтва беларуска-літоўскіх губерняў беларусаў (па роднай мове) было толькі 14,5%. Разам з тым беларускую мову назвалі роднай больш за 50% усёй шляхты, 60% настаўнікаў, 40% чыноўнікаў, 20% медыцынскіх работнікаў. Ва ўмовах жорсткай русіфікацыі гэтыя паказчыкі сведчылі пра значны рост нацыянальнай самасвядомасці.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***«Гоман»*** – нелегальная народніцкая арганізацыя, створаная беларускімі студэнтамі ў Пецярбургу ў 1884 г.

***Марксізм*** – палітычнае вучэнне, створанае *нямецкімі вучонымі* К. Марксам і Ф. Энгельсам, адпаведна якому рухаючай сілай грамадскага развіцця з'яўляецца класавая барацьба прыгнечаных класаў супраць пануючых. Найвышэйшым праяўленнем класавай барацьбы паводле тэорыі марксізму з'яўляецца сацыялістычная рэвалюцыя і ўсталяванне дыктатуры пралетарыяту.

***«Мужыцкая праўда»*** – нелегальная рэвалюцыйна-дэмакратычная газета на беларускай мове, якая выдавалася ў 1862–1863 гг.

***Народніцтва*** – кірунак рэвалюцыйнага руху ў Расійскай імперыі, прыхільнікі якога лічылі, што Расія можа прыйсці да сацыялізму праз сялянскую абшчыну, мінуючы капіталістычную стадыю развіцця.

***Рэвалюцыйныя дэмакраты*** – прадстаўнікі рэвалюцыйнага руху, выразнікі інтарэсаў сялянства. Разглядалі сялян як галоўную рэвалюцыйную сілу. Спалучалі ідэю сялянскай рэвалюцыі з ідэяй утапічнага сацыялізму.

***Сацыял-дэмакраты*** – прыхільнікі ідэй сацыялізму, класавай барацьбы пралетарыята, дэмакратызацыі палітычнага і грамадскага ладу. Падзяляліся на два асноўныя накірункі: рэвалюцыйны і рэфармісцкі.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***Вясна 1862 г.*** – стварэнне ў г. Варшаве Цэнтральнага нацыянальнага камітэта (ЦНК) – органа для падрыхтоўкі нацыянальна-вызваленчага паўстання.

***Лета 1862 г.*** – стварэнне ў г. Вільні Літоўскага правінцыяльнага камітэта (ЛПК) – органа па падрыхтоўцы паўстання ў Беларусі і Літве.

***Кастрычнік 1862 г.*** – уступленне на пасаду старшыні Літоўскага правінцыяльнага камітэта Кастуся (Канстанціна Вікенція) Каліноўскага.

***1862–1863 гг.*** – выйшла 7 нумароў першай нелегальнай беларускай дэмакратычнай газеты «Мужыцкая праўда».

***1863–1864 гг.*** – нацыянальна-вызваленчае паўстанне ў Беларусі, Літве і Польшчы.

***Красавік 1863 г.*** – атрад Людвіка Звяждоўскага з дапамогай студэнтаў Горы-Горацкага земляробчага інстытута захапіў г. Горкі.

***24 красавіка 1863 г.*** – бітва каля вёскі Мілавіды Слонімскага павета паміж паўстанцамі і царскімі войскамі.

***Вясна 1863 г.*** – найвышэйшы ўздым паўстання на тэрыторыі Беларусі і Літвы.

***Восень 1863 г.*** – спыненне ўзброенай барацьбы на тэрыторыі Беларусі.

***29 студзеня 1864 г.*** – арышт Кастуся Каліноўскага.

***10 (22) сакавіка 1864 г.*** – Кастусь Каліноўскі пакараны на смерць праз павешанне на Лукішкаўскай плошчы ў г. Вільні.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Біч М. В.* Нацыянальнае і аграрнае пытанні ў час паўстання 1863–1864 гг. // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – №3. – С. 36–45.
2. *Голубеў В. Ф.* Люблю Беларусь! Пароль паўстанцаў 1863–1864 гг. // Беларускі гістарычны часопіс, 2013. – №12. – С. 11–15.
3. *Голубеў В. Ф.* «Столік аднаногі з круглаю шашачнаю дошкаю...» (лёс рэчаў К. Каліноўскага, канфіскаваных пад час яго арышту). // Беларускі гістарычны часопіс, 2013. – №12. – С. 16–24.
4. Восстание в Литве и Беларуси 1863–1864 гг. Сборник документов. – М., 1960.
5. *Калиновский К.* Из печатного и рукописного нследия. – Минск, 1988.
6. *Самбук С. М.* Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX в. – Минск, 1980.
7. Публицистика белорусских народников: нелегальные издания белорусских народников (1881–1884). Сборник документов. – Минск, 1983.

# РАЗДЗЕЛ 5.
# АДУКАЦЫЯ, НАВУКА І КУЛЬТУРА БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст. УМОВЫ І АСАБЛІВАСЦІ ФАРМІРАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ

1. *Змены ў сістэме адукацыі ў другой палове XIX ст. Школьная рэформа 1864 г.*
2. *Навука. Пашырэнне беларусазнаўства.*
3. *Новая беларуская літаратура.*
4. *Мастацтва і архітэктура.*
5. *Тэатр і музыка.*
6. *Умовы і асаблівасці фарміравання беларускай нацыі.*

**1. *Змены ў сістэме адукацыі ў другой палове XIX ст. Школьная рэформа 1864 г.*** Важныя змены ў сферу адукацыі былі ўнесеныя рэформай, якая пачала праводзіцца з 1864 г. Рэформа мела прагрэсіўны характар: абвяшчалася ўсесаслоўнасць адукацыі, уводзілася пераемнасць паміж рознымі ступенямі навучання, адкрывалася магчымасць для навучання ў сярэдняй і вышэйшай школе для прадстаўнікоў непрывілеяваных саслоўяў.

Аднак на тэрыторыі Беларусі правядзенне рэформы супала з рэакцыйнай палітыкай царскага самаўладдзя, якая праводзілася тут пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. У 1864 г. за ўдзел студэнтаў у паўстанні быў закрыты Горы-Горацкі земляробчы інстытут і 8 сярэдніх навучальных устаноў Віленскай акругі (сярод іх – Навагрудская гімназія, Свіслацкая і Маладзечанская прагімназіі). У адрозненне ад расійскіх губерняў, у Беларусі не было земскіх школ. Тут дзейнічалі «Часовыя правілы для народных школ», распрацаваныя з удзелам віленскага генерал-губернатара М. М. Мураўёва. У кожнай з беларускіх губерняў ствараліся

дырэкцыі народных вучылішчаў, якія кантралявалі праграмы і працэс навучання, набіралі і звальнялі настаўнікаў. Праводзілася адкрыта прарускае выкладанне гісторыі Беларусі і Літвы. Дзейнічаў лозунг: «*Што не зрабіў рускі штык – павінна зрабіць рускае пяро (школа)*!»

М. М. Мураўёў імкнуўся поўнасцю русіфікаваць насельніцтва Беларусі і Літвы і заяўляў, што «для ўсталявання рускага ўладарання ў Паўночна-Заходнім краі неабходна ўмацаваць і ўзвысіць рускую народнасць і праваслаўе…» і таму трэба заняцца «…распаўсюджаннем грамадскай адукацыі ў духу праваслаўя і рускай народнасці…».

Навучальныя ўстановы на землях Беларусі давалі адукацыю двух узроўняў: пачатковую і сярэднюю. Пачатковую адукацыю можна было атрымаць у сельскай мясцовасці – *у народных вучылішчах, царкоўнапрыходскіх школах і школах граматы*; у гарадах – *у прыходскіх, павятовых і гарадскіх вучылішчах.* Народныя і гарадскія вучылішчы адносіліся да Міністэрства асветы і атрымлівалі дзяржаўнае фінансаванне.

Царкоўна-прыходскія школы і школы граматы знаходзіліся ў структуры праваслаўнай царквы і дзяржаўнага фінансавання не мелі. Навучанне ў іх адбывалася ў духу прапаганды праваслаўя і царскага самаўладдзя, таму насельніцтва каталіцкага веравызнання імкнулася не адпраўляць сваіх дзяцей для навучання ў такія школы.

Лепшую ад царкоўна-прыходскіх школ адукацыю давалі народныя вучылішчы, якія мелі адна- і двухкласную структуру. Вучылі там Закону Божаму, рускай мове, арыфметыцы, рамёствам (хлопчыкаў) і рукадзеллю (дзяўчынак).

Для адукацыі дзяцей рамеснікаў, гандляроў і дробнай шляхты існавалі шасцігадовыя гарадскія вучылішчы. Пасля завяршэння адукацыі ў іх, можна было паступіць у гімназію ці настаўніцкі інстытут.

Сярэднюю адукацыю давалі мжчынскія і жаночыя *рэальныя* і *класічныя гімназіі*. У класічных гімназіях ішла спецыялізацыя па гуманітарных навуках, а ў рэальных – на прыродазнаўчых

і тэхнічных. Выпускнікі класічных гімназій маглі без здачы дадатковых экзаменаў паступаць ва ўніверсітэты, а выпускнікі рэальных гімназій – у тэхнічныя інстытуты.

У 1864 г. у Маладзечне адкрылася першая на тэрыторыі Расійскай імперыі *настаўніцкая семінарыя.* У Беларусі настаўніцкія семінарыі адкрыліся таксама ў Полацку, Нясвіжы і Свіслачы, дзе атрымлівалі адукацыю будучыя настаўнікі пачатковых школ.

Настаўнікаў гарадскіх вучылішчаў і сярэдніх школ на тэрыторыі Беларусі не рыхтавалі, іх прысылалі сюды з Масквы, Пецярбурга і Кіева.

Пасля закрыцця ў 1832 г. Віленскага ўніверсітэта, а ў 1864 г. – Горы-Горацкага земляробчага інстытута ў другой палове XIX ст. атрымаць вышэйшую адукацыю на тэрыторыі Беларусі ўвогуле было немагчыма. Беларускія студэнты вучыліся ў асноўным ва ўніверсітэтах Пецярбурга, Масквы і Кіева.

**2. *Навука. Пашырэнне беларусазнаўства.*** Праз некаторы час пасля нацыянальна-вызваленчага паўстання пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага значна пашырылася навуковае вывучэнне Беларусі (беларусазнаўства). Галоўнай прычынай гэтага стала тое, што царскі ўрад паставіў перад расійскімі вучонымі задачу даказаць, што Беларусь не мае права на самастойнасць, бо нібыта заўсёды была часткай Расіі, а беларусы не з’яўляюцца самастойнай нацыяй, а толькі часткай агульнага «рускага племені».

На працягу 1860–1910 гг. вучонымі Расійскай акадэміі навук, Рускага геаграфічнага таварыства, розных універсітэтаў і навуковых устаноў была праведзена руплівая праца па выяўленні дакументаў па старажытнай гісторыі Беларусі і Літвы. У выніку была апрацавана велізарная колькасць матэрыялаў, якія, насуперак установкам царскага ўрада, сведчылі пра самабытнасць беларускага народа, пра існаванне самастойнага беларускага этнасу. Большая частка сабранага матэрыялу была апублікаваная. Сярод іх 39 тамоў «Актаў, якія выдавала Віленская камісія для разбору старажытных актаў», што выйшлі ў свет на працягу 1865–1915 гг., 14 тамоў «Археаграфічнага зборніка дакументаў, якія адносяцца да гісторыі

Паўночнай-Заходняй Русі», выдадзеных у 1867–1904 гг., іншыя зборнікі гістарычных дакументаў.

Развівалася беларусазнаўства, даследавалася мова і культура беларусаў. Значную ролю ў правядзенні адпаведных даследаванняў адыграў Паўночна-Заходні аддзел Рускага геаграфічнага таварыства, створаны ў 1867 г. у Вільні. Тут працавалі і выдавалі свае працы па гісторыі беларускага этнасу вядомыя этнографы і мовазнаўцы Іван Насовіч, Павел Шэйн, Юльян Крачкоўскі, Аляксандр Семянтоўскі і інш.

Так, мовазнаўца і этнограф, ураджэнец Быхаўскага павета *І. Насовіч* у 1870 г. выдаў «*Слоўнік беларускай мовы*», які ўключаў больш за 30 тысяч слоў.

*П. Шэйн*, родам з Магілёва, у 1873 г. выдаў зборнік «*Беларускія песні*», у якім змешчана больш за тысячу народных песень, загадак, казак, паданняў. Пры яго актыўным удзеле і кіраўніцтве ў 1887–1902 гг. выйшлі трохтомныя «*Матэрыялы для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўднёва-Заходняга краю*», у якіх утрымліваецца маса этнаграфічных апісанняў беларускіх абрадаў, звестак пра жыллё, адзенне, ежу, заняткі і звычкі беларусаў.

Ураджэнец Гомельшчыны *Еўдакім Раманаў* у 1886–1912 гг. выдаваў шматтомны «*Беларускі зборнік*», дзе публікаваў звесткі пра гарадзішчы і курганы на тэрыторыі Беларусі.



*Яўхім Карскі.*

У вывучэнні беларускай мовы і беларускага народа шмат зрабіў *Яўхім Карскі* – першы беларус, які атрымаў званне акадэміка Расійскай акадэміі навук. У сваёй трохтомнай працы пад назвай «*Беларусы*» Я. Карскі вызначыў этнаграфічныя межы рассялення беларусаў і склаў адпаведную карту, паказаў асаблівасці і самастойнасць беларускай мовы ў сям’і славянскіх моваў, вызначыў

беларускі этнас як самабытны славянскі народ са старажытнай і самабытнай гісторыяй і культурай.

**3. *Новая беларуская літаратура*.** Пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. беларуская літаратура перажывала крызісны перыяд. На гэта паўплывала агульнапалітычная сітуацыя ў краіне, звязаная з рэпрэсіямі ў адносінах да паўстанцаў і ўвогуле да мясцовай творчай інтэлігенцыі, а таксама фактычная забарона беларускага друку. Разам з тым, перадавыя людзі, галоўным чынам прадстаўнікі беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі, пісалі свае творы, працягвалі працу па нацыянальна-патрыятычнаму выхаванню насельніцтва.

Найбуйнейшым нацыянальным паэтам другой паловы XIX ст. стаў ураджэнец фальварка Свіраны Віленскага павета *Францішак Багушэвіч*. Удзельнік студэнцкіх хваляванняў у Пецярбургскім універсітэце, паўстанец 1863 г., ён добра адчуваў жаданні і пачуцці свайго народа, найперш сялянства. У 1891–1894 гг. на тэрыторыі Польшчы, у Кракаве і Познані, былі надрукаваны два зборнікі яго вершаў: «*Дудка беларуская*» і «*Смык беларускі*». Падпісваў іх аўтар псеўданімамі Мацей Бурачок і Сымон Рэўка з-пад Барысава. Галоўнай дзеючай асобай твораў Ф. Багушэвіча быў беларускі селянін, жыццё і працу якога яскрава паказваў паэт.

Ф. Багушэвіч пісаў па-беларуску і ўслаўляў беларускую мову, якую называў «бацькавай спрадвечнай мовай» і заклікаў ніколі не пакідаць «мовы нашай беларускай». Ф. Багушэвіч першы ў беларускай літаратуры выступіў як натхняльнік працэсу нацыянальнага самаўсведамлення і самаідэнтыфікацыі беларусаў, заклікаў народ да барацьбы за незалежнасць, за волю і шчасце.

*Янка Лучына* (Іван Неслухоўскі) нарадзіўся ў Мінску. Многа працаваў, але лёс распарадзіўся так, што зборнік яго беларускамоўных вершаў пад назвай «*Вязанка*» выйшаў толькі праз шэсць гадоў пасля яго смерці. Я. Лучына таксама пісаў пра беларускага селяніна, пра яго цяжкую долю і гарачую любоў да радзімы. Найбольш вядомы верш паэта «*Роднай старонцы*», у якім аўтар выказаў сваю любоў да роднай Бацькаўшчыны, з якой не жадаў ніколі развітвацца.

Значнымі постацямі ў беларускай паэзіі другой паловы XIX ст.

таксама былі *Адам Гурыновіч* з вершамі «*Чаго спіш, мужычок?*», «*Перш душылі паны*» і інш. (мастацкія творы паэта захоўваліся ў рукапісах і ўпершыню былі апублікаваны толькі ў 1921 г.) і *Карусь Каганец (Казімір Кастравіцкі)* – вершы «*Прамова*», «*Наш сымболь*», «*Гадка пра Галубка*» і інш. Аўтары таксама былі сялянскімі паэтамі, пісалі пра цяжкую долю селяніна, заклікалі да барацьбы за нацыянальную свабоду.

Шырокую вядомасць набыла творчасць *Алаізы Пашкевіч* (псеўданім *Цётка*). У 1902–1904 гг. яна вучылася ў Пецярбургу, дзе стала членам гуртка студэнтаў-беларусаў «Круг беларускай народнай прасветы». Тады ж пачалася і яе літаратурная творчасць. У нелегальных выданнях гуртка – «Каляднай пісанцы» і «Велікоднай пісанцы» – былі змешчаны яе вершы «Мужык не змяніўся», «Музыкант беларускі». У 1906 г. выйшлі два зборнікі яе вершаў «Скрыпка беларуская» і «Хрэст на свабоду». Вершы «Хрэст на свабоду», «Мора», «Пад штандарам» сталі сапраўднымі шэдэўрамі рэвалюцыйна-агітацыйнай паэзіі. Асноўныя матывы паэзіі Цёткі – любоў да радзімы, да прыроды, самаахвярнае служэнне народу. Цётка – адна з пачынальніц беларускай прозы. Яе апавяданні адлюстроўваюць настроі студэнцкай моладзі («Зялёнка»), цяжкі вясковы побыт («Навагодні ліст»). Апавяданне «Прысяга над крывавымі разорамі» друкавалася нават у якасці пракламацыі. Для дзяцей яна выдала буквар («Лемантар»), падручнік для чытання «Першае чытанне для дзетак беларусаў» і інш.

У гэты ж час раскрыліся паэтычныя таленты заснавальнікаў сучаснай беларускай літаратуры і літаратурнай мовы Янкі Купалы і Якуба Коласа.

*Янка Купала (Іван Дамінікавіч Луцэвіч)* нарадзіўся ў фальварку Вязынка Мінскага павета. Першы яго верш, напісаны на беларускай мове «Мая доля» датуецца 1904 г. Першым апублікаваным беларускамоўным вершам стаў «Мужык» (1905 г.). У 1908 г. пецярбургскае выдавецтва «Загляне сонца і ў наша ваконца» выпусціла зборнік паэта «Жалейка», які двойчы канфіскоўвалі. Другі зборнік вершаў «Гусляр» быў выдадзены лацінкай у Пецярбургу ў 1910 г. Шырокую вядомасць набылі паэмы Я. Купалы «Курган», «Бандароўна»

«Магіла льва». Аўтар драматычных твораў «Паўлінка», «Раскіданае гняздо», «Тутэйшыя» і інш. П’еса «Тутэйшыя», у якой гучала ідэя нацыянальнай незалежнасці Беларусі, доўгі час была ў ліку забароненых твораў.

Я. Купала ў сваіх творах выступаў сапраўдным патрыётам Беларусі, імкнуўся абудзіць у чытачоў пачуццё годнасці, гонару за гераічнае мінулае сваёй краіны, за сваіх продкаў.

*Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч)* – адзін з класікаў і заснавальнікаў новай беларускай літаратуры нарадзіўся ў засценку Акінчыцы Мінскага павета. Першыя зборнікі вершаў «Песні няволі» (1908 г.) і «Песні смутку». У 1911 г. Я. Колас пачаў працу над паэмамі «Новая Зямля» і «Сымон-музыка». Для творчасці Я. Коласа характэрна майстэрскае адлюстраванне роднай прыроды, глыбокае веданне псіхалогіі беларускага сялянства.

Значнай з’явай у беларускім культурным жыцці стала творчасць *Максіма Багдановіча.* Адзіны прыжыццёвы зборнік паэта «Вянок» выйшаў у Вільні ў 1913 г. Паэт любіў родную Беларусь і пісаў пра гэта. Яго верш «Пагоня» стаў паэтычным гімнам Беларусі.

**4. *Мастацтва і архітэктура*.** *У* выяўленчым мастацтве Беларусі другой паловы XIX ст. значна ўзрасла цікавасць да гістарычнага мінулага свайго народу. Разам з тым, папулярнымі заставаліся таксама пейзажныя і партрэтныя жанры.



*К. Альхімовіч «Найманне работнікаў».*

Адным з вядомых жывапісцаў Беларусі ў разглядаемы час быў ураджэнец Лідскага павета, паўстанец 1863 г. *Казімір Альхімовіч*. Ён пісаў карціны на гістарычную тэматыку, пра лёс ссыльных паўстанцаў, а таксама паказваў жыццё простых беларускіх людзей, сялян. Найбольшую вядомасць набылі яго гістарычныя карціны «*Пахаванне Гедыміна*», «*Пасля бітвы*», «*Смерць Глінскага ў турме*», палотны, звязаныя з высылкай у Сібір «*На этапе*», «*Пахаванне на Урале*», *а* таксама творы пра жыццё сельскага насельніцтва «*Жніво*», «*Парабкава хата*», «*Найманне работнікаў*».

Значным мастацкім дасягненнем К. Альхімовіча з’яўляецца серыя карцін, напісаная ім па матывах твораў А. Міцкевіча.

*Апалінар Гараўскі* нарадзіўся ў маёнтку Ўборкі Ігуменскага павета Мінскай губерні. Працаваў пераважна ў пейзажным і партрэтным жанрах. У 1861 г. за свае працы атрымаў званне акадэміка. Лепшымі пейзажамі мастака лічацца тыя, дзе ён адлюстраваў краявіды роднай Міншчыны: «*Вечар у Мінскай губерні*», «*Свіслач*», «*Рака Бярэзіна*», «*На радзіме*», «*Пінскія балоты*». Сярод карцін партрэтнага жанру вылучаюцца працы «*Жанчына з палітрай*», «*Жаночы партрэт*» *і асабліва палатно* «*Старая моліцца*». Некаторыя з прац А. Гараўскага адабраў для сваёй галерэі вядомы расійскі мецэнат П. М. Траццякоў.

Жыццё беларускіх сялян у XIX ст. яскрава адлюстравана ў палотнах *Нікадзіма Сілівановіча з* вёскі Цынцавічы Вілейскага паве-



*А. Гараўскі «Вечар у Мінскай губерні».*



*Н. Сіліванові*ч *«Літоўская дзяўчынка».*

та. Яго карціны «*Стары пастух*», «*У школу*», «*Дзеці ў двары*», «*Гульня дзяцей вёскі Цынцавічы*» прасякнуты надзвычайнай цеплынёй, добрымі пачуццямі да свайго народа, да Беларусі, разуменнем сялянскага жыцця. Мастак пісаў таксама партрэты і іконы, прымаў удзел у роспісе Ісакіеўскага сабора ў Пецярбургу, у прыватнасці, у стварэнні мазаічнага пано для галоўнага іканастаса сабора.

*Напалеон Орда*, ураджэнец вёскі Варацэвічы Пінскага павета Мінскай губерні атрымаў мастацкую адукацыю ў Парыжы. Многа падарожнічаў па Беларусі, Літве, Украіне, Польшчы і стварыў каля тысячы замалёвак мясцін, якія ён наведваў. Сярод замалёвак – палацы і замкі, гістарычныя помнікі. Так, вядомы зробленыя рукой Н. Орды малюнкі Камянецкай вежы, замкаў у Міры, Нясвіжы, Гродне, Лідзе і інш.

У Беларусі ў маёнтку Здраўнева пад Віцебскам некалькі гадоў працаваў вядомы рускі мастак *Ілья Рэпін*. Тут ён напісаў адну з найбольш вядомых сваіх карцін «*Беларус*».



*Напалеон Орда*

Яркім прадстаўніком творцаў пейзажнага жывапісу быў *Вітольд Бялыніцкі-Біруля*. Прырода ў яго творах выглядала казкай, боскім тварэннем, нечым светлым і радасным. Мастак вельмі любіў маляваць вясеннія пейзажы, якіх у яго творчым багажы было каля 200 (сярод іх працы «*Ізумруд вясны*», «*Вясна*», «*Ранняя вясна*»,

*В. Бялыніцкі-Біруля «Ранняя вясна».*



«*У канцы зімы*» і інш). В. Бялыніцкі-Біруля атрымаў званне акадэміка жывапісу.

Пасля таго, як скончыў у 1886 г. мастацкую акадэмію ў Пецярбурзе, у 1891 г. пераехаў у Віцебск і пасяліўся там *Юдаль Пэн*. У 1892 г. Ю. Пэн адчыніў у Віцебску Школу малявання і жывапісу, якая існавала там да 1919 г. Гэтая школа стала першым у Расійскай імперыі яўрэйскім мастацкім вучылішчам. Вучнямі Ю. Пэна былі *Марк Шагал, Заір Азгур*. Ю. Пэна мастацтвазнаўцы называюць вялікім беларускім мастаком яўрэйскага паходжання.

У сваіх карцінах Юдаль Пэн паказаў жыццё яўрэйскай беднаты, стварыў цэлую галерэю вобразаў простых людзей, галоўным



*Ю. Пэн «Домік з козачкай».*

чынам рамеснікаў, паказаў абставіны, у якіх яны жылі і працавалі. Гэта карціны «Стары кравец», «Стары салдат», «Стары з кошыкам», «Яўрэйскі равін» і інш. Цікавыя і замалёўкі гарадскога побыту, зробленыя Ю. Пэнам, на якіх можна ўбачыць важныя дэталі тагачаснага жыцця простага люду («Дом у мястэчку Лёзне», «Вуліца ў Віцебску», «Млын на Віцьбе» і інш.).

***Архітэктура.*** У другой палове XIX ст. адбыліся значныя змены ў сацыяльным і эканамічным развіцці краіны, што сказалася і на стане архітэктуры. З'яўленне фабрык і заводаў, вялікіх прадпрыемстваў з паравымі рухавікамі, чыгуначнае будаўніцтва змянілі архітэктурны воблік многіх населеных пунктаў.

Адбыўся хуткі рост і забудова гарадоў, што знаходзіліся на чыгуначных шляхах, змяніўся парадак іх планіроўкі. На знешні выгляд гарадоў уплывала будаўніцтва каменных шматпавярховых дамоў, з'яўленне вулічнага асвятлення, будаўніцтва водаправодаў і да т. п., хаця масавая гарадская забудова характарызавалася, як і раней, аднапавярховымі драўлянымі пабудовамі.

Прыблізна ў сярэдзіне XIX ст. заўважаецца паступовы заняпад класічнай архітэктуры, у беларускім дойлідстве пачынае пераважаць *эклектыка* – спалучэнне элементаў розных мастацкіх стыляў мінулага.



*Віленскі вакзал у Мінску (эклектыка).*

У беларускім дойлідстве (беларускай архітэктурнай эклектыцы) другой паловы – канца XIX ст. выкарыстоўваліся рознастылёвыя архітэктурныя формы: неаготыка, неабарока, неакласіцызм, неарамантызм, псеўдавізантыйскі стыль і інш. Гэтыя неастылі атрымалі назву «гістарычнай архітэктуры».

Звычайна будынкі банкаў і навучальных устаноў афармляліся ў стылі рэнесансу ці класіцызму, тэатры – пад стыль барока, касцёлы – пад готыку, праваслаўныя цэрквы – у візантыйскім ці псеўдарускім стылі.

Пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. па ініцыятыве ўладаў узнікла так званае праваслаўнае культавае дойлідства, у якім панаваў *псеўдарускі і псеўдавізантыйскі* архітэктурны стыль. Рускія архітэктары для таго, каб паказаць пераемнасць рускага дойлідства ад Візантыі, распрацавалі тыповыя варыянты праваслаўных цэркваў, якія механічна былі скапіраваны з візантыйскіх храмаў. Ініцыятарам такога тыпавога будаўніцтва быў віленскі генерал-губернатар М. М. Мураўёў, таму яны і атрымалі ў народзе назву «*цэркваў-мураўёвак*». Для псеўдарускага стылю было характэрна традыцыйнае пяцікупалле, цыбулепадобныя купалы, высокія шатровыя званіцы, знешні дэкор сцен у выглядзе какошнікаў. Цэрквы, пабудаваныя ў псеўдарускім стылі можна сустрэць па ўсёй



*Касцёл Святога Роха ў Мінску (неаготыка).*



*Гасцініца «Еўропа» ў Мінску (мадэрн).*

тэрыторыі Беларусі. Напрыклад, гэта капліца князёў Паскевічаў у Гомелі, Пакроўскі сабор у Гродне, Свята-Уваскрэсенскі сабор у Барысаве і інш.

У другой палове XIX ст. назіраўся росквіт і *неагатычнага* стылю, які стаў як бы афіцыйным стылем каталіцкай царквы ў Беларусі. Культавыя пабудовы такога стылю ўзводзіліся з добра абпаленай чырвонай цэглы, упрыгожваліся вітражамі, мазаікай, фрэскамі. Прыкладамі такога стылю з'яўляюцца касцёл Святога Роха ў Мінску, а таксама касцёлы ў Відзах, Вілейцы, Паставах і інш.

У культавым дойлідстве Беларусі склаўся таксама і *неарамантычны* стыль, у якім спалучаліся матывы раманскай і гатычнай культуры. У такім стылі пабудаваны касцёл Святых Сымона і Алены ў Мінску. У псеўдагатычным стылі таксама будаваліся некаторыя фабрычна-заводскія будынкі.

У канцы XIX ст. пачынаецца станаўленне новага архітэктурнага стылю – *мадэрну*. Пашыраліся новыя тыпы пабудоў: чыгуначныя вакзалы, прамысловыя будынкі, воданапорныя вежы, пачынаюць выкарыстоўвацца новыя будаўнічыя матэрыялы (цэмент, металічная арматура), шырока выкарыстоўвалася шкло. У стылі

мадэрн пабудаваны гасцініца «Еўропа» ў Мінску, банк у Віцебску, жылыя дамы ў Мінску, Гродне, Гомелі, Магілёве і інш.

З помнікаў грамадзянскай забудовы, дзе ёсць будынкі другой паловы XIX ст., вылучаюцца комплексы Ракаўскага і Траецкага прадмесцяў у Мінску, забудовы ў Гродне і Брэсце (жылыя будынкі, крамы, даходныя дамы і да т. п.).

**5. *Тэатр і музыка.*** У другой палове XIX ст. на тэрыторыі Беларусі працягвала развівацца тэатральнае мастацтва. Практычна ва ўсіх буйных гарадах меліся стацыянарныя тэатры з прафесійнымі тэатральнымі трупамі. Праўда, манапольнае права на тэатральную дзейнасць мелі толькі зарэгістраваныя тэатры, якія ставілі пастаноўкі на польскай і рускай мовах.

Значнай падзеяй у тэатральным жыцці Беларусі стала стварэнне намаганнямі В. Дуніна-Марцінкевіча ў Мінску нацыянальнай тэатральнай трупы. Гэтая трупа, у складзе больш за 20 чалавек, была арганізавана спецыяльна для пастаноўкі оперы «Сялянка» В. Дуніна-Марцінкевіча. Прэм’ера оперы адбылася 9 лютага 1852 г. на сцэне Мінскага гарадскога тэатра і стала вызначальнай з’явай беларускага тэатральнага жыцця сярэдзіны XIX ст. Прэм’ера першай беларускай оперы «Ідылія» («Сялянка») на музыку С. Манюшкі і К. Крыжаноўскага і на лібрэта В. Дуніна-Марцінкевіча прайшла з вялікім поспехам. Як адзначала тагачасная крытыка, спектакль атрымаўся яскравы, маляўнічы і пакінуў моцнае ўражанне. Відовішча пачыналася масавай сцэнай – на падмостках выступаў хор, які дапамог стварыць атмасферу жыццёвай верагоднасці. Значная частка дзеяў спектакля адбывалася на беларускай мове. Але вельмі хутка ўлады выдалі загад аб забароне спектакляў на «простонародном языке». Нават спектаклі ў Беларусі можна было ставіць толькі па-руску ці па-польску.

Пазней гэтую п’есу неаднаразова ставілі ў прыватных памяшканнях у Мінску, Бабруйску, Нясвіжы, Слуцку, Глуску і іншых мясцінах, куды прыязджала трупа В. Дуніна-Марцінкевіча. Пастаноўка «Сялянкі» сведчыла аб нараджэнні беларускага нацыянальнага музычнага тэатра.

На тэатральнае жыццё Беларусі вялікі ўплыў аказвалі польскія, расійскія і ўкраінскія трупы, якія тут гастралявалі. Тэатралы, найперш жыхары гарадоў, знаёміліся з іх дапамогай з замежнай тэатральнай класікай.

Як і тэатральнае мастацтва, музыка ў гэты час даволі выразна падзялялася на прафесійную, якую культывавалі ў мастацкіх салонах і на канцэртах (распаўсюджвалася з дапамогай друкаваных нот, тэатральных відовішчаў і г. д.), а таксама музыку народную, якая зберагалася і ўзбагачалася народнымі музыкантамі.

У Беларусі музыка была адной з найважнейшых і найбольш распаўсюджаных галін мастацтва. Асновамі музычнай культуры тут валодаў амаль кожны адукаваны чалавек, напрыклад, для жанчын-шляхцянак уменне іграць на музычным інструменце і спяваць лічылася амаль абавязковым. Музыка гучала ў салонах мясцовай шляхты, выкладалася ў навучальных установах, даволі часта адбываліся сольныя канцэрты прафесійных музыкантаў і аматараў. Губернскія гарады, як правіла, мелі свае аматарскія ці прафесійныя аркестры. У маёнтках буйных магнатаў існавалі прыгонныя аркестры і капэлы – традыцыя, якая захавалася яшчэ з XVIII ст.

Пасля паўстання 1863–1864 гг. павялічылася цікавасць не толькі да гісторыі беларусаў, але і да беларускай народнай музычнай творчасці. Спецыялісты-музыканты пачалі збіраць, друкаваць і вывучаць беларускія народныя песні і манеру іх выканання. Рабілася кампазітарская апрацоўка і канцэртная прапаганда беларускай народнай музыкі. Беларускія песенныя і музычныя матывы гучалі ў творах С. Манюшкі. Так, вядомы музыказнаўца-фалькларыст Р. Р. Шырма адзначаў, што ў оперы С. Манюшкі «Фліс» («Плытагоны»), напісанай у 1858 г., «*такое багацце песенных і танцавальных народных інтанацый, што часам ствараецца ўражанне, што ты дзесьці пад Слуцкам ці каля Менску прысутнічаеш на народным свяце*». На працягу жыцця С. Манюшка меў цесныя сувязі з беларускімі музыкантамі, падтрымліваў іх у творчай дзейнасці.

Сярод выхадцаў з Беларусі можна назваць імёны кампазітараў *М. Карловіча, Ф. Міладоўскага, Н. Орды*. Напалеон Орда аўтар

больш чым 20 паланэзаў, мазурак, вальсаў, накцюрнаў, полек, а таксама рамансаў. У 1873 г. выдаў падручнік «Граматыка музыкі», які быў высока ацэнены С. Манюшкам і на дзесяцігоддзі стаў лепшым дапаможнікам па тэорыі музыкі.

У пачатку XX ст. у беларускіх гарадах і вёсках сталі надзвычай папулярнымі тэатральна-канцэртныя нацыянальныя прадстаўленні – так званыя *беларускія вечарынкі*. Тут выступалі самадзейныя і прафесійныя артысты, якія выконвалі народныя песні і танцы, чыталі беларускія вершы, ставілі спектаклі.

У 1907 г., выкарыстоўваючы вопыт беларускіх вечарынак, *Ігнат Буйніцкі* ў сваёй сядзібе Палівачы пад Глыбокім заснаваў самадзейны тэатр, які даваў канцэрты і спектаклі ў Палівачах, Празароках і навакольных вёсках. І. Буйніцкі вывучаў беларускія песні, танцы, народнае адзенне.

12 лютага 1910 г. тэатр Буйніцкага прыняў удзел у прадстаўленні ў Вільні, якое ўвайшло ў гісторыю пад назвай «Першая беларуская вечарынка ў Вільні». Выступленне трупы Буйніцкага мела каласальны поспех. Разам з новымі драматычнымі акцёрамі і спевакамі трупа стала прафесійнай і атрымала назву «Першая беларуская трупа», або «Тэатр Ігната Буйніцкага». У 1910–1913 гг. тэатр гастраляваў па Беларусі (Мінск, Слуцк, Полацк, Дзісна, Свянцяны, Паставы, Нясвіж, Ляхавічы), двойчы выступаў у Пецярбургу (у 1911 і 1912 гг.), а таксама ў Варшаве ў 1913 г.

У рэпертуары тэатра, акрамя танцаў і песняў, былі пастаноўкі п'ес «Пашыліся ў дурні» М. Крапіўніцкага, «Хам» і «У зімовы вечар» паводле Э. Ажэшкі, «Сватанне» А. Чэхава, «Модны шляхцюк» К. Каганца і інш. І. Буйніцкі быў і рэжысёрам і акторам у сваіх спектаклях.

Тэатр працаваў у неспрыяльных умовах, прыходзілася пераадольваць прыдзіркі цэнзуры і перашкоды мясцовых уладаў, якія бачылі ў дзейнасці трупы пагрозу вялікадзяржаўнай палітыцы царызму. Царскія ўлады непрыхільна ставіліся да паказу са сцэны твораў на беларускай мове, асабліва на вострыя сацыяльныя тэмы і часта забаранялі спектаклі.

Разам з тым, пад уплывам дзейнасці трупы І. Буйніцкага ў Бе-

ларусі пачаў шырыцца самадзейны тэатральны рух. Узрасла цікавасць да беларускай мовы, беларускіх песень і танцаў.

Такім чынам, культура Беларусі і ў другой палове XIX – пачатку XX ст. захавала сваю самабытнасць і арганічна спалучалася з агульнаеўрапейскай культурай.

**6.** ***Умовы і асаблівасці фарміравання беларускай нацыі.*** Як адзначалася раней, асноўнымі гістарычнымі формамі этнасу з'яўляюцца *племя, народнасць, нацыя*. Нацыя гістарычна з'яўляецца пераемніцай народнасці. Для яе галоўным лічацца не тэрытарыяльныя сувязі, а агульнасць эканамічнага жыцця, сталае пражыванне насельніцтва на адной тэрыторыі, наяўнасць адзінай літаратурнай мовы, агульных рысаў культуры і псіхічнага складу этнасу.

Менавіта нацыя ператвараецца ў такую грамадзянскую супольнасць людзей, перад якой паўстае задача нацыянальна-культурнай ідэнтыфікацыі і пабудовы ўласнай нацыянальнай дзяржавы.

Асаблівасцю фарміравання беларускай нацыі было тое, што ў час яе складвання ў беларусаў не было сваёй нацыянальнай дзяржаўнасці. Працэс фарміравання нацыі прыпаў на час уваходжання Беларусі ў склад Расійскай імперыі. Уладамі апошняй праводзілася палітыка захавання адзінай і непадзельнай Расійскай імперыі і, значыць, аслаблення і ўвогуле забароны ў ёй нацыянальных рухаў.

Разам з тым, у складзе Расійскай імперыі беларусы мелі агульныя рысы гаспадарчага жыцця, чаму садзейнічала складванне агульнанацыянальнага рынку. Фарміраванню на тэрыторыі Беларусі агульнай эканамічнай прасторы садзейнічала развіццё гандлю і чыгуначнае будаўніцтва.

Для беларусаў было характэрным пражыванне на адной тэрыторыі: асноўная колькасць насельніцтва пражывала на тэрыторыі Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў. Паводле перапісу 1897 г. насельніцтва Беларусі складала 6,7 млн. чалавек. Па нацыянальным складзе 65,6% насельніцтва былі беларусамі, 14,6% – яўрэямі, 6% – рускімі, 5,2% – палякамі, 4,6% – украінцамі.

Асаблівасць Беларусі была ў тым, што гарады і мястэчкі ў сувязі з наяўнасцю мяжы яўрэйскай аселасці былі перанаселены яўрэямі. Многа ў гарадах было таксама рускіх і палякаў. Гэта некалькі тармазіла працэс нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, бо беларусаў улады аб'яўлялі вясковай нацыяй. Разам з тым, нацыянальная ідэя магла выспець толькі ў культурна-палітычных цэнтрах, г. зн. у гарадах.

Па сацыяльным складзе сярод беларусаў сапраўды найбольш было сялян. Але ў склад беларускага грамадства таксама ўваходзілі буржуазія, дваранства, інтэлігенцыя. Асаблівасцю было тое, што беларуская буржуазія ўяўляла сабой меншасць у параўнанні з яўрэйскай, польскай і рускай буржуазіяй на тэрыторыі ўласнай краіны. Мясцовая буржуазія не ўсведамляла яшчэ сваёй нацыянальнай адметнасці і часта выбірала для сябе польскія або расійскія нацыянальна-культурныя прыярытэты. Рабочы клас быў прадстаўлены ў асноўным рабочымі-яўрэямі; беларусамі-рабочымі з'яўляліся ў асноўным былыя сяляне, якія былі рабочымі-гараджанамі ў першым пакаленні.

У канфесійным складзе насельніцтва Беларусі пераважалі праваслаўныя (каля 2/3 ад агульнай колькасці насельніцтва), якія адчувалі вялікі культурны і маральны ўціск з боку Рускай праваслаўнай царквы, якая дзейнічала ў адпаведнасці з дэвізам «Самадзяржаўе, праваслаўе, народнасць».

Беларуская нацыянальная інтэлігенцыя фарміравалася ў другой палове XIX ст. пераважна з ліку каталіцкай шляхты, сялян і мяшчан і таксама не была дастаткова арганізаванай і нацыянальна арыентаванай.

Да канца XIX ст. склалася беларуская літаратурная мова, у якой пануючае месца заняла кірыліца.

Узраслі працэсы самаідэнтыфікацыі беларусаў. Паводле перапісу 1897 г. беларускую мову прызналі роднай 60% настаўнікаў, 40% чыноўнікаў, 29% паштова-тэлеграфных служачых, 20% работнікаў медыцынскіх устаноў. Вясковыя жыхары, беларускія сяляне, якія пераехалі ў горад і значная колькасць бяднейшага яўрэйскага насельніцтва таксама гаварылі па-беларуску.

Такім чынам, у канцы XIX ст. беларускі этнас меў усе падставы для пераходу ў новую гістарычную форму свайго існавання і развіцця – *нацыю*.

Зараджалася і фарміравалася *беларуская нацыянальная ідэя* – сумеснае існаванне беларусаў у складзе ўласнай нацыянальнай дзяржавы.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Нацыянальная свядомасць*** – сукупнасць ідэй, уяўленняў, перакананняў, вераванняў у якіх народ асэнсоўвае сябе як нацыю і ўсведамляе гістарычныя карані свайго паходжання.

***Мадэрн*** – архітэктурны стыль, што ўзнік на мяжы XIX–XX стст. Характэрна навізна, адмаўленне ад механічнага капіравання гістарычных архітэктурных формаў.

***Псеўдарускі стыль*** – архітэктурны стыль, арыентаваны на візантыйскія і старажытнарускія ўзоры. Характэрная прыкмета – цэрквы-«мураўёўкі» з тыповымі купаламі-цыбулінамі.

***Эклектыка*** – накірунак у архітэктуры, у якім характэрна спалучэнне (змешванне) разнародных стылёвых элементаў.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1864 г.*** – за ўдзел студэнтаў у нацыянальна-вызваленчым паўстанні быў закрыты Гора-Горацкі земляробчы інстытут.

***1864 г.*** – школьная рэформа ў Расійскай імперыі. Школа абвяшчалася ўсесаслоўнай. Ствараліся народныя і гарадскія вучылішчы, царкоўнапрыходскія школы і школы граматы (пачатковая адукацыя), мужчынскія і жаночыя гімназіі – класічныя і рэальныя (сярэдняя адукацыя) і інстытуты і ўніверсітэты (вышэйшая адукацыя).

***1864 г.*** – *у* г. Маладзечне адчынілася першая на тэрыторыі Расійскай імперыі настаўніцкая семінарыя.

***1887 г.*** – выданне міністрам народнай адукацыі Расійскай імперыі цыркуляра, па якому забаранялася прымаць у гімназіі дзяцей ні-

жэйшых саслоўяў гарадскога насельніцтва (кухарак, прачак, дробных гандляроў і інш.). У грамадстве атрымаў назву цыркуляр «Аб кухарчыных дзецях».

***1889 г.*** – у газеце «Минский листок» упершыню была апублікавана паэма «Тарас на Парнасе».

## ЛІТАРАТУРА


1. Архитектурные памятники Белоруссии. – Минск, 1982.
2. *Капилов А. Л., Ахвердова Е. И.* Музыкальная культура Беларуси XIX – начала XX веков. – Минск, 2000.
3. *Лыч Л., Навіцкі У.* Гісторыя культуры Беларусі. – Мінск, 1997.
4. *Самусік А. Ф.* Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – Мінск, 2004.
5. *Снапкоўская С. В.* Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. – Мінск, 1998.
6. *Трусаў А.* Кароткая гісторыя архітэктуры Беларусі. – Мінск, 2015.
7. *Чантурия В. А.* История архитектуры Белоруссии. – Минск, 1969.

# РАЗДЗЕЛ 6.
# БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ РЭВАЛЮЦЫІ 1905–1907 гг. І ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

1. *Палітычная сітуацыя ў Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. і Беларусь.*
2. *Сельская гаспадарка і прамысловасць Беларусі ў пачатку XX ст. Сталыпінская аграрная рэформа.*
3. *Беларускі нацыянальна-вызваленчы і культурны рух у пачатку XX ст.*
4. *Беларусь у гады Першай сусветнай вайны.*

**1. *Палітычная сітуацыя ў Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Рэвалюцыя 1905 –1907 гг. і Беларусь.*** Грамадска-палітычная і эканамічная сітуацыя ў Беларусі, як і ва ўсёй Расійскай імперыі, у пачатку XX ст. была вельмі нестабільнай. У азначаны перыяд у Расійскай імперыі склалася рэвалюцыйная сітуацыя, якая вылілася ў *рэвалюцыю* 1905–1907 гг. Сярод асноўных *прычын рэвалюцыі* можна вылучыць наступныя:

1) ***эканамічны крызіс*** пачатку XX ст., які прывёў да беспрацоўя, рэзкага пагаршэння матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва і, як вынік, да росту рэвалюцыйных настрояў сярод як гараджан, так і сялянства. Паглыбленне эканамічнага крызісу адбылося з прычыны паражэння Расіі ў руска-японскай вайне 1904–1905 гг. Крызіс быў звязаны з вузкасцю ўнутранага рынку, рост якога тармазіўся наяўнасцю феадальна-прыгонніцкіх перажыткаў у сельскай гаспадарцы і галечай вёскі. З вёскі выкачваліся велізарныя сродкі ў выглядзе выкупных плацяжоў, а таксама шматлікіх дзяржаўных і земскіх збораў. Тым самым рэзка скарачаліся магчымасці сялян набыць сучасныя сельскагаспадарчыя машыны і прылады працы, штучнае ўгнаенне, сартавое насенне, пародзістую жывёлу, а таксама фабрычнае адзенне і абутак;

2) ***нявырашанасць аграрнага пытання.*** Нягледзячы на праведзеную рэформу па адмене прыгоннага права, у Расійскай імперыі па-ранейшаму заставаліся феадальныя перажыткі: буйное дваранскае землеўладанне, сялянская абшчына, малазямелле сялян і інш. Сяляне не былі ўласнікамі выдзеленай ім у 1861 г. зямлі, паколькі працягвалі плаціць выкупныя плацяжы;

3) ***наяўнасць самадзяржаўя і адсутнасць дэмакратычных правоў і свабодаў***;

4) ***нявырашанасць нацыянальнага пытання.*** Расія з'яўлялася шматнацыянальнай краінай, аднак усе нацыі, акрамя рускай, не мелі ў Расійскай імперыі адпаведных умоваў, неабходных для забеспячэння нацыянальных інтарэсаў і развіцця нацыянальнай культуры. Пазіцыі царскага ўрада па нацыянальнаму пытанню паранейшаму вызначаліся лозунгам захавання «адзінай і непадзельнай Расійскай імперыі» і любыя патрабаванні свабоды нацыянальнага развіцця, а тым больш аўтаноміі і незалежнасці расцэньваліся як антыдзяржаўныя;

5) ***нестабільнасць палітычнай сітуацыі*** выяўлялася ў стварэнні вялікай колькасці палітычных партый, якія ставілі розныя патрабаванні. На тэрыторыі Беларусі дзейнічала шмат сацыял-дэмакратычных арганізацый, асноўнымі з якіх былі:

• ***Бунд*** *(«Усеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Польшчы і Расіі»)* – самая ўплывовая рэвалюцыйная арганізацыя ў Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Утвораны ў Вільні ў 1897 г. з мэтай арганізацыі барацьбы яўрэйскіх рабочых за паляпшэнне іх эканамічнага становішча;

• ***РСДРП*** *(Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя)* – утворана ў 1898 г. у Мінску на I з'ездзе прадстаўнікоў сацыял-дэмакратычных арганізацый. Стаяла на пазіцыях марксісцкага вучэння аб класавай барацьбе як рухаючай сіле гісторыі і рабіла стаўку на пралетарыят. У 1903 г. на II з'ездзе ў РСДРП вызначыліся дзве фракцыі: *бальшавікі*, якія выступалі за рэвалюцыйны шлях пабудовы сацыялізму, і *меншавікі*, мэтай якіх было паступовае рэфармаванне грамадства;

• ***Эсэры*** *(ПСР – Партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў)* – гэтая

партыя аформілася ў 1902 г., аб'яднаўшы народніцкія арганізацыі і групы, якія ў сваёй дзейнасці арыентаваліся на сялянства. Праграма эсэраў прадугледжвала *сацыялізацыю зямлі* – перадачу ўсёй зямлі ва ўласнасць народа і ўраўняльнае надзяленне зямлёй без права куплі-продажу;

• ***ППС на Літве*** *(Польская сацыялістычная партыя на Літве)* – утварылася ў 1902 г. у выніку адасаблення ад Польскай сацыялістычнай партыі груп, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі і Літвы. Як і іншыя сацыял-дэмакратычныя арганізацыі, выступала за звяржэнне самадзяржаўя, усталяванне ўлады народа і пабудову сацыялізму шляхам народнай рэвалюцыі;

• ***БСГ*** *(Беларуская сацыялістычная грамада)* – першая беларуская нацыянальная палітычная партыя. Утворана зімою 1902–1903 г. на аснове маладзёжных культурна-асветніцкіх гурткоў беларускай вучнёўскай і студэнцкай моладзі Пецярбурга, Мінска і Вільні як *Беларуская рэвалюцыйная грамада* (пазней была перайменавана). Стваральнікамі і кіраўнікамі БСГ былі прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі: ***Вацлаў Іваноўскі***, браты ***Іван*** і ***Антон Луцкевічы***, ***Алаіза Пашкевіч*** (*Цётка*), ***Алесь Бурбіс***, ***Казімір Кастравіцкі*** (*Карусь Каганец*) і інш. У сваёй праграме мела *бліжэйшую* мэту (звяржэнне самадзяржаўя і ўтварэнне на тэрыторыі Беларусі незалежнай дэмакратычнай рэспублікі) і *канчатковую* (знішчэнне капіталізму і пераход у грамадскую ўласнасць зямлі, сродкаў вытворчасці і камунікацый).

***Пачатак рэвалюцыі і падзеі ў Беларусі.*** Рэвалюцыя пачалася 9 студзеня 1905 г. у Пецярбургу з расстрэлу мірнай дэманстрацыі рабочых *(«крывавая нядзеля»)*. У беларускіх гарадах у студзені 1905 г. адбыліся акцыі салідарнасці з рабочымі Пецярбурга – забастоўкі ахапілі 31 горад Беларусі (Мінск, Гомель, Смаргонь, Гродна, Пінск і інш.). Пад уздзеяннем рабочага руху актывізаваліся таксама сялянскія і салдацкія выступленні.

***Удзельнікі рэвалюцыі*** былі аб'яднаны ў 3 лагеры:

1) ***урадавы*** *(кансерватыўны, манархічны)*. Яго сацыяльнай базай былі дваранства, чыноўніцтва, буйная буржуазія. Выступаў за захаванне існуючага грамадска-палітычнага ладу і абапіраўся

на армію і паліцыю. Сярод праўрадавых палітычных партый былі ***«Саюз рускага народа»*** (*чарнасоценцы*) і ***«Русский окраинный союз»***;

2) ***буржуазна-ліберальны*** лагер быў прадстаўлены большай часткай буржуазіі, передавымі памешчыкамі, часткай інтэлігенцыі. Іх мэтай было ўсталяванне канстытуцыйнай манархіі, стварэнне парламента і правядзенне палітычных рэформ;

3) ***дэмакратычны*** *(рэвалюцыйны)* лагер аб'яднаў сялян, пралетарыят і дэмакратычную інтэлігенцыю. Яны выступалі за звяржэнне самадзяржаўя і ўсталяванне дэмакратычнай рэспублікі шляхам склікання Ўстаноўчага сходу, а таксама за ліквідацыю памешчыцкага землеўладання. У гэты лагер уваходзілі пералічаныя вышэй сацыял-дэмакратычныя партыі.

Значнага ўздыму рэвалюцыйныя падзеі дасягнулі восенню 1905 г. У кастрычніку 1905 г. працоўныя Беларусі ўзялі ўдзел ва *Ўсерасійскай палітычнай стачцы*. 18 кастрычніка ў гарадах Беларусі быў абвешчаны *Маніфест Мікалая II ад 17 кастрычніка 1905 г.*, паводле якога ў Расіі абвяшчаліся *дэмакратычныя правы і свабоды* (свабода слова, друку, сходаў, веравызнання, недатыкальнасць асобы), а таксама стваралася надзеленая заканадаўчымі паўнамоцтвамі *Дзяржаўная дума*, пры наяўнасці якой расійскае самадзяржаўе ператваралася ў парламенцкую манархію.

Маніфест ад 17 кастрычніка задаволіў прадстаўнікоў буржуазна-ліберальнага лагера. Яны адышлі ад рэвалюцыі, утварылі дзве палітычныя партыі – ***Канстытуцыйна-дэмакратычную партыю*** (*кадэты*) і ***«Саюз 17 кастрычніка»*** (*акцябрысты*) – і далучыліся да ўрадавай кааліцыі.

Прадстаўнікі рэвалюцыйных партый заклікалі не верыць Маніфесту і працягваць барацьбу за звяржэнне царызму і скліканне Ўстаноўчага сходу. 18 кастрычніка 1905 г. у Мінску па загаду губернатара П. Курлова быў расстраляны мітынг рабочых па абмеркаванню Маніфеста (*Курлоўскі расстрэл*). Сутычкі з паліцыяй адбываліся і ў іншых гарадах Беларусі. У кастрычніку 1905 г. рэвалюцыйны рух пашырыўся на 53 гарады і мястэчкі Беларусі.

Каб спыніць рост рэвалюцыйнага руху, царскі ўрад выкарыс-

тоўваў як прымус (*армію і паліцыю*), так і эканамічныя (*сталыпінская аграрная рэформа 1906 г.*), і палітычныя агітацыі (*выбары ў Дзяржаўную думу*).

***I Дзяржаўная дума*** (*27.04–09.07.1906 г.*). Сацыял-дэмакратычныя арганізацыі байкатавалі выбары, і большасць месцаў у Думе атрымалі кадэты. У ёй былі прадстаўлены і дэпутаты з 5 беларускіх губерняў. Найбольш актыўнай пазіцыі ў I Дзяржаўнай думе прытрымліваліся беларускія памешчыкі-каталікі ***Р. Скірмунт***, ***І. Друцкі-Любецкі*** і інш., якія патрабавалі прадастаўлення Беларусі і Літве шырокага абласнога самакіравання з правам вырашэння аграрнага пытання. Менавіта аграрнае пытанне стала асноўным у Думе. Пэўная радыкальнасць I Дзяржаўнай думы прывяла да яе роспуску царскім указам ад 9 ліпеня 1906 г.

***II Дзяржаўная дума*** (*20.02.–02.06.1907 г.*) дзейнічала ў 1907 г. ва ўмовах спаду рэвалюцыі, таму ўсе партыі прынялі актыўны ўдзел у выбарах. У Беларусі ў гэты перыяд выразна вызначылася барацьба дзвюх асноўных палітычных сіл: з аднаго боку, *Рускага акраіннага саюза* (саюза акцябрыстаў і чарнасоценцаў), які разгарнуў антыпольскую і антыяўрэйскую агітацыю, з другога – так званых *аўтанамістаў* – польска-беларускіх памешчыкаў і ксяндзоў, якія праз касцёл і друк даказвалі беларускім сялянам-каталікам, што яны палякі і павінны выбіраць у Думу тых, хто абараняе каталіцкую веру. Галоўным пытаннем у Думе па-ранейшаму заставалася аграрнае.

***Вынікі рэвалюцыі.*** Па свайму характару рэвалюцыя 1905–1907 гг. была *буржуазна-дэмакратычнай* – за ўсталяванне рэспублікі і дэмакратычных свабодаў, але скончылася паражэннем. Стомленасць і расчараванне народных мас працяглай барацьбой і яе вынікамі прывялі да спаду рэвалюцыйнага руху, што падштурхнула царскі ўрад да рашучых дзеянняў. 3 чэрвеня 1907 г. Мікалай II распусціў II Дзяржаўную думу і ўвёў новы выбарчы закон, па якому Дзяржаўная дума пазбаўлялася заканадаўчых паўнамоцтваў. Фактычна ў выніку так званага «*трэцячэрвеньскага дзяржаўнага перавароту*» ў Расіі адбылася рэстаўрацыя самадзяржаўя.

***2. Сельская гаспадарка і прамысловасць Беларусі ў пачатку XX ст. Сталыпінская аграрная рэформа.*** Як ужо адзначалася, асноўным пытаннем рэвалюцыі 1905–1907 гг. было аграрнае. Удзел шырокіх сялянскіх мас у рэвалюцыйных падзеях падштурхнуў царскі ўрад да свядомай ліквідацыі некаторых феадальных перажыткаў шляхам рэформ. Ініцыятарам і кіраўніком аграрнай рэформы быў старшыня Савета Міністраў і міністр унутраных спраў Расіі ***П. А. Сталыпін***.

***Мэты рэформы***:

• адцягнуць сялян ад удзелу ў рэвалюцыі;

• павялічыць сярэдні слой сялянства і ўмацаваць слой сялянскай буржуазіі, якія створаць апору царскаму самадзяржаўю на вёсцы;

• даць магчымасць малазямельным і беззямельным сялянам выйсці на працу ў горад і павялічыць колькасць прамысловых рабочых;

• падтрымаць паскоранае развіццё капіталізму ў вёсцы пры захаванні памешчыцкіх латыфундый.

Сталыпінская аграрная рэформа пачалася ў адпаведнасці з царскім указам ад 9 лістапада 1906 г. ***Асноўнымі мерапрыемствамі*** рэформы былі наступныя:

1) *ліквідацыя сялянскай абшчыны* шляхам ускладвання абавязкаў па выплаце падаткаў і адбыванні павіннасцяў на кожную сялянскую гаспадарку. На тэрыторыі Беларусі гэта было асабліва актуальна для Магілёўскай і Віцебскай губерняў, дзе пераважала абшчыннае сялянскае землекарыстанне;

2) *адмена выкупных плацяжоў*. З 1 студзеня 1907 г. сяляне станавіліся поўнымі ўласнікамі сваіх надзелаў;

3) *ліквідацыя цераспалосіцы і хутарызацыя*. Узамен палосак зямлі *(«шнуроў»)*, якія сяляне атрымалі ў розных месцах паводле рэформы 1861 г., кожны селянін меў права патрабаваць выдзялення яму замест гэтых участкаў адзінага надзела ў адным месцы. Такі надзел атрымаў назву «*водруб*». Пры перасяленні сялянскай сям'і з вёскі на водруб гэты надзел называўся *хутар*;

4) *прапаганда хутарызацыі.* Каб паказаць сялянству перавагу хутарскога спосабу вядзення гаспадаркі, дзяржава стварала

паказальныя хутары, якія забяспечваліся сартавым насеннем, пародзістай жывёлай, мінеральнымі ўгнаеннямі, удасканаленым інвентаром і інш.;

5) *арганізацыя масавага перасялення ў Сібір, Сярэднюю Азію і на Далёкі Ўсход.* Гэтае мерапрыемства праводзілася ўрадам з мэтай змяншэння вастрыні зямельнага пытання ў еўрапейскай частцы Расіі. Каб заахвоціць сялян да пераезду, дзяржава выдзяляла сродкі на пераезд, забяспечвала спецыяльнымі цягнікамі, а таксама давала беззваротную грашовую дапамогу;

6) *стварэнне Сялянскага пазямельнага банка,* які выдаваў сялянам крэдыты на куплю зямлі, прычым для набыцця вялікіх участкаў пад хутары выдаваўся доўгатэрміновы крэдыт у поўным памеры іх кошту.

***Вынікі рэформы.*** Сталыпінская аграрная рэформа садзейнічала паскарэнню развіцця капіталізму ў вёсцы:

• ліквідацыя сельскай абшчыны і выкупных плацяжоў, перадача зямлі ва ўласнасць сялян і перасяленне на хутары спрыялі інтэнсіфікацыі сялянскай гаспадаркі. Пашыраліся шматпольныя севазвароты, паглыблялася спецыялізацыя сельскай гаспадаркі Беларусі ў кірунку малочнай жывёлагадоўлі і вінакурэння, выкарыстоўваліся мадэрнізаваныя прылады працы і сельскагаспадарчыя машыны;



*П. А. Сталыпін.*

• адбываўся працэс дыферэнцыяцыі сялянства. З аднаго боку, павялічылася колькасць сялян-прадпрымальнікаў, якія бралі крэдыты, набывалі зямлю і стваралі гаспадаркі фермерскага тыпу. З другога боку, узрасла лічба сялян-беднякоў, якія не здолелі наладзіць гаспадарку, вымушаны былі прадаць сваю зямлю і наймаліся на працу ў якасці парабкаў або папоўнілі шэрагі прамысловага пралетарыя-

ту. Напярэдадні Першай сусветнай вайны сялянская бедната ў Беларусі складала каля 70%, сяляне-серадняні – 20%, а сельская буржуазія – каля 11%;

• асаблівасцю рэформы на тэрыторыі Беларусі было ўвядзенне ў 1911 г. выбарных органаў мясцовага самакіравання – *земстваў*. Земствы былі ўтвораны толькі ў Магілёўскай, Віцебскай і Мінскай губернях. З прычыны значнай перавагі сярод выбаршчыкаў католікаў у Гродзенскай і Віленскай губернях земствы па-ранейшаму не былі дазволены.

Разам з тым у самой рэформе былі закладзены некаторыя палажэнні, якія пэўным чынам стрымлівалі яе вынікі. Па-першае, паскарэнне развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы П. А. Сталыпін хацеў правесці без разбурэння асноў латыфундыяльнага памешчыцкага землеўладання – аднаго з асноўных перажыткаў феадалізму. Па-другое, працэс хутарызацыі быў не вельмі эфектыўным з прычыны беднасці і непісьменнасці большасці сялян, якія прывыклі да сваіх «шнуравых» надзелаў і баяліся высяляцца на хутары (да 1914 г. на тэрыторыі Беларусі было хутарызавана каля 13% сялянскіх гаспадарак). Да таго ж, перасяленне сялян у Сібір, Казахстан і на Далёкі Ўсход не палепшыла іх становішча: часта дзяржаўнай фінансавай дапамогі было недастаткова, землі адводзіліся неўрадлівыя, у нязручных месцах (далёка ад дарог і вадаёмаў), сяляне не маглі прыстасавацца да новых прыродных умоваў і інш.

Такім чынам, нягледзячы на пэўныя станоўчыя вынікі сталыпінскай рэформы, яна не вырашыла галоўнага пытання рэвалюцыі 1905–1907 гг. – аграрнага, і ператварэнні ў вёсцы да Першай сусветнай вайны адбываліся на фоне росту сялянскіх хваляванняў.

***Прамысловасць***. Пасля эканамічнага крызісу 1900–1904 гг. і перыяду дэпрэсіі (застою) 1904–1907 гг. наступіў прамысловы ўздым. У 1908–1913 гг. у Расійскай імперыі і Беларусі ў яе складзе адбываўся працэс паскоранай мадэрнізацыі, і эканоміка набывала тэндэнцыю стабільнага росту. Прамысловасць Беларусі гэтага часу характарызавалася шэрагам адметных рысаў:

• *канцэнтрацыя вытворчасці і стварэнне манапалістычных аб'яднанняў* сталі магчымымі дзякуючы аб'яднанню капіталу (як мясцовага, так і замежнага) у форме *акцыянерных таварыстваў* і *сіндыкатаў*, а таксама дзякуючы павелічэнню рынку таннай рабочай сілы ў выніку сталыпінскай аграрнай рэформы. У 1909–1910 гг. былі арганізаваны Акцыянерныя таварыствы запалкавых фабрык, Мазырскай фанернай фабрыкі, Дняпроўскай мануфактуры, тытунёвай фабрыкі ў Гродне, ільнопрадзільнай фабрыкі «Дзвіна» ў Віцебску і інш.;

• *рост галіновай разнастайнасці мясцовай прамысловасці*. Па-ранейшаму вядучае месца на тэрыторыі Беларусі займала харчовая прамысловасць. Разам з тым вялікую ролю адыгрывалі дрэваапрацоўчая і тэкстыльная галіны прамысловасці;

• *вялікая ўдзельная вага рамеснай вытворчасці.* У Беларусі існавалі каля 90 тыс. рамесных майстэрняў, у якіх працавалі гаспадар і адзін-два рабочыя. Дробная і рамесная вытворчасць давалі больш за палову прамысловых вырабаў на ўнутраны рынак Беларусі і карысталіся вялікім попытам вяскоўцаў з прычыны таннасці тавараў;

• *развіццё банкаўскай сістэмы.* На пачатку XX ст. прамысловасць у Беларусі фінансавалі *банкаўскія канторы* і *таварыствы ўзаемнага крэдыту*. Найбольш значнымі былі канторы наступных банкаў: Дзяржаўнага, Азоўска-Данскога, Маскоўскага, Віленскага прыватнага камерцыйнага і інш.;

• *у нацыянальным складзе* сярод рабочага класа Беларусі выразна пераважалі яўрэі, што было наўпрост звязана з наяўнасцю на гэтых землях «мяжы яўрэйскай аселасці».

Па-ранейшаму ў межах Расійскай імперыі беларускія землі заставаліся аграрнай ускраінай, а прамысловая вытворчасць складала толькі каля 20% нацыянальнага даходу.

**3. *Беларускі нацыянальна-вызваленчы і культурны рух у пачатку XX ст.*** Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух у пачатку XX ст. быў часткай агульнага рэвалюцыйнага руху ў Расійскай імперыі. Арганізатарам, а таксама ідэйным і палітычным натхняльнікам яго была *Беларуская сацыялістычная грамада.* Яна ставіла

сваёй мэтай нацыянальнае адраджэнне народа, яго мовы і культуры, даказвала права беларусаў на самавызначэнне і на ўласную дзяржаўнасць. Абуджэнню нацыянальнай самасвядомасці садзейнічалі шматлікія публікацыі, прысвечаныя беларускай мове, культуры, гісторыі.

Рэвалюцыйныя падзеі 1905 г. і ўвядзенне Маніфестам ад 17 кастрычніка дэмакратычных правоў і свабод адмянілі на тэрыторыі Беларусі папярэднюю цэнзуру і стварылі магчымасці для заснавання нацыянальных выдавецтваў. Першае беларускае легальнае выдавецкае таварыства было створана ў Пецярбургу ў 1906 г. і мела назву «*Загляне сонца і ў наша аконца*».

У верасні 1906 г. актывісты БСГ пачалі выдаваць у Вільні штотыднёвую грамадска-палітычную і літаратурную беларускую газету «*Наша доля*». Радыкальныя рэвалюцыйныя погляды, якія прапагандаваліся на старонках гэтай газеты, палохалі царскія ўлады, таму чатыры з шасці яе нумароў былі канфіскаваныя, а далейшы выпуск газеты забаронены. Аднак у лістападзе 1906 г. у свет выйшаў першы нумар новай газеты «*Наша ніва*». Менавіта ёй належыць вялікая роля ў згуртаванні ўсіх нацыянальных сіл, якія на пачатку XX ст. змагаліся за нацыянальнае адраджэнне Беларусі. На


Год VI. № 1.

НАША НІВА

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА З РЫСУНКАМІ

Выходзіць што тыдзень рускімі і лацінскімі літэрамі.

Адрес рэдакції і адміністрації: Вільня, Віленская вуліца, д. № 20

Хто не здалее адзін плаціць за „Нашу Ніву“, хай знойдзе яшчэ колькі людзей і выпішэ газэту хаўрусам.

Хто спагадае справе адраджэньня нашаго народу, нехай падтрымае нашу працу і падпішыцца на „Нашу Ніву“.

VI год выданьня Прыймаецца падпіска год выданьня VI

НА 1911 ГОД

НА ЕДЗІНУЮ БЕЛАРУСКУЮ ГАЗЭТУ

„НАША НІВА“



старонках газеты друкаваліся творы Максіма Багдановіча, Максіма Гарэцкага, Змітрака Бядулі, Цішкі Гартнага, Уладзіслава Галубка і шэрагу іншых беларускіх пісьменнікаў. Пры газеце існавала выдавецтва, якое з 1910 г. наладзіла выпуск папулярнага сярод вяскоўцаў «*Беларускага календара*», з 1912 г. – сатырычнага часопіса «*Крапіва*», сельскагаспадарчага часопіса «*Саха*», літаратурнага штомесячніка для моладзі «*Лучынка*» і інш.

Беларускія выдавецтвы існавалі таксама і ў Мінску. У 1910 г. у Вільні выйшла кніга ***Вацлава Ластоўскага*** «*Кароткая гісторыя Беларусі*», якая паклала пачатак афармленню нацыянальнай канцэпцыі беларускай гісторыі. Усяго за 1906–1915 гг. было выдадзена каля 160 беларускіх кніг.

Нягледзячы на пэўныя поспехі і дасягненні, у нацыянальным руху Беларусі меліся аб'ектыўныя цяжкасці. Яны былі выкліканы тым, што, па-першае, доўгі час у Расійскай імперыі не было ўмоваў для развіцця беларускай мовы. Па-другое, беларуская інтэлігенцыя, як правіла, складалася з выхадцаў з вёскі і была інтэлігенцыяй першага пакалення. Па нацыянальнаму складу беларусамі былі пераважна сяляне, якія з прычыны сваёй неадукаванасці не маглі адстойваць нацыянальную ідэю. Не было зваротнай сувязі паміж нацыянальна арыентаванай інтэлігенцыяй і сялянствам. Адмоўным момантам на шляху нацыянальнага развіцця з'яўляўся таксама той факт, што генератарам нацыянальнай ідэі не мог стаць горад, паколькі сярод яго жыхароў на пачатку XX ст. беларусы складалі толькі каля 17%.

Разам з тым першае дзесяцігоддзе XX ст. яскрава сведчыла, што насуперак розным перашкодам адбывалася згуртаванне беларускіх нацыянальных сіл. За вялікую ролю, якую ў нацыянальна-вызваленчым і культурна-асветніцкім руху ў Беларусі адыграла газета «Наша ніва», перыяд 1906–1915 гг. у беларускай гісторыі атрымаў назву «*нашаніўскага*».

**4.** ***Беларусь у гады Першай сусветнай вайны***. Першая сусветная вайна (01.08.1914–11.11.1918 гг.) стала вынікам абвастрэння супярэчнасцяў паміж вядучымі еўрапейскімі дзяржавамі за перадзел

сфер уплыву, за рынкі збыту і крыніцы сыравіны. Асноўныя ваенныя сапернікі былі аб'яднаныя ў два ваенна-палітычныя блокі: *Антанту* (Англія, Францыя, Расія) і *Траісты саюз* (Германія, Аўстра-Венгрыя, Італія), усяго ў вайну было ўцягнута 38 краін.

Вайна пачалася 1 жніўня 1914 г., а непасрэдна да тэрыторыі Беларусі фронт наблізіўся летам 1915 г. Аднак ужо ў першыя дні вайны беларускае насельніцтва выразна адчувала яе подых: беларускія губерні былі абвешчаны на *ваенным становішчы.* Забараняліся дзейнасць палітычных партый, правядзенне мітынгаў, маніфестацый, шэсцяў, забастовак, уводзілася цэнзура пры выданні газет і кніг. На тэрыторыі Беларусі была праведзена мабілізацыя – у армію было прызвана больш за палову працаздольных мужчын, на насельніцтва былі ўскладзены павялічаныя падаткі, людзі прыцягваліся да будаўніцтва абарончых умацаванняў. У Баранавічах размяшчалася *Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандавання* расійскай арміі.

У жніўні 1915 г. пачалося нямецкае наступленне ў накірунку Коўна – Вільня, а на пачатку верасня нямецкая армія прарвала фронт у раёне в. Свянцяны (сёння знаходзіцца на тэрыторыі Літоўскай Рэспублікі) і дайшла да Смалявіч (*Свянцянскі прарыў*). Восен-



*Першая сусветная вайна. Беларусь.*

ню 1915 г. лінія фронту стабілізавалася ў раёне гарадоў Дзвінск – Паставы – Смаргонь – Баранавічы – Пінск. Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандавання была перанесена ў Магілёў.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі быў усталяваны германскі *акупацыйны рэжым*. Ён быў заснаваны на жорсткай сістэме падаткаў, прымусовых работ, штрафаў, рэквізіцыяў. У Германію вывозіліся матэрыяльныя каштоўнасці і працаздольнае насельніцтва. Пры гэтым нямецкае камандаванне рабіла пэўныя крокі па падтрымцы беларускага нацыянальнага руху. Праўда, у гэтай палітыцы Германія зыходзіла не з інтарэсаў беларускага народа, а са сваіх геапалітычных інтарэсаў – не прызнаючы права беларускага народа на самавызначэнне, разам з тым нямецкі ўрад хацеў паменшыць расійскі ўплыў на гэтых тэрыторыях за кошт падтрымкі адукацыі і культуры іншых нацыянальнасцяў, у першую чаргу беларусаў. У адпаведнасці з распараджэннем генерал-фельдмаршала Паўля фон Гіндэнбурга ад 16 студзеня 1916 г. на акупаванай тэрыторыі забаранялася навучанне па-руску і ўводзілася абавязковае навучанне дзяцей на роднай мове. У выніку на тэрыторыі Заходняй Беларусі было адкрыта каля 300 беларускіх школ, пачалося выдан-



*Першая сусветная вайна. Беларусь.*

не газет і часопісаў на беларускай мове, ствараліся розныя нацыянальныя арганізацыі. Са згоды нямецкага ваеннага камандавання ў Вільні ў 1915 г. быў створаны каардынацыйны орган беларускіх палітычных, грамадскіх і прафесійных арганізацый – *Беларускі народны камітэт*, які ўзначаліў А. Луцкевіч. Сябры гэтай арганізацыі прытрымліваліся канцэпцыі стварэння Беларуска-Літоўскай дзяржавы з унутраным размежаваннем аўтаноміяў. З гэтай ідэяй дзеячы Беларускага народнага камітэта выступалі ў 1916 г. на Стакгольмскай і Лазанскай канферэнцыях народаў Расіі. Таксама пытанне незалежнасці Беларусі ўздымалася на старонках газеты «Гоман», галоўным рэдактарам якой быў В. Ластоўскі. Акрамя таго, у перыяд акупацыі ў Вільні дзейнічаў *Беларускі клуб*, пры якім існаваў аматарскі тэатр, было створана навуковае таварыства, адчынілася беларуская бібліятэка і інш.

На той тэрыторыі Беларусі, якая знаходзілася на ўсход ад лініі фронту, па-ранейшаму існаваў рэжым ваеннага становішча, працягваліся мабілізацыя, рэквізіцыі. Сітуацыя ўскладнялася тым, што адступленне расійскай арміі суправаджалася масавым бежанствам. Часткова яно было справакавана агітацыйнай палітыкай



*Першая сусветная вайна. Беларусь.*

царскага ўрада, якi заклiкаў насельнiцтва ратавацца ўцёкамi ад нямецкага гвалту, а часткова перасяленні мелі вымушаны характар, калі пры адступленні войскі спальвалі вёскі і сяляне гублялі дах над галавой. Летам 1915 г. у Мінску было створана *Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны*, якое арганізоўвала для бежанцаў начлегі, харчаванне і дапамагала ў працаўладкаванні. Але дапамагчы ўсім не было магчымасці, бежанцаў было вельмі многа. Ваенныя ўлады выкарыстоўвалі іх як танную рабочую сілу на будаўніцтве абарончых умацаванняў і іншых ваенных аб'ектаў, але большасць вымушана была ў пошуках лепшай долі накіроўвацца далей на ўсход.

Першая сусветная вайна прынесла шмат гора беларускаму народу – Расія і Германія аспрэчвалі права гегемоніі ў Еўропе менавіта на тэрыторыі Беларусі. Ваенныя дзеянні, татальная мабілізацыя, рэквізіцыі, акупацыйны рэжым і інш. падрывалі гаспадарчы, дэмаграфічны, нацыянальны патэнцыял нашай краіны: загінулі 1 мільён 200 тыс. чалавек, сотні тысяч беларусаў не вярнуліся з эвакуацыі, амаль на 75% скараціліся пасяўныя плошчы, былі разбураны прамысловыя прадпрыемствы і іншыя будынкі.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Акупацыйны рэжым*** – сістэма эканамічных, палітычных, ваенных, ідэалагічных мерапрыемстваў, накіраваных на ліквідацыю існуючага грамадскага і дзяржаўнага ладу, рабаванне нацыянальных багаццяў і рэсурсаў, зняволенне насельніцтва.

***Акцыянернае таварыства*** – форма арганізацыі гаспадарчай дзейнасці прадпрыемстваў, пры якой капітал утвараўся з грашовых укладаў шэрагу прадпрымальнікаў і існаваў у форме акцый, якія свабодна прадаваліся і купляліся.

***Анексія*** – далучэнне з дапамогай сілы адной дзяржавай усёй тэрыторыі або часткі другой дзяржавы.

***Ваеннае становішча*** – спецыяльны прававы рэжым, які ўводзіцца дзяржавай у надзвычайных абставінах і выяўляецца ў пашырэнні паўнамоцтваў ваенных улад і ўвядзенні абмежаванняў для насельніцтва.

***Водруб*** – адасоблены надзел, вылучаны з сельскага абшчыннага землекарыстання ў асабістую ўласнасць сялянскай сям'і паводле сталыпінскай аграрнай рэформы.

***Кантрыбуцыя*** – грошы або матэрыяльныя каштоўнасці, якія дзяржавы-пераможцы спаганяюць з краін, што пацярпелі паражэнне.

***Манаполія*** – прадпрыемства або саюз прадпрыемстваў, якія кантралююць выпуск і продаж тавараў у адной галіне прамысловасці ці сельскай гаспадарцы.

***Рэвалюцыйная сітуацыя*** – сітуацыя ў краіне, пры якой магчыма рэвалюцыя.

***Сіндыкат*** – форма аб'яднання прадпрымальнікаў для рэгулявання аб'ёмаў вытворчасці і адзіных коштаў на прадукцыю.

***Хутарызацыя*** – аграрная палітыка падчас сталыпінскай рэформы, накіраваная на стварэнне аднадворных сельскіх паселішчаў – хутароў.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***1905–1907 гг.*** – першая расійская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя.

***9 студзеня 1905 г.*** – «крывавая нядзеля» ў г. Петраградзе, расстрэл шматтысячнага мірнага шэсця працоўных, якія збіраліся перадаць петыцыю імператару Мікалаю II.

***6 жніўня 1905 г.*** – Маніфест цара Мікалая II аб скліканні *законадарадчай* Дзяржаўнай думы (Булыгінская дума).

***17 кастрычніка 1905 г.*** – Маніфест цара Мікалая II аб стварэнні парламента – *Дзяржаўнай думы з заканадаўчымі паўнамоцтвамі*, правам удзелу ў выбарах усіх слаёў насельніцтва. Былі ўведзены палітычныя свабоды – свабода слова, сходаў, друку, саюзаў.

***18 кастрычніка 1905 г.*** – Курлоўскі расстрэл на вакзальнай плошчы ў г. Мінску 20-тысячнага мітынгу працоўных. Загінула 100 чалавек. Названы па імені тагачаснага мінскага губернатара П. Р. Курлова.

***24 красавіка – 8 ліпеня 1906 г.*** – дзейнасць I Дзяржаўнай думы.

***18 мая 1906 г.*** – заснаванне ў г. Пецярбургу беларускай выдавецкай суполкі «Загляне сонца і ў наша ваконца».

***9 лістапада 1906 г.*** – указ цара Мікалая II аб праве выхаду сялян з абшчыны і замацаванні зямлі ў асабістую ўласнасць сялян, *пачатак сталыпінскай аграрнай рэформы*.

***10 лістапада 1906 – 7 жніўня 1915 гг.*** – выданне газеты «Наша ніва», «нашаніўскі перыяд» беларускай гісторыі. Газета да 1912 г. друкавалася кірыліцай і лацінкай, пазней – толькі кірыліцай.

***20 лютага – 2 чэрвеня 1907 г.*** – дзейнасць II Дзяржаўнай думы.

***3 чэрвеня 1907 г.*** – завяршэнне першай расійскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, 3-чэрвеньскі дзяржаўны пераварот.

***1914–1918 гг.*** – Першая сусветная вайна.

***1915 г.*** – утварэнне ў Вільні дабрачыннага Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны на чале з Антонам і Іванам Луцкевічамі і Вацлавам Ластоўскім.

***1915 г.*** – утварэнне ў Вільні Беларускага народнага камітэта (БНК).

***Кастрычнік 1915 г.*** – фронт стабілізаваўся па лініі Дзвінск–Смаргонь–Паставы–Баранавічы–Пінск.

***Красавік і чэрвень 1916 г.*** – выступленне беларускай дэлегацыі на міжнародных канферэнцыях у г. Стакгольме і г. Лазане з ідэяй стварэння Злучаных штатаў Беларусі, Літвы, Латвіі і Украіны.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Белявина В. Н.* Беларусь в годы Первой мировой войны. – Минск, 2013.
2. *Весялкоўскі Ю.* Беларусь у Першай Сусьветнай вайне (Гістарычны нарыс). – Беласток-Лёндан, 1996.
3. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.). – Мінск, 2005. – С. 301–486.
4. *Мірановіч Я.* Найноўшая гісторыя Беларусі. – СПб., 2003.
5. *Смольянинов М. М.* Беларусь в Первой мировой войне 1914–1918 гг. – Минск, 2014.
6. *Шабуня К. И.* Аграрный вопрос и крестьянское движение в революции 1905–1907 гг. – Минск, 1960.
7. *Шыбека З.* Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002). – Мінск, 2003.

# РАЗДЗЕЛ 7.
# БЕЛАРУСЬ У 1917–1920 ГГ.
# УТВАРЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

1. *Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя і Беларусь.*
2. *Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. і беларускі нацыянальны рух.*
3. *Брэсцкі мір. Абвяшчэнне БНР.*
4. *Утварэнне БССР і ЛітБел ССР.*
5. *Палітыка «ваеннага камунізму».*
6. *Беларусь у перыяд савецка-польскай вайны 1919–1920 гг. Другое абвяшчэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ).*

**1. *Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя і Беларусь.*** Урады практычна ўсіх краін, якія ўдзельнічалі ў Першай сусветнай вайне, спадзяваліся, што яна будзе мець «маланкавы» характар і былі не гатовымі да працяглых ваенных дзеянняў. Таму да пачатку 1917 г. у многіх краінах, што ваявалі, склаліся агульнанацыянальныя крызісы, якія ахапілі практычна ўсе сферы жыцця грамадства – эканамічную, ваенную, палітычную, культурную, сацыяльную.

Велізарныя людскія, матэрыяльныя і маральныя страты, якія цярпела насельніцтва Расійскай імперыі на працягу трох год вайны выклікалі моцныя антыўрадавыя і антываенныя настроі.

23 лютага 1917 г. з забастоўкі работніц тэкстыльных прадпрыемстваў у Петраградзе пачалася рэвалюцыя ў Расійскай імперыі, у выніку якой было звергнутае царскае самадзяржаўе. Расія была абвешчана дэмакратычнай рэспублікай. Як і рэвалюцыя 1905–1907 гг., Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. мела буржуазна-дэмакратычны характар. Асаблівасцю яе стала ўсталяванне *двоеўладдзя*: з аднаго боку, падчас рэвалюцыйных падзей рэальная ўлада знаходзілася ў руках *Петраградскага савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў*,

з другога боку, 28 лютага *Часовы камітэт Дзяржаўнай думы,* створаны з удзелам дэпутатаў Дзяржаўнай думы і кіраўнікоў Петраградскага Савета, абвясціў пераход да яго ўсёй улады ў краіне і стаў называцца *Часовым урадам*.

Насельніцтва Беларусі сустрэла звесткі аб перамозе рэвалюцыі ў Петраградзе масавымі мітынгамі і вулічнымі шэсцямі. У Беларусі таксама ўзнікла двоеўладдзе: саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў і падначаленыя Часоваму ўраду *Часовыя грамадскія камітэты парадку*.

З наданнем усім грамадзянам роўных правоў і свабодаў узнікла магчымасць вырашэння наспелых грамадскіх і эканамічных праблем мірным, рэфармісцкім шляхам. Аптымістычнай падставай таму з'яўлялася шырокая падтрымка Часовага ўрада і яго палітыкі і ўзрослая актыўнасць усіх пластоў насельніцтва ў галіне абароны сваіх інтарэсаў. Важна адзначыць, што нідзе па краіне, у тым ліку на тэрыторыі Беларусі, не назіралася актыўнасці прыхільнікаў манархіі. Пасля адрачэння Раманавых ад трона вышэйшае ваеннае камандаванне, а таксама афіцэры і салдаты вызваляліся ад дадзенай цару прысягі і пакляліся ў вернасці Часоваму ўраду.

Такім чынам, усе ўзброеныя сілы, у тым ліку паўтарамільённы Заходні фронт, размешчаны ў Беларусі, зрабіліся рэальнай апорай новых органаў улады, якія толькі пачалі фарміравацца. На пераходным этапе іх функцыі ўскладаліся на гарадскія і местачковыя грамадскія камітэты парадку, створаныя на базе мясцовага самакіравання і прадстаўнікоў ад усіх пластоў насельніцтва і арганізацый.

У мэтах згуртавання вайскоўцаў і працоўных для падтрымання парадку і прадухілення контррэвалюцыі ў гарадах і мястэчках сталі ўтварацца Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў. У сакавіку 1917 г. у ліку першых яны ўзніклі ў Мінску, Гомелі, Бабруйску, Оршы, Віцебску. Крыху пазней, у красавіку-маі сталі фарміравацца Саветы сялянскіх дэпутатаў. Паступова Саветы сталі самымі масавымі грамадска-палітычнымі арганізацыямі, якія не толькі змагаліся за інтарэсы працоўных і салдат, але і дапамагалі органам Часовага ўрада.

Усе палітычныя партыі, акрамя бальшавікоў, напачатку падтрымлівалі Часовы ўрад. У. І. Ленін выказаўся за недавер Часоваму

ўраду як «буржуазна-памешчыцкаму» і вылучыў лозунг «Уся ўлада саветам!». Становішча Часовага ўрада яшчэ больш пагоршылася пасля няўдалага наступлення рускіх войск на Паўднёва-Заходнім фронце летам 1917 г. Пачаліся хваляванні, а 3–4 ліпеня часці Петраградскага гарнізона, якія знаходзіліся пад уплывам бальшавікоў і анархістаў, здзейснілі спробу звяржэння Часовага ўрада. У адказ з мэтай умацавання дысцыпліны на фронце ўрад А. Керанскага ўвёў пакаранне смерцю і забараніў антыўрадавую агітацыю.

Палітычная напружанасць у краіне ўзрасла яшчэ больш, калі стала вядома аб накіраванні ў жніўні 1917 г. вярхоўным галоўнакамандуючым генералам Л. Г. Карнілавым казацкіх і іншых часцей у Петраград для замены войск бальшавізаванага гарнізона. Аднак спроба Карнілава здзейсніць дзяржаўны пераварот і ўсталяваць ваенную дыктатуру не атрымала падтрымкі, і мяцеж быў падаўлены.

У ліку важнейшых наступстваў гэтага канфлікту было і тое, што колькасць прыхільнікаў кааліцыі з буржуазіяй рэзка зменшылася, ідэя ваеннага шляху ў дасягненні міру была канчаткова адкінутая. Адначасова аўтарытэт бальшавікоў як змагароў за неадкладнае спыненне вайны і прыхільнікаў перадачы ўсёй улады Саветам істотна ўзрос.

***Актывізацыя беларускага руху.*** Лютаўская рэвалюцыя абудзіла палітычную актыўнасць шырокіх мас насельніцтва і палітычных партый. Аднавіла сваю дзейнасць і БСГ. 25 сакавіка 1917 г. у Мінску адбыўся з’езд прадстаўнікоў беларускіх нацыянальных арганізацый. З’езд абраў *Беларускі нацыянальны камітэт* (БНК) на чале з **Раманам Скірмунтам.** Р. Скірмунту была пастаўлена задача дабівацца ад Часовага ўрада аўтаноміі Беларусі ў складзе дэмакратычнай Расіі. Аднак Часовы ўрад не падтрымаў аўтанамісцкіх захадаў БНК, матывуючы гэта складанасцю ваеннага часу, акупацы-



*Раман Скірмунт.*

яй часткі тэрыторыі Беларусі нямецкімі войскамі і неабходнасцю склікання *Ўстаноўчага сходу* для вырашэння гэтага пытання. Нягледзячы на тое, што спадзяванні на атрыманне аўтаноміі не спраўдзіліся, Беларуская сацыялістычная грамада падтрымлівала Часовы ўрад з надзеяй на перспектыву. Яна падзяляла ідэю вядзення вайны да перамогі, за мір без *анексій* і *кантрыбуцый*, паколькі толькі ў такім выпадку можна было захаваць цэласнасць Беларусі. 8–10 ліпеня 1917 г. у Мінску адбыўся II з'езд беларускіх нацыянальных арганізацый, на якім была абрана *Цэнтральная рада* беларускіх арганізацый на чале з **Язэпам Лёсікам** (пазней, пасля далучэння да яе *Беларускай вайсковай Рады*, была перайменаваная ў *Вялікую Беларускую Раду – ВБР*).

Разам з тым асноўныя пытанні рэвалюцыі – аб міры, аб зямлі, аб увядзенні рабочага заканадаўства, аб скліканні Ўстаноўчага сходу не былі вырашаныя Часовым урадам. Такім чынам, палітыка Часовага ўрада не ліквідавала агульнадзяржаўны крызіс, а яшчэ больш абвастрыла яго, што ў выніку прывяло да яшчэ адной рэвалюцыі.

***2. Кастрычніцкая рэвалюцыя і беларускі нацыянальны рух.*** ***У*** ноч на 25 кастрычніка 1917 г. у Петраградзе адбылося ўзброенае паўстанне, у выніку якога ўладу ў свае рукі ўзялі бальшавікі. 26 кастрычніка на II Усерасійскім з'ездзе Саветаў былі прыняты «*Дэкрэт аб міры*», у якім прапаноўвалася неабходнасць неадкладных перагавораў з ваюючымі краінамі для заключэння міру без анексій і кантрыбуцый, і «*Дэкрэт аб зямлі*», які абвясціў ліквідацыю прыватнай уласнасці і нацыяналізацыю зямлі.

Атрымаўшы паведамленне аб перамозе рэвалюцыі ў Петраградзе, 25 кастрычніка Мінскі Савет абвясціў сябе ўладай у Беларусі. Але процідзеянне яму аказаў *Камітэт ратавання рэвалюцыі* на чале з меншавіком Т. Калатухіным. Супраціўленне бальшавікам было аказана і ў Магілёве, дзе знаходзілася Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандавання. У кастрычніку-лістападзе 1917 г. савецкая ўлада перамагла ў Віцебску, Гомелі, Полацку. Адносна лёгкая перамога бальшавікоў тлумачыцца тым, што стомленае вайной

насельніцтва чакала, што з прыходам гэтай партыі да ўлады будуць вырашаны многія набалелыя пытанні.

У лістападзе 1917 г. у Беларусі былі сфарміраваны органы савецкай улады: заканадаўчы – *Аблвыкамзах* (Абласны выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і фронту) на чале з **М. Рагазінскім**, выканаўчы – *Саўнаркам* (Савет Народных Камісараў) на чале з **К. Ландэрам** і кіраўнічая структура бальшавісцкіх арганізацый – Паўночна-Заходні абласны камітэт РСДРП(б) на чале з **А. Мясніковым**. Вялікая Беларуская Рада не прызнала гэтых органаў улады, створаных на тэрыторыі Беларусі недэмакратычным шляхам.

У адпаведнасці з выдадзенай бальшавікамі 2 лістапада 1917 г. «*Дэкларацыяй правоў народаў Расіі*», дзе абвяшчалася права кожнага народа на самавызначэнне, ВБР пачала актыўную працу па скліканні І *Усебеларускага з'езда* для вырашэння пытання беларускай дзяржаўнасці. З'езд праходзіў у Мінску з **7 па 17 снежня 1917 г.** У яго рабоце прынялі ўдзел 1872 дэлегаты, якія прадстаўлялі ўсе колы беларускага грамадства, розныя палітычныя арганізацыі з Віленскай, Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай і Смаленскай губерняў. У ноч з 17 на 18 снежня 1917 г. удзельнікі з'езда прынялі рэзалюцыю, у якой абвяшчаліся ўсталяванне на тэрыторыі Беларусі рэспубліканскага ладу і ўтварэнне Ўсебеларускай Рады сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў. Дэлегаты выказаліся за аўтаномію Беларусі ў складзе Савецкай Расіі. Але гэта не ўваходзіла ў планы бальшавікоў, і па рашэнню Аблвыкамзаха з'езд быў разагнаны сілай.


*Язэп Лёсік.*

Дэлегаты з'езда ратаваліся ад арышту ў мінскім дэпо, дзе працягнулі сваю работу і выбралі *Раду Ўсебеларускага* з'езда ў складзе 56 чалавек на чале з **Язэпам Лёсікам**. 21 снежня 1917 г. Рада абрала *Выканаўчы камітэт*, які ўзначаліў **Язэп Варонка**. У пытанні аб дзяржаўным будучым Беларусі Рада



Язэп Варонка.

і Выканкам перайшлі ад ідэі *аўтаноміі* ў складзе Расіі да ідэі поўнага *суверэнітэту*.

**3. *Брэсцкі мір. Абвяшчэнне БНР.*** У студзені 1918 г. у Брэсце кіраўнік дэлегацыі РСФСР **Л. Троцкі** сарваў перамовы з нямецкім камандаваннем аб міры, і 18 лютага 1918 г. немцы распачалі наступленне па ўсяму Заходняму фронту. 19 лютага Мінск пакінулі прадстаўнікі ўлады бальшавікоў. У такіх умовах Выканкам Рады Ўсебеларускага з'езда **21 лютага 1918 г.** звярнуўся да беларускага народа з *1-й Устаўной граматай*, у якой абвясціў сябе часовай уладай на тэрыторыі Беларусі. Выканкам вылучыў са свайго складу *Народны Сакратарыят Беларусі* (на чале з **Я. Варонкам**), які па сутнасці стаў *першым беларускім урадам*. Усе палітычныя рашэнні планавалася прыняць на Ўсебеларускім устаноўчым сходзе, але ўжо 25 лютага 1918 г. немцы захапілі Мінск і ўсталявалі акупацыйны рэжым, які не меў намеру прызнаваць іншую ўладу. У выніку зімовага наступлення немцы прасунуліся на ўсход аж да Дняпра.

У такіх складаных умовах урад Савецкай Расіі **3 сакавіка 1918 г.** падпісаў з Германіяй мір у Брэсце, па якому землі, якія знаходзіліся на захад ад лініі Рыга – Дзвінск – Свянцяны – Ліда – Пружаны – Брэст, перадаваліся Германіі. Але рэальна немцы заставаліся на тэрыторыі, занятай пад час зімовай кампаніі 1918 г. Пры заключэнні Брэсцкага міру беларускае пытанне нават не закранался. Беларускія землі ў мірным дагаворы называліся «*абласцямі, якія раней належалі Расіі*».

Такім чынам, тэрыторыя Беларусі аказалася падзеленай на тры часткі. Заходняя Беларусь разам з Вільняй далучалася непасрэдна да Германіі і атрымала назву «*Новая Ўсходняя Прусія*». Цэнтральная Беларусь і частка ўсходніх раёнаў лічыліся тэрыторыяй, часова

акупаванай немцамі. Усходняя Беларусь па сутнасці далучалася да Савецкай Расіі.

У адказ на гэта **9 сакавіка 1918 г.** Выканкам Рады выдаў *2-ю Устаўную грамату*, у якой абвясціў стварэнне ***Беларускай Народнай Рэспублікі*** (БНР) у межах рассялення і колькаснай перавагі беларускага народа. Да склікання Ўсебеларускага ўстаноўчага сходу заканадаўчая ўлада перадавалася Радзе БНР, выканаўчая – Народнаму Сакратарыяту. Дзяржаўнымі сімваламі БНР сталі герб «Пагоня» і бела-чырвона-белы сцяг.

**15 сакавіка 1918 г.** IV Надзвычайны Ўсерасійскі з’езд саветаў ратыфікаваў Брэсцкі мір. Тады **25 сакавіка 1918 г.** Рада БНР прыняла *3-ю Устаўную грамату*, у якой абвяшчалася незалежнасць БНР і патрабавалася перагледзець умовы Брэсцкага міру. Рада БНР адправіла імператару Германіі **Вільгельму II** тэлеграму з просьбай аб падтрымцы дзяржаўнай незалежнасці Беларусі. Але спроба абаперціся на Германію не прынесла чаканага выніку. Дзяржавы Антанты і ЗША ва ўмовах вайны з Германіяй і грамадзянскай вайны ў Расіі таксама не праявілі зацікаўленасці беларускім пытаннем. Савецкая Расія адкрыта выступала супраць БНР.

Звязаная ўмовамі Брэсцкага міру, Германія дэ-юрэ не прызнала незалежнасці БНР, але разам з тым нямецкія акупацыйныя ўлады надалі органам БНР некаторыя рэальныя паўнамоцтвы. У кампетэнцыі БНР знаходзіліся гандаль, асвета, культура, сацыяльнае забеспячэнне. Дзякуючы дзейнасці Рады БНР выдаваліся падручнікі, адчыняліся беларускія школы, быў створаны педагагічны інстытут



*Герб і сцяг БНР.*



УСТАЎНАЯ ГРАМАТА

РАДЫ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ.

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі.

і інш. Пасля капітуляцыі Германіі (11.11.1918 г.) урад Савецкай Расіі заявіў пра дэнансацыю (адмену) умоваў Брэсцкага дагавора і накіраваў Чырвоную Армію ў Беларусь. Урад БНР вымушаны быў эмігрыраваць.

Абвяшчэнне БНР мела вялікае значэнне ў працэсе ўтварэння беларускай дзяржаўнасці. Урад бальшавікоў, зыходзячы з аб'ектыўных абставін рэальнай дзейнасці Рады і Народнага Сакратарыята БНР, не мог больш ігнараваць права беларускага народа на стварэнне сваёй дзяржавы і вымушаны быў перагледзець свае пазіцыі па беларускаму пытанню.

**4.** ***Утварэнне БССР і ЛітБел***. Падзеі, звязаныя з Усебеларускім з'ездам, сведчылі пра сур'ёзнасць беларускага пытання. У студзені 1918 г. у Петраградзе ў Народным камісарыяце па справах нацыянальнасцяў быў створаны *Беларускі нацыянальны камісарыят* (*Белнацкам*) (старшыня – **А. Чарвякоў**, сакратар – **З. Жылуновіч**). Белнацкам выступаў за ператварэнне *Заходняй вобласці*, якая была створана на тэрыторыі Беларусі ў выніку рэвалюцыйных падзей 1917 г., у беларускую аўтаномію ў складзе РСФСР. Дзейнасць Белнацкама выклікала незадаволенасць Аблвыкамзаха, які адхіліў усялякія спробы стварэння беларускай дзяржаўнасці і перайменаваў Заходнюю вобласць у *Заходнюю камуну*. Толькі абвяшчэнне БНР і прэтэнзіі на беларускія тэрыторыі з боку адноўле-



*Зміцер Жылуновіч.*

най пасля Першай сусветнай вайны Польскай дзяржавы прымусілі ўрад Савецкай Расіі пайсці на ўтварэнне беларускай сацыялістычнай дзяржавы.

Рашэнне аб стварэнні *Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі* было аформлена на VI Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі бальшавікоў, якая праходзіла ў Смаленску 30–31 снежня 1918 г. і была перайменавана ў I з’езд камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. **1 студзеня 1919 г.** быў утвораны Часовы рабоча-сялянскі ўрад рэспублікі, які ўзначаліў З. Жылуновіч. У гэты ж дзень урад прыняў Маніфест аб абвяшчэнні БССР. У дакуменце дэкларараваліся сацыяльныя правы працоўных у новай краіне, але адсутнічалі дэмакратычныя правы і свабоды, паколькі яны не адпавядалі інтарэсам *дыктатуры пралетарыяту*.

Урад БССР не меў практычна ніякіх паўнамоцтваў, а ўсе асноўныя пытанні, якія тычыліся беларускага народа, вырашаліся ў Маскве. Так, былі зачынены ўсе беларускія навучальныя ўстановы, створаныя ў час нямецкай акупацыі, было адмоўлена ў вылучэнні сродкаў на выданне камуністычнай газеты на беларускай мове. Больш за тое, 16 студзеня 1919 г. ЦК РКП(б), рыхтуючыся да падзелу сфераў уплыву з Польшчай, прыняў рашэнне аб вывадзе са складу БССР Смаленскай, Віцебскай і Магілёўскай губерняў і далучэнні іх да Расіі, а Гродзенскай і Мінскай губерням прапаноўвалася аб’яднацца з Літвой і ўтварыць адзіную дзяржаву. Зварот урада БССР у Маскву з надзеяй адмяніць гэтыя рашэнні поспеху не меў.

2–3 лютага 1919 г. у Мінску адбыўся I Усебеларускі з’езд Саветаў, на якім было зацверджанае рашэнне аб аб’яднанні Беларусі і Літвы і ўтварэнні Літоўска-Беларускай ССР (ЛітБел ССР). На гэтым жа з’ездзе 3 лютага 1919 г. была прынятая *першая Канстытуцыя БССР*. Яна замацавала назву дзяржавы – Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусі (ССРБ) і абвясціла яе рэспублікай Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў.

Беларуска-Літоўская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка са сталіцай у Вільні ўзнікла **27 лютага 1919 г.** Ва ўрад новага дзяржаўнага ўтварэння не быў уключаны ніводны беларус, а ў дзяржаўным справаводстве выкарыстоўваліся руская, літоўская і нават польская




*Герб ССРБ (1919).*

мовы, акрамя беларускай. ЛітБел ССР з’яўлялася *бufернай дзяржавай*, якую бальшавікі стварылі з мэтай выкарыстаць яе ў якасці пагранічнай зоны паміж РСФСР і Польшчай з мэтай прадухілення адкрытай вайны. Гэтае дзяржаўнае ўтварэнне не праіснавала і двух месяцаў. У жніўні 1919 г. тэрыторыя ЛітБел ССР была занятая польскімі войскамі, і дзяржава з такой назвай перастала існаваць.

**5. *Палітыка «ваеннага камунізму».*** Сацыяльна-эканамічнае становішча на беларускіх землях было вельмі складанае. У Савецкай Расіі бальшавікамі была ўведзена палітыка *«ваеннага камунізму»* (1918 – сакавік 1921 г.), якая грунтавалася на сістэме надзвычайных мер і мела на мэце ўсталяваць дыктатуру пралетарыяту ў краіне з перавагай дробна-буржуазнага насельніцтва. Сваю назву палітыка атрымала з прычыны адмены таварна-грашовых адносін, свабоднага гандлю і прыватнай уласнасці і ўвядзення натуралізацыі аплаты працы. У прамысловасці была праведзена нацыяналізацыя ўсіх прадпрыемстваў, уведзена ўсеагульная абавязковая працоўная павіннасць (**«кто не работает, тот не ест»**), а таксама цэнтралізацыя і каманднa-адміністрацыйны стыль кіравання прамысловасцю.

Найбольш цяжкая сітуацыя склалася ў сельскай гаспадарцы. Для таго, каб пракарміць армію, рабочых і непрацаздольнае насельніцтва гарадоў, улада ўвяла манаполію хлебнага гандлю і *харчразвёрстку*. Сяляне абавязаны былі здаваць дзяржаве ўсе лішкі хлеба і іншых прадуктаў па фіксаваных цэнах. На самай справе ў сялян забіраліся не толькі лішкі, але і частка неабходных для спажывання прадуктаў. У большасці выпадкаў іх забіралі ў доўг, або за папяровыя грошы, якія не мелі ніякай пакупной здольнасці. Праводзілі харчразвёрстку спецыяльныя харчатрады і прадстаўнікі мясцовых саветаў. Тых, хто адмаўляўся падпарадкавацца, хаваў

збожжа, аказваў супраціўленне, па ўмовах ваеннага часу чакаў расстрэл. У Беларусі палітыка «ваеннага камунізму» ажыццяўлялася на тэрыторыі, якая ў той час кантралявалася бальшавікамі.

У выніку гэтай палітыкі за два гады была зруйнавана гаспадарка былой Расійскай імперыі. Пагаршэнне становішча насельніцтва выклікала сацыяльную напружанасць у грамадстве і прыводзіла да антыбальшавісцкіх выступленняў сялян і салдат.

**6.** ***Беларусь у перыяд савецка-польскай вайны 1919–1920 гг. Другое абвяшчэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ).*** Пачатак 1919 г. быў перыядам дзяржаўна-тэрытарыяльнай перабудовы пасляваеннай Еўропы і часам спадзяванняў для многіх еўрапейскіх народаў на стварэнне ўласных незалежных дзяржаў. Беларусь чарговы раз апынулася ў сферы спаборніцтва геапалітычных інтарэсаў Расіі і Польшчы. Прэтэнзіі прадстаўнікоў урада БНР на незалежнасць не былі падтрыманы на Версальскай канферэнцыі ў студзені 1919 г. Для барацьбы з савецкай уладай вядучыя краіны Еўропы і ЗША пайшлі на палітычны саюз з А. Калчаком, які на той час з'яўляўся кіраўніком *белага руху* ў Расіі, і выказаліся толькі за магчымасць аўтаноміяў народаў у складзе Расіі.

З другога боку, Юзаф Пілсудскі, кіраўнік адноўленай польскай дзяржавы, чарговы раз агучыў ідэю польскага нацыянальна-вызваленчага руху XIX ст. – аднаўлення Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. У адозве «Да насельніцтва былога Вялікага княства Літоўскага» Ю. Пілсудскі запэўніваў, што «польскае войска нясе ўсім вольнасць і свабоду». Насельніцтва Беларусі, якое ў большасці было незадаволенае палітыкай «ваеннага камунізму», мабілізацыяй у Чырвоную Армію і рэквізіцыямі (у Расіі ішла грамадзянская вайна), з пэўным энтузіязмам успрыняло абяцанні Ю. Пілсудскага.

Наступленне польскай арміі на беларускія землі пачалося ў лютым 1919 г. і мела вельмі імклівы характар: у сакавіку палякі ўжо кантралявалі тэрыторыю на захад ад лініі рэк Піна – Ясельда, 21 красавіка была занятая Вільня, у жніўні – Мінск, а ў верасні польскае войска апынулася на лініі Дзвінск – Полацк – Барысаў – Любань. Лідары ўрада БНР спадзяваліся на магчымасць аднаўлення

рэспублікі, аднак незалежная Беларусь не ўваходзіла ў планы Ю. Пілсудскага. На захопленай тэрыторыі быў усталяваны польскі акупацыйны рэжым: ліквідаваны органы мясцовага кіравання, аднаўлялася памешчыцкае землеўладанне, праводзіліся рэквізіцыі, а многія дзеячы беларускага нацыянальнага руху апынуліся ў турмах.

Такая палітыка польскіх уладаў выклікала масавы рух супраціву, які ўзначаліла самая ўплывовая на той час партыя на тэрыторыі Беларусі – БПС-Р (беларускія эсэры). Супраціўленне польскім акупантам арганізоўвалі таксама і бальшавікі. 14 мая 1920 г. Чырвоная Армія пад камандаваннем *М. Тухачэўскага* перайшла ў контрнаступленне. Пасля вызвалення Мінска **31 ліпеня 1920 г.** адбылося другое абвяшчэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ). У жніўні 1920 г. быў вызвалены Брэст. Апанаванае ідэяй «сусветнай рэвалюцыі» войска М. Тухачэўскага рушыла далей на Захад, але было спыненае пад Варшавай і вымушанае было адступаць.

Адначасова на беларускіх землях актывізаваўся антысавецкі ўзброены рух. На Палессі дзейнічаў атрад генерала С. Булак-Балаховіча, а ў лістападзе 1920 г. адбылося ўзброенае паўстанне на Случчыне. 14–15 лістапада 1920 г. адбыўся І беларускі з’езд Слуцка і Случчыны, які выказаўся за прызнанне ўлады БНР. Была створаная Першая Слуцкая брыгада стральцоў войск БНР, якая налічвала каля дзесяці тысяч добраахвотнікаў і ўтрымлівала ўладу ў 15 валасцях Слуцкага і Бабруйскага паветаў у перыяд з 27 лістапада па 28 снежня 1920 г. Паўстанні адбыліся таксама ў Койданаўскім, Ігуменскім і іншых паветах.

Падводзячы вынікі, неабходна адзначыць, што першае 20-годдзе XX ст. стала часам выпрабаванняў для беларускага народа. У складаны перыяд войнаў і рэвалюцый абуджалася беларускае грамадства, паскараліся працэсы самаідэнтыфікацыі беларусаў. Беларуская нацыя прайшла шлях ад непрызнання яе існавання ў складзе Расійскай імперыі, а потым і РСФСР, да ўтварэння нацыянальнай дзяржавы (БНР, БССР). Аднак Рыжскі мір 1921 г., які замацаваў падзел Беларусі і ўваходжанне яе частак у склад розных у палітычных,

эканамічных і ідэалагічных адносінах дзяржаваў – Расіі і Польшчы, чарговы раз штучна затрымаў працэс кансалідацыі беларускай нацыі.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Бальшавізм*** – плынь у расійскай сацыял-дэмакратыі, якая аформілася ў 1903 г. у выніку барацьбы па пытаннях аб Праграме і Статуце партыі ў выніку галасавання на II з’ездзе РСДРП; прадстаўнікі гэтай плыні былі прыхільнікамі жорсткай партыйнай цэнтралізацыі.

***«Ваенны камунізм»*** – назва эканамічнай палітыкі Савецкай дзяржавы ў 1918–1920 гг., сістэма надзвычайных мер, выкліканых грамадзянскай вайной і ваеннай інтэрвенцыяй.

***Двоеўладдзе*** – своеасаблівая палітычная сітуацыя ў Расіі пасля звяржэння царызму ў выніку Лютаўскай рэвалюцыі, прадстаўленая органамі Часовага ўрада і Саветамі дэпутатаў у перыяд з 2 сакавіка па 4 ліпеня 1917 г.

***Дыктатура*** – сістэма неабмежаванага палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага, духоўнага панавання на чале з лідарам-дыктатарам. Характарызуецца палітычным тэрорам, абмежаваннем палітычных правоў і свабодаў грамадзян.

***Меншавізм*** – плынь у расійскай сацыял-дэмакратыі, якая аформілася ў 1903 г. у выніку барацьбы па пытаннях аб Праграме і Статуце партыі ў выніку галасавання на II з’ездзе РСДРП; прадстаўнікі гэтай плыні выступалі супраць стварэння строга законспіраванай і цэнтралізаванай партыі з безумоўным падпарадкаваннем ніжэйшых арганізацый цэнтру.

***Нацыянальна-вызваленчы рух*** – навуковы тэрмін, які характарызуе грамадскі рух за вызваленне народа з-пад каланіяльнага ўціску, за нацыянальнае адраджэнне, за свабоднае развіццё на аснове ўласнай дзяржаўнасці.

***Нацыянал-дэмакратызм*** – кірунак грамадска-палітычнай думкі, які спалучае агульнадэмакратычныя ідэі і мэты з задачамі сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення прыгнечаных народаў (на гэтай платформе, у прыватнасці, стаяла БСГ).

***Рэвалюцыя*** – карэнны пераварот у жыцці грамадства, звязаны са зменай улады і з пераходам ад аднаго грамадска-палітычнага ладу да другога шляхам актыўных насільных дзеянняў.

***Сацыялізацыя зямлі*** – назва аграрнай праграмы эсэраў, сутнасць якой заключалася ў перадачы ўсёй зямлі ва ўласнасць народа і ўраўняльным надзяленні зямлёй без права куплі-продажу.

***Устаноўчы сход*** – найвышэйшы дэмакратычна выбраны орган улады, які мае паўнамоцтвы для вырашэння пытанняў дзяржаўнага і грамадскага будаўніцтва краіны.

***Чарнасоценцы*** – назва прадстаўнікоў крайне правых, манархічных колаў у 1903–1917 гг. у Расійскай імперыі; адна з іх палітычных арганізацый – «Саюз рускага народа».

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***23 лютага 1917 г.*** – пачатак Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў Расіі.

***2 сакавіка 1917 г.*** – цар Мікалай II падпісаў акт адрачэння ад прастола; на аснове Часовага камітэту Дзяржаўнай думы сфарміраваны Часовы ўрад на чале з князем Г.Я. Львовым.

**25–27 сакавіка 1917 г.** – першы з’езд беларускіх партый і арганізацый у г. Мінску. Утварэнне Беларускага нацыянальнага камітэта (БНК) на чале з Р. Скірмунтам.

***8–12 ліпеня 1917 г.*** – Другі з’езд беларускіх партый і арганізацый у г. Мінску. Стварэнне замест БНК Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый.

***25–30 жніўня 1917 г.*** – «карнілаўскі мяцеж» (Лаўр Георгіевіч Карнілаў – Вярхоўны галоўнакамандуючы расійскай арміі выступіў супраць Часовага ўрада і Саветаў).

***25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 г.*** – узброенае паўстанне ў г. Петраградзе, звяржэнне Часовага ўрада, пераход улады да бальшавікоў.

***25–27 кастрычніка (7–9 лістапада) 1917 г.*** – II Усерасійскі з’езд саветаў у г. Петраградзе. Утварэнне першага савецкага ўрада – Савета Народных Камісараў (СНК) на чале з У. Леніным. Прыняцце дэкрэтаў аб міры і зямлі.

***27 кастрычніка (9 лістапада) 1917 г.*** – утварэнне Ваеннага-рэвалюцыйнага камітэта (ВРК) Заходняга фронту; утварэнне ў г. Мінску Камітэта ратавання рэвалюцыі на чале з меншавіком Т. Калатухіным.

***Лістапад 1917 г.*** – утварэнне вышэйшага органа савецкай улады на тэрыторыі Беларусі – Абласнога выканаўчага камітэта Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту (Аблвыкамзах) на чале з М. Рагазінскім; выканаўчай улады – Савета Народных Камісараў (СНК) Заходняй вобласці і фронту на чале з К. Ландарам і кіраўнічай структуры бальшавіцкіх арганізацый – Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б) на чале з А. Мясніковым.

***7–17 (20–30) снежня 1917 г.*** – Першы Ўсебеларускі з'езд (Кангрэс) прадстаўнікоў беларускіх партый і арганізацый. Разагнаны па рашэнню СНК Заходняй вобласці і фронту.

***21 лютага 1918 г.*** – стварэнне Народнага сакратарыята Беларусі; выданне Выканаўчым камітэтам Рады Ўсебеларускага з'езда Першай Устаўной граматы да народаў Беларусі.

***3 сакавіка 1918 г.*** – Брэсцкі мірны дагавор, падзел тэрыторыі Беларусі паміж Савецкай Расіяй і Германіяй.

***9 сакавіка 1918 г.*** – выданне Выканаўчым камітэтам Рады Ўсебеларускага з'езда Другой Устаўной граматы, абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР).

***15 сакавіка 1918 г.*** – IV Надзвычайны Ўсерасійскі з'езд саветаў ратыфікаваў Брэсцкі мір.

***25 сакавіка 1918 г.*** – выданне Радай БНР Трэцяй Устаўной граматы, абвяшчэнне незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі.

***1 студзеня 1919 г.*** – абвяшчэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі ў г. Смаленску (ўтварэнне БССР). Утварэнне Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада на чале з З. Жылуновічам. Апублікаванне Маніфеста Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі.

***16 студзеня 1919 г.*** – пастанова ЦК РКП(б) аб далучэнні да РСФСР Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў Беларусі і ўтварэнні Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

***2–3 лютага 1919 г.*** – Першы Ўсебеларускі з'езд саветаў Беларусі. Прыняцце Канстытуцыі Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі. Зацвярджэнне герба рэспублікі. Прынццe рашэння аб утварэнні Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

***3 лютага 1919 г.*** – прынцце першай Канстытуцыі Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ) першым Усебеларускім з'ездам саветаў Беларусі.

***Люты 1919 – кастрычнік 1920 гг.*** – польска-савецкая вайна.

***27 лютага 1919 г.*** – сумеснае пасяджэнне ЦВК Літоўскай ССР і ЦВК Беларускай ССР. Стварэнне Літоўска-Беларускай ССР (ЛітБел).

***12 ліпеня 1920 г.*** – падпісанне ў г. Маскве дагавора паміж РСФСР і Літвой. Быў заключаны ў час савецка-польскай вайны 1920 г. У выніку юрыдычна ліквідавана ЛітБел ССР. Была адзначана дзяржаўная граніца паміж РСФСР і Літвой, згодна з якой частка тэрыторыі Беларусі з гарадамі Гродна, Шчучын, Ашмяны, Смаргонь, Браслаў, Ліда, Паставы, а таксама Віленскі край з г. Вільняй, былі прызнаны часткай Літвы.

***31 ліпеня 1920 г.*** – другое абвяшчэнне БССР. Прынццe «Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі» (ССРБ).

***27 лістапада – 28 снежня 1920 г.*** – Слуцкае антысавецкае паўстанне.

## ЛІТАРАТУРА


1. Актуальныя пытанні гісторыі БССР. Савецкі перыяд. – Мінск, 1991.
2. *Игнатенко И. М.* Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии. – Минск, 1992.
3. *Касцюк М.* Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. – Мінск, 2000.
4. *Краўцоў М.* Рада Беларускай Народнай Рэспублікі // Спадчына. – 1998. – № 1. – С. 75–126.
5. *Круталевіч В. А.* Станаўленне дзяржаўнасці. – Мінск, 1989.
6. *Марченко И. Е.* Аграрные преобразования в Белоруссии в 1917–1918 гг. – Минск, 1959.
7. *Мілеўскі Я. Е.* Адносіны польскіх войск да насельніцтва Беларусі (1919–1921 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс – 1996. – №4. – С. 32–43.

8. *Міранові́ч Я.* Найноўшая гісторыя Беларусі. – СПб., 2003.
9. *Рудовіч С.* Час выбару. Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 г. – Мінск, 2001.
10. *Савицкий Э. М.* Революционное движение в Белоруссии (август 1914 – февраль 1917). – Минск, 1981.
11. *Скалабан В.У.* Белнацком. – Минск, 1989.
12. *Сташкевич Н.С.* Приговор революции: крушение антисоветского движения в Белоруссии. 1917 – 1925. – Минск, 1985.
13. *Цвикевич А.* Краткий очерк возникновения Белорусской Народной Республики. – Минск, 1990.
14. *Шыбека З.* Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002). – Мінск, 2003.

# РАЗДЗЕЛ 8.
# САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ
# У МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД (1921–1939 гг.)

1. *Рыжскі мір і Беларусь.*
2. *Новая эканамічная палітыка (НЭП) і беларусізацыя ў БССР.*
3. *БССР у перыяд індустрыялізацыі і калектывізацыі.*
4. *Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у канцы 1920-х – 1930-я гг.*

**1. *Рыжскі мір і Беларусь.*** Яшчэ падчас наступлення на Варшаву ўрад РСФСР пачаў дзяліць беларускія землі. 12 ліпеня 1920 г., улічваючы, што Літва знаходзіцца ў стане канфрантацыі з Польшчай, ён схіліў літоўскае кіраўніцтва да падпісання ў Маскве мірнай дамовы. У адпаведнасці з ёю ўрад РСФСР прызнаваў незалежнасць Літоўскай Рэспублікі, а Віленскі край (з Гродна, Шчучынам, Лідай, Ашмянамі, Смаргонню, Браславам) – яе неад'емнай часткай. 14 ліпеня 1920 г. Чырвоная Армія заняла Вільню, а пры вераснёўскім адступленні саступіла горад літоўскай арміі. Бальшавікі дамагліся таго, што літоўская дзяржава ўцягвалася ў вострае супрацьстаянне з Польшчай, якая прэтэндавала на гэтыя ж тэрыторыі.

Да таго ж, 11 жніўня 1920 г. у Рызе быў падпісаны дагавор паміж РСФСР і Латвіяй, па якому Масква перадала Латвіі памежную паласу беларускіх земляў Віцебскай губерні разам з Дзвінскам (Даўгаўпілсам).

16 жніўня 1920 г. польскія войскі перайшлі ў наступленне пад Варшавай, пацяснілі Чырвоную Армію і занялі значную частку тэрыторыі Беларусі. Ва ўмовах контрнаступлення польскай арміі і ўзмацнення антысавецкага руху на тэрыторыі Беларусі восенню 1920 г. урад РСФСР пайшоў на мірныя перагаворы з Польшчай.

12 кастрычніка 1920 г. у Рызе былі заключаны папярэднія ўмовы міру. Але падпісанне перамір'я не спыніла ваенных дзеянняў.

Пры падтрымцы польскага боку ў лістападзе на тэрыторыю Беларусі ўвайшлі атрады пад камандаваннем С. Булак-Балаховіча, прыхільніка БНР, які абвясціў сябе начальнікам Беларускай дзяржавы. Але пасля захопу ім Мазыра, Пінска, Петрыкава, Калінкавіч атрады С. Булак-Балаховіча былі разбіты, а сам генерал перайшоў у Польшчу.

**18 сакавіка 1921 г.** у Рызе быў падпісаны мірны дагавор, цяжкі і несправядлівы для Беларусі, якім было зафіксавана спыненне савецка-польскай вайны 1920 г. і заяўлены асноўныя прынцыпы пасляваенных адносін. Рыжскі мірны дагавор замацаваў падзел тэрыторыі Беларусі паміж РСФСР і Польшчай.

Беларускія дэлегацыі ні ад БССР, ні ад БНР не былі дапушчаны да падрыхтоўкі і падпісання дагавора. Дэлегацыя БССР прысутнічала ў Рызе з самага пачатку перагавораў, але яе паўнамоцтвы не былі прызнаны польскім бокам. Ад імя БССР выступала РСФСР. Для РСФСР удзел Беларусі ў перагаворах таксама быў непажаданым, таму што і яна прэтэндавала на некаторыя беларускія землі.

Паводле Рыжскага дагавора да Польскай дзяржавы адыходзіла тэрыторыя Заходняй Беларусі з насельніцтвам 4,6 млн. чалавек. Са-




*Карыкатура на Рыжскі мір.*




вецка-польская мяжа праходзіла за 30 км ад Мінска. Такім чынам, у складзе абвешчанай 31 ліпеня 1920 г. ССРБ засталіся толькі шэсць паветаў былой Мінскай губерні (Мінскі, Барысаўскі, Бабруйскі, Ігуменскі, Мазырскі і Слуцкі), у якіх пражывала 1,5 млн. чалавек. Віцебская і Гомельская губерні, заходнія паветы Смаленскай губерні заставаліся ў складзе РСФСР.

У адпаведнасці з Рыжскім мірным дагаворам ад 18 сакавіка 1921 г., тэрыторыя Беларусі амаль на два дзесяцігоддзі аказалася штучна падзеленай: Заходняя Беларусь стала часткай II Рэчы Паспалітай (Польшчы), а БССР (у складзе шасці паветаў былой Мінскай губерні) фармальна з'яўлялася суб'ектам міжнароднага права, хаця рэальна апынулася ў эканамічнай і палітычнай залежнасці ад РСФСР. Умовы развіцця гэтых дзьвюх частак Беларусі вельмі адрозніваліся.

**2.** ***Новая эканамічная палітыка (НЭП) і беларусізацыя ў БССР.*** Першая сусветная і савецка-польская войны, змена акупацыйных рэжымаў, а таксама палітыка «ваеннага камунізму» прывялі да глыбокага эканамічнага крызісу ў Беларусі. Асабліва цяжкім было становішча ў сельскай гаспадарцы, дзе ў выніку рэквізіцыі коней, свіней, збожжа ўсімі арміямі і правядзення бальшавікамі харчразвёрсткі вясной 1921 г. фактычна не было чым сеяць. Гэта прывяло да сялянскіх хваляванняў і нават узброеных выступленняў.

Падобная сітуацыя склалася і ў расійскай вёсцы. Да таго ж, спадзяванні прыхільнікаў У. Леніна на хуткую сусветную рэвалюцыю не спраўдзіліся, і далейшы працяг палітыкі «ваеннага камунізму» з яго сістэмай надзвычайных мер ствараў пагрозу ўладзе бальшавікоў і прымусіў іх перагледзець свой эканамічны курс. У **сакавіку 1921 г.** на X з'ездзе РКП(б) была прынятая ***«новая эканамічная палітыка» (НЭП)***, якая павінна была забяспечыць хуткі гаспадарчы ўздым, павышэнне матэрыяльнага і культурнага ўзроўню насельніцтва і ў канчатковым выніку – пабудову сацыялізму.

***Сутнасць НЭП***. Новая эканамічная палітыка ўяўляла сабой комплекс мерапрыемстваў Савецкай дзяржавы ў галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі і фінансавай сферы.

***У прамысловасці***, якая ў першыя гады савецкай улады была поўнасцю нацыяналізавана, неабходным крокам стала яе дэцэнтралізацыя. Дзяржава не мела сродкаў для аднаўлення эканомікі, і на аснове існуючых метадаў гаспадарання дзяржаўная прамысловасць не магла забяспечыць дастатковага таварнага ро-

сту, таму пачалі ўводзіцца розныя формы кіравання прамысловасцю. Буйныя і стратэгічна важныя прадпрыемствы аб'ядноўваліся ў *трэсты* і заставаліся ва ўласнасці дзяржавы, астатнія падлягалі кансервацыі або здаваліся ў арэнду прыватным асобам, а нерэнтабельныя дробныя прадпрыемствы закрываліся. Дапускаліся розныя формы ўласнасці – *дзяржаўная, прыватная, кааператыўная*. Некаторыя прадпрыемствы пераводзіліся на *гаспадарчы разлік* (у рамках дзяржбюджэту і фіксаваных цэн) і *камерцыйны разлік* (атрыманне прыбытку за кошт дагаворна-рыначных цэн) і атрымлівалі шырокую гаспадарчую аўтаномію.

Адмянялася абавязковая працоўная павіннасць і фарміраваўся рынак свабоднай рабочай сілы. У аплаце працы рабочых ліквідавалася ўраўнілаўка, улічвалася прадукцыйнасць працы і кваліфікацыя. За гады «ваеннага камунізму» бальшавікі пераканаліся, што для кіраўніцтва прадпрыемствамі неабходны спецыяльныя веды. Таму ў перыяд НЭП да супрацоўніцтва прыцягваліся спецыялісты (эканамісты, бухгалтары, інжынеры і інш.), якія павінны былі перадаць свой вопыт і веды выхадцам з рабочых і сялян.

У канцы 1920 г. быў распрацаваны план дзяржаўнай электрыфікацыі Расіі (ГОЭЛРО), у адпаведнасці з якім на тэрыторыі Беларусі да сярэдзіны 1920-х гг. было пабудавана больш за 20 электрастанцый, першай з якіх стала Аршанская БелДРЭС.

***У сельскай гаспадарцы*** харчразвёрстка была заменена натуральным *харчпадаткам*, памеры якога да сялян даводзілі яшчэ да пачатку сяўбы. Харчпадатак перыядычна памяншаўся – спачатку ён складаў 20% ад ураджаю, потым – 10% і 5%. Лішкі прадукцыі сяляне свабодна маглі прадаць на рынку, што, несумненна, стымулявала працу вяскоўцаў. Для сялян, якія распрацоўвалі пусткі і зараснікі, праводзілі меліярацыю зямель, памер падатку быў яшчэ меншы.

На вёсцы былі дазволены арэнда зямлі і выкарыстанне наёмнай працы, пры ўмове, што сам гаспадар таксама будзе працаваць на палетках. Развівалася і сялянская кааперацыя.

Аднак заставалася праблема сялянскага малазямелля, для вырашэння якой улада заахвочвала сялян да перасялення на ху-

тары. У БССР гэтаму працэсу актыўна садзейнічаў народны камісар (наркам) земляробства БССР **Д. Ф. Прышчэпаў**, які быў знаёмы з арганізацыяй фермерскай гаспадаркі ў Даніі і Германіі. Па яго ініцыятыве ў 1925–1928 гг. у рэспубліцы праводзілася *камасацыя* сельскагаспадарчых грунтаў, якая ліквідавала цераспалоснасць сельскіх гаспадарак шляхам стварэння хутароў. Такая аграрная палітыка стымулявала развіццё прыватнай гаспадарчай ініцыятывы і садзейнічала стварэнню заможных сялянскіх гаспадарак. Пазней, падчас правядзення калектывізацыі, Д. Ф. Прышчэпаў быў абвінавачаны ў стварэнні кулацкіх гаспадарак, да яго палітыкі быў прычэплены ярлык «прышчэпаўшчына», а сам наркам рэпрэсіраваны.

***У фінансавай сферы*** важным крокам стала правядзенне ў 1922–1924 гг. грашовай рэформы. Яе неабходнасць тлумачылася, з аднаго боку, гіперінфляцыяй, абясцэньваннем савецкіх папяровых грошай, з другога – патрэбай рынку ў новай устойлівай валюце і стварэнні адзінай грашовай сістэмы. Ініцыятарам рэформы стаў наркам фінансаў **Г. Я. Сакольнікаў**. У выніку была створана двухузроўневая грашовая сістэма:

- *дзяржаўныя казначэйскія білеты* вартасцю 1, 3, 5 руб., а таксама манеты: сярэбраныя (10, 15, 20, 50 кап.) і медныя (1, 2, 3, 5 кап.), якія выкарыстоўваліся для разлікаў унутры краіны;
- *банкаўскія білеты*, якія атрымалі назву *«чырвонец»* і былі падмацаваны золатам. Залатое ўтрыманне чырвонца было роўным 7,7 г чыстага золата. З 1923 г. чырвонец стаў адзіным цвёрдым плацёжным сродкам у СССР. З грашовага абарачэння чырвонец афіцыйна быў зняты ў 1947 г., але рэальна – яшчэ з пачатку 1930-х г., падчас правядзення палітыкі індустрыялізацыі.

У гады НЭП адбывалася станаўленне савецкай банкаўска-крэдытнай сістэмы. З 1921 г. у Мінску пачала сваю работу Ўсебеларуская кантора дзяржаўнага банка, а праз пяць гадоў яна ўжо мела дзевяць філіялаў. Ствараліся камерцыйныя банкі, таварыствы ўзаемнага крэдыту, ашчадныя касы.

***Вынікі НЭП.*** Адносная эканамічная лібералізацыя ў гады НЭП стварала спрыяльныя ўмовы для адбудовы прамысловасці

і сельскай гаспадаркі. Да 1927 г. у асноўным была адноўлена сельская гаспадарка Беларусі. Разгарнуліся работы па асушэнні балот, павялічвалася колькасць хутарскіх гаспадарак (у асобных раёнах да 70–80% ад іх агульнай колькасці). Аднак усё гэта дасягалася цяжкай працай сялян, якія добраахвотна змяншалі асабістае спажыванне. Нягледзячы на першыя поспехі, эканамічнае становішча заставалася складаным. У Беларусі па-ранейшаму пераважала дробная і саматужная прамысловасць.

У другой палове 1920-х гг. эканамічная сістэма НЭП працавала з вялікім напружаннем. Развязаўшы сілы рынку, НЭП стымулявала расслаенне грамадства. Разам з тым прыватная ўласнасць і іншыя капіталістычныя формы гаспадарання (арэнда, наёмная праца, свабодны рынак) не адпавядалі ўяўленням бальшавікоў аб сацыялізме. Да таго ж, для НЭП былі ўласцівы эканамічныя крызісы.

Першы *крызіс збыту* ў прамысловасці ўзнік у 1923 г. Ён быў выкліканы тым, што прадпрыемствы ў імкненні атрымаць вялікія прыбыткі штучна завышалі цэны на сваю прадукцыю, у выніку склаліся так званыя «*нажніцы цэн*» – высокія цэны на прамысловыя тавары і нізкія на сельскагаспадарчыя. Гэта прывяло да таго, што сяляне пасля продажу на рынку лішкаў сваёй прадукцыі не маглі дазволіць сабе купіць дарагія прамысловыя тавары. Для таго, каб задаволіць свае патрэбы ў прамысловай прадукцыі, у наступныя гады сяляне, здаўшы дзяржаве фіксаваны харчпадатак, паступова пераходзілі да натуралізацыі сваёй гаспадаркі. У выніку ў 1925–1927 гг. быў сарваны план дзяржаўных нарыхтовак збожжа і ў краіне ўзнік *збожжавы крызіс*. Улада вымушана была купляць збожжа за мяжой.

З 1927 г. НЭП пачала згортвацца хуткімі тэмпамі, і на змену ёй прыйшлі *індустрыялізацыя* прамысловасці і *калектывізацыя* сельскай гаспадаркі.

***Беларусізацыя.*** З лета 1922 г. пачаўся пошук магчымых форм аб'яднання савецкіх рэспублік у адну дзяржаву. Сталін выступіў з ідэяй «*аўтанамізацыі*», згодна з якой усе рэспублікі павінны былі ўвайсці ў склад РСФСР як яе складаныя часткі. Аднак супраць гэтага выступілі кіраўнікі камуністычных партый рэспублік, у тым

ліку і БССР. Яны падтрымалі план У. Леніна аб стварэнні *федэрацыі*, пры якой усе савецкія рэспублікі аб'ядноўваліся на раўнапраўнай аснове.

На I Усесаюзным з'ездзе Саветаў у Маскве **30 снежня 1922 г.** дэлегацыя БССР на чале з А. Чарвяковым падпісала Дэкларацыю аб стварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР). У 1924 г. і 1926 г. адбыліся ўзбуйненні БССР, у выніку якіх Беларусі былі вернуты землі (акрамя Смаленшчыны), якія былі ўключаны ў склад Савецкай Расіі ў 1919 г. Тэрыторыя Беларусі павялічылася ў 2 разы, а колькасць насельніцтва – амаль у 3 і дасягнула 4,9 млн. чалавек.

Увядзенне пэўнай эканамічнай свабоды ў часы НЭП патрабавала лібералізацыі і грамадска-палітычнага жыцця, а таксама вырашэння нацыянальнага пытання. У 1920-я гг. у БССР праводзілася палітыка нацыянальна-дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва, якая атрымала назву *«беларусізацыя»*. Яна прадугледжвала правядзенне наступных мерапрыемстваў:

- развіццё беларускай культуры і нацыянальнай адукацыі: стварэнне навучальных устаноў з беларускай мовай навучання, выданне на беларускай мове кніг, газет і часопісаў, развіццё беларускай літаратуры, арганізацыя навукова-даследчай дзейнасці па ўсебаковаму вывучэнню гісторыі Беларусі;
- перавод на беларускую мову дзяржаўнага апарату, партыйных органаў і Чырвонай Арміі;
- вылучэнне на дзяржаўную, партыйную і грамадскую работу карэннага беларускага насельніцтва, што атрымала назву *«карэнізацыі»*.

Як дзяржаўная палітыка беларусізацыя ажыццяўлялася ў 3 этапы:

1) *1921–1924 гг.* – падрыхтоўка фундаменту для нацыянальнага адраджэння. У кастрычніку-лістападзе 1921 г. ЦК КП(б) Беларусі апублікаваў тэзісы «Беларускае нацыянальнае пытанне і камуністычная партыя», у якіх ставілася задача неабмежаванага ўжывання беларускай мовы і развіцця беларускай нацыянальнай культуры. У 1921 г. быў адкрыты Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; у 1922 г. – Інбелкульт (Інстытут беларускай культуры).

Згуртаванню творчых сіл народа садзейнічала абвешчаная ў ліпені 1923 г. амністыя ўсіх удзельнікаў антысавецкіх нацыянальных фарміраванняў і арганізацый 1918–1920 гг.;

2) *1924–1928 гг.* – рэальнае ажыццяўленне беларусізацыі як афіцыйнай палітыкі. Рашэннем ліпеньскага 1924 г. пленума ЦК КП(б) Беларусі была абвешчана шырокая праграма нацыянальна-культурнага адраджэння і правядзення ў рэспубліцы «нацыянальнай палітыкі» – беларусізацыі. Сярод найбольш важных яе дасягненняў можна вылучыць наступныя:

• да 1928 г. прыкладна 80% агульнаадукацыйных школ былі пераведзены на беларускую мову; беларуская мова была ўведзена ў дзяржаўных установах і вайсковых адзінках БССР. Асаблівасцю беларусізацыі было тое, што дзяржаўнымі мовамі адначасова былі абвешчаны беларуская, руская, яўрэйская і польская;

• каля 48% раённых кіруючых пасад да 1927 г. займалі беларусы;

• развіваліся беларуская літаратура, тэатр, утварылася выдавецтва *«Савецкая Беларусь»*, у 1928 г. выйшаў першы беларускі фільм *«Лясная быль»*;




• гісторыкамі **У. Ігнатоўскім**, **В. Ластоўскім**, **У. Пічэтам** былі зробленыя першыя спробы стварыць нацыянальную канцэпцыю беларускай гісторыі;

• дзякуючы палітыцы беларусізацыі ў БССР паспяхова вырашыліся пытанні, звязаныя з ліквідацыяй непісьменнасці сярод дарослага насельніцтва, былі створаны рабочыя факультэты (рабфакі) для падрыхтоўкі рабоча-сялянскай моладзі да паступлення ў ВНУ.

Праўда, ажыццяўленне беларусізацыі адбывалася фарсіраванымі тэмпамі з выкарыстаннем адміністрацыйных метадаў;

3) з *1929 г.* – згортванне беларусізацыі. Палітыка беларусізацыі праіснавала нядоўга і была спынена разам з адмовай ад НЭП і зменай палітычнага курсу партыі. Праз палітыку беларусізацыі аднаўлялася ідэя беларускага адраджэння, але яна не адпавядала ідэі бальшавікоў аб хуткай сусветнай рэвалюцыі, пры якой нацыі не павінны мець істотнага значэння. У канцы 1920-х гг. у БССР пачалася кампанія па выкрыцці так званага *нацыянал-дэмакратызму* («барацьба з нацдэмамі»), пад якім разумелі варожую ідэалогію, накіраваную на рэстаўрацыю капіталізму ў БССР.

Нягледзячы на хуткае згортванне, беларусізацыя заклала трывалыя асновы развіцця беларускай нацыянальнай дзяржавы, абудзіла да свядомага нацыянальнага жыцця шырокія слаі беларускага насельніцтва, садзейнічала развіццю беларускай культуры, стварэнню першай нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі.

**3.** ***БССР у перыяд індустрыялізацыі і калектывізацыі***. У другой палове 1920-х гг. на змену эканамічнаму лібералізму перыяду НЭП у прамысловасці прыйшла палітыка *індустрыялізацыі*, пры-




*Чыгуначны вакзал Менска. 1920-я гады.*

ярытэтным накірункам якой стала стварэнне ў СССР машыннай вытворчасці. Правядзенне індустрыялізацыі тлумачылася неабходнасцю пераадолення тэхнічнай адсталасці і залежнасці СССР ад імпарту прадукцыі цяжкай прамысловасці. Індустрыялізацыя ў БССР была часткай агульнасавецкага працэсу ў прамысловасці, але пры гэтым мела свае асаблівасці. Яе правядзенне звязвалася з шырокім выкарыстаннем значных прыродных багаццяў Беларусі – лесу і торфу, а таксама рэзерваў рабочай сілы ў сельскай мясцовасці, таму вялікая ўвага надавалася харчовай, тэкстыльнай і гарбарнай галінам.

Курс на індустрыялізацыю быў узяты бальшавікамі на XIV з'ездзе ВКП(б) у 1925 г., але фактычнае яе ажыццяўленне пачалося з абвяшчэння першага пяцігадовага плана 1928–1932 гг. Для стварэння машыннай вытворчасці патрабаваліся вялікія сродкі. Сярод асноўных крыніц, з якіх чэрпаліся фінансы для правядзення індустрыялізацыі, можна вызначыць наступныя:

• *калектывізацыя вёскі*, у выніку якой былі створаны *калгасы* – вялікія фабрыкі па вытворчасці збожжа, якое прадавалася за мяжу, а аплата працы калгаснікаў была натуральная і адбывалася раз у год пасля збору ўраджаю, што дазваляла дзяржаве эканоміць вялікія грашовыя сродкі;

• *дзяржаўныя абавязковыя ўнутраныя пазыкі і жорсткая эканомія* пры аплаце працы рабочых;

• *сацыялістычнае спаборніцтва* («*стаханаўскі рух*»), якое патрабавала вялікай мабілізацыі сіл працоўных і арганізоўвала працу рабочых пад лозунгам: «Выканаць план – доўг, перавыканаць – гонар!»;

• *продаж матэрыяльных каштоўнасцяў за мяжу*, сярод якіх у асноўным былі прадметы мастацтва: залатыя і сярэбраныя вырабы, карціны і інш.;

• *барацьба з рэлігіяй*, якая яшчэ раней была абвешчана «опіумам для народа», а закрыццё цэркваў, касцёлаў і іншых рэлігійных устаноў і канфіскацыя прадметаў рэлігійнага культу ў канцы 1920-х – 1930-я гг. давалі дадатковыя сродкі для правядзення індустрыялізацыі;

• *бясплатная праца зняволеных ГУЛАГА.*

Ажыццяўленне індустрыялізацыі адбывалася адміністрацыйнымі метадамі. У 1929 г. Сталіным былі папраўлены лічбы пяцігадовага плана ў бок іх павялічэння, што было эканамічна неабгрунтавана, а ў студзені 1930 г. для фарсіравання тэмпаў індустрыялізацыі была абвешчана палітыка «вялікага скачка». Для прыбліжэння да планавых лічбаў індустрыялізацыя праводзілася экстэнсіўнымі сродкамі: за гады першай пяцігодкі толькі ў БССР было пабудавана 78 буйных і 480 дробных прамысловых прадпрыемстваў, а ў другой пяцігодцы – 1700 прадпрыемстваў.

Індустрыялізацыя суправаджалася вялікім напружаннем сіл працоўных і значнымі цяжкасцямі. У 1929 г. была ўведзена картачная сістэма размеркавання прадуктаў ва ўсіх гарадах. Міграцыя, выкліканая індустрыялізацыяй, ахапіла вялікія масы людзей, што абвастрыла жыллёвую праблему, павялічыла колькасць беспрацоўных. Разам з тым не хапала кваліфікаваных рабочых. Насуперак рэальным вынікам 7 студзеня 1933 г. Сталін абвясціў пяцігодку выкананай за 4 гады і 3 месяцы. Гэта не адпавядала рэчаіснасці, паколькі план першай пяцігодкі, як і ўсіх даваенных пяцігодак, не быў выкананы.

***Вынікі індустрыялізацыі*** не былі адназначнымі:

*станоўчыя:* у 1931 г. былі ліквідаваныя біржы працы і знікла беспрацоўе. У БССР узніклі новыя галіны прамысловасці, такія як сельскагаспадарчае машынабудаванне, станкабудаванне, хімічная вытворчасць і інш. За гады першай пяцігодкі былі пабудаваныя швейная і панчошна-трыкатажная фабрыкі ў Віцебску, фабрыка штучнага валакна і трубаліцейны завод у Магілёве, дрэваапрацоўчыя камбінаты ў Гомелі, Бабруйску і Барысаве, завод сельскагаспадарчых машын у Гомелі і інш.; у другой пяцігодцы (1933–1937 гг.) былі пабудаваныя Гомельскі шклозавод, Крычаўскі цэментны завод, Аршанскі льнокамбінат, Магілёўскі аўтаматорны завод і інш. З аграрнай краіны БССР ператварылася ў аграрна-індустрыяльную;

*адмоўныя:* індустрыялізацыя праводзілася фарсіраванымі тэмпамі і каманднa-адміністрацыйнымі метадамі. Фактычна аднаўлялася жорсткая цэнтралізаваная сістэма кіравання прамысловасцю перыяду «ваеннага камунізму». Прамысловасць Беларусі стала

часткай адзінага эканамічнага арганізму Савецкага Саюза і магла функцыяніраваць толькі ў ім, паколькі гаспадарчыя сувязі паміж прадпрыемствамі былі жорстка рэгламентаваны цэнтрам.

Сацыялістычнае спаборніцтва суправаджалася павелічэннем норм выпрацоўкі і зніжэннем расцэнак выпускаемай прадукцыі, што патрабавала неверагоднага напружання сіл працоўных. Невыкананне плана разглядалася як наўмыснае «шкодніцтва», і па ўсёй краіне разгарнуліся масавыя кампаніі па выкрыцці «контррэвалюцыйных элементаў». У ходзе індустрыялізацыі пагоршылася матэрыяльнае становішча ўсіх слаёў насельніцтва і ў першую чаргу сялянства ў час правядзення калектывізацыі.

***Калектывізацыя*** – палітыка ў СССР у канцы 1920-х – 1930-я гг., якая заключалася ў масавым пераводзе сялянскіх гаспадарак з індывідуальнай сістэмы гаспадарання на калектыўную і стварэнні калгасаў.

*Прычыны калектывізацыі* былі абумоўлены неабходнасцю пошуку сродкаў для правядзення індустрыялізацыі. Разам з тым бальшавікамі была пастаўлена задача ліквідацыі прыватнай уласнасці ў вёсцы, а для гэтага неабходна было ліквідаваць заможныя (*кулацкія*) сялянскія гаспадаркі. Іх уласнікі, як свабодныя таваравытворцы, не «ўпісваліся» ў рамкі адміністрацыйнага рэгламентавання эканомікі, паколькі выкарыстоўвалі ў сваёй гаспадарцы наёмную сілу, мелі прыбытак і таму разглядаліся бальшавікамі як класавыя ворагі.

Каапераванне сялянскіх гаспадарак адбывалася і раней у розных формах: спажывецкай, збытавай, вытворчай. Яны былі распаўсюджаны ў перыяд НЭП, а галоўным прынцыпам была добраахвотнасць. Курс на калектывізацыю быў узяты ў 1927 г. на XV з’ездзе ВКП(б), а з 1928 г. аб’яднанне сялянскіх гаспадарак у буйныя калгасы стала генеральнай лініяй партыі.

Першапачаткова калектывізацыя разумелася як *добраахвотнае* і *паступовае* аб’яднанне сялянскіх гаспадарак. Але сама ідэя аб’яднання ў калгасы на тэрыторыі Беларусі, як і ў іншых рэгіёнах СССР, не знайшла падтрымкі не толькі сярод простага насельніцтва, але і сярод кіруючых партыйных работнікаў. Супраць яе правядзення выступіла большасць беларускіх камуністаў, сярод якіх быў

наркам земляробства БССР Д. Ф. Прышчэпаў. Таму ажыццяўленне калектывізацыі на тэрыторыі Беларусі стала магчымым толькі пасля іх арышту.

Добраахвотна ў калгасы да сярэдзіны 1929 г. аб'ядналіся каля 13 тыс. сялянскіх гаспадарак Беларусі, што складала прыблізна 1,4% ад іх агульнай колькасці. Пераважна гэта былі гаспадаркі беднейшых сялян, якім абагульняць у калгасную маёмасць па сутнасці не было чаго.

Калектывізацыя ў БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, актывізавалася ў перыяд збору ўраджаю 1929 г., а вялікіх тэмпаў дасягнула ў снежні 1929 г. На паскарэнне тэмпаў калектывізацыі паўплываў артыкул Сталіна «*Год вялікага пералому*», які быў надрукаваны ў газеце «*Праўда*» 7 лістапада 1929 г. У ім сцвярджалася, што ў калгасы пайшлі асноўныя серадняцкія масы, што абсалютна не адпавядала рэчаіснасці, паколькі ў калгасах на той час было аб'яднана каля 6–7% сялянскіх гаспадарак, большасць з якіх былі бядняцкімі.

Каб прывесці ў адпаведнасць сталінскія жаданні і рэальную сітуацыю, у СССР пачалася «гонка за тэмпамі». 5 студзеня 1930 г. ЦК ВКП(б) выдаў пастанову «Аб тэмпе калектывізацыі і мерах дапамогі дзяржавы калгаснаму будаўніцтву», у якой для БССР быў вызначаны тэрмін завяршэння калектывізацыі – да 1933 г. Ад прынцыпу паступовасці і добраахвотнасці бальшавікі перайшлі да прынцыпу *суцэльнай* калектывізацыі, якая ажыццяўлялася *гвалтоўнымі, прымусовымі* метадамі. У дапамогу партыйным і савецкім работнікам у сельскую мясцовасць па ўсім СССР былі накіраваны 25 тысяч найбольш актыўных рабочых-камуністаў (*«дваццаціпяцітысячнікі»*).

Такім чынам, за першыя тры месяцы 1930 г. колькасць сялянскіх гаспадарак, аб'яднаных у калгасы, узрасла да 58%. Але гэта выклікала супраціў сялянства: ад забойства жывёлы, каб не здаваць яе ў калгас, сяляне перайшлі да антысавецкіх узброеных выступленняў. З пачатку студзеня да сярэдзіны красавіка 1930 г. толькі ў БССР было зарэгістравана 520 сялянскіх выступленняў.

Газета «Праўда» 2 красавіка 1930 г. апублікавала артыкул Сталіна «*Галавакружэнне ад поспехаў*», у якім крытыцы была падвергнута

практыка прымусовай калектывізацыі. Сталін абвінаваціў ва ўсім мясцовыя ўлады («*перагібы на месцах*»). Сяляне зразумелі гэта як права выхаду з калгасаў, і да 1 чэрвеня 1930 г. колькасць сялянскіх гаспадарак у калгасах скарацілася да 11%, зніклі гвалтоўна створаныя калгасы.

Аднак летам 1930 г. адбылася наступная хваля калектывізацыі. Дапамогу ў яе правядзенні аказвалі машына-трактарныя станцыі (МТС) і створаныя пры іх палітаддзелы. Гэтая хваля прыкрывалася лозунгам аб «класавай барацьбе ў вёсцы». Яшчэ 1 лютага 1930 г. была выдадзена пастанова, якая заканадаўча замацоўвала неабходнасць ліквідацыі кулацтва як класа. З гэтага ж года было забаронена прымаць у калгасы кулакоў. Працэс калектывізацыі быў падменены працэсам «*раскулачвання*». Лёс кулакоў быў цяжкі: ад перасялення на поўнач да турэмнага зняволення і нават расстрэлу. 1932 г. быў абвешчаны «*годам суцэльнай калектывізацыі*».

Адсутнасць грашовай аплаты работы (сяляне працавалі за працадні) і ўласнай гаспадаркі ставіла пад пагрозу жыццё сялян. Разам з тым хутка падала прадукцыйнасць сельскагаспадарчай вытворчасці ў калгасах, як у галіне вырошчвання збожжа, так і ў жывёлагадоўлі. У 1932 г. для ўсіх грамадзян СССР была ўведзена пашпартная сістэма, якая давала свабоду перамяшчэння, аднак сяляне пашпартоў не атрымалі. Гэта была свядомая палітыка дзяржавы, накіраваная на спыненне масавых уцёкаў сялян у гарады.

Найбольш цяжкая сітуацыя склалася ў 1932–1933 гг., калі ў многіх раёнах Расіі і ва Ўкраіне ўзнік страшэнны голад, выкліканы продажам за мяжу вялікай колькасці збожжа на патрэбы індустрыялізацыі. 7 жніўня 1932 г. СНК СССР прыняў закон аб ахове сацыялістычнай уласнасці, які ў народзе атрымаў назву «закон аб трох каласках». Згодна з ім, за збор збожжавага калосся з калгасных палёў вінаватыя падлягалі расстрэлу, які ў асобных выпадках мог быць заменены на 10-гадовае зняволенне з канфіскацыяй маёмасці. У БССР па гэтым законе было асуджана амаль 11 тыс. чалавек. Каб некалькі палепшыць жыццё сялян, толькі ў 1937–1938 гг. ім былі выдзеленыя невялікія зямельныя ўчасткі для вырошчвання бульбы і гародніны.

***Вынікі калектывізацыі.*** Да 1939 г. у калгасах на тэрыторыі БССР было аб'яднана больш за 90% сялянскіх гаспадарак. Усталявалася калгасная ўласнасць, і калгаснікі фактычна былі адхілены ад валодання сродкамі вытворчасці. Невялікі працэнт аднаасобнікаў быў абкладзены нязноснымі падаткамі. У БССР было раскулачана 34 тыс. сялянскіх гаспадарак, каля 700 тыс. вяскоўцаў былі высланыя на поўнач.

Такім чынам, за кошт каласальных ахвяраў да 1939 г. калектывізацыя ў БССР была завершана. Аднак вытворчасць у створаных калектыўных гаспадарках падала, скарачалася колькасць цяглавай і прадукцыйнай жывёлы, а праца, нягледзячы на стварэнне МТС, заставалася ў асноўным ручной.

Але сваёй галоўнай мэты калектывізацыя дасягнула – прыватная ўласнасць на вёсцы была ліквідавана; за кошт стварэння калгасаў і арганізацыі калектыўнай працы дзяржава атрымала вялікія сродкі, неабходныя для правядзення індустрыялізацыі.

**4.** ***Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у канцы 1920-х – 1930-я гг.*** У канцы 1920-х – сярэдзіне 1930-х гг. з прыходам да ўлады Сталіна, у БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, адбывалася ўсталяванне *таталітарнага рэжыму*. **Таталітарызм** – гэта тып палітычнай і грамадскай сістэм, якія характарызуецца імкненнем дзяржавы да поўнага (*татальнага*) кантролю над усімі сферамі жыцця грамадства, забаронай дэмакратычных арганізацый і ліквідацыяй канстытуцыйных правоў і свабодаў грамадзян. Сутнасцю таталітарызму з'яўляецца яго ідэалогія. У адрозненне ад іншых сацыяльных сістэм, напрыклад, феадалізму або капіталізму, якія ўзніклі натуральным шляхам развіцця гісторыі, таталітарны строй






*Герб БССР 1926–1937 гг.*

ствараўся мэтанакіравана на падставе вызначанай ідэалагічнай дактрыны. Ёй з'яўлялася ідэя аб непазбежнасці пабудовы «светлай будучыні» – камунізму. Для гэтага неабходна было адмовіцца ад мінулага, а цяперашняе жыццё падпарадкаваць ажыццяўленню вышэйзгаданай ідэі.

Таталітарызму ўласцівы наступныя прыкметы, якія мелі месца ў Савецкай Беларусі ў разгляданы час:

• *манаполія дзяржавы на сродкі вытворчасці і вынікі працы*. Такая сітуацыя стала магчымай з ліквідацыяй НЭП і ажыццяўленнем палітыкі індустрыялізацыі і калектывізацыі, пры якіх быў поўнасцю ліквідаваны прыватны капітал у прамысловасці і сельскай гаспадарцы, а непасрэдны вытворца – рабочы і селянін – адхілены ад валодання сродкамі вытворчасці;

• *жорсткая дзяржаўная сістэма размеркавання матэрыяльных даброт*. У выніку правядзення індустрыялізацыі ўзмацнілася эканамічная залежнасць БССР ад цэнтра. Усе даходы пералічваліся ў саюзны бюджэт, а там адвольна вырашалі, колькі сродкаў выдзеліць на развіццё народнай гаспадаркі Беларусі. Размеркаванне ажыццяўлялася і сярод кіраўнікоў партыйных і савецкіх органаў. Простае насельніцтва (рабочыя і сяляне) пераводзілася на сістэму самазабеспячэння за кошт выдзялення ім невялікіх зямельных надзелаў і прысядзібных участкаў;

• *культ асобы* – рэжым асабістай улады, пры якім узвялічвалася роля аднаго чалавека (Сталіна), яму ж прыпісвалася магчымасць вызначальна ўплываць на ход гістарычных падзей. Замацаванне культу асобы ў БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, фактычна адбылося да сярэдзіны 1930-х гг.;

• *наяўнасць каманднa-адміністрацыйнай сістэмы* – іерархічна арганізаванай сістэмы кіравання грамадствам, якая заснавана на прынцыпах бюракратычнага цэнтралізму. У СССР характарызавалася непадзельнай уладай адной партыі – партыі камуністаў.

У рамках каманднa-адміністрацыйнай сістэмы дзейнічаў прынцып: *«Забаронена ўсё, што не загадана»*. Узаемадзеянне апарата кіравання і мас ажыццяўлялася праз іерархічную сістэму сувязяў *«загад – выкананне»*, прычым зваротнай сувязі не існавала. Гэтая сістэма выхоўвала паслухмяных выканаўцаў, якія павінны былі верыць у бязгрэшнасць і беспамылковасць вышэйшага кіраўніцтва партыі і дзяржавы. У такіх умовах страчвалася роля саветаў, грамадскіх арганізацый, нізавых органаў самой партыі. Затое павялічылася роля Народнага камісарыята ўнутраных спраў (НКУС), які выкарыстоўваўся для расправаў з праціўнікамі сталінскага курса. Дзяржава з грамадска-палітычнага інстытута ператваралася ў нейкі механізм, у якім чалавек, пазбаўлены ўласнасці, улады і кіравання, станавіўся простым *«вінцікам»* велізарнай машыны пад назвай «дзяржава»;

• *адсутнасць дэмакратычных правоў і свабодаў*. У 1936 г. у СССР была прынятая Канстытуцыя, якая задэкларавала правы савецкіх грамадзян на свабоду слова, недатыкальнасць асобы, тайну перапіскі, незалежны суд і інш. дэмакратычныя правы. Але на самой справе гэта не выконвалася. Побач з усімі пералічанымі ў Канстытуцыі правамі ў Савецкім Саюзе існавала бязлітасная рэпрэсіўная машына, прымяняліся арышты і расстрэлы;

• *масавыя рэпрэсіі* з’яўляліся важным атрыбутам функцыянавання таталітарнай сістэмы. У краіне не існавала прэзумпцыі невінаватасці: на людзей прышчапляўся ярлык «ворагаў народа», яны падвяргаліся рэпрэсіям. Часта канчатковае рашэнне аб лёсе чалавека прымалі знакамітыя «тройкі». Яшчэ хутчэй закруціла рухавік масавых рэпрэсій пастанова ЦВК СССР ад 1 снежня 1934 г., якая прадпісвала праводзіць следства па справах тэрарыстычных арганізацый у 10-дзённы тэрмін, разглядаць іх у судзе без прысутнасці адвакатаў, а прысуды выконваць адразу пасля іх абвяшчэння. Па абвінавачванню ў тэрарызме і супрацоўніцтве з варожымі разведкамі (у БССР – пераважна з Польшчай) былі рэпрэсіраваны сотні тысяч людзей.

***Барацьба з нацдэмамі.*** Сталіну для таго, каб трывала замацаваць свае пазіцыі, трэба было знішчыць найбольш адукаваную

частку грамадства, здольную разабрацца ў рэальнай сітуацыі – інтэлігенцыю. На беларускую інтэлігенцыю прышчапілі ярлык «нацыянал-дэмакратызму», абвінаваціўшы ў варожай савецкаму ладу дзейнасці з мэтай рэстаўрацыі капіталізму ў Беларусі. Ужо ў канцы 1920-х гг. арыштам падвергліся тыя дзеячы, якія актыўна праводзілі палітыку беларусізацыі: быў змешчаны з пасады старшыня ўрада БССР **І. Адамовіч**, пераследу падвергліся прэзідэнт Акадэміі навук БССР **У. Ігнатоўскі** і першы старшыня СНК БССР **З. Жылуновіч**. З больш чым 800 удзельнікаў беларускага нацыянальнага руху 1917–1927 гг. былі рэпрэсіяваныя ўсе, хто не з'ехаў у эміграцыю.

Вышэйшай кропкай барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам стала сфабрыкаваная справа, якая атрымала назву «*Саюз вызвалення Беларусі*» (СВБ). У 1931 г. за «прыналежнасць» да яе было асуджана 90 чалавек, галоўным чынам работнікаў культуры, навукі, мастацтва. Роля кіраўніка СВБ адводзілася народнаму пісьменніку Янку Купалу, але спробай самагубства ён сябе «рэабілітаваў» у вачах дзяржаўнай улады.

У 1930-я гг. вялікі ўрон быў нанесены беларускай культуры, навуцы і беларускай нацыянальнай ідэі. Пасля палітыкі беларусізацыі, у канцы 1920-х – 1930-я гг. савецкі ўрад праводзіў на тэрыторыі БССР цэлы комплекс мерапрыемстваў у галіне навукі і культуры, які атрымаў назву «*культурнай рэвалюцыі*». З аднаго боку, гэтыя мерапрыемствы садзейнічалі павышэнню адукаванасці насельніцтва і культурнага ўзроўню мас, а з другога – рабілася ўсё для таго, каб знішчыць адметнасць і самабытнасць беларускага народа. Нават выкладанне на беларускай мове ў 1930-я гг. магло быць пастаўлена ў віну і кваліфікавана як нацдэмаўшчына. Так здарылася з рэктарам БДУ **У. Пічэтам**.

У 1933 г. была праведзена рэформа беларускай мовы, у выніку чаго яна значна наблізілася да рускай. 1778 найменняў кніг на беларускай мове падлягалі знішчэнню. Былі расстраляныя больш за 100 навуковых супрацоўнікаў Акадэміі навук БССР, большасць выкладчыкаў БДУ, з 238 беларускіх пісьменнікаў больш за 200 былі рэпрэсіраваныя. Чарговы раз у гісторыі Беларусь па сутнасці апы-

нулася без нацыянальнай эліты. Акрамя таго, рэпрэсіі зведала і простае насельніцтва: сяляне-«кулакі» і абвінавачаныя ў «шкодніцтве» рабочыя. Ад маршала да хатняй гаспадыні – ніхто не быў застрахаваны ад арышту.

Пік сталінскіх рэпрэсій прыйшоўся на 1937–1938 гг. Было абвешчана, што ў БССР існуюць антысавецкае падполле і нацыянал-фашысцкая арганізацыя, у якія ўваходзіць вышэйшае партыйнае кіраўніцтва рэспублікі. У выніку праведзеных рэпрэсій рэспубліканская партыйная арганізацыя страціла 40% свайго складу, а з 101 сакратара райкамаў Беларусі былі рэпрэсіраваны 99 чалавек.

У 1939 г., у час знаходжання на пасадзе кіраўніка НКУС БССР **Л. Цанавы**, было арыштавана 27 тыс. чалавек – амаль па 900 чалавек у дзень. Толькі ў адным месцы – ва ўрочышчы *Курапаты* пад Мінскам – было знойдзена больш за 100 тыс. пахаваных ахвяр сталінскіх рэпрэсій. Усяго, паводле падлікаў вучоных, у 1930-я гг. у Беларусі было рэпрэсіравана больш за 600 тыс. чалавек.

Такім чынам, грамадска-палітычнае жыццё ў Савецкай Беларусі ў канцы 1920-х – 1930-я гг. характарызавалася ўсталяваннем таталітарнага рэжыму і культу асобы, якія суправаджаліся непрымірымасцю да любых спроб непадпарадкавання і масавымі рэпрэсіямі.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Беларусізацыя*** – палітыка нацыянальна-дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР у 1920-я гг.

***Гаспадарчы разлік*** – метад гаспадарання, пры якім даходы, якія атрымлівае прадпрыемства ад рэалізацыі сваёй прадукцыі, пакрываюць яго выдаткі на вытворчасць гэтай прадукцыі.

***ГУЛАГ*** – абрэвіятура галоўнага ўпраўлення лагерамі, якое існавала ў СССР у сталінскія часы.

***Індустрыялізацыя*** – палітыка ў СССР у канцы 1920-х – 1930-я гг. па стварэнню буйной машыннай вытворчасці ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

***Кааперацыя*** – форма арганізацыі працы, пры якой адбываецца добраахвотнае аб’яднанне людзей для сумеснай працоўнай дзейнасці.

***Калектывізацыя*** – прымусовае аб’яднанне дробных аднаасобных сялянскіх гаспадарак у буйныя калектыўныя (калгасы).

***Карэнізацыя*** – вылучэнне ўраджэнцаў Беларусі на дзяржаўныя пасады ў перыяд беларусізацыі.

***Культ асобы*** – узвялічванне ролі аднаго чалавека, прыпісванне яму вызначальнага ўплыву на ход гістарычных падзей.

***Новая эканамічная палітыка (НЭП)*** – шэраг мерапрыемстваў Савецкай дзяржавы ў галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі і фінансавай сферы ў 1920-я г., накіраваных на вывад эканомікі з крызісу з частковым ужываннем элементаў рыначнай эканомікі.

***Рэпрэсіі*** – неабгрунтаванае, незаконнае прыцягненне да крымінальнай адказнасці за так званыя контррэвалюцыйныя дзеянні. Праводзіліся ў форме расстрэлу, турэмнага зняволення, высылак, накіравання на спецпасяленне за межы рэспублікі і інш.

***Таталітарны рэжым*** – форма дзяржаўнай улады, пры якой ажыццяўляецца поўны (татальны) кантроль над усімі сферамі жыцця грамадства, забараняюцца дэмакратычныя арганізацыі і ліквідуюцца канстытуцыйныя правы і свабоды грамадзян.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***Люты–сакавік 1921 г.*** – антыбальшавіцкае выступленне ў крэпасці Кранштадт («Кранштацкі мяцеж»).

***8–16 сакавіка 1921 г.*** – X з’езд РКП(б), бальшавікі пачалі праводзіць «новую эканамічную палітыку» (НЭП).

***18 сакавіка 1921 г.*** – Рыжскі мірны дагавор паміж РСФСР і УССР, з аднаго боку, і Польшчай – з другога. Заходняя Беларусь адышла да Польшчы (II Рэчы Паспалітай).

***30 студзеня 1922 г.*** – у г. Мінску заснаваны Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт).

***30 снежня 1922 г.*** – I Усесаюзны з’езд Саветаў у г. Маскве, падпісанне Дэкларацыі і Дагавора аб утварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР).

***3 сакавіка 1924 г.*** – першае ўзбуйненне БССР: вяртанне ў склад Беларусі ад РСФСР пятнаццаці паветаў Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў, у якіх пераважала беларускае насельніцтва.

***Ліпень 1924 г. – пачатак 1929 г.*** – ажыццяўленне ў БССР палітыкі беларусізацыі.

***14–19 лістапада 1926 г.*** – акадэмічная канферэнцыя па рэформе беларускага правапісу і азбукі. Склікана Інстытутам беларускай культуры. Павінна была прадэманстраваць адзінства паміж КП(б)Б, заходнебеларускім нацыянальным рухам і беларускай палітычнай эміграцыяй.

***11 красавіка 1927 г.*** – прыняцце другой Канстытуцыі Беларускай ССР на VIII Усебеларускім з'ездзе Саветаў. Абвяшчала поўную роўнасць беларускай, яўрэйскай, рускай і польскай моў, але аддавала перавагу беларускай мове ў зносінах паміж дзяржаўнымі, прафесійнымі і грамадскімі ўстановамі і арганізацыямі. Дзейнічала да 1937 г.

***26 жніўня 1933 г.*** – пастанова СНК БССР «Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапісу».

***19 лютага 1937 г.*** – прыняцце трэцяй Канстытуцыі Беларускай ССР XII Надзвычайным Усебеларускім з'ездам Саветаў. Поўнасцю адпавядала Канстытуцыі СССР 1936 г. Дзейнічала да 1978 г.

***1937– пачатак 1941 гг.*** – масавыя расстрэлы мірнага насельніцтва органамі НКУС ва ўрочышчы Курапаты пад г. Мінскам.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Адамушка У.* Палітычныя рэпрэсіі 20–50-х гадоў на Беларусі. – Мінск, 1994.
2. *Бяспалая М. А.* Беларуская вёска ў першыя гады НЭПа (1921–1923 гг.). – Мінск, 1999.
3. *Вышынскі У. І.* Індустрыялізацыя БССР // Актуальныя пытанні гісторыі БССР. Савецкі перыяд. – Мінск, 1991.
4. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. – Мінск, 2006. – С. 138–473.
5. *Ігнаценка І., Кароль А.* Усевалад Ігнатоўскі і яго час. – Мінск, 1991.
6. Индустриализация Белорусской ССР (1926–1941 г.): Сборник документов и материалов. – Минск, 1975.

7. *Касцюк М.* Сталіншчына і Беларусь // Беларускі гістарычны часопіс. – 1995. – №1. – С. 9–14.
8. *Кузняцоў М. В.* Калектывізацыя: цяжкія шляхі ажыццяўлення // Актуальныя пытанні гісторыі БССР. Савецкі перыяд. – Мінск, 1991.
9. *Лыч Г. М.* Трагедыя беларускага сялянства. – Мінск, 2003.
10. *Мірановіч Я.* Найноўшая гісторыя Беларусі. – Санкт-Пецярбург, 2003.
11. *Мяснікоў А.* Нацдэмы. – Мінск, 1993.
12. Правда истории: память и боль. – Минск, 1991.
13. *Сарокін А.* Церні калектывізацыі // Полымя. – 1990. – № 2.
14. *Шыбека З.* Ці былі кулакі на Беларусі? // Літаратура і мастацтва. – 1991. – 22 сакавіка.
15. *Шыбека З.* Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002). – Мінск, 2003.
16. Эканамічная гісторыя Беларусі: Вучэб. дапам. – Мінск, 1999.

# РАЗДЗЕЛ 9.
# ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ У МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД (1921–1939 гг.)

1. *Заходняя Беларусь пасля Рыжскага міру (1921 – пачатак 1930-х гг.).*
2. *Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі.*
3. *Беларускае пытанне ў Заходняй Беларусі ў 1930-я гг.*
4. *Беларуская культура ў Заходняй Беларусі.*
5. *Пачатак Другой сусветнай вайны. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.*

**1.** ***Заходняя Беларусь пасля Рыжскага міру (1921 – пачатак 1930-х гг.).*** Беларускія землі, якія па Рыжскім мірным дагаворы 18 сакавіка 1921 г. апынуліся ў складзе Польшчы, былі ўключаныя ў склад 4-х ваяводстваў (Віленскага, Беластоцкага, Навагрудскага і Палескага). Ваяводствы падзяляліся на паветы, паветы – на гміны.




*Памежная чыгуначная станцыя Негарэлае.*

Гэтыя землі атрымалі неафіцыйную назву «Заходняя Беларусь», хаця польскія ўлады замацавалі за імі назву «ўсходнія ўскраіны» («*крэсы всходне*»). Плошча Заходняй Беларусі складала больш за 113 тыс. кв. км. Тут пражывала 4,6 млн. насельніцтва, 70% якога складалі беларусы.

***Эканоміка Заходняй Беларусі.*** Асаблівасці эканамічнага развіцця Заходняй Беларусі вызначаліся мэтамі польскіх уладаў – ператварыць усходнія ўскраіны ў аграрна-сыравінны прыдатак больш развітых прамысловых раёнаў карэннай Польшчы, у крыніцу таннай рабочай сілы і рынак збыту для польскіх прамысловых тавараў.

Менавіта таму польскі ўрад нічога не рабіў для развіцця прамысловасці на гэтых землях. У Заходняй Беларусі амаль не было цяжкай прамысловасці. Пераважную большасць прадпрыемстваў тут складалі дробныя, якія займаліся перапрацоўкай прадуктаў сельскай гаспадаркі і некаторых відаў мясцовай сыравіны. Так, на долю харчовай і дрэваапрацоўчай прамысловасці тут прыходзілася 2/3 прадпрыемстваў. Прамысловых прадпрыемстваў з колькасцю рабочых больш чым 100 чалавек было ўсяго 19. Сярод іх – шклозавод «Нёман», запалкавая фабрыка «Прагрэс-Вулкан» у Пінску, тытунёвая фабрыка ў Гродне і інш.

Пэўнае ажыўленне прамысловай вытворчасці адбылося ў першыя пасляваенныя гады. Але ў 1924–1926 гг. краіну ахапіў эканамічны крызіс. У 1924 г. была праведзена грашовая рэформа, якая спыніла гіперінфляцыю. У ходзе рэформы замест маркі была ўведзена польская нацыянальная валюта – злоты.

Адмоўна паўплываў на эканоміку Польшчы сусветны эканамічны крызіс 1929–1933 гг. Асабліва пацярпела прамысловасць у Заходняй Беларусі. Эканамічная дэпрэсія, якая характарызавалася агульным застоем вытворчасці, цягнулася да 1937 г.

Рабаўніча польскія ўлады адносіліся да прыродных рэсурсаў на тэрыторыях, атрыманых па Рыжскім міры. Так, напрыклад, за перыяд 1921–1936 гг. было знішчана (высечана і вывезена на продаж) больш за 400 тыс. гектараў Белавежскай пушчы.

Вядучым напрамкам у эканоміцы Заходняй Беларусі была дрэваапрацоўка (найбольш вытворчасць фанеры, паперы, запалак).

Згортвалася харчовая (за выключэннем мяса-малочнай) вытворчасць. Гарбарная, тэкстыльная і металаапрацоўчая галіны прамысловасці прыйшлі ў заняпад. Акрамя таго, існуючая ў Заходняй Беларусі вытворчасць вызначалася тэхнічнай адсталасцю.

***Сельская гаспадарка.*** У Заходняй Беларусі захавалася памешчыцкае землеўладанне. Больш за 80% ад агульнай колькасці жыхароў тут складалі сяляне, якія пакутавалі ад малазямелля, цяжкіх падаткаў, высокіх цэн на прадукцыю прамысловасці і нізкіх на сельскагаспадарчыя тавары. У пошуках лепшага жыцця беларускае насельніцтва масава выязджала на заробкі ў Аргентыну, Бразілію, Канаду, ЗША.

У ліпені 1925 г. польскім соймам быў прыняты закон аб зямельнай рэформе, якая складалася з наступных мерапрыемстваў:

• *парцэляцыя* – падзел на дробныя ўчасткі (парцэлы) ад 2 да 20 га і продаж праз банкі дзяржаўных, памешчыцкіх і так званых пакінутых земляў (земляў бежанцаў гадоў Першай сусветнай вайны, якія не вярнуліся на Радзіму);

• ліквідацыя *сервітутаў*;

• *камасацыя* – ліквідацыя цераспалосіцы і хутарызацыя сялянскіх гаспадарак;

• распаўсюджанне інстытута *асадніцтва.* Асаднікамі называліся ваенныя і грамадзянскія каланісты, якіх польскі ўрад перасяляў з тэрыторыі карэннай Польшчы ў Заходнюю Беларусь для ўмацавання тут сваіх інтарэсаў. Асаднікі атрымлівалі на льготных умовах або задарма ўчасткі (асады) памерам ад 12 да 45 га, крэдыты і будаўнічыя матэрыялы. Да 1934 г. на землі Заходняй Беларусі былі пераселены 8742 асаднікі, якія з’яўляліся апорай польскага ўрада, падтрымлівалі палітыку паланізацыі, былі ўзброены і нярэдка выкарыстоўваліся ўладамі для падаўлення нацыянальна-вызваленчага руху.

Рэформа садзейнічала канцэнтрацыі сельскагаспадарчай вытворчасці і развіццю ў вёсцы капіталістычных адносін. Яна паспрыяла з’яўленню беларускага фермерства, але не закранула памешчыцкага землеўладання і амаль не зменшыла колькасці малазямельных і беззямельных сялян. У выніку аграрнай палітыкі

ўрада ўзмацніліся пазіцыі польскага каланізацыйнага элемента і разам з гэтым пагоршылася становішча беларускіх сялян, асабліва вясковай беднаты. Паляпшэнне свайго становішча адчулі толькі заможныя сяляне.

***Палітычны рэжым.*** У міжваенны перыяд Польшча ўяўляла сабой буржуазна-дэмакратычную рэспубліку з двухпалатным парламентам (сеймам). З 1926 г. у краіне быў усталяваны аўтарытарны рэжым **Ю. Пілсудскага,** з абмежаваным і падпарадкаваным ураду парламентам, які атрымаў назву «*санацыі*» (аздараўленне). Дзяржаўны апарат у Заходняй Беларусі выступаў як частка каланіяльнай улады. «Крэсы всходне» павінны былі стаць своеасаблівым «*санітарным кардонам*» і выконваць ролю буфера паміж СССР і Заходняй Еўропай з мэтай не дапусціць распаўсюджвання на гэтых землях камуністычных ідэй.

***Культурна-нацыянальнае жыццё.*** У польскім палітычным жыцці былі прадстаўлены дзве канцэпцыі вырашэння нацыянальнага пытання.

Польскія нацыянальныя дэмакраты прапаноўвалі праграму ўтварэння нацыянальнай дзяржавы, у якой ролю адзінага суверэна павінен быў адыгрываць польскі этнас. Прадстаўнікі ўсіх іншых этнасаў павінны былі быць паланізаваны (беларусы і ўкраінцы), альбо эмігрыраваць з краіны (немцы, яўрэі).

Сацыялісты ж і іх прыхільнікі лічылі, што нацыянальным меншасцям трэба гарантаваць права на свабоднае нацыянальнае жыццё, каб забяспечыць іх лаяльнасць у адносінах да польскай дзяржавы. Але рэальна ў Польшчы перамагла канцэпцыя ажыццяўлення *дзяржаўнай праграмы асіміляцыі нацыянальных меншасцяў.*

Так, нягледзячы на ўмовы Рыжскага мірнага дагавору, Польшча не прадаставіла Заходняй Беларусі статуса культурна-нацыянальнай аўтаноміі. Больш за тое, ва ўсіх сферах жыццядзейнасці адчувалася дыскрымінацыя беларусаў. У адносінах да беларускага насельніцтва польскі ўрад праводзіў палітыку прымусовай паланізацыі і асіміляцыі: беларусаў не бралі на дзяржаўную службу, да 1939 г. усе беларускія школы былі ператвораны ў польскія; закрываліся і забараняліся беларускія газеты і часопісы, бібліятэкі

і выдавецтвы; забаранялася ўжыванне беларускай мовы ў дзяржаўных установах; большая частка праваслаўных цэркваў была ператворана ў каталіцкія касцёлы і інш.

Палітыка паланізацыі найбольш яскрава праяўлялася ў закрыцці беларускіх школ і прызнанні каталіцызму адзінай дзяржаўнай рэлігіяй. Калі на землях Заходняй Беларусі яшчэ ў пачатку 1919 г. дзейнічалі 359 беларускіх школ, 2 настаўніцкія семінарыі (у Барунах і Свіслачы), 5 агульнаадукацыйных гімназій (Вільня, Клецк, Навагрудак, Нясвіж, Радашковічы), то ў 1924 г. засталося ўжо толькі 37 беларускіх школ і 4 гімназіі з абмежаванымі правамі.

Пад націскам нацыянальна-вызваленчага руху і для заспакаення міжнароднай грамадскасці польскі сейм вымушаны быў прыняць 31 ліпеня 1924 г. «Закон аб мове і арганізацыі школьнай справы для нацыянальных меншасцяў». Паводле закона беларускія школы маглі быць адкрыты ў тых паветах, дзе беларусы складалі не менш за 25% насельніцтва, і ў тым выпадку, калі гэтага хацелі не менш за 40 бацькоў дзяцей школьнага ўзросту. Але, калі б тут жа было б пададзена не менш за 20 заяваў бацькоў з падтрымкай навучання па-польску, то адкрывалася двухмоўная польска-беларуская школа. Менавіта такія школы і ствараліся, яны былі зручнымі для польскіх улад, праз іх праводзілася адкрытая паланізацыя беларускага насельніцтва.

Нягледзячы на тое, што ў 1922 г. Польская праваслаўная царква абвясціла аўтакефалію і разарвала ўсе сувязі з Маскоўскім патрыярхатам, абмежаванні да яе дзейнасці ў Польшчы працягваліся. Так, з 500 існаваўшых у Заходняй Беларусі праваслаўных цэркваў да 1924 г. больш за 300 былі ператвораны ў касцёлы.

У 1924 г. быў створаны спецыяльны рэпрэсіўны орган для насельніцтва ўсходніх ускраін «Корпус аховы памежжа», а прыняты 31 ліпеня 1924 г. Закон аб ужыванні беларускай, украінскай і літоўскай моў ва ўстановах і школах забяспечыў панаванне польскай мовы як адзінай дзяржаўнай. У адказ на пратэсты насельніцтва ўлады ўжывалі рэпрэсіўныя меры.

На пачатку 1930-х гадоў быў нават распрацаваны спецыяльны план асіміляцыі беларускай нацыянальнай меншасці ў Поль-

шчы. Гучалі прапановы аб надзяленні ўрада надзвычайнымі паўнамоцтвамі, якія б дазволілі ачысціць Польшчу «ад адкідаў грамадства і шкоднікаў», дзейнасць якіх перашкаджала хуткай асіміляцыі беларускіх масаў.

**2. *Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі*.** Узмацненне сацыяльнага, нацыянальнага і рэлігійнага прыгнёту выклікала актывізацыю нацыянальна-вызваленчага і рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. Ён падтрымліваўся з боку як СССР, так і з боку ўрада БНР, які знаходзіўся ў эміграцыі ў Коўне.

У першай палове 1920-х гг. нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі меў пераважна форму *ўзброенай партызанскай барацьбы*. Ім кіравалі ў заходніх раёнах *беларускія эсэры*, а на ўсходзе – *камуністы*. Колькасць партызан даходзіла да 6 тыс. чалавек. У 1924–1925 гг. імі было праведзена каля 280 баявых аперацый. Найбольш вядомымі арганізатарамі партызанскай барацьбы на тэрыторыі Заходняй Беларусі былі камуністы, спецыяльна прысланыя для гэтага з СССР К. П. Арлоўскі, С. А. Ваўпшасаў, В. З. Корж, А. М. Рабцэвіч.

У 1925 г. у Заходняй Беларусі склалася сітуацыя, якая магла прывесці да ўзброенага паўстання. Для яго прадухілення *польскі ўрад увёў на тэрыторыю Заходняй Беларусі вялікую колькасць рэгулярных войскаў*. Тут было ўведзена надзвычайнае становішча. Усюды дзейнічалі ваенна-палявыя суды і лютавалі карныя экспедыцыі. Рэпрэсіямі і тэрорам польскім уладам удалося задушыць партызанскі рух на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Вызваленчы рух у Заходняй Беларусі да канца 1920-х г. адбываўся пад лозунгам уз'яднання з БССР, дзе праводзілася палітыка беларусізацыі.

Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі найбольш праявіўся ў двух палітычных накірунках:

• *рэвалюцыйна-вызваленчы*, які быў прадстаўлены *Камуністычнай партыяй Заходняй Беларусі* (КПЗБ), створанай у 1923 г., *Камуністычным саюзам моладзі Заходняй Беларусі* (КСМЗБ). Іх прыхільнікі выступалі за арганізацыю партызанскай барацьбы супраць

польскага прыгнёту (**І. Лагіновіч** (старшыня ЦК КПЗБ), **А. Славінскі, С. Прытыцкі, В. Харужая** (сакратар ЦК КСМЗБ);



*Браніслаў Тарашкевіч.*

- *нацыянальна-дэмакратычны* накірунак, які напачатку ўзначальвала створаная ў 1921 г. культурна-асветніцкая арганізацыя *Таварыства беларускай школы* (ТБШ), а з 1925 г. – самая ўплывовая беларуская палітычная партыя *Беларуская сялянска-работніцкая грамада* (БСРГ) на чале з **Б. Тарашкевічам**, якая налічвала ў сваіх шэрагах да 120 тыс. чалавек. Прыхільнікі гэтай плыні прытрымліваліся выкарыстання парламенцкіх форм барацьбы.

Рабочыя і сяляне барацьбу за свае правы вялі шляхам пратэстаў, адмоваў ад працы, стачак і забастовак, якія нярэдка перарасталі ў антыўрадавыя дэманстрацыі, мітынгі і сутычкі з паліцыяй.

У першай палове 30-х гг. значна знізілася колькасць выступленняў рабочых і сялян з нацыянальна-вызваленчымі лозунгамі. Прычынай таму стаў эканамічны крызіс, які значна пагоршыў жыццё працоўных. У рабочым руху адбыўся паступовы рост забастовачнай барацьбы з перавагай стачак эканамічнага характару. Найбольш масавымі былі выступленні рабочых *дрэваапрацоўчай* прамысловасці: баставалі рабочыя лесапільных заводаў Гайнаўкі, Белавежы і Слоніма, лесарубы і возчыкі ў Белавежскай пушчы. Адбываліся забастоўкі на многіх прамысловых прадпрыемствах буйных гарадоў Заходняй Беларусі. Больш за чатыры месяцы, з кастрычніка 1932 г. па люты 1933 г. баставалі 7 тыс. рабочых і сялян, якія працавалі ў Белавежскай пушчы. Былі выпадкі захопу прадпрыемстваў рабочымі.

З 1931 г. пачаўся рост сялянскіх выступленняў. Пачыналіся яны звычайна з аграрных ці антыпадаткавых выступленняў. Часта яны

перарасталі ў партызанскую барацьбу, якая ахоплівала тэрыторыі цэлых паветаў. Яркай старонкай вызваленчай барацьбы ў вёсцы стала ўзброенае паўстанне сялян Кобрынскага павета ў жніўні 1933 г. Супраць паўстаўшых былі накіраваны карныя войскі і паліцыя з усяго ваяводства. Карнікі знішчылі мястэчка Навасёлкі, у якім выступленні сялян былі найбольш актыўнымі. Вядома і буйнейшае паўстанне нарачанскіх рыбакоў, у якім на працягу 1935–1939 гг. удзельнічала каля 5 тыс. чал.

Польскія ўлады жорстка распраўляліся з удзельнікамі нацыянальна-вызваленчага руху. Пачаліся палітычныя рэпрэсіі супраць камуністычных арганізацый і асабліва палітычных структур, якія прадстаўлялі нацыянальныя меншасці. На тэрыторыю Заходняй Беларусі ў 1925 г. былі ўведзены рэгулярныя войскі; праводзіліся карныя экспедыцыі; актывізавалі сваю дзейнасць агенты польскай палітычнай паліцыі – *дэфензівы*, якія выкрывалі ўсіх незадаволеных рэжымам; «нядобранадзейных» асоб адпраўлялі ў турмы ці ў спецыяльна створаны канцэнтрацыйны лагер у Бярозе-Картузскай. У 1927 г. была разгромлена Беларуская сялянска-работніцкая грамада (БСРГ) і арыштаваны яе кіраўнікі, у тым ліку дэпутаты сейма Рэчы Паспалітай Браніслаў Тарашкевіч, Сымон Рак-Міхайлоўскі і іншыя. Іх абвінавацілі ў тым, што яны падтрымліваюць камуністаў і вядуць антыдзяржаўную дзейнасць. Большасць барацьбітоў за нацыянальнае вызваленне зведалі рэпрэсіі, прайшлі праз польскія турмы, многія былі перададзены ў СССР падчас абмену палітвязнямі. Там, абвінавачаныя ў супрацоўніцтве з дэфензівай, яны сталі ахвярамі сталінскіх рэпрэсій 1937–1938 гг.

***3. Беларускае пытанне ў Заходняй Беларусі ў 1930-я гг.*** У 1930-я гады сітуацыя ў справе нацыянальнага жыцця і дэмакратычных свабодаў для беларусаў пагоршылася як у БССР, так і ў Заходняй Беларусі.

У 1930-я гады палітыка польскага ўрада, накіраваная на апалячванне насельніцтва Заходняй Беларусі, стала больш аўтарытарнай і агрэсіўнай. У жніўні 1930 г. па ініцыятыве маршала Ю. Пілсудскага прэзідэнт І. Масціцкі выдаў указ аб роспуску парламента. Праз ме-

сяц былі праведзены арышты лідэраў апазіцыі, а вынікі выбараў сфальсіфікаваны.

Бесперапынна ішла ліквідацыя беларускіх культурных установ. Працягвалі закрывацца праваслаўныя цэрквы. У 100-кіламетровай паласе ўздоўж савецкай мяжы праваслаўных пад пагрозай высылкі прымушалі пераходзіць у каталіцызм.

13 верасня 1935 г. Польшча анулявала трактат Лігі нацый аб нацыянальных меншасцях.

У кастрычніку 1936 г. Міністэрства ўнутраных спраў Польшчы падрыхтавала праект паскарэння нацыянальнай асіміляцыі беларусаў. На пачатку снежня гэтага ж года была забаронена дзейнасць Таварыства беларускай школы (ТБШ), а 22 студзеня 1937 г. – Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры. Да студзеня 1938 г. у Вільні яшчэ існаваў Беларускі нацыянальны камітэт, але і гэтую арганізацыю спачатку абвінавацілі ў нанясенні шкоды ў галіне абароны і адзінства польскай дзяржавы, а пасля распусцілі. У 1938 г. было адменена права мясцовага беларускага насельніцтва на свае школы. 18 лістапада 1938 г. прэзідэнт Польшчы падпісаў дэкрэт «Аб адносінах да польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы». Дакумент афіцыйна забяспечваў уплыў дзяржавы на кадравую палітыку царквы, зацвярджаў польскую мову як мову царкоўнага справаводства, абавязваў духавенства адпраўляць малебны ў дзяржаўныя святы, у імя прэзідэнта, урада, войска і значна абмяжоўваў правы праваслаўных грамадзян, якім, у прыватнасці, было адмоўлена ў праве набываць зямлю.

Нягледзячы на рэпрэсіі з боку паліцыі, пашыраўся рабочы і сялянскі рух, праходзілі дэманстрацыі і мітынгі беларускага насельніцтва Заходняй Беларусі ў абарону сваіх дэмакратычных і нацыянальных правоў.

**4.** ***Беларуская культура ў Заходняй Беларусі.*** Паводле ўмоў Рыжскага міру 1921 г. урад Польшчы абавязваўся надаць беларускаму і ўкраінскаму насельніцтву «правы, якія б забяспечвалі свабоднае развіццё культуры, мовы і выкананне рэлігійных абрадаў». Нацыянальным меншасцям гарантавалася права навучання на

роднай мове, ужывання яе ў грамадскіх і дзяржаўных установах. Аднак на самой справе ўрад Рэчы Паспалітай нават не даў Заходняй Беларусі статусу культурна-нацыянальнай аўтаноміі і праводзіў палітыку па іх поўнаму палітычнаму і культурнаму зліццю з Польшчай. Адкрыта праводзіўся курс *паланізацыі*. Яна ўяўляла сабой *сістэму мерапрыемстваў, якія праводзіліся польскімі дзяржаўнымі органамі, культурнымі ўстановамі, каталіцкім духавенствам па распаўсюджванні польскай мовы і культуры, па асіміляцыі беларускага насельніцтва.*

Супраць палітыкі польскіх улад на заходнебеларускіх землях, якая была нікіравана на паланізацыю і асіміляцыю беларусаў актыўна выступіла масавая легальная культурна-асветніцкая арганізацыя Таварыства беларускай школы, якая дзейнічала на працягу 1921–1937 гг. У розны час яго ўзначальвалі **Б. Тарашкевіч, І. Дварчанін, Р. Шырма.** Удзельнікі руху ТБШ выступалі за правa нацыянальнай школы для беларусаў, стваралі падручнікі, займаліся з насельніцтвам у гуртках самаадукацыі, адчынялі бібліятэкі і чытальні і інш.

У выніку ў канцы 1920-х гг. пад націскам грамадскасці было адчынена 18 беларускіх школ. Ідэйным кіраўніком ТБШ стаў вучоны-філолаг, літаратар, аўтар «Беларускай граматыкі для школ» (1918 г.) Браніслаў Тарашкевіч. Сапраўднымі асяродкамі беларускай мовы і культуры былі Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры (1926–1936 гг.), беларускія гімназіі ў Вільні (1914–1944 гг.), Навагрудку, Нясвіжы, Радашковічах, Клецку, Будславе (зачынены ў канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг.).

У віленскіх выдавецтвах выйшлі «Хрэстаматыя беларускай літаратуры XI век – 1905 год» **М. Гарэцкага** (1922 г.), «Хрэстаматыя новай беларускай літаратуры (ад 1905 г.)» І. Дварчаніна (1927 г.), падручнікі для беларускіх школ С. Рак-Міхайлоўскага, С. Паўлоўскага. Выдаваліся беларускамоўныя часопісы і газеты «Маланка», «Шлях моладзі», «Летапіс ТБШ» («Беларускі летапіс»), «Беларуская крыніца» і інш.

У Вільні на працягу 1918–1939 гг. дзейнічала Беларускае навуковае таварыства (БНТ) створанае **В. Ластоўскім**, братамі Іванам і Антонам Луцкевічамі. БНТ займалася рпаспрацоўкай белару-

скай навуковай тэрмінгалогіі, перакладам на беларускую мову педагагічынай, навуковай і мастацкай літаратуры, выдавала навуковыя зборнікі, сярод якіх «Беларуская мова ў школах Беларусі XVI і XVII ст.» (1928 г.), «Мужыцкая праўда і ідэя незалежнасці Беларусі» (1933 г.) і інш.

У 1921 г. на базе прыватнай калекцыі беларускага археолага і этнографа **І. Луцкевіча** па ініцыятыве БНТ быў заснаваны Віленскі беларускі гісторыка-этнаграфічны музей. У навуковай і культурна-асветніцкай рабоце актыўна ўдзельнічалі В. Ластоўскі, А. Станкевіч, Б. Тарашкевіч, браты Луцкевічы і інш.

***Літаратура і мастацтва.*** Заходнебеларускія літаратары 1921–1939 гг. бралі асноўныя ідэі сваіх твораў з жыцця народных мас, з барацьбы беларусаў за свае нацыянальныя і сацыяльныя правы. Менавіта ідэяй вызваленчай барацьбы прасякнутая кніга **І. Канчэўскага** (І. Абдзіраловіча) «Адвечным шляхам». Для заходнебеларускай літаратуры была характэрна перавага паэтычнага жанру, які таксама адзначаецца эмацыянальнай рэакцыяй на падзеі, актыўнай грамадзянскай пазіцыяй аўтараў, а таксама рамантызмам. Многія літаратары спалучалі сваю творчасць з удзелам у нацыянальна-вызваленчым руху. Найбольш яркім прадстаўніком тагачасных літаратурных творцаў з Заходняй Беларусі з’яўляецца **Максім Танк** (Скурко Яўген Іванавіч). Ён быў актыўным удзельнікам нацыянальна-вызваленчага руху. Падчас зняволення ў 1933 г. у віленскай турме Лукішкі арганізаваў выданне падпольнага рукапіснага часопіса «Краты». У 1936 г. у Вільні выйшаў яго першы зборнік вершаў «На этапах», а таксама зборнікі «Журавінавы цвет» (1937 г.), «Пад мачтай» (1938 г.) і паэма «Нарач» пра паўстанне нарачанскіх рыбакоў.

Паэзія і барацьба спалучаліся ў жыццёвым лёсе **П. Пестрака**. За сваю рэвалюцыйную дзейнасць ён правёў больш за 10 гадоў у польскіх турмах. У 1940 г., ужо пасля ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР, выдаў зборнік вершаў «На варце», прысвечаны барацьбе беларускага народа за сваё вызваленне.

З тэмай барацьбы за незалежнасць звязаны творы паэтаў-удзельнікаў нацыянальна-вызваленчага руху **В. Таўлая, М. Засіма**. Рамантызмам, лірызмам, любоўю да Радзімы характарызуюцца

творы **Н. Арсенневай** (зборнік вершаў «Пад сінім небам»), **К. Сваяка** (паэма «Купалле»), **У. Жылкі** (зборнікі вершаў «На ростані», «З палёў Заходняй Беларусі») і інш.

Значнай падзеяй у культурным жыцці Заходняй Беларусі стала выданне ў 1937 г. зборнікаў вершаў **М. Васілька** «З сялянскіх ніў», **М. Машары** «З-пад стрэх саламяных». Лепшым дасягненнем паэтычнага таленту В. Таўлая лічыцца яго паэма «Таварыш». У Заходняй Беларусі пачыналі сваю творчасць Я. Брыль, П. Граніт, А. Дубровіч, С. Крывец і іншыя.

Літаратурнай дзейнасцю займаўся ***М. Касцевіч*** (псеўданім – *М. Краўцоў*), які з 1921 г. жыў і працаваў у Вільні. Перш за ўсё ён вядомы як аўтар верша «*Мы выйдзем шчыльнымі радамі*». Гэты верш, пакладзены на музыку У. Тэраўскім, выкарыстоўваўся пад назвай «Ваяцкі гімн». М. Краўцоў перакладаў з рускай мовы творы М. Лермантава, М. Гогаля, Л. Талстога, М. Горкага, з украінскай – Т. Шаўчэнкі, з польскай – А. Міцкевіча, Г. Сянкевіча.

***Выяўленчае мастацтва. Тэатр.*** Выдатнай асобай, чалавекам, які шмат зрабіў для беларускай культуры быў **Язэп Драздовіч** – мастак, скульптар, разьбяр, пісьменнік, паэт, археолаг, фалькларыст, педагог. Я. Драздовіч супрацоўнічаў з Віленскім беларускім музеем імя Івана Луцкевіча, займаўся раскопкамі гарадзішчаў, збіраў фальклор, ствараў шматлікія замалёўкі прадметаў матэрыяльнай культуры, архітэктуры, тыпажоў сялян. У другой палове 1920-х гг. ён выкладаў маляванне ў Глыбоцкай школе, Наваградскай і Радашковіцкай беларускіх гімназіях. З 1926 г. Драздовіч працаваў у Віленскай беларускай гімназіі, пры якой стварыў мастацкую студыю-майстроўню. Ён зрабіў малюнкі старадаўніх замкаў у Крэве, Гальшанах, а таксама іншых архітэктурных пабудоў Беларусі.



*Язэп Драздовіч.*

Адметнай рысай Я. Драздовіча бы-



*Я. Драздовіч «Ф. Скарына».*



*Я. Драздовіч «Усяслаў».*

ло яго захапленне космасам. У 1931 г. ён выдаў у Вільні першую на беларускай мове кнігу па астраноміі «Нябесныя бегі», у якой выклаў шэраг сваіх тэорый, у прыватнасці, аб паходжанні планет Сонечнай сістэмы. Выданне ўпрыгожылі ўласныя малюнкі аўтара. У 1931–1933 гг. Я. Драздовіч працягнуў тэму космасу трыма серыямі графічных малюнкаў і жывапісных палотнаў «Космас», «Жыццё на Марсе», «Жыццё на Сатурне» і «Жыццё на Месяцы». Напісаў некалькі карцін і акварэляў, прысвечаных Ф. Скарыну. Я. Драздовіч



*Я. Драздовіч «Ляскова».*

з'яўляецца аўтарам насценных маляваных дываноў, якія сталі ўнікальнай з'явай у мастацтве славянскага свету і Еўропы ўвогуле. Калекцыя гэтых дываноў захоўваецца сёння ў Заслаўі, дзе Я. Драздовіч праводзіў археалагічныя раскопкі. Мастак стварыў графічныя партрэты славутых полацкіх князёў, шматлікія замалёўкі палескіх вёсак і іх жыхароў.

«Беларускім Леанарда да Вінчы» назваў Я. Драздовіча яго сябра, вядомы мастак П. Сергіевіч. Вучань знакамітага мастака Ф. Рушчыца, ён у 1928 г. скончыў Віленскі ўніверсітэт. У сваёй творчасці **П. Сергіевіч** адлюстроўваў краявіды роднай Браслаўшчыны, стварыў карціны на гістарычныя сюжэты, сярод іх – «Усяслаў Полацкі», «Беларусы», «Каліноўскі сярод паўстанцаў» і інш. Вядомы і іншыя жывапісныя партрэты, створаныя П. Сергіевічам у гэты час «Партрэт маці» (1929 г.), «Беларуская настаўніца» (1938 г.).

У Заходняй Беларусі працаваў мастак **М. Сеўрук,** які скончыў у 1932 г. мастацкі факультэт Віленскага ўніверсітэта імя Стэфана Баторыя. Для яго ранніх прац характэрны рысы рамантызму, апісанне жыцця простых людзей – «На ўборцы буракоў» (1936 г.), «Жніво» (1937 г.). М. Сеўрук з'яўляецца аўтарам вокладак зборніка вершаў М. Танка «На этапах», зборніка песень Р. Шырмы «Наша песня» (1938 г.), графічных прац «Віленская Alma mater» (1937 г.) і інш.

У Заходняй Беларусі ў разглядаемы час працавалі таксама мастакі Г. Семашкевіч, С. Вішнеўскі, Д. Крачкоўскі, В. Сідаровіч і інш. Жывапісец Ф. Рушчыц зрабіў замалёўкі замкаў у Міры, Крэва, Лідзе, іншых мясцінах.

У пачатку 1920-х гг. тэатральныя пастаноўкі ў Вільні ладзіла Беларуская драматычная майстроўня. Тут ствараліся гурткі мастацкай самадзейнасці, даваліся канцэрты. У рэпертуары пераважалі беларускія народныя песні, танцы. Драматычныя калектывы ставілі спектаклі «Паўлінка» і «Прымакі» Я. Купалы, «Модны шляхцюк» К. Каганца, «Суд» У. Галубка і інш. Аматарскія спектаклі былі своеасаблівай формай пратэсту супраць паланізацыі. Таму паліцыя часта арыштоўвала кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці, забараняла спектаклі.

Значную працу па збіранні і прапагандзе беларускага фальклору праводзілі **А. Грыневіч**, **Р. Шырма**. У 1923 г. А. Грыневіч выдаў першы беларускі падручнік па музыцы «Навука спеву», а ў 1928 г. – «Дзіцячы спеўнік». Важную ролю ў заходнебеларускай культуры адыграў Р. Шырма – стваральнік беларускага народнага хору, харавы дырыжор. Ён запісаў больш за 2000 беларускіх народных песень, узначальваў народныя хары ў шэрагу населеных пунктаў Заходняй Беларусі (Пружаны, Вільня). Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР Р. Шырма на працягу 30 гадоў узначальваў Беларускі ансамбль песні і танца, які быў пераўтвораны ў Дзяржаўную акадэмічную харавую капэлу, якая цяпер носіць яго імя.

Значны ўнёсак у музычную культуру зроблены кампазітарамі **К. Галкоўскім, Л. Раеўскім**, оперным спеваком і выканаўцам народных беларускіх песень **М. Забэйдам-Суміцкім.**

**5.** ***Пачатак Другой сусветнай вайны. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.*** На лёс насельніцтва Заходняй Беларусі, як і іншых еўрапейскіх народаў, моцна паўплывалі ваенна-палітычныя падзеі 1939 г., звязаныя з пачаткам Другой сусветнай вайны і новай расстаноўкай сіл у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. **23 жніўня 1939 г.** у Маскве міністрамі замежных спраў СССР і Германіі **В. Молатавым** і **І. Рыбентропам** быў падпісаны *пакт аб ненападзенні* («Пакт Рыбентропа-Молатава»), які ўтрымліваў дадатковы сакрэтны пратакол. У адпаведнасці з апошнім Савецкі Саюз і Германія падзялілі Еўропу на сферы ўплыву па рэках Нараў, Буг, Вісла, Сан. Тэрыторыі, якія былі размешчаны на захад ад гэтай лініі, прызнаваліся сферай інтарэсаў Германіі, а на ўсход – Савецкага Саюза.




*Савецкі плакат 1939 г.*



*Савецкія і нямецкія афіцэры*
*ў Заходняй Беларусі, верасень 1939 г.*

З нападу Германіі на Польшчу **1 верасня 1939 г.** пачалася Другая сусветная вайна. Маючы вялікую перавагу ў тэхніцы, войскі Германіі хутка падступілі да межаў Заходняй Беларусі, а **17 верасня 1939 г.** Сталін аддаў загад Чырвонай Арміі перайсці савецка-польскую мяжу. Да 25 верасня савецкія войскі поўнасцю занялі Заходнюю Беларусь і спыніліся на лініі Беласток-Брэст, а 28 верасня 1939 г. паміж СССР і Германіяй быў падпісаны *Дагавор аб дружбе і граніцы*, па якім усталёўвалася новая заходняя мяжа Савецкага Саюза па так званай «лініі Керзана». Дагавор аб дружбе і граніцы, як і заключаны раней сакрэтны пратакол, супярэчылі агульнапрызнаным нормам міжнароднага права, аднак яны аб’ектыўна аднаўлялі нацыянальна-тэрытарыяльнае адзінства беларускага народа, якое было парушана ўмовамі Рыжскага дагавора 1921 г.

22 кастрычніка 1939 г. прайшлі выбары ў Народны Сход, які адбыўся ў Беластоку **28–30 кастрычніка**. На ім было прынята рашэнне аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР, аб канфіскацыі памешчыцкіх зямель, нацыяналізацыі банкаў і буйной

прамысловасці. **2 лістапада 1939 г.** сесія Вярхоўнага Савета СССР прыняла закон аб уз'яднанні Заходняй Беларусі з БССР.

На далучаных тэрыторыях пачалося ўсталяванне савецкага ладу ва ўсіх сферах – эканоміцы, палітыцы, культуры і сацыяльным жыцці. Аднаўляліся зруйнаваныя прамысловыя прадпрыемствы, будаваліся новыя фабрыкі і заводы, паступова ліквідавалася беспрацоўе. Першапачаткова некалькі палепшылася становішча сялян за кошт змяншэння павіннасцяў на карысць дзяржавы і зніжэння цэн на прамысловыя тавары. На тэрыторыі Заходняй Беларусі было ўведзена бясплатнае медыцынскае абслугоўванне насельніцтва, створаны паліклінікі і бальніцы. З мэтай ліквідацыі непісьменнасці было ўтворана амаль 6 тыс. агульнаадукацыйных школ, большасць з якіх вялі навучанне на беларускай мове, 5 інстытутаў, 25 сярэдніх спецыяльных навучальных установаў. У заходніх абласцях дзейнічалі драматычныя і кінатэатры, Дамы культуры і бібліятэкі.

Такім чынам, уз'яднанне беларускага народа ў адной дзяржаве было, безумоўна, актам гістарычнай справядлівасці. Але разам са станоўчымі зменамі ўсталяванне савецкай улады на тэрыторыі Заходняй Беларусі суправаджалася выкарыстаннем уласцівага для яе механізма масавых рэпрэсій. Рэпрэсіі былі ўчынены супраць лідэраў нацыянальна-вызваленчага руху, супраць «кулакоў» падчас стварэння калгасаў, супраць інтэлігенцыі, якую абвінавачвалі ў супрацоўніцтве з польскімі ўладамі. Паводле даследаванняў беларускіх гісторыкаў, да 20 чэрвеня 1941 г. з заходніх абласцей Беларусі было вывезена ў Сібір або Казахстан звыш за 120 тыс. чалавек (у гэтую лічбу не ўключаны 14 тыс. афіцэраў польскай арміі, якія трапілі ў канцлагеры для ваеннапалонных).

Да таго ж, 10 кастрычніка 1939 г. па ініцыятыве Сталіна было прынята рашэнне аб перадачы Вільні і Віленскага краю Літве. У чарговы раз ад тэрыторыі Беларусі было адарвана 2,6 тыс. кв. км, на якіх пражывала каля 300 тыс. чалавек. У выніку перад Вялікай Айчыннай вайной у межах БССР знаходзілася 225 тыс. кв. км тэрыторыі і 10,5 млн. чалавек насельніцтва.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Асаднікі*** – польскія ваенныя і грамадзянскія каланісты ў Заходняй Беларусі.

***Беларуская сялянска-работніцкая грамада (БСРГ)*** – масавая легальная рэвалюцыйна-дэмакратычная нацыянальна-вызваленчая арганізацыя працоўных у Заходняй Беларусі ў 1925–1927 гг.

***Дэфензіва –*** арганізацыя, якая займалася контрразведкай і выконвала ролю палітычнай паліцыі ў міжваеннай Рэчы Паспалітай.

***Камасацыя*** – ліквідацыя цераспалосіцы праз звядзенне сялянскіх зямель у адзін участак з наступным выхадам на хутар.

***Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ***) – камуністычная партыя, якая існавала ў 1923–1938 гг. на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

***Паланізацыя*** – насаджэнне польскай культуры і асабліва польскай мовы на землях з няпольскім насельніцтвам. У 1921–1939 гг. у Заходняй Беларусі – сістэма мерапрыемстваў, якія праводзіліся польскімі дзяржаўнымі органамі, культурнымі ўстановамі, каталіцкім духавенствам па распаўсюджванні польскай мовы і культуры, па асіміляцыі беларускага насельніцтва.

***Парцэляцыя*** – раздрабленне зямельных надзелаў на маленькія ўчасткі і продаж іх праз банкі.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***23 жніўня 1939 г.*** – у г. Маскве падпісаны Дагавор аб ненападзенні паміж СССР і Германіяй і сакрэтныя пратаколы да яго аб падзеле Еўропы на сферы ўплыву («Пакт Молатаў – Рыбентроп»).

***18 сакавіка 1921 – 17 верасня 1939 гг.*** – час знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе ІІ Рэчы Паспалітай.

***1 снежня 1921 – 2 снежня 1936 гг. –*** дзейнасць у Заходняй Беларусі Таварыства беларускай школы (ТБШ).

***1 верасня 1939 г.*** – нападзенне фашысцкай Германіі на Польшчу – пачатак Другой сусветнай вайны.

***17–25 верасня 1939 г.*** – паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.

***28 верасня 1939 г.*** – заключэнне Дагавора аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй.

***2 лістапада 1939 г.*** – Вярхоўны Савет СССР прыняў Закон аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад СССР і аб'яднанні з БССР.

***10 кастрычніка 1939 г.*** – савецка-літоўскі дагавор «*Аб перадачы Літоўскай Рэспубліцы горада Вільні і Віленскай вобласці* і аб узаемадапамозе паміж Савецкім Саюзам і Літвой». Віленшчына (тэр. 7129 км$^2$, насельніцтва 457 тыс. чалавек) адлучалася ад Заходняй Беларусі і перадавалася Літве.

## ЛІТАРАТУРА


1. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. – Мінск, 2006. – С. 138–473.
2. *Вабішчэвіч А. М.* Асвета ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.). – Брэст, 2004.
3. *Вабішчэвіч А. М.* Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.). – Брэст, 2008.
4. *Даніловіч В. В.* Дзейнасць арганізацыі «Змаганне» ў Заходняй Беларусі (1927–1930 гг.). – Мінск, 2007.
5. *Мацко А. Н.* Революционная борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против гнета буржуазии и помещиков. 1918–1939 гг. Минск, 1972.
6. *Мірановіч Я.* Найноўшая гісторыя Беларусі. – Санкт-Пецярбург, 2003.
7. Нарыс гісторыі Польскай Дзяржавы і Народа. X–XXI стст. – Варшава, 2005.
8. *Полуян В.* Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927–1939). Минск, 1978.
9. *Разуванава К. С.* Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры ў Заходняй Беларусі (1926–1936 гг.). – Мінск, 2013.
10. *Шыбека З.* Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002). – Мінск, 2003.
11. Эканамічная гісторыя Беларусі: Вучэб. дапам. – Мінск, 1999.

# РАЗДЗЕЛ 10.
# БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (1941–1945 гг.)

1. *Беларусь напярэдадні і ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны.*
2. *Нямецкі акупацыйны рэжым.*
3. *Партызанская і падпольная барацьба супраць захопнікаў.*
4. *Вызваленне Беларусі. Аперацыя «Баграціён».*
5. *Пасляваеннае аднаўленне эканомікі. Беларусь – краіна-заснавальніца Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН).*

**1. *Беларусь напярэдадні і ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны.*** Вялікая Айчынная вайна савецкага народа супраць фашысцкай Германіі (22.06.1941–09.05.1945 гг.) стала састаўной часткай Другой сусветнай вайны (01.09.1939–02.09.1945 гг.), якая пачалася з нападзення Германіі на Польшчу і ўцягнула ў сваю арбіту 61 краіну і звыш 80% насельніцтва планеты. 3 верасня 1939 г. вайну Германіі абвясцілі Англія і Францыя, аднак актыўных ваенных дзеянняў яны не прадпрымалі, з-за гэтага падзеі на Заходнім фронце ў верасні 1939 г. атрымалі назву «*дзіўная вайна*».

Адносіны паміж Савецкім Саюзам і Германіяй у той час рэгуляваліся дзвюма асноўнымі дакументамі: *Пактам аб ненападзенні* ад 23 жніўня 1939 г. і *Дагаворам аб дружбе і граніцы* ад 28 верасня 1939 г. Але абодва бакі разумелі, што пазбегнуць адкрытага ваеннага супрацьстаяння не змогуць. Ужо ў снежні 1940 г. нямецкім генеральным штабам быў распрацаваны план «Барбароса» – план маланкавай вайны супраць СССР.

У Савецкім Саюзе напярэдадні вайны існавала забарона ўсялякай антынацысцкай прапаганды, але разам з тым ваенна-патрыятычныя творы, у першую чаргу песні, якія пісаліся ў адпаведнасці з палітыка-сацыяльным заказам, прапагандавалі непазбежнасць

перамогі над нейкім неназваным праціўнікам *«малой крывёю і на чужой тэрыторыі»*. Эканоміка СССР мела выразна мілітарызаваны характар з ужываннем надзвычайных метадаў: у 1939 г. быў уведзены абавязковы мінімум працадзён для калгаснікаў; у 1940 г. быў прыняты ўказ аб замацаванні рабочых і служачых за прадпрыемствамі і ўсталяванні 8-гадзіннага рабочага дня пры 7-дзённым працоўным тыдні; жанчыны павінны былі авалодваць прафесіяй трактарыста, каб у выпадку неабходнасці замяніць пайшоўшых на фронт мужчын і г. д. Тым не менш, нападзенне Германіі на Савецкі Саюз у ноч на 22 чэрвеня 1941 г. трыма групамі армій *«Поўнач»*, *«Цэнтр»* *і «Поўдзень»* па ўсёй заходняй мяжы ад Балтыйскага мора да Чорнага прывяло да разгортвання ваенных дзеянняў па сцэнарыю, якога не чакала савецкае кіраўніцтва.

***Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі.*** На Беларусь наступала група армій *«Цэнтр»*, якія дзвюма часткамі – праз Сувалкі, Вільню і праз Брэст – павінны былі акружыць савецкія ваенныя фарміраванні і злучыцца пад Мінскам. Ім супрацьстаялі войскі *Заходняй Асобай Ваеннай Акругі* (ЗахАВА) пад кіраўніцтвам генерала **Д. Паўлава**. Дзякуючы папярэдне атрыманай інфармацыі, вораг наносіў дакладныя ўдары па аэрадромах, чыгуначных вузлах, скапленнях баявой тэхнікі. У першы дзень вайны толькі на тэрыторыі Беларусі Чырвоная Армія страціла 738 самалётаў, з іх 528 на аэрадромах. Нягледзячы на мужнасць і гераізм пагранічнікаў і супраціўленне асобных адступаючых савецкіх войск, нямецкія арміі вельмі хутка, да 60 км у дзень, рухаліся па тэрыторыі Беларусі, і ўжо 28 чэрвеня быў захоплены Мінск.



*Маёр П.М. Гаўрылаў – абаронца Брэсцкай крэпасці.*

Напружаны характар насілі баі ў раёне Магілёва, абарона якога працягвалася 23 дні (3–26 ліпеня 1941 г.). Для абароны горада было створана народ-



*Немцы ў акупаваным Мінску.*

нае апалчэнне. З Усходняй Беларусі здолелі эвакуіраваць 1,5 млн. спецыялістаў народнай гаспадаркі і 124 прамысловыя прадпрыемствы, сярод якіх быў «Гомсельмаш». Жахлівы лёс напаткаў палітычных зняволеных, большасць якіх была расстраляна супрацоўнікамі НКУС.

30 чэрвеня 1941 г. быў створаны *Дзяржаўны Камітэт Абароны* (ДКА) на чале са Сталіным. У руках ДКА засяродзілася ўся паўната дзяржаўнай, ваеннай і партыйнай улады. Адказнасць за паражэнні на першапачатковым этапе вайны сталінскае кіраўніцтва вырашыла перакласці на некаторых военачальнікаў. Так, на восьмы дзень вайны быў зняты з пасады камандуючага ЗахАВА (пасля пачатку вайны – камандуючы Заходнім фронтам) і расстраляны генерал **Д. Паўлаў**.

***Прычыны першапачатковых няўдач Чырвонай Арміі.*** У савецкіх падручніках асноўнай прычынай першапачатковых ваенных няўдач Чырвонай Арміі называўся фактар раптоўнасці і нечаканасці нямецкай агрэсіі. Аднак галоўная прычына крылася ў савецкай ваеннай дактрыне – вядзенне толькі наступальнай вайны – і праліках вышэйшага савецкага камандавання. Як сведчаць даследаванні гісторыкаў, Сталін да апошняга не верыў, што Гітлер можа рашыцца на вайну з СССР. Па апублікаваных дадзеных, на мяжы Савецкага Саюза і Германіі з абодвух бакоў была сабрана прыкладна адноль-

кавая колькасць салдат і ваеннай тэхнікі, аднак ва ўмовах ваеннай ініцыятывы Германіі канцэнтрацыя на мяжы савецкіх войск і непадрыхтаванасць іх да абарончых баёў прадвызначылі перавагу Вермахта ў першыя дні вайны. Не валодаючы сітуацыяй, не маючы ўяўлення аб маштабах нямецкага ўварвання, савецкае камандаванне аддавала загады перайсці ў контрнаступленне і выбіць праціўніка за межы СССР, што прыводзіла да неабгрунтаваных стратаў. Паколькі маршруты магчымага адступлення раней нават не разглядаліся, то войскі Чырвонай Арміі часта траплялі ў акружэнне, у так званыя «*катлы*». Толькі пад Навагрудкам у канцы чэрвеня 1941 г. былі акружаны 11 савецкіх дывізій («Навагрудскі кацёл»).



*Савецкі плакат часоў Вялікай Айчыннай вайны.*

Негатыўна на баяздольнасць савецкіх войскаў паўплывала аслабленне арміі ў выніку «чысткі» 1938–1939 гг., падчас якой было рэпрэсіявана каля 40 тыс. чалавек вышэйшага афіцэрскага саставу.

**2.** ***Нямецкі акупацыйны рэжым***. Да канца жніўня – пачатку верасня 1941 г. уся тэрыторыя Беларусі была акупіравана гітлераўскімі войскамі. На занятых землях немцы ўдала выкарыстоўвалі грамадскія настроі, выкліканыя папярэдняй савецкай палітыкай. Асабліва гэта было адчувальна ў Заходняй Беларусі, дзе частка насельніцтва пайшла на супрацоўніцтва (*калабарацыянізм*) з немцамі. Акупацыйная адміністрацыя актыўна выкарыстоўвала беларускую нацыянальную карту, ствараючы ілюзію падтрымкі беларускага руху і аднаўлення беларускай дзяржаўнасці ў перспектыве: адкрываліся беларускія школы, былі створаны Беларуская народная самапомач, Беларуская самаахова, Саюз беларускай моладзі і інш.

Але на самай справе ў адносінах да насельніцтва на акупіраваных тэрыторыях германскае камандаванне кіравалася планам *«Ост»* – генеральным планам каланізацыі і германізацыі Ўсходняй Еўропы. У нямецкіх планах Беларусь з'яўлялася тэрыторыяй, якая ў будучым павінна была ператварыцца ў частку іх жыццёвай прасторы. Згодна з гэтымі планамі, 25% беларусаў планавалася анямечыць, непрацаздольных – знішчыць, а астатніх перасяліць на ўсход і выкарыстоўваць у якасці рабочай сілы на карысць Вялікай Германіі. Поўнаму вынішчэнню падлягалі яўрэі і цыгане. Зразумела, што план «Ост» быў сакрэтным, і яго палажэнні не былі вядомыя не толькі насельніцтву Беларусі, але нават частцы вышэйшага кіраўніцтва Трэцяга рэйха.

Нямецкія ўлады падзялілі тэрыторыю Беларусі на некалькі акупацыйных зон, якія падпарадкоўваліся розным цэнтрам:

• *Усходняя Прусія* – да яе былі далучаны паўночна-заходнія раёны Брэсцкай і Беластоцкай абласцей;

• *рэйхскамісарыяту «Украіна»* падпарадкоўваліся паўднёвыя раёны Брэсцкай, Пінскай, Палескай і Гомельскай абласцей;

• *генеральная акруга Літва* ўключала ў сабе паўночна-заходнія раёны Вілейскай вобласці;

• *зону армейскага тылу* з непасрэдным ваенным кіраўніцтвам складалі Віцебская, Магілёўская, большая частка Гомельскай і ўсходнія раёны Мінскай абласцей;

• *генеральная акруга Беларусь («Беларутэнія»)* – самая вялікая зона акупацыі з цэнтрам у Мінску, якая ўключала 1/3 частку тэрыторыі Беларусі.

Для дасягнення сваіх мэт немцы на акупаваных тэрыторыях пачалі ўводзіць так званы «новы парадак», накіраваны, у першую чаргу, на ліквідацыю савецкіх органаў улады і замену іх уласнай адміністрацыяй. У верасні 1941 г. ва ўсіх зонах акупацыі, акрамя зоны армейскага тылу, была ўсталявана грамадзянская адміністрацыя, функцыі якой былі абмежаваны дзейнасцю паліцыі і войск СС. Генеральную акругу Беларусь узначаліў Вільгельм Кубэ.

Фашысцкае кіраўніцтва дзейнічала насуперак існаваўшым міжнародным канвенцыям і здымала са сваіх салдат усялякую адказ-

насць за любыя злачынствы. «Новы парадак» грунтаваўся на палітыцы *генацыду* – знішчэння груп насельніцтва па тых ці іншых прычынах: за прыналежнасць да камуністаў, яўрэяў або цыган, за антыфашысцкую дзейнасць, за любое непаслушэнства рэжыму. Для ажыццяўлення гэтай палітыкі акупацыйныя ўлады выкарыстоўвалі наступныя сродкі:

• *правядзенне карных аперацый* – акцый рэпрэсіўнага характару з мэтай загасіць партызанскі рух і зняволіць жыхароў на акупаваных тэрыторыях. Нярэдка падчас карных аперацый фашыстамі знішчаліся цэлыя вёскі разам з іх насельніцтвам. Так, за часы акупацыі ў Беларусі было спалена 627 вёсак, 186 з якіх не былі адноўлены пасля вайны. Найбольш значным па маштабу карным аперацыям немцы надавалі кодавыя назвы – «Прыпяцкія балоты», «Балотная ліхаманка», «Зімовы лес», «Котбус» і інш.;

• *стварэнне канцлагераў*. На тэрыторыі Беларусі такіх «фабрык смерці» дзейнічала больш за 260. Самым вялікім канцлагерам быў Трасцянец (пад Мінскам), у якім было знішчана 206 500 чалавек. Усяго на тэрыторыі Беларусі ў лагерах смерці загінула каля 800 тыс. чалавек;

• *арганізацыя гета.* Гета – спецыяльна агароджаныя, ізаляваныя часткі гарадоў, куды перасялялася яўрэйскае насельніцтва. Яно пражывала ва ўмовах вялікай скучанасці, антысанітарыі, цяжкай працы і пад пастаяннай пагрозай смерці. Усяго ў гарадах Беларусі было створана звыш за 160 гета. Да канца 1943 г. усе гета былі ліквідаваныя – жыхары вывезеныя ў Асвенцым або расстраляныя, а іх маёмасць разрабаваная.

Акупацыйныя ўлады распрацавалі праграму рабавання занятых тэрыторый. Каралі літаральна за ўсё: за адмову ад працы, за перамяшчэнне ў начны час, за забіванне жывёлы без дазволу ўладаў і г. д. Спецыяльныя гаспадарчыя інспекцыі рэквізавалі харчаванне, матэрыяльныя каштоўнасці, рэсурсы, у тым ліку людскія. За часы акупацыі ў Германію прымусова было вывезена каля 380 тыс. працаздольнага насельніцтва Беларусі.

Нямецкія ўлады былі зацікаўлены ў арганізацыі бесперабойнай працы прамысловасці і сельскай гаспадаркі Беларусі на па-

трэбы фронту. Усе прамысловыя прадпрыемствы былі абвешчаны ўласнасцю Германіі. У гарадах на насельніцтва ва ўзросце ад 18 да 45 гадоў распаўсюджвалася ўсеагульная працоўная павіннасць. Заработная плата была вельмі нізкая, а кіраўнікі прадпрыемстваў мелі права ў выпадку неабходнасці падаўжаць працоўны дзень. Мясцовае насельніцтва таксама выкарыстоўвалася на прымусовых работах па расчыстцы дарог, будаўніцтву мастоў, ваенных умацаванняў і інш.

На тэрыторыі «Беларутэніі» вясной 1942 г. была праведзена аграрная рэформа, у адпаведнасці з якой ліквідаваліся калгасы, а іх землі і інвентар перайшлі ў сямейнае карыстанне сялян. Ва Ўсходняй Беларусі, у зоне армейскага тылу калгасы, наадварот, аднаўляліся, паколькі з такіх гаспадарак было значна прасцей збіраць прадукцыю, неабходную для забеспячэння рэгулярнай арміі.

Адказам насельніцтва на ўведзены «новы парадак» з’явілася пашырэнне руху супраціву акупацыйным уладам.

**3.** ***Партызанская і падпольная барацьба супраць захопнікаў.*** Яшчэ 29 чэрвеня 1941 г. ва ўмовах адступлення Чырвонай Арміі была выдадзена Дырэктыва СНК СССР, у якой утрымліваўся заклік да разгортвання ўсенароднай барацьбы ў тыле ворага, стварэння дыверсійных груп і партызанскіх атрадаў. Насельніцтва абавязана было аказваць ім усялякую дапамогу, а спроба ўхіліцца ад яе расцэньвалася як здрада.

Але нават да афіцыйнага загаду на тэрыторыі Беларусі, пераважна стыхійна, пачалі стварацца партызанскія атрады. Тэрыторыя Беларусі, густа пакрытая лясамі і балотамі, спрыяла разгортванню партызанскай барацьбы. Ужо на пяты дзень вайны супрацоўнік Пінскага абкама партыі **В. З. Корж** арганізаваў партызанскі атрад на Піншчыне. Аднымі з першых партызанскіх атрадаў былі таксама: атрад *«Чырвоны Кастрычнік»* на Палессі (яго кіраўнікам **Ц. П. Бумажкову** і **Ф. І. Паўлоўскаму** першым з партызан ужо 6 жніўня 1941 г. было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза), атрад **М. П. Шмырова** ў Суражскім раёне на Віцебшчыне, атрад **А. І. Далідовіча** на Міншчыне, атрад *«Бальшавік»* на Гомельшчыне.

Склад удзельнікаў першых партызанскіх атрадаў быў неаднародным. Сярод іх былі савецкія салдаты, якія трапілі ў акружэнне; спецыяльна пакінутыя партыйныя і камсамольскія работнікі; насельніцтва, якое не паспелі мабілізаваць у армію; мясцовае насельніцтва, якое пацярпела ад немцаў. У перыяд свайго станаўлення партызанскі рух перажыў значныя цяжкасці. Першыя атрады былі нешматлікія, слаба арганізаваныя, не мелі сувязі паміж сабой і не праводзілі буйных аперацый. Асабліва цяжкім быў перыяд зімы 1941–1942 гг.: не хапала зброі, боепрыпасаў, медыкаментаў. Але насуперак усім перашкодам партызанскі рух на тэрыторыі Беларусі пашыраўся. Для яго каардынацыі 30 мая 1942 г. быў створаны *Цэнтральны штаб партызанскага руху* (ЦШПР) на чале з першым сакратаром ЦК КПБ **П. Панамарэнкам**, а 9 верасня 1942 г. – *Беларускі штаб партызанскага руху* (БШПР) на чале з **П. Калініным**. Гэтыя арганізацыі здолелі аб'яднаць партызанскі рух і ўзняць яго на новы ўзровень. У спецыяльных школах у савецкім тыле рыхтаваліся падрыўнікі, радысты, сувязныя-разведчыкі. Толькі ў 1942 г. было падрыхтавана і накіравана ў тыл ворага 175 дыверсійных груп (2077 чалавек). У 1942 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічала 417 партызанскіх атрадаў, у якіх змагалася 47 тыс. чалавек.

У красавіку 1942 г. пачала дзейнічаць 1-я Беларуская партызанская брыгада пад кіраўніцтвам М. Шмырова, у якой аб'ядналіся некалькі партызанскіх атрадаў Віцебшчыны. З лета 1942 г. утварэнне партызанскіх брыгад і злучэнняў стала распаўсюджанай з'явай.

Узмацненне партызанскага руху прывяло да ўтварэння *партызанскіх зон* – тэрыторый, якія кантраляваліся партызанамі, а не акупацыйнымі ўладамі. У 1943 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічала звыш за 20 буйных партызанскіх зон. З 10 лютага да 28 верасня 1942 г. на Віцебшчыне дзейнічалі так званыя *Віцебскія* або *Суражскія «вароты»*. Гэта быў 40-кіламетровы разрыў у лініі фронту, які даваў магчымасць партызанам падтрымліваць сувязь з неакупаванымі тэрыторыямі.

Самай значнай аперацыяй беларускіх партызан была *«рэйкавая вайна»*, якая праходзіла ў тры этапы:

**1 этап** (жнівень 1943 г.) быў звязаны з наступленнем савецкіх войск пад Курскам. Было пушчана пад адхон 833 варожыя эшалоны, узарвана 184 чыгуначныя масты, што прывяло да скарачэння ваенных перавозак для групы армій «Цэнтр» на 40%;

**2 этап** (верасень – кастрычнік 1943 г.) праходзіў пад кодавай назвай «Канцэрт» і быў прысвечаны ўступленню Чырвонай Арміі на тэрыторыю БССР. Праціўнік вымушаны быў падвоіць колькасць дывізій для аховы сваіх камунікацый, а для рамонту ўзарваных на тэрыторыі Беларусі рэек разбіраліся чыгункі ў шэрагу краін Еўропы;

**3 этап** пачаўся ў ноч 20 чэрвеня 1944 г., напярэдадні *Беларускай наступальнай аперацыі* і працягваўся да поўнага вызвалення Беларусі (канец ліпеня 1944 г.). Партызаны знаходзіліся ў аператыўна-тактычным узаемадзеянні з Чырвонай Арміяй. Імі была падарвана 61 тыс. рэек і паралізавана дзейнасць амаль усіх важных чыгуначных ліній.

Другой формай барацьбы ва ўмовах акупацыі было **гарадское падполле**. Падпольшчыкі распаўсюджвалі лістоўкі, зводкі Саўінфармбюро, збіралі і перадавалі партызанам зброю, боепрыпасы, харчаванне, медыкаменты, а таксама інфармацыю пра варожыя гарнізоны і перамяшчэнне войск праціўніка. Адным з першых было арганізавана *Мінскае падполле*, якое ўзначаліў Мінскі падпольны гарком КПБ. Яно стала самай вялікай падпольнай арганізацыяй на тэрыторыі БССР у гады Вялікай Айчыннай вайны. 22 верасня 1943 г. яго ўдзельнікамі было ажыццёўлена забойства генеральнага камісара акупацыйнай акругі «Беларусь» В. Кубэ.



*Канстанцін Заслонаў.*

На Аршанскім чыгуначным вузле дзейнічала *падпольная група* **К. Заслонава**, удзельнікі якой вывелі са строю больш за 200 нямецкіх паравозаў і ажыццявілі каля 100 крушэнняў

цягнікоў. Падпольныя арганізацыі ствараліся не толькі ў буйных, але і невялікіх гарадах Беларусі, як, напрыклад, камсамольскае маладзёжнае падполле ў г. Скідзелі (Гродзенская вобл.) і інш. Дзейнасць падпольшчыкаў праходзіла ва ўмовах жорсткай канспірацыі і практычна без усялякай дапамогі з боку савецкага тылу. Амаль усе падпольныя арганізацыі былі выкрыты акупацыйнымі ўладамі пры дапамозе нямецкай агентуры і правакатараў. Вялікія страты ў канцы 1942 – пачатку 1943 г. панесла Мінскае падполле – было арыштавана 100 чалавек, большасць з якіх загінула на шыбеніцах і ў лагерах смерці. Аднак рэпрэсіўныя і карныя меры не маглі задушыць антыфашысцкі рух на тэрыторыі Беларусі.

У заходніх абласцях Беларусі з акупантамі змагалася і польская ваенная падпольная арганізацыя – *Армія Краёва* (АК), якая налічвала 250–300 тыс. чалавек. АК падпарадкоўвалася *Польскаму эміграцыйнаму ўраду* ў Лондане і атрымала заданне ствараць умовы для аднаўлення польскай дзяржаўнасці ў межах да 17 верасня 1939 г. Першапачаткова атрады АК дзейнічалі ў саюзе з савецкімі партызанамі і нават праводзілі сумесныя аперацыі супраць нямецкіх узброеных сіл. Але ў красавіку 1943 г. былі разарваны дыпламатычныя адносіны паміж СССР і Польскім эміграцыйным урадам, і АК ператварылася ў варожую сілу. У кастрычніку 1943 г. камандаванне АК зацвердзіла план аперацыі «*Бура*», згодна з якім неабходна было ў час адступлення немцаў захапіць тэрыторыі Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны і Віленшчыны з мэтай далейшага іх далучэння да Польшчы. Партызаны Беларусі атрымалі загад камандавання, у якім АК абвяшчалася варожай сілай, супраць якой таксама трэба было змагацца, як і супраць немцаў.

**4. *Вызваленне Беларусі. Аперацыя «Баграціён»*.** Вызваленне тэрыторыі Беларусі пачалося ўвосень 1943 г. падчас шырокага наступлення Чырвонай Арміі пасля перамогі ў Курскай бітве. Да канца 1943 г. была вызвалена паўднёва-ўсходняя частка рэспублікі з гарадамі Камарын, Мсціслаў, Чэрыкаў, Гомель, Рэчыца, Мазыр. Але далей развіваць наступленне без сур'ёзнай дадатковай падрыхтоўкі не ўяўлялася магчымым, паколькі тэрыторыю Беларусі нем-



*В. Волкаў «Мінск 3 ліпеня 1944 года».*

цы лічылі зонай сваёй жыццёвай прасторы, стварылі тут некалькі магутных ліній абароны і далі ім назву *«Фатэрлянд»* (Айчына).

Вясной 1944 г. Генеральным штабам Чырвонай Арміі была распрацавана аперацыя па поўнаму вызваленню Беларусі, якая атрымала кодавую назву *«Баграціён»*. У аснову распрацоўкі стратэгіі аперацыі было пакладзена становішча, якое склалася на лініі фронту да лета 1944 г.: у выніку вызвалення Ўкраіны канфігурацыя фронту ў Беларусі ўяўляла вялікі выступ, так званы *«беларускі балкон»*. Савецкае камандаванне хацела магутнымі ўдарамі з флангаў акружыць і разграміць групу армій «Цэнтр», для чаго была створана колькасная перавага ў жывой сіле (у два разы) і тэхніцы (амаль у пяць разоў). Вызваленне Беларусі ажыццяўлялася сіламі 1-га, 2-га і 3-га *Беларускіх франтоў* (камандуючыя **К. Ракасоўскі**, **Г. Захараў**, **І. Чарняхоўскі**) і 1-га *Прыбалтыйскага фронту* (камандуючы **І. Баграмян**).

Савецкай наступальнай аперацыі папярэднічаў 3-ці этап «рэйкавай вайны», які распачаўся ў ноч на 20 чэрвеня 1944 г. Партызаны фактычна паралізавалі асноўныя чыгуначныя магістралі Беларусі і пазбавілі кіраўніцтва групы армій «Цэнтр» магчымасці аператыўна перамяшчаць свае войскі. Непасрэднае ажыццяўленне плана «Баграціён» праходзіла ў два этапы:

**1 этап (**23.06–04.07.1944 г.). Раніцай 23 чэрвеня 1944 г. пасля магутнай артылерыйскай і авіяцыйнай падрыхтоўкі пачалося наступленне савецкіх войск. За шэсць дзён ваенных дзеянняў лінія абароны праціўніка была прарвана на 100–150 км, а нямецкія войскі апынуліся ў трох «катлах»: *Віцебскім* (5 дывізій), *Бабруйскім* (6 дывізій) і самым вялікім – *Мінскім «катле»*, дзе ў акружэнне трапіла каля 105 тыс. чалавек. 3 ліпеня 1944 г. быў вызвалены Мінск.

**2 этап** (05.07–29.08.1944 г.). У ходзе другога этапу была вызвалена большая частка Літвы, Латвіі, усходніх раёнаў Польшчы. Вызваленне Беларусі завяршылася **28 ліпеня 1944 г.** вызваленнем г. Брэста.

Такім чынам, у выніку правядзення аперацыі «Баграціён» была разгромлена нямецкая група армій «Цэнтр», поўнасцю вызвалена тэрыторыя Беларусі, адноўлена заходняя граніца СССР, а лінія фронту перамясцілася за межы Савецкага Саюза.

**5. *Пасляваеннае аднаўленне эканомікі. Беларусь – краіна-заснавальніца Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН).*** Усяго за гады Вялікай Айчыннай вайны Беларусь страціла 2,7 млн. чалавек. На прымусовыя работы ў Германію былі вывезены 380 тыс. беларусаў (у тым ліку 24 тыс. дзяцей), з якіх вярнуліся на Радзіму менш за 120 тыс.

Вайна зруйнавала гаспадарку Беларусі – краіна страціла больш за палову свайго нацыянальнага багацця. З 270 гарадоў Беларусі было разрабавана і спалена 209, практычна ў руіны ператварыліся Мінск і Віцебск. Пасля вайны прамысловасць Беларусі не далічылася 100 465 прадпрыемстваў. Асабліва моцна пацярпела сельская гаспадарка: было разбурана 9200 вёсак, з якіх 627 спалены разам з жыхарамі. У параўнанні з даваенным часам адчувальна зменшылася колькасць жывёлы: коней – на 61%, буйной рагатай жывёлы – на 69%, свіней – на 89%. Такія страты тлумачыліся не столькі правядзеннем на тэрыторыі Беларусі ваенных дзеянняў, колькі трохгадовым існаваннем жорсткага акупацыйнага рэжыму, які абапіраўся на генацыд, рабаванне, вываз каштоўнасцяў у Германію і г. д.

У выніку вайны ў чарговы раз паменшылася тэрыторыя БССР. На працягу 1944–1950 гг. да Польшчы былі далучаны Беластоцкая вобласць і шэраг раёнаў Брэсцкай і Гродзенскай абласцей.

Яшчэ адным адмоўным вынікам вайны для Беларусі стала дыскрэдытацыя нацыянальнай ідэі і нацыянальнай сімволікі, якія выкарыстоўваліся нямецкімі акупацыйнымі ўладамі з мэтай схіліць да калабарацыі як мага больш мясцовага насельніцтва і тым самым ліквідаваць рух супраціўлення на гэтых землях. Па сутнасці гэта была трагедыя часткі беларускай эліты, якая, жадаючы аднавіць незалежнасць Беларусі, не грэбавала супрацоўніцтвам з немцамі. Такую палітыку не падтрымліваў старшыня Рады БНР **Васіль Захарка**, які ад супрацоўніцтва адмовіўся.

Разам з тым перамога ў вайне значна ўмацавала міжнароднае становішча БССР – краіна выйшла на міжнародную арэну ў рамках дзейнасці ў *Арганізацыі Аб'яднаных Нацый* (ААН). Неабходнасць заснавання такой арганізацыі, якая б вырашала важнейшыя праблемы сусветнага жыцця і выступала гарантам міру і бяспекі, абмяркоўвалася на Тэгеранскай канферэнцыі 1943 г. кіраўнікамі Вялікабрытаніі, СССР і Злучаных Штатаў Амерыкі. Сусветнай супольнасцю былі прызнаны страты, якія панесла Беларусь падчас вайны, ацэнены ўклад рэспублікі ў перамогу над фашызмам, таму БССР атрымала запрашэнне стаць дзяржавай-заснавальніцай ААН. Статут Арганізацыі Аб'яднаных Нацый дэлегацыя БССР разам з іншымі краінамі падпісала **26 чэрвеня 1945 г.**

Нягледзячы на тое, што БССР не была самастойнай у прыняцці рашэнняў, а выступала выключна ў падтрымку прапаноў Савецкага Саюза, удзел Беларусі ў важнейшай міжнароднай арганізацыі, безумоўна, садзейнічаў развіццю кантактаў і сувязяў з рознымі краінамі, набыццю міжнароднага вопыту.

***Аднаўленне эканомікі.*** Па меры вызвалення Беларусі паступова адбывалася аднаўленне эканомікі рэспублікі: ужо ўвосень 1943 г. першыя работы па адбудове гаспадаркі пачаліся на вызваленай частцы Гомельскай вобласці, а са жніўня 1944 г. – на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

Пасля заканчэння вайны, у 1946 г., быў прыняты чарговы пяцігадовы план (1946–1950 гг.), галоўнай мэтай якога было аднаўленне разбуранай вайной гаспадаркі ў межах усяго Савецкага Саюза і перавод эканомікі з ваенных рэек на мірныя. Цяжкасці гэтага перыяду на тэрыторыі Беларусі заключаліся ў тым, што большасць прамысловых цэнтраў была разбурана, у дрэнным стане знаходзілася чыгунка, назіраўся дэфіцыт сыравіны і электраэнергіі. Паколькі прыярытэт аддаваўся аднаўленню цяжкай прамысловасці, з эвакуацыі былі вернуты некаторыя прамысловыя прадпрыемствы, якія былі вывезены летам 1941 г. Але значная іх частка так і засталася на тэрыторыі Расіі. У 1946 г. сваю прадукцыю выдавалі станкабудаўнічы завод у Бабруйску, веласіпедны ў Мінску, а да канца пяцігодкі працавалі Мінскі трактарны завод, Гомсельмаш, Мінскі аўтамабільны завод. У 1947 г. у СССР былі адменены картачкі на прадукты харчавання.

У 1949 г. Беларусь ужо здолела дасягнуць даваеннага ўзроўню, а ў 1950 г. перавысіць яго. *Якім жа коштам былі атрыманы гэтыя вынікі?* Паколькі страты, панесеныя БССР падчас вайны, былі вельмі вялікія, самастойна Беларусі аднавіць эканоміку не ўяўлялася магчымым. Урад СССР выдзеліў на адбудову народнай гаспадаркі Беларусі значныя грашовыя сродкі, будаўнічыя матэрыялы, станкі. З індустрыяльных цэнтраў СССР у Беларусь накіроўваліся кваліфікаваныя спецыялісты. Акрамя таго, БССР атрымала частку германскіх *рэпарацыяў*. Важным сродкам, дзякуючы якому народная гаспадарка Беларусі ўздымалася з руін, заставаўся чалавечы фактар – самаадданая праца і энтузіязм простых людзей. Пры гэтым у арганізацыі працы нічога не змянілася, усе аднаўленчыя работы па-ранейшаму здзяйсняліся камандна-адміністрацыйнымі метадамі, існавала жорсткая дысцыпліна, а план для прадпрыемстваў даводзіўся зверху.

Што тычыцца сельскай гаспадаркі Беларусі, то нягледзячы на панесеныя страты, яна знаходзілася ў лепшым стане, чым прамысловасць. У ходзе вайны на большасці акупаванай тэрыторыі Беларусі былі разбураны калгасы, сяляне разабралі па хатах калгасную ўласнасць. Перад Савецкім урадам узнікла дылема – захаваць

у Савецкім Саюзе разам з калгаснай сістэмай і прыватны сектар ці поўнасцю ліквідаваць яго. І хоць вытворчасць у прыватных гаспадарках была больш прадукцыйнай, чым у калектыўных, пасляваенная аграрная палітыка СССР у адносінах да беларускіх зямель не змянілася – калгасы былі адноўлены, а ў заходніх абласцях Беларусі паскоранымі тэмпамі праводзілася калектывізацыя. Урадавае рашэнне аб аднаўленні калгасаў было выклікана не эканамічнымі разлікамі, а палітычнымі меркаваннямі, паколькі вядзенне сялянамі індывідуальнай гаспадаркі не ўпісвалася ў сацыялістычную сістэму, якая не прадугледжвала прыватнай уласнасці.

Становішча сялян заставалася вельмі цяжкім. Закупачныя цэны на прадукцыю сельскай гаспадаркі былі вельмі нізкімі, а планы дзяржаўных паставак высокімі. У адносінах да калгаснікаў дзейнічалі нормы даваеннага часу: яны былі абмежаваны ў свабодзе перамяшчэння, паколькі не мелі пашпартоў; на іх не распаўсюджвалася аплата бальнічных лістоў і права атрымліваць пенсіі. Прымусовы характар правядзення калектывізацыі ў Заходняй Беларусі выклікаў масавыя пратэсты насельніцтва і, як следства, узмацненне рэпрэсій.

***Грамадска-палітычнае і культурнае жыццё.*** Пасля перамогі над фашызмам ніякіх дэмакратычных змен у краіне не адбылося. У БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, захавалася таталітарная сістэма, вядучую ролю ў якой адыгрывала камуністычная партыя. У 1947 г. адбыліся выбары ў Вярхоўны Савет БССР, а ў 1948 г. – у мясцовыя Саветы, але па-ранейшаму яны былі безальтэрнатыўнымі. У бюлетэнь уносілася толькі адно прозвішча загадзя праверанага, «патрэбнага» чалавека. Функцыя падбору і расстаноўкі кадраў ускладвалася на партыйныя камітэты. Асаблівая ўвага кіруючымі органамі надавалася Заходняй Беларусі, дзе фарсіраванымі тэмпамі праводзіліся мерапрыемствы з мэтай уніфікацыі грамадска-палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця на гэтых землях з астатняй тэрыторыяй БССР. Гэты працэс атрымаў назву *саветызацыі*.

У дзяржаўным апараце адносіны да Беларусі былі неадназначныя з прычыны трохгадовага існавання на гэтых землях акупацый-

нага рэжыму. На кіруючыя пасады ў БССР мясцовыя камуністы не прызначаліся, а ўсё насельніцтва апынулася пад падазрэннем.

Нягледзячы на перамогу ў вайне, масавыя рэпрэсіі не спыніліся, а, наадварот, распачаліся з новай сілай. У лік рэпрэсіраваных трапілі:

1) *рэпатрыянты* (ваеннапалонныя і насельніцтва, прымусова вывезенае на работу ў Германію);

2) насельніцтва, якое знаходзілася на акупіраваных тэрыторыях;

3) людзі, якія супрацоўнічалі з немцамі;

4) дзеячы культуры, навукі, якія праўдзіва адлюстроўвалі ваенныя падзеі ці ролю партыі і кіраўніцтва ў перамозе і пасляваеннай адбудове, а не пераходзілі на пазіцыі так званага *«сацыялістычнага рэалізму»*.

У стомленым вайной грамадстве зноў усталявалася атмасфера страху і падазронасці. Падазрэнні ў здрадзе тычыліся нават партызан і падпольшчыкаў, як, напрыклад, удзельнікаў мінскага антыфашысцкага падполля. Фізічна і маральна былі зломлены рэпатрыянты, якія, зведаўшы цяжкасці фашысцкага палону і рабскай працы, на радзіме трапілі ў лік ворагаў і ў пераважнай большасці апынуліся ў засценках ГУЛАГа.

Пасляваенны перыяд быў вельмі цяжкім для савецкай культуры. Яна была падвергнутая жорсткаму ідэалагічнаму ўціску, у аснову якога быў пакладзены *прынцып партыйнасці* – строгае выкананне партыйных загадаў і ўсхваленне камуністычнай ідэі. Галоўнымі тэмамі ў літаратуры, музыцы і мастацтве былі тэмы сталініяны, вайны, кіруючай ролі камуністычнай партыі ў пераможнай вайне і адбудове грамадства. Тыя прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, якія раней арыштоўваліся па палітычных матывах, лічыліся нядобранадзейнымі і былі паўторна рэпрэсіяваныя. Так, пасля вайны ўжо трэці раз былі арыштаваныя і высланыя з Беларусі вядомы вучоны-гісторык **М. Улашчык** і пісьменнік **У. Дубоўка**.

З вялікімі цяжкасцямі сутыкнулася адукацыйная сістэма, матэрыяльная база якой была амаль цалкам знішчана за гады вайны: былі зруйнаваны будынкі школ, не было падручнікаў, паперы,

не хапала настаўнікаў. Разам з тым ужо ў 1949 г. была ўведзена ўсеагульная абавязковая сямігадовая адукацыя, а ў 1950 г. колькасць пабудаваных школ перавысіла даваенную лічбу.

Такім чынам, пры пераходзе да мірнага жыцця БССР сутыкнулася з вялікімі цяжкасцямі. Яны былі абумоўлены панесенымі падчас вайны стратамі і ўзмацненнем таталітарнага рэжыму, якому былі падпарадкаваны эканоміка, культура, грамадска-палітычнае жыццё ў краіне. Аднаўленне гаспадаркі Беларусі адбывалася дзякуючы, у першую чаргу, працоўнаму подзвігу народа. Згодна з афіцыйнымі дадзенымі, да 1950 г. эканамічныя паказчыкі ў СССР перавысілі даваенны ўзровень. Аднак праблемы заставаліся. Першачарговая адбудова цяжкай прамысловасці прывяла да заняпаду традыцыйных для Беларусі галін лёгкай прамысловасці – тэкстыльнай, дрэваапрацоўчай, харчовай. Няпростым было становішча і ў сельскай гаспадарцы. На пачатку 1950-х гг. адбылося рэзкае зніжэнне ўзроўню сельскагаспадарчай вытворчасці, што стала вынікам прымусовай калектывізацыі і палітыкі пераразмеркавання сродкаў з аграрнага сектара ў прамысловы.

## АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ

***Генацыд*** – знішчэнне груп насельніцтва па расавых, нацыянальных, этнічных, палітычных ці рэлігійных матывах.

***Калабарацыянізм*** *(ад франц. collaboration – супрацоўніцтва)* – супрацоўніцтва з ворагам асоб, палітычных партый, грамадскіх рухаў і арганізацый на акупіраваных тэрыторыях.

***Рэпарацыя*** *(ад лац. reparatio – аднаўленне)* – поўная ці частковая кампенсацыя, аплата матэрыяльных страт ад вайны, якая выплачваецца дзяржавай-агрэсарам краіне, якая падверглася агрэсіі.

***Рэпатрыяцыя*** *(ад лац. repatriatio – вяртанне на радзіму)* – вяртанне ў краіну паходжання ці грамадзянства асоб, якія апынуліся па-за яе межамі ў выніку розных сацыяльна-эканамічных і палітычных абставін з аднаўленнем у правах грамадзянства.

***Халакост*** – сістэматычны пераслед і знішчэнне яўрэяў нацыстамі ў гады Другой Сусветнай вайны.

# НАЙВАЖНЕЙШЫЯ ПАДЗЕІ

***22 чэрвеня 1941 г.*** – нападзенне фашысцкай Германіі на СССР, пачатак Вялікай Айчыннай вайны.

***22 чэрвеня – канец ліпеня 1941 г.*** – гераічная абарона гарнізона Брэсцкай крэпасці (штаб абароны ўзначалілі капітан І. М. Зубачоў і палкавы камісар Я. М. Фамін).

***30 чэрвеня 1941 г.*** – пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб утварэнні Дзяржаўнага Камітэта Абароны» на чале з І. В. Сталіным. Дзейнічаў да 4 верасня 1945 г.

***14 ліпеня 1941 г.*** – пад г. Оршай упершыню нанесла ўдар батарэя рэактыўных установак («кацюш») пад камандаваннем капітана І. А. Флёрава.

***30 мая 1942 г.*** – утварэнне Цэнтральнага штаба партызанскага руху (ЦШПР) у Маскве. Начальнік штаба П. К. Панамарэнка.

***Канец жніўня 1941 г.*** – поўная акупацыя нямецкімі войскамі тэрыторыі Беларусі.

***9 верасня 1942 г.*** – утварэнне Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР). Кіраўнік штаба – П. З. Калінін.

***3 жніўня – сярэдзіна верасня 1943 г.*** – першы этап «рэйкавай вайны» беларускіх партызан на чыгуначных камунікацыях ворага.

***19 верасня – пачатак лістапада 1943 г.*** – другі этап «рэйкавай вайны» – аперацыя «Канцэрт».

***23 верасня 1943 г.*** – пачатак вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, вызваленне першага раённага цэнтра Беларусі – г. Камарына.

***20 чэрвеня – ліпень 1944 г.*** – трэці этап «рэйкавай вайны» беларускіх партызан на чыгуначных камунікацыях ворага.

***3 ліпеня 1944 г.*** – вызваленне ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў г. Мінска

***16 ліпеня 1944 г.*** – парад партызан у г. Мінску, прысвечаны вызваленню сталіцы Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

***17 ліпеня 1944 г.*** – «парад ганьбы» – у г. Маскве па вул. Горкага былі праведзены калоны нямецкіх ваеннапалонных, якія былі захоплены падчас баёў у «Мінскім катле».

***28 ліпеня 1944 г.*** – вызваленне ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў г. Брэста; завяршэнне вызвалення тэрыторыі Беларусі.

***27 красавіка 1945 г.*** – Беларуская ССР прынята ў склад дзяржаў-заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных нацый (ААН).

***8 мая 1945 г.*** – Германія падпісала акт аб поўнай і безумоўнай капітуляцыі.

***26 чэрвеня 1945 г.*** – дэлегацыя БССР разам з іншымі краінамі-заснавальніцамі падпісала Статут Арганізацыі Аб'яднаных Нацый

## ЛІТАРАТУРА


1. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны. Праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства. – Мінск, 1999.
2. *Воронкова И. Ю.* «Двадцать второго июня, ровно в четыре часа…» Минск и минчане в первые дни Великой Отечественной войны. – Минск, 2011.
3. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны. – Мінск, 2005.
4. *Літвін А. М.* Акупацыя Беларусі: Праблемы супрацiву і калабарацыі. – Мінск, 2000.
5. *Литвин А. М.* Руководство боевой деятельностью партизанских сил Беларуси и их оперативное использование в интересах фронта // Партизанское движение в Беларуси и его роль в разгроме фашистских захватчиков в 1941–1944 годах: Материалы Междунар. науч.-практ. конф. (Минск, 25–26 июня 2009 г.) / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории, М-во обороны Респ. Беларусь; редкол.: М. В. Мясникович (пред.) и др. – Минск, 2009. – С. 72–90.
6. Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941–1944). – Мінск, 1983.
7. *Сервачынскі І.* Аграрная палітыка нацыстаў на Беларусі (1941–1944 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. – 1996. – №4.
8. *Туронак Ю.* Беларусь пад нямецкай акупацыяй. – Мінск, 1993.
9. *Факторович А. А.* Крах аграрной политики немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. – Минск, 1979.

# ТАБЛІЦЫ НАЙВАЖНЕЙШЫХ ДАТ

## I. Беларусь на зыходзе феадалізму: канец XVIII – сярэдзіна XIX ст.

| | |
|---|---|
| 5 жніўня 1772 г. – | у г. Санкт-Пецярбургу падпісана канвенцыя аб першым падзеле Рэчы Паспалітай паміж Прусіяй, Аўстрыяй і Расіяй. Да Расійскай імперыі была далучана ўсходняя частка Беларусі; |
| 13 верасня 1772 г. – | шляхце было загадана падаць у губернскія гарады спісы з доказамі свайго дваранства, *першы разбор шляхты;* |
| 1772–1856 гг. – | існаванне адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі *Беларускае генерал-губернатарства.* Складалася з ўсходніх губерняў Беларусі пасля далучэння яе тэрыторыі да Расійскай імперыі; |
| 1773–1794 гг. – | заснаванне і дзейнасць у Рэчы Паспалітай Адукацыйнай камісіі – першага ў Еўропе міністэрства народнай адукацыі; |
| 1773 г. – | расфарміраванне рымскім папам ордэна езуітаў; |
| люты 1774 г. – | дароўная грамата Кацярыны II на заснаванне Беларускай каталіцкай епархіі з цэнтрам у г. Магілёве; |
| 1775 г. – | з мэтай замацавання расійскага ўплыву на сейме Рэчы Паспалітай была створана *Пастаянная Рада*; |
| 1775 г. – | у г. Гродна закладзены батанічны сад – першы на тэрыторыі Беларусі; |

| | |
|---|---|
| 1775–1781 гг. – | заснаванне і дзейнасць у г. Гродна Вышэйшай медыцынскай акадэміі – першай медыцынскай навуковай установы на тэрыторыі Беларусі; |
| 1775–1784 гг. – | будаўніцтва Каралеўскага (Дняпроўска-Бугскага) канала, які злучыў р. Прыпяць з р. Заходні Буг; |
| май 1776 г. – | пачатак выдання «Газеты Гродзенскай» – першага перыядычнага выдання на тэрыторыі Беларусі; |
| верасень 1776 г. – | утварэнне Полацкай губерні; |
| 1776 г. – | пазбаўленне большасці гарадоў і мястэчак Беларусі магдэбургскага права (акрамя гарадоў Брэста, Ваўкавыска, Гродна, Ліды, Мазыра, Мінска, Навагрудка і Пінска); |
| 1778 г. – | заснаванне С. Г. Зорычам Шклоўскага шляхетнага вучылішча – першай расійскай ваеннай навучальнай установы на тэрыторыі Беларусі; |
| 1778–1800 гг. – | дзейнасць Шклоўскага прыгоннага тэатра графа С. Г. Зорыча; |
| 1779 г. – | Віленскі ўніверсітэт з 1779 г. да 1781 г. называўся Акадэміяй; |
| 1780 г. – | пачатак дзейнасці суконнай мануфактуры ва ўладанні Сапегаў Ружаны; |
| 1781 г. – | Віленскі ўніверсітэт стаў насіць назву Галоўная школа ВКЛ; |
| 1783–1941 гг. – | перыяд гаспадарчага выкарыстання Агінскага канала; |
| з 1784 г. – | перыяд гаспадарчага выкарыстання Дняпроўска-Бугскага канала. Рэканструяваны ў 1848 і 1940 гг. Выкарыстоўваецца для перавозкі на баржах разнастайных матэрыялаў; |

| | |
|---|---|
| 1785 г. – | пачатак будаўніцтва Гомельскага палаца – выдатнага помніка беларускага класіцызму; |
| 1788–1792 гг. – | Чатырохгадовы («Вялікі») сейм Рэчы Паспалітай; |
| 1790 г. – | беззямельная шляхта страціла права выбіраць на павятовых сейміках паслоў на агульнадзяржаўны сейм; |
| 1790 г. – | колькасць насельніцтва Беларусі склала 3 млн. 700 тыс. чалавек; |
| 3 мая 1791 г. – | прыняцце сеймам Канстытуцыі Рэчы Паспалітай (Урадавай Уставы); |
| кастрычнік 1791 г. – | прыняцце сеймам дакумента пад назвай *«Узаемнае заручэнне абодвух народаў»*, якім гарантавалася аднолькавая колькасць прадстаўнікоў Вялікага Княства Літоўскага і Кароны ва ўрадзе; |
| май-верасень 1792 г. – | стварэнне і дзейнасць Таргавіцкай канфедэрацыі, накіраванай супраць Канстытуцыі 3 мая; |
| 24 ліпеня 1792 г. – | Станіслаў Аўгуст Панятоўскі па патрабаванні Кацярыны II перайшоў на бок канфедэратаў; |
| красавік 1793 г. – | стварэнне Мінскага намесніцтва; |
| 1793 г. – | другі падзел Рэчы Паспалітай паміж Прусіяй і Расіяй. Далучэнне цэнтральнай часткі Беларусі да Расійскай імперыі; |
| 17 чэрвеня – 23 лістапада 1793 г. – | другі «нямы сейм» у Рэчы Паспалітай (Гродзенскі) – надзвычайны, апошні сейм Рэчы Паспалітай. Скліканы для зацвярджэння руска-прускай канвенцыі ад 23 студзеня 1793 г. аб другім падзеле Рэчы Паспалітай; |

| | |
|---|---|
| 24 сакавіка – 16 лістапада 1794 г. – | нацыянальна-вызваленчае паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі; |
| 23 красавіка 1794 г. – | паўстанцы ўзялі ўладу ў г. Вільні; |
| 30 красавіка 1794 г. – | *Найвышэйшая літоўская рада* прыняла зварот «Да земляробаў і люду вясковага»; |
| 7 мая 1794 г. – | абвяшчэнне *Паланецкага ўніверсала*, які дазваляў сялянам атрымаць асабістую свабоду, пры ўмове, што яны разлічацца з землеўласнікамі і заплацяць дзяржаўныя падаткі; |
| 23 верасня 1794 г. – | падпісанне Кацярынай II указа аб увядзенні мяжы «яўрэйскай аселасці»; |
| 17 верасня 1794 г. – | бітва каля *вёскі Крупчыцы* пад г. Кобрынам паўстанцкіх атрадаў пад кіраўніцтвам генерал-маёра К. Серакоўскага з расійскімі войскамі пад кіраўніцтвам А. Суворава. Паўстанцы былі вымушаны адступіць; |
| 10 кастрычніка 1794 г. – | бітва *пад Мацяёвіцамі*, паражэнне паўстанцаў. Т. Касцюшка папаў у палон і быў вывезены ў Петрапаўлаўскую крэпасць г. Пецярбурга; |
| 4 лістапада 1794 г. – | расійскія войскі пад камандаваннем А. Суворава авалодалі прадмесцем г. Варшавы – Прагай. 6 лістапада 1794 г. г. Варшава капітулявала; |
| 1794 г. – | указ імператрыцы Кацярыны II аб пераводзе ўніятаў у праваслаўе; |
| 1794–1912 гг. – | існаванне Віленскага генерал-губернатарства, у склад якога ўваходзіла значная частка тэрыторыі Беларусі; |

| | |
|---|---|
| 1795 г. – | трэці падзел Рэчы Паспалітай паміж Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй. Тэрыторыя Беларусі была поўнасцю ўключана ў склад Расійскай імперыі; |
| 5 лістапада 1795 г. – | адрачэнне апошняга караля польскага і вялікага князя літоўскага Станіслава Аўгуста Панятоўскага ад трона; |
| снежань 1795 г. – | утварэнне Слонімскай губерні; |
| снежань 1796 г. – | утварэнне Беларускай і Літоўскай губерняў; |
| 1796–1797 гг. – | дзейнасць *Віленскай асацыяцыі* – тайнага патрыятычнага таварыства; |
| 1796–1801 гг. – | гады праўлення ў Расійскай імперыі Паўла І (сына Пятра ІІІ); |
| 1796–1803 гг. – | Галоўная Віленская школа – тагачасная назва Віленскага ўніверсітэта; |
| 1796–1840 гг. – | выданне газеты «Кур'ер Літоўскі» у г. Гродне (да 1797 г.) і ў г. Вільні; |
| 5 красавіка 1797 г. – | маніфест імператара Паўла І аб трохдзённай паншчыне; |
| 1797–1805 гг. – | будаўніцтва Бярэзінскага канала, які злучыў басейны рэк Дняпра і Заходняй Дзвіны; |
| 1801–1825 гг. – | гады праўлення ў Расійскай імперыі Аляксандра І (сына Паўла І); |
| 1802 г. – | стварэнне ў Расійскай імперыі Міністэрства народнай асветы; |
| 4 ліпеня 1803 г. – | выхад рэскрыпта імператара Аляксандра І аб забароне пераходаў у каталіцтва; |
| 1803–1804 гг. – | рэформа сістэмы адукацыі, стварэнне Віленскай вучэбнай акругі на чале з князем Адамам Чартарыйскім; |
| 1803 г. – | рэарганізацыя Галоўнай Віленскай школы ў Віленскі ўніверсітэт |

| | |
|---|---|
| 1805 г. – | у г. Свіслач адчынена першая на тэрыторыі Беларусі гімназія; |
| 1805 г. – канец XIX ст. – | перыяд гаспадарчага выкарыстання Бярэзінскай воднай сістэмы; |
| 1807 г. – | Тыльзіцкі мір паміж Францыяй і Расіяй. Да Расійскай імперыі адышла тэрыторыя Беластоцкай акругі, якая была ўключана затым у склад Гродзенскай губерні; |
| 1807–1884 гг. – | гады жыцця і дзейнасці класіка беларускай літаратуры Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча; |
| 1809–1819 гг. – | будаўніцтва ў г. Гомелі Петрапаўлаўскага сабора – выдатнага культавага помніка эпохі класіцызму ў Беларусі (архітэктар – англічанін Дж. Кларк); |
| 1810 г. – | стварэнне ў Расійскай імперыі па ініцыятыве графа А. А. Аракчэева сістэмы ваенных пасяленняў. Першае ваеннае пасяленне ў Беларусі было створана на базе Бабылецкага староства Клімавіцкага павета Віцебскай губерні; |
| 1810–1820 гг. – | будаўніцтва Бабруйскай крэпасці (у 2002 г. уключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь); |
| 1811 г. – | колькасць насельніцтва Беларусі склала 3 млн. 800 тыс. чалавек; |
| 1811–1812 гг. – | князь М. К. Агінскі разам з князем Ф. К. Любецкім і графам Л. Плятэрам распрацаваў праект «Палажэння аб праўленні аўтаномным Вялікім княствам Літоўскім» у складзе Расійскай імперыі, так званы *План Агінскага;* |
| 10 чэрвеня 1812 г. – | Францыя аб'явіла вайну Расійскай імперыі; |

| | |
|---|---|
| 12 чэрвеня 1812 г. – | армія Напалеона пераправілася цераз р. Нёман і ўварвалася ў межы Расійскай імперыі; |
| 16 чэрвеня 1812 г. – | войскі Напалеона занялі г. Вільню; |
| 24 чэрвеня 1812 г. – | войскі Напалеона занялі г. Мінск; |
| 1 ліпеня 1812 г. – | загадам Напалеона быў утвораны Часовы ўрад Вялікага княства Літоўскага, якому падпарадкоўваліся Віленская, Гродзенская, Мінская губерні і Беластоцкая вобласць; |
| 8 ліпеня 1812 г. – | бітва каля вёскі Салтанаўка пад Магілёвам. Подзвіг генерала М. М. Раеўскага; |
| 18–20 ліпеня 1812 г. – | бітва паміж расійскімі і французскімі войскамі пад Клясціцамі каля г. Полацка. Подзвіг генерала Я. П. Кульнева; |
| 26 жніўня 1812 г. – | Барадзінская бітва; |
| 4 лістапада 1812 г. – | расійскія войскі занялі г. Мінск; |
| 14–16 лістапада 1812 г. – | пераправа французскіх войск цераз р. Бярэзіну каля вёскі Студзёнка, разгром французскіх войск – страта Напалеонам больш як 20 тыс. вайскоўцаў; |
| 24 лістапада 1812 г. – | Напалеон у м. Смаргоні пакінуў армію і ад'ехаў у г. Парыж; |
| 12 снежня 1812 г. – | маніфест імператара Аляксандра I аб амністыі жыхарам заходніх губерняў, якія выступілі на баку Напалеона пры ўмове вяртання іх на радзіму на працягу 2-х месяцаў; |
| 1812–1820 гг. – | дзейнасць Полацкай езуіцкай акадэміі (створана на базе Полацкага езуіцкага калегіума); |
| 1813–1891 гг. – | гады жыцця і дзейнасці Паўлюка Багрыма, беларускага паэта, сына каваля з мястэчка Крошын Навагрудскага павета, аўтара верша «Зайграй, зайграй, хлопча малы...»; |

| | |
|---|---|
| 30 жніўня 1814 г. – | маніфест імператара Аляксандра I пра ўсеагульную і безумоўную амністыю і вяртанне канфіскаваных альбо секвестраваных маёнткаў жыхарам заходніх губерняў, якія выступілі на баку Напалеона; |
| 1814 г. – | була папы рымскага аб аднаўленні дзейнасці ордэна езуітаў (быў забаронены ў 1773 г.); |
| 1817 г. – | у Віленскім універсітэце па ініцыятыве студэнтаў Адама Міцкевіча, Тамаша Зана і Яна Чачота створана патрыятычнае Таварыства *філаматаў* (аматараў навук). Прэзідэнт таварыства – Юзэф Яжоўскі; |
| 1819 г. – | адкрыццё ў г. Гомелі, маёнтку графа М. П. Румянцава, першай у Расійскай імперыі *ланкастэрскай школы* – школы ўзаемнага навучання; |
| 1820 г. – | стварэнне Таварыства *філарэтаў* – аматараў дабрачыннасці; |
| 1820 г. – | з гэтага года рэкруцкая павіннасць на 25-гадовую вайсковую службу ў расійскую армію прызначалася не ад 200 чалавек мужчынскага полу, а ад 125 чалавек; |
| 1820 г. – | указ імператара Аляксандра I аб высылцы езуітаў за межы Расійскай імперыі; |
| 1820-я гг. – | будаўніцтва першых фабрык на тэрыторыі Беларусі ў мястэчках *Хомск* Кобрынскага і *Косава* Слонімскага паветаў. Суконныя фабрыкі з паравымі рухавікамі належалі графу Войцеху Пуслоўскаму; |
| снежань 1821 г. – | указ аб забароне тайных таварыстваў; |
| 1823 г. – | арышты па справе таварыстваў філаматаў і філарэтаў; |

| | |
|---|---|
| 1823 г. – | па ініцыятыве будучага дзекабрыста Сяргея Мураўёва-Апостала распрацаваны бабруйскі план паўстання, які прадугледжваў арышт імператара Аляксандра I у час агляду войскаў у Бабруйскай крэпасці; |
| 1824–1839 гг. – | будаўніцтва Аўгустоўскага канала, які злучыў басейны рэк Нёмана і Віслы; |
| 1824 г. – | на р. Сож прайшоў апрабаванне першы параход пабудаваны ў Гомельскім маёнтку графа М. П. Румянцава англійскім механікам А. Смітам; |
| 1825–1855 гг. – | гады праўлення ў Расійскай імперыі Мікалая I (сына Паўла I); |
| 14 снежня 1825 г. – | спроба групы дваранскіх рэвалюцыянераў *(дзекабрысты)* пачаць узброенае выступленне ў г. Пецярбургу на Сенацкай плошчы ў дзень прысягі новаму імператару Мікалаю I; |
| 24 снежня 1825 г. – | члены тайнага *Таварыства ваенных сяброў* (створана па ініцыятыве філарэта Міхаіла Рукевіча) сарвалі цырымонію прысягі на вернасць Мікалаю I у мястэчку Браньск на Беласточчыне; |
| 1825 г. – | з гэтага года юнакам забаранялася выязджаць на вучобу ў замежныя ўніверсітэты; |
| 1826–1841 гг. – | дзейнасць у г. Віцебску Беларускага вольнага эканамічнага таварыства; |
| 1828 г. – | вяртанне да саслоўнага прынцыпу навучання ў Расійскай імперыі (выданне Статута навучальных устаноў 1828 г.); |

| | |
|---|---|
| 1829 г. – | стварэнне Беларускай навучальнай акругі ў складзе Віцебскай і Магілёўскай губерняў. Пазней да яе былі далучаны Мінская, Гродзенская і Віленская губерні і Беластоцкая вобласць; |
| 1830 г. – | заснаванне першай цукровай фабрыкі ў Беларусі ў маёнтку *Моладава* Кобрынскага павета. Належала землеўласніку і прадпрымальніку Аляксандру Скірмунту; |
| 1830 г. – | пачатак будаўніцтва ў Беларусі шашэйных дарог з дарожным палатном (цвёрдым пакрыццём), абочынамі і кюветамі; |
| лістапад 1830–1831 гг. – | нацыянальна-вызваленчае паўстанне ў Польшчы, Літве і Беларусі; |
| 29 лістапада 1830 г. – | пачалося паўстанне ў г. Варшаве; |
| снежань 1830 г. – | на тэрыторыі Беларусі, Літвы і Украіны ў сувязі з пашырэннем антырасійскага паўстання ўведзена ваеннае становішча; |
| 1 студзеня 1831 г. – | адмена дзеяння Статута ВКЛ у Віцебскай і Магілёўскай губернях; |
| студзень 1831 г. – | створаны Віленскі цэнтральны паўстанцкі камітэт; |
| канец сакавіка 1831 г. – | пачатак нацыянальна-вызваленчага паўстання ў Беларусі і Літве; |
| 19 чэрвеня 1831 г. – | бітва за г. Вільню пад час нацыянальна-вызваленчага паўстання 1830–1831 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі. Паўстанцы пацярпелі паражэнне ад урадавых войскаў; |
| пачатак жніўня 1831 г. – | нацыянальна-вызваленчае паўстанне на тэрыторыі Беларусі і Літвы падаўлена; |
| 19 кастрычніка 1831 г. – | указ «Аб разборы шляхты ў заходніх губернях і аб уладкаванні гэтага роду людзей» *(другі разбор шляхты)*; |

| | |
|---|---|
| 1831–1848 гг. – | дзейнасць Камітэта па справах заходніх губерняў; |
| 1832 г. – | указ аб ліквідацыі каталіцкіх манастыроў, якія не мелі поўнага складу манахаў і перадачы іх маёнткаў у разрад казённых; |
| 1832 г. – | закрыццё Віленскага ўніверсітэта (за ўдзел студэнтаў у паўстанні 1830–1831 гг.); |
| 1833 г. – | у мэтах русіфікацыі мясцовай моладзі ўрад выдзеліў 50 казённых стыпендый у Пецярбургскім і Маскоўскім універсітэтах для добранадзейных выпускнікоў беларускіх гімназій; |
| 1833–1842 гг. – | будаўніцтва Брэсцкай крэпасці; |
| 1834 г. – | з гэтага года рэкруцкая павіннасць на вайсковую службу ў расійскую армію складала 20, а не 25 гадоў, як было раней; |
| 1835 г. – | колькасць насельніцтва Беларусі склала 3 млн. 300 тыс. чалавек; |
| 1835–1918 гг. – | дзейнасць Полацкага кадэцкага корпуса; |
| 1836 г. – | царскі ўказ аб увядзенні ва ўсіх навучальных установах Беларусі навучання на рускай мове; |
| 1836–1839 гг. – | дзейнасць у г. Вільні заснаванага Францам Савічам «*Дэмакратычнага таварыства*»; |
| 1837–1846 гг. – | Ян Чачот выдаў у г. Вільні 6 зборнікаў «Вясковых песень»; |
| 1838–1864 гг. – | гады жыцця Кастуся (Канстанціна Вікенція) Каліноўскага; |
| 1838–1917 гг. – | выданне ў гарадах – цэнтрах губерняў «Губернских ведомостей»; |
| 12 лютага 1839 г. – | Полацкі царкоўны сабор, далучэнне ўніятаў да Рускай праваслаўнай царквы; |

| | |
|---|---|
| 1839–1857 гг. – | рэформа П. Д. Кісялёва ў дзяржаўнай вёсцы; |
| 1839 г. – сярэдзіна XX ст. – | перыяд гаспадарчага выкарыстання Аўгустоўскага канала; |
| 25 чэрвеня 1840 г. – | адмена дзеяння Статута ВКЛ у Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губернях; |
| 18 ліпеня 1840 г. – | выданне царскага ўказа, які прадпісаў замест агульнага найменя беларускіх і літоўскіх губерняў выкарыстоўваць іх назвы: Віцебская, Магілёўская, Віленская і Гродзенская; |
| жнівень 1840 г. – | пачатак працы Горы-Горацкай земляробчай школы (з 1848 г. – земляробчы інстытут); |
| 1840-я гг. – | адкрыццё ў адпаведнасці з рэформай П. Д. Кісялёва пачатковых школ для дзяржаўных сялян; |
| 1840-я гг. – | з’яўленне ў Беларусі тэлеграфа; |
| 1840–1850 гг. – | дзейнасць у г. Мінску тэатра, арганізаванага В. І. Дуніным-Марцінкевічам; |
| 1840–1900 гг. – | гады жыцця і дзейнасці Францішка Багушэвіча, беларускага паэта і публіцыста; |
| 1841–1916 гг. – | выданне газеты «Виленский вестник»; |
| 1842 г. – | заснаванне Канстанцінам Тышкевічам у г. Лагойску першага ў Беларусі гістарычнага музея; |
| 1844–1846 гг. – | выданне 4-томнага зборніка Яна Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях»; |
| 1844–1857 гг. – | правядзенне *інвентарнай рэформы* ў памешчыцкай вёсцы; |

| | |
|---|---|
| 1846–1849 гг. – | дзейнасць на тэрыторыі Беларусі «Саюза свабодных братоў» – тайнага таварыства разначыннай рэвалюцыйна-дэмакратычнай моладзі на чале якога стаялі Франц і Аляксандр Далеўскія. Цэнтр знаходзіўся ў г. Вільні, філіялы – у гг. Мінску, Гродне, Лідзе, Ашмянах, Слоніме і інш.; |
| 1847 г. – | распаўсюджванне ў маёнтку Смаргонь Ашмянскага павета ліста з заклікам да сялян, каб яны сумесна з мяшчанамі выразалі ўсіх памешчыкаў, аканомаў і здабылі сабе свабоду. Аўтарам ліста быў шляхціц Юльян Бакшанскі. За гэта быў арыштаваны і высланы на 15 гадоў у Сібір. Вярнуўся адтуль у 1862 г. Загінуў падчас паўстання 1863 г.; |
| 1848 г. – | адкрыццё Горы-Горацкага земляробчага інстытута – першай у Расійскай імперыі вышэйшай навучальнай установы, дзе рыхтаваліся аграномы і заатэхнікі; |
| 1849 г. – | група вайскоўцаў на чале з капітанам А. Гусевым вяла агітацыю ў адной з воінскіх часцей у г. Мінску, каб салдаты адмовіліся ад удзелу ў карнай экспедыцыі ў Заходнюю і Цэнтральную Еўропу для падаўлення рэвалюцыі 1848–1849 гг. У жніўні 1849 г. А. Гусеў і шэсць яго паплечнікаў былі пакараны на смерць. |

## II. Усталяванне капіталізму на беларускіх землях: другая палова XIX – пачатак XX ст.

| | |
|---|---|
| Другая палова XIX ст. – | распаўсюджанне ў архітэктуры так званага псеўдарускага стылю; |
| другая палова XIX – пачатак XX ст. – | час станаўлення новай беларускай літаратурнай мовы; |
| 1850-я гады – | найбольшы размах руху цвярозасці, накіраваны супраць уладальнікаў вінакурань і карчмароў у Заходняй Беларусі і Літве, у першую чаргу ў Гродзенскай і Віленскай губернях; |
| 1851 г. – | Мінская гарадская дума прыняла рашэнне аб зносе будынка ратушы, які напамінаў пра магдэбургскае права, атрыманае горадам у 1499 г. (Будынак ратушы адноўлены ў 2004 г.); |
| 1851–1898 гг. – | гады жыцця і дзейнасці Янкі Лучыны, беларускага паэта, аўтара зборніка «Вязанка»; |
| 1852 г. – | пастаноўка ў Мінску трупай В. Дуніна-Марцінкевіча першай беларускай камедыі-оперы «Ідылія» («Сялянка») (кампазітары С. Манюшка і К. Крыжаноўскі, аўтар лібрэта В. Дунін-Марцінкевіч); |
| 1855 г. – | стварэнне па ініцыятыве Яўстафія Тышкевіча Віленскага музея старажытнасцяў; |
| 1855–1881 гг. – | гады праўлення ў Расійскай імперыі Аляксандра II (сына Мікалая I); |
| студзень 1857 г. – | стварэнне Сакрэтнага камітэта для абмеркавання мер па ўладкаванні побыту памешчыцкіх сялян; |

| | |
|---|---|
| 20 лістапада 1857 г. – | рэскрыпт імператара Аляксандра II віленскаму генерал-губернатару У. І. Назімаву аб падрыхтоўцы праектаў «паляпшэння быту памешчыцкіх сялян»; |
| 1859 г. – | увядзенне ў эксплуатацыю тэлеграфнай лініі Мінск – Бабруйск; |
| 1860 г. – | у Беларусі налічвалася 76 фабрык і заводаў, 140 мануфактур і каля 28 тысяч дробных прадпрыемстваў; |
| 1860–1870 гг. – | правядзенне буржуазных рэформ у Расійскай імперыі; |
| 1860–1870 гг. – | у гэтыя гады сельская гаспадарка Беларусі спецыялізавалася на вытворчасці збожжа: жыта, аўса, ячменю; |
| 1860–1890 гг. – | у прамысловасці Беларусі значна паскорыўся пераход ад ручной да машыннай (фабрычнай) вытворчасці; |
| 19 лютага 1861 г. – | падпісанне імператарам Аляксандрам II Палажэння і Маніфеста аб вызваленні памешчыцкіх сялян ад прыгоннай залежнасці; |
| вясна 1862 г. – | стварэнне ў г. Варшаве *Цэнтральнага нацыянальнага камітэта (ЦНК)* – органа для падрыхтоўкі паўстання; |
| лета 1862 г. – | стварэнне ў г. Вільні *Літоўскага правінцыяльнага камітэта (ЛПК)* – органа па падрыхтоўцы паўстання ў Беларусі і Літве; |
| кастрычнік 1862 г. – | уступленне на пасаду старшыні Літоўскага правінцыяльнага камітэта Кастуся (Канстанціна Вікенція) Каліноўскага; |
| 1862 г. – | пачатак ажыццяўлення ваеннай рэформы. Утварэнне Віленскай ваеннай акругі; |

| | |
|---|---|
| 1862 г. – | праз Беларусь прайшла першая чыгунка, участак Пецярбургска-Варшаўскай магістралі (датай заснавання беларускай чыгункі прынята лічыць 29 лістапада 1871 г. – дзень уводу ў эксплуатацыю лініі Смаленск–Орша–Мінск–Брэст); |
| 1862–1863 гг. – | выйшла 7 нумароў першай нелегальнай беларускай дэмакратычнай газеты «Мужыцкая праўда»; |
| 1862–1874 гг. – | ваенная рэформа ў Расійскай імперыі. Замест рэкрутчыны ўводзілася ўсеагульная воінская павіннасць; |
| 1863–1864 гг. – | нацыянальна-вызваленчае паўстанне пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага; |
| 10 студзеня 1863 г. – | пачатак паўстання ў Царстве Польскім; |
| 20 студзеня 1863 г. – | Літоўскі правінцыяльны камітэт (ЛПК) аб'явіў сябе Часовым правінцыяльным урадам Літвы і Беларусі і абнародаваў праграмныя дакументы. Пачатак паўстання ў Літве і Беларусі; |
| люты 1863 г. – | паўстанцы захапілі г. Пружаны; |
| люты 1863 г. – | «белыя» захапілі кіраўніцтва ў Літоўскім правінцыяльным камітэце; |
| 1 сакавіка 1863 г. – | указ імператара Аляксандра II аб спыненні часоваабавязанага становішча сялян у беларускіх губернях і ўвядзенні абавязковага выкупу сялянскіх надзелаў у Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай і Мінскай губернях і ў інфлянцкіх паветах Віцебскай губерні; |
| красавік 1863 г. – | атрад Людвіка Звяждоўскага з дапамогай студэнтаў Горы-Горацкага земляробчага інстытута захапіў г. Горкі; |

| | |
|---|---|
| 24 красавіка 1863 г. – | бітва каля вёскі Мілавіды Слонімскага павета паміж паўстанцамі і царскімі войскамі; |
| вясна 1863 г. – | найвышэйшы ўздым паўстання на тэрыторыі Беларусі і Літвы; |
| май 1863 г. – | прыбыццё ў г. Вільню новага генерал-губернатара Міхаіла Мікалаевіча Мураўёва, пачатак жорсткіх рэпрэсій і публічных пакаранняў паўстанцаў. М. М. Мураўёў у народзе атрымаў мянушку «вешальнік»; |
| 18 кастрычніка 1863 г. – | цыркуляр М. М. Мураўёва аб наданні трохдзесяціннага надзела сялянам, якія былі абеззямелены ў 1846–1856 гг. і аб вяртанні надзелаў сялянам, абеззямеленым пасля 1857 г.; |
| 2 лістапада 1863 г. – | указ імператара Аляксандра II аб абавязковым выкупе сялянскіх надзелаў у Віцебскай і Магілёўскай губернях; |
| восень 1863 г. – | спыненне ўзброенай барацьбы на тэрыторыі Беларусі; |
| 1863 г. – | колькасць насельніцтва Беларусі склала 4 млн. 200 тыс. чалавек; |
| 29 студзеня 1864 г. – | арышт Кастуся Каліноўскага; |
| 5 сакавіка 1864 г. – | прыняцце палажэння аб ільготах і перавагах пры куплі зямлі ў заходніх губернях для асоб рускага паходжання; |
| 10 (22) сакавіка 1864 г. – | Кастусь Каліноўскі пакараны на смерць праз павешанне на Лукішкаўскай плошчы ў г. Вільні; |
| 1864 г. – | за ўдзел студэнтаў у нацыянальна-вызваленчым паўстанні быў закрыты Гора-Горацкі земляробчы інстытут; |

| | |
|---|---|
| 1864 г. – | школьная рэформа ў Расійскай імперыі. Школа абвяшчалася ўсесаслоўнай. Ствараліся народныя і гарадскія вучылішчы, царкоўна-прыходскія школы і школы граматы (пачатковая адукацыя), мужчынскія і жаночыя гімназіі – класічныя і рэальныя (сярэдняя адукацыя) і інстытуты і ўніверсітэты (вышэйшая адукацыя); |
| 1864 г. – | земская рэформа ў Расійскай імперыі. У Беларусі па палітычных прычынах земская рэформа пачала ажыццяўляцца толькі ў 1911 г.; |
| 1864 г. – | судовая рэформа ў Расійскай імперыі. Саслоўныя суды заменены агульнасаслоўнымі. Крымінальныя справы разглядаліся з удзелам прадстаўнікоў грамадскасці – прысяжных засядацеляў. Уводзіўся інстытут адвакатуры. У Беларусі пачалася ў 1872 г.; |
| 1864 г. – | у г. Маладзечне адчынілася першая на тэрыторыі Расійскай імперыі настаўніцкая семінарыя; |
| 1864–1880 гг. – | найбольш значныя сялянскія выступленні ў сувязі з падзеламі зямлі пасля адмены прыгоннага права і спробамі ўлад павялічыць выкупныя плацяжы і павіннасці сялян на карысць памешчыкаў; |
| 1865 г. – | цэнзурная рэформа ў Расійскай імперыі; |
| 1866 г. – | пачала дзейнічаць Рыга–Арлоўская чыгунка (Дзвінск–Полацк–Віцебск); |
| 1866–1870 гг. – | адмена ваеннага становішча на тэрыторыі Беларусі, уведзенага ў сувязі з паўстаннем 1863–1864 гг. (у 1866 г. ваеннае становішча адменена ва ўсходніх губернях, цалкам – у 1870 г.) |

| | |
|---|---|
| 1870 г. – | пачатак правядзення ў Расійскай імперыі гарадской рэформы. У Беларусі яна пачалася ў 1875 г.; |
| 1870 г. – | выйшаў «Слоўнік беларускай мовы» Івана Насовіча; |
| сярэдзіна 1870- гг. – | на змену пакаленню дваранскіх (шляхецкіх) рэвалюцыянераў прыйшло *народніцтва*; |
| 1870–1890-я гг. – | галоўная форма пратэсту рабочых – *стачкі* – калектыўныя спыненні працы з патрабаваннем рэгулярнай выплаты зарплаты, скарачэння рабочага дня, паляпшэння ўмоў працы; |
| 1870–1890-я гг. – | хваляванні рабочых-землякопаў на будаўніцтве Лібава-Роменскай чыгункі ў Мінскім павеце і на цагельным заводзе ў Брэсцкай крэпасці; |
| 29 лістапада 1871 г. – | дата заснавання беларускай чыгункі, дзень уводу ў эксплуатацыю лініі Смаленск–Орша–Мінск–Баранавічы–Брэст Маскоўска-Брэсцкай чыгункі; |
| 1871–1874 гг. – | пачала дзейнічаць Лібава-Роменская чыгунка (Вільня–Маладзечна–Мінск–Асіповічы–Бабруйск–Жлобін); |
| 1872–1882 гг. – | пачатак правядзення ў Беларусі судовай рэформы; |
| 1873–1875 гг. – | узнікненне першых народніцкіх гурткоў у беларускіх гарадах; |
| лета 1874 г. – | жыхары мястэчка Лагішын Пінскага павета Мінскай губерні далі адпор атраду паліцыі пры абароне сваіх правоў на адрэзаныя надзелы зямлі; |

| | |
|---|---|
| 1875 г. – | пачатак правядзення ў Беларусі гарадской рэформы; |
| 7 сакавіка 1876 г. – | забастоўка рабочых Мінскіх чыгуначных майстэрань – адно з першых выступленняў рабочых у Беларусі; |
| 1876 г. – | у г. Пецярбургу была створаная агульнарасійская народніцкая арганізацыя «Зямля і воля»; |
| 1877 г. – | дзейнасць у г. Мінску гурткоў народніцкай арганізацыі «Зямля і воля»; |
| 1878 г. – | утварэнне ў г. Магілёве гуртка народніцкай арганізацыі «Зямля і воля»; |
| 1879 г. – | раскол народніцкай арганізацыі «Зямля і воля» на дзве – «Чорны перадзел» і «Народная воля»; |
| пачатак 1880-х гг. – | цэнтрам дзейнасці беларускіх народнікаў з'яўляўся г. Пецярбург; |
| 1880-я гг. – | у Беларусі пачалі дзейнічаць аддзяленні Дзяржаўнага, Сялянскага пазямельнага і Дваранскага зямельнага банкаў Расіі; |
| 1880-я гг. – | пабудаваны *Палескія чыгункі* (Вільня–Баранавічы–Лунінец; Гомель–Лунінец–Пінск–Жабінка; Баранавічы–Слонім–Ваўкавыск–Беласток); |
| сярэдзіна 1880-х гг. – | народніцтва паступова саступае месца на палітычнай арэне *сацыял-дэмакратам;* |
| 1880–1890 гг. – | у Беларусі адбыўся пераход да машыннай вытворчасці; |
| 1880–1890 гг. – | на ўсходзе Беларусі пашырыўся перасяленчы рух на свабодныя землі ў Сібір і іншыя губерні Расійскай імперыі; |
| 1880–1890 гг. – | час фарміравання беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі; |

| | |
|---|---|
| 1 сакавіка 1881 г. – | забойства цара Аляксандра II ураджэнцам Бабруйскага павета Ігнатам Грынявіцкім і наступленне перыяду контррэформаў; |
| 1881–1890-я гг. – | перыяд контррэформаў у Расійскай імперыі; |
| 1881–1894 гг. – | гады праўлення ў Расійскай імперыі Аляксандра III (сына Аляксандра II); |
| 19 жніўня 1881 г. – | падпісанне Аляксандрам III «Палажэння аб мерах для аховы дзяржаўнай бяспекі і грамадскага спакою», ператварэнне Расійскай імперыі ў паліцэйскую дзяржаву; |
| 1881 г. – | утварэнне ў Пецярбургскім універсітэце нелегальнага беларускага студэнцкага зямляцтва; |
| 1881–1889 гг. – | дзейнасць паўночна-заходняй арганізацыі «Народная воля»; |
| 9 студзеня 1882 г. – | прыняцце закона аб абавязковым выкупе зямлі сялянамі і спыненні часоваабавязаных адносін з памешчыкамі з 1883 г.; |
| 1882 г. – | у судах Беларусі ўведзены пасады прысяжных засядацеляў; |
| 1882 г. – | першая ў Беларусі тэлефонная сетка звязала Добрушскую папяровую фабрыку графа Ф. І. Паскевіча з яго маёнткамі і палацам у г. Гомелі; |
| 1882 г. – | заснаванне ў Расійскай імперыі Сялянскага пазямельнага банка. У г. Мінску яго аддзяленні былі адчынены ў 1886 г.; |
| 1882–1942 гг. – | жыццё і дзейнасць класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы (Івана Дамінікавіча Луцэвіча); |
| 1882–1956 гг. – | жыццё і дзейнасць класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа (Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча); |

| | |
|---|---|
| 1883 г. – | стварэнне Г. В. Пляханавым першай расійскай марксісцкай арганізацыі «Вызваленне працы»; |
| 1884 г. – | утварэнне беларускімі студэнтамі-народнікамі групы «Гоман» у г. Пецярбургу і выданне імі аднайменнага часопіса; |
| 1884 г. – | здадзена ў эксплуатацыю чыгуначная лінія Вільня – Пінск; |
| 1884 г. – | пачатак адкрыцця ў Беларусі царкоўна-прыходскіх школ; |
| 1884–1885 гг. – | стварэнне і дзейнасць у г. Мінску першых груп па прапагандзе марксізму; |
| 1884–1940 гг. – | жыццё і дзейнасць Язэпа Лёсіка, пісьменніка, мовазнаўцы, акадэміка, члена Рады Беларускай Народнай Рэспублікі; |
| чэрвень 1885 г. – | выданне закона аб забароне начной працы жанчын і падлеткаў да семнаццаці гадоў; |
| 1885–1887 гг. – | у слясарных майстэрнях г. Мінска была створана і дзейнічала першая ў Беларусі стачачная каса з мэтай матэрыяльнай падтрымкі стачачнікаў; |
| 1885–1900 гг. – | за гэты час з пяці беларускіх губерняў выехала за Урал 104 тыс. чалавек перасяленцаў; |
| 1886 г. – | закон аб абавязковым пераводзе дзяржаўных сялян на выкуп; |
| 1886 г. – | пачатак выхаду газеты «Минский листок», першага перыядычнага няўрадавага выдання ў Беларусі; |
| 1886 г. – | першая дэманстрацыя электрычнага асвятлення ў г. Мінску, на вадакачцы Лібава-Роменскай чыгункі; |
| 1886 г. – | здадзена ў эксплуатацыю чыгуначная лінія Лунінец – Гомель; |

| | |
|---|---|
| 1886–1912 гг. – | выйшаў «Беларускі зборнік» Еўдакіма Раманава ў 9-ці выпусках; |
| 1887 г. – | выданне міністрам народнай адукацыі Расійскай імперыі цыркуляра, па якому забаранялася прымаць у гімназіі дзяцей ніжэйшых саслоўяў гарадскога насельніцтва (кухарак, прачак, дробных гандляроў і інш.). У грамадстве атрымаў назву цыркуляр «Аб кухарчыных дзецях»; |
| 1887–1902 гг. – | Павел Шэін выдаў трохтомнік «Матэрыялы для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю»; |
| 1887–1937 гг. – | жыццё і дзейнасць Зміцера Федаравіча Жылуновіча (Цішкі Гартнага), першага старшыні ўрада БССР; |
| 1889 г. – | пачатак працы першай у Беларусі электрастанцыі на Добрушскай папяровай фабрыцы; |
| 1889 г. – | у газеце «Минский листок» упершыню была апублікавана паэма «Тарас на Парнасе»; |
| канец 1880-х – першая палова 1890-х гг. – | стварэнне першых груп па прапагандзе марксізму ў гарадах Вільні, Віцебску, Гомелі, Гродне, Брэсце, Смаргоні; |
| чэрвень 1890 г. – | адкрыццё ў г. Мінску гарадскога тэатра; |
| 1890-я гг. – | галоўнай галіной сельскай гаспадаркі Беларусі стала малочная жывёлагадоўля; |
| 1890-я гг. – | у Беларусі пачалі дзейнічаць аддзяленні Маскоўскага, Пецярбургска-Азоўскага, Паўднёва-Рускага, Віленскага і Паўднёвага камерцыйных банкаў; |
| другая палова 1890-х гг. – | стачачны рух беларускіх рабочых стаў масавым, але захаваў эканамічны характар; |

| | |
|---|---|
| 1891–1917 гг. – | жыццё і дзейнасць беларускага паэта Максіма Багдановіча; |
| 1892 г. – | у г. Мінску адкрылася конна-чыгуначная дарога (конка); |
| 1892–1937 гг. – | жыццё і дзейнасць Аляксандра Рыгоравіча Чарвякова, старшыні Савета Народных Камісараў БССР; |
| 1892–1938 гг. – | жыццё і дзейнасць Браніслава Адамавіча Тарашкевіча, стваральніка і старшыні БСРГ, кіраўніка ТБШ, акадэміка; |
| 1894–1917 гг. – | гады праўлення ў Расійскай імперыі Мікалая II (сына Аляксандра III), апошняга расійскага імператара; |
| студзень, сакавік 1895 г. – | забастоўкі рабочых Мінскіх чыгуначных майстэрань пад кіраўніцтвам сацыял-дэмакратычнай групы С. С. Трусевіча; |
| 1 мая 1895 г. – | невялікая група мінскіх рабочых упершыню тайна адсвяткавала 1 Мая як дзень міжнароднай пралетарскай салідарнасці; |
| 1895 г. – | пуск электрастанцыі ў г. Мінску, пачатак электрычнага асвятлення вуліц горада; |
| май 1896 г. – | з’езд прадстаўнікоў Мінскай, Віленскай і Смаргонскай рабочых арганізацый, арганізаваны С. С. Трусевічам – утварэнне *Рабочага саюза Літвы* (РСЛ); |
| 1896 г. – | у г. Мінску з’явілася тэлефонная станцыя агульнага карыстання; |
| верасень 1897 г. – | на з’ездзе ў г. Вільні ўтвораны *Ўсеагульны яўрэйскі рабочы саюз у Літве, Польшчы і Расіі* (Бунд); |

| | |
|---|---|
| 1897 г. – | першы Ўсерасійскі перапіс насельніцтва, згодна з якім у Беларусі жыло 6,7 млн. чалавек (65,6% – беларусы, 14,6% – яўрэі, 6% – рускія, 5,2% – палякі, 4,6% – украінцы; праваслаўныя складалі каля 2/3 ад усяго насельніцтва); |
| сакавік 1898 г. – | I з'езд *Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі* (РСДРП) у г. Мінску; |
| 1898 г. – | у г. Віцебску пушчаны электрычны трамвай (раней, чым у г. Маскве і г. Пецярбургу); |
| 1898–1900 гг. – | першыя палітычныя выступленні рабочых у форме стачак, вулічных маніфестацый і дэманстрацый прайшлі ў гарадах Віцебску, Гродне, Смаргоні; |
| май 1899 г. – | забастоўка рабочых Гомельскіх чыгуначных майстэрань; |
| канец XIX ст. – | з'яўленне ў Беларусі тэлефоннай сувязі; |
| пачатак XX ст. – | адкрыццё настаўніцкіх інстытутаў у гарадах Віцебску, Магілёве і Мінску; |
| студзень 1900 г. – | у г. Мінску на сваім з'ездзе Рабочы саюз Літвы аб'яднаўся з сацыял-дэмакратыяй Каралеўства Польскага ў новую партыю – *Сацыял-дэмакратыя Каралеўства Польскага і Літвы* (СДКПіЛ). Яе кіраўнікамі сталі С. Трусевіч і Ф. Дзяржынскі; |
| 1900 г. – | у г. Мінску адбылася першая вулічная дэманстрацыя, прысвечаная 1 Мая; |
| 1901 г. – | прыхільнікі Зубатава ўтварылі ў г. Мінску *Яўрэйскую незалежную рабочую партыю* (ЯНРП); |
| 1902 г. – | утварэнне *партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў* (ПСР, эсэры); |

| | |
|---|---|
| 1902 г. – | утварэнне *Польскай сацыялістычнай партыі ў Літве* (ППС на Літве); |
| 1902 г. – | Другая Ўсерасійская канферэнцыя сіяністаў у г. Мінску; |
| 1902 г. – | адкрылася Пецярбургска-Адэская чыгуначная магістраль (Віцебск–Орша–Магілёў–Жлобін); |
| 1902–1903 гг. – | П. А. Сталыпін займаў пасаду гродзенскага губернатара; |
| 1902–1905 гг. – | выданне ў г. Мінску газеты «Северо-Западный край»; |
| 1903 г. – | падзел РСДРП на бальшавікоў і меншавікоў; |
| 1903 г. – | канчатковае афармленне *Беларускай сацыялістычнай грамады* (БСГ), першай беларускай палітычнай партыі; I з'езд БСГ; |
| 1903–1922 гг. – | выйшаў трохтомнік «Беларусы» Яўхіма Карскага; |
| студзень 1904 г. – | утварэнне Палескага камітэта РСДРП; |
| сакавік 1904 г. – | утварэнне Паўночна-Заходняга камітэта РСДРП; |
| 1905–1907 гг. – | першая расійская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя; |
| 9 студзеня 1905 г. – | «крывавая нядзеля» у г. Петраградзе, расстрэл шматтысячнага мірнага шэсця працоўных, якія збіраліся перадаць петыцыю імператару Мікалаю II; |
| студзень 1905 г. – | палітычныя стачкі ў гарадах Беларусі; |
| сакавік 1905 г. – | утварэнне *Беларускага сялянскага саюза*; |
| вясна 1905 г. – | на змену палітычным стачкам у Беларусі прыйшлі эканамічныя; |

| | |
|---|---|
| лета 1905 г. – | шэраг стачак у беларускіх вёсках. Адной з найбольш вядомых, у маёнтку Шчорсы Навагрудскага павета, кіраваў знакаміты дзеяч БСГ А. Бурбіс; |
| 6 жніўня 1905 г. – | Маніфест цара Мікалая II аб скліканні *заканадарадчай* Дзяржаўнай думы (Булыгінская дума); |
| восень 1905г. – | салдацкія хваляванні, далучэнне да рэвалюцыйнага руху прадстаўнікоў арміі; |
| кастрычнік 1905 г – | Усерасійская палітычная стачка; |
| 17 кастрычніка 1905 г. – | Маніфест цара Мікалая II аб стварэнні парламента – *Дзяржаўнай думы з заканадаўчымі паўнамоцтвамі*, правам удзелу ў выбарах усіх слаёў насельніцтва. Былі ўведзены палітычныя свабоды – свабода слова, сходаў, друку, саюзаў; |
| кастрычнік 1905 г. – | стварэнне *Канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі* (кадэты); |
| 18 кастрычніка 1905 г. – | Курлоўскі расстрэл на вакзальнай плошчы ў г. Мінску 20-тысячнага мітынгу працоўных. Загінула 100 чалавек. Названы па імені тагачаснага мінскага губернатара П. Р. Курлова; |
| 18 кастрычніка 1905 г. – | расстрэл дэманстрацыі працоўных у г. Віцебску; |
| 3 лістапада 1905 г. – | Маніфест імператара Мікалая II аб адмене выкупных плацяжоў з сялян з 1 студзеня 1907 г.; |
| 22–25 лістапада 1905 г. – | паўстанне салдат у Бабруйскім дысцыплінарным батальёне; |
| канец 1905 г. – | стварэнне партыі *«Саюз 17 кастрычніка»* (акцябрысты) – партыі буйной буржуазіі і памешчыкаў; |

| | |
|---|---|
| снежань 1905 г. – | выступленне сялян у вёсцы Пінкавічы Пінскага павета, дачыненне да якога меў К. М. Міцкевіч (Я. Колас), які працаваў там школьным настаўнікам; |
| 11 снежня 1905 г. – | выдадзены закон аб выбарах у І Дзяржаўную думу; |
| 1905–1910 гг. – | пабудова ў г. Мінску касцёла Святых Сымона і Алены (спалучэнне раманскай і гатычнай архітэктуры); |
| 14 студзеня 1906 г. – | спроба забойства мінскага губернатара П. Р. Курлова эсэрам Іванам Пуліхавым; |
| студзень 1906 г. – | ІІ з'езд Беларускай сацыялістычнай грамады ў г. Мінску; |
| 27 лютага 1906 г. – | маніфестацыя пратэсту ў г. Мінску супраць смяротнага пакарання эсэра І. Пуліхава; |
| сакавік 1906 г. – | выданне закона аб легалізацыі прафсаюзаў; |
| 24 красавіка – 8 ліпеня 1906 г. – | дзейнасць І Дзяржаўнай думы; |
| 18 мая 1906 г. – | заснаванне ў г. Пецярбургу беларускай выдавецкай суполкі «Загляне сонца і ў наша ваконца»; |
| 9 ліпеня 1906 г. – | указ цара Мікалая ІІ аб роспуску І Дзяржаўнай думы; |
| лета 1906 г. – | нелегальны сход народных настаўнікаў у вёсцы Мікалаеўка Мінскага павета; |
| 1 верасня – 1 снежня 1906 г. – | выданне газеты «Наша доля», першай легальнай беларускай газеты. Выйшла 6 нумароў; |
| 9 лістапада 1906 г. – | указ цара Мікалая ІІ аб праве выхаду сялян з абшчыны і замацаванні зямлі ў асабістую ўласнасць сялян, *пачатак сталыпінскай аграрнай рэформы*; |

| | |
|---|---|
| 10 лістапада 1906 – 7 жніўня 1915 гг. – | выданне газеты «Наша ніва», «нашаніўскі перыяд» беларускай гісторыі. Газета да 1912 г. друкавалася кірыліцай і лацінкай, пазней – толькі кірыліцай; |
| 20 лютага – 2 чэрвеня 1907 г. – | дзейнасць II Дзяржаўнай думы; |
| 3 чэрвеня 1907 г. – | завяршэнне першай расійскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, 3-чэрвеньскі дзяржаўны пераварот; |
| 1 лістапада 1907 – 9 чэрвеня 1912 гг. – | дзейнасць III Дзяржаўнай думы; |
| 1910 г. – | выданне ў г. Вільні «Кароткай гісторыі Беларусі» Вацлава Ластоўскага, першай кнігі па гісторыі Беларусі, напісанай беларусам, з беларускіх нацыянальных пазіцый і на беларускай мове; |
| 1910–1913 гг. – | дзейнасць «Першай беларускай трупы Ігната Буйніцкага» – першага нацыянальнага прафесійнага тэатра; |
| 14 сакавіка 1911 г. – | увядзенне выбарных земстваў у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях; |
| студзень 1912 г. – | першая пастаноўка п'есы Я. Купалы «Паўлінка» ў г. Вільні; |
| 15 лістапада 1912 – 6 кастрычніка 1917 гг. – | дзейнасць IV Дзяржаўнай думы; |
| 1913 г. – | колькасць насельніцтва Беларусі склала 6 млн. 899 тыс. чалавек; |
| 19 ліпеня (1 жніўня) 1914 г. – | пачатак Першай сусветнай вайны. Увядзенне ваеннага становішча на тэрыторыі Беларусі; |
| 1914–1918 гг. – | Першая сусветная вайна; |

| | |
|---|---|
| лета 1914 г. – | Беларусь становіцца галоўнай арэнай ваенных дзеянняў Першай сусветнай вайны; |
| 2 жніўня 1914 г. – | у г. Баранавічы размешчана Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага ўзброенымі сіламі Расіі; |
| 27 жніўня –<br>19 верасня 1915 г. – | наступальная аперацыя германскай арміі «Свянцянскі прарыў», якая стварыла пагрозу захопу г. Мінска; |
| 1915 г. – | утварэнне ў Вільні дабрачыннага Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны на чале з Антонам і Іванам Луцкевічамі і Вацлавам Ластоўскім; |
| 1915 г. – | утварэнне ў Вільні Беларускага народнага камітэта (БНК); |
| кастрычнік 1915 г. – | фронт стабілізаваўся па лініі Дзвінск–Смаргонь–Паставы–Баранавічы–Пінск; |
| сакавік 1916 г. – | наступальная аперацыя расійскіх войск у раёне воз. Нарач. Закончылася беспаспяхова; |
| красавік і чэрвень 1916 г. – | выступленне беларускай дэлегацыі на міжнародных канферэнцыях у г. Стакгольме і г. Лазане з ідэяй стварэння Злучаных штатаў Беларусі, Літвы, Латвіі і Украіны; |
| чэрвень–ліпень 1916 г. – | наступальная аперацыя расійскіх войск у раёне г. Баранавічы; |
| кастрычнік 1916 г. – | антываеннае і антыўрадавае выступленне салдат і матросаў на размеркавальным пункце ў г. Гомелі; |
| 28 лістапада 1916 г. – | у г. Вільна створаны Першы беларускі тэатр пад кіраўніцтвам Ф. Аляхновіча; |
| 1916–1917 гг. – | утварэнне і дзейнасць саюза беларускіх нацыянальных арганізацый на чале з Беларускім народным камітэтам у г. Вільні; |

| | |
|---|---|
| 23 лютага 1917 г. – | пачатак Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў Расіі; |
| 27 лютага 1917 г. – | першае пасяджэнне Петраградскага савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў – органа ўлады паўстаўшага народа; |
| – | фарміраванне Часовага камітэту Дзяржаўнай думы; |
| 2 сакавіка 1917 г. – | цар Мікалай II падпісаў акт адрачэння ад прастола; |
| – | на аснове Часовага камітэту Дзяржаўнай думы сфарміраваны *Часовы ўрад* на чале з князем Г. Я. Львовым; |
| 3–4 сакавіка 1917 г. – | стварэнне ў г. Мінску Часовага грамадскага камітэта парадку, які са згоды камандуючага Заходнім фронтам сфарміраваў часовыя органы ўлады ў г. Мінску; |
| 4 сакавіка 1917 г. – | у склад Мінскага савета рабочых дэпутатаў былі ўключаны прадстаўнікі салдат і ён стаў Саветам рабочых і салдацкіх дэпутатаў; |
| 6 сакавіка 1917 г. – | Часовы ўрад Расіі перадаў уладу ў губернях і паветах сваім камісарам, якія выконвалі функцыі губернатараў; |
| 8 сакавіка 1917 г. – | у г. Мінску была створана народная міліцыя, якую ўзначаліў М. В. Фрунзэ; |
| 18 сакавіка 1917 г. – | выйшаў першы нумар газеты «Известия Минского Совета рабочих и солдатских депутатов»; |
| 25–27 сакавіка 1917 г. – | першы з’езд беларускіх партый і арганізацый у г. Мінску. Утварэнне *Беларускага нацыянальнага камітэта* (БНК) на чале з Р. Скірмунтам; |
| сакавік 1917 г. – | адраджэнне БСГ пасля дзесяцігадовага перапынку; |

| | |
|---|---|
| сакавік–чэрвень 1917 г. – | саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў былі арганізаваны больш чым у 100 населеных пунктах Беларусі; |
| 7–17 красавіка 1917 г. – | у г. Мінску адбыўся I з'езд ваенных і рабочых дэпутатаў армій і тылу Заходняга фронту; |
| 20 красавіка 1917 г. – | у г. Мінску адкрыўся з'езд сялянскіх дэлегатаў Мінскай губерні; |
| чэрвень 1917 г. – | група дзеячаў беларускага нацыянальнага руху на чале з В. Ластоўскім упершыню выступіла з ідэяй поўнай дзяржаўнай незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі ў яе этнаграфічных межах; |
| чэрвень 1917 – 1918 гг. – | *Заходняя вобласць* – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, утвораная на з'ездзе саветаў Мінскай, Віленскай і Магілёўскай губерняў у чэрвені 1917 г. У верасні 1917 г. перайменавана ў *Заходнюю камуну* (уключала Смаленскую, Віцебскую, Магілёўскую, Мінскую і Віленскую губерні). Скасавана пасля абвяшчэння БССР; |
| 8–12 ліпеня 1917 г. – | Другі з'езд беларускіх партый і арганізацый у г. Мінску. Стварэнне замест БНК *Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый;* |
| 25–30 жніўня 1917 г. – | «карнілаўскі мяцеж» (Лаўр Георгіевіч Карнілаў – Вярхоўны галоўнакамандуючы расійскай арміі выступіў супраць Часовага ўрада і Саветаў); |
| верасень 1917 г. – | Расія абвешчана дэмакратычнай рэспублікай; |
| верасень 1917 г. – | I Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РСДРП(б) у г. Мінску, стварэнне Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б); |

| | |
|---|---|
| 1917 г. – | Першае беларускае таварыства драмы і камедыі створана ў г. Мінску Фларыянам Ждановічам пры ўдзеле Ігната Буйніцкага; |
| канец 1917 г. – | колькасць насельніцтва Беларусі склала 6 млн. 900 тыс. чалавек. |

## III. Кастрычніцкая рэвалюцыя. Стварэнне беларускай дзяржаўнасці (1917–1920 гг.)

| | |
|---|---|
| 25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 г. – | узброенае паўстанне ў г. Петраградзе, звяржэнне Часовага ўрада, пераход улады да бальшавікоў; |
| 25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 г. – | бальшавікі г. Мінска па вайсковаму радыё атрымалі паведамленне аб перамозе ўзброенага паўстання ў г. Петраградзе. Мінскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў абвясціў сябе ўладай. Быў створаны Першы рэвалюцыйны імя Мінскага Савета полк; |
| 25–27 кастрычніка (7–9 лістапада) 1917 г. – | II Усерасійскі з’езд саветаў у г. Петраградзе. Утварэнне першага савецкага ўрада – Савета Народных Камісараў (СНК) на чале з У. Леніным. Прыняцце дэкрэтаў аб міры і зямлі; |
| 27 кастрычніка (9 лістапада) 1917 г. – | утварэнне Ваеннага-рэвалюцыйнага камітэта (ВРК) Заходняга фронту; |
| – | утварэнне ў г. Мінску Камітэта выратавання рэвалюцыі на чале з меншавіком Калатухіным; |
| 20 лістапада (3 снежня) 1917 г. – | ліквідацыя Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага ў г. Магілёве; |

| | |
|---|---|
| лістапад 1917 г. – | утварэнне вышэйшага органа савецкай улады на тэрыторыі Беларусі – *Абласнога выканаўчага камітэта Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту (Аблвыкамзах)* на чале з М. Рагазінскім; выканаўчай улады – *Савета Народных Камісараў (СНК) Заходняй вобласці і фронту* на чале з К. Ландарам і кіраўнічай структуры бальшавіцкіх арганізацый – *Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б)* на чале з А. Мясніковым; |
| 2 (15) снежня 1917 г. – | пагадненне ў г. Брэст-Літоўску паміж савецкай Расіяй і дзяржавамі германскага блоку аб часовым спыненні ваенных дзеянняў; |
| 7–17 (20–30) снежня 1917 г. – | Першы Ўсебеларускі з'езд (Кангрэс) прадстаўнікоў беларускіх партый і арганізацый. Разагнаны па рашэнню СНК Заходняй вобласці і фронту; |
| 12 студзеня 1918 г. – | пачатак антысавецкага выступлення польскага корпуса генерала Ю. Р. Доўбар-Мусніцкага; |
| 13 лютага 1918 г. – | СНК РСФСР прыняў дэкрэт аб увядзенні новага (грыгарыянскага) календара. Наступным пасля 31 студзеня (па старому стылю) днём стала 14 лютага (па новаму стылю); |
| 18 лютага 1918 г. – | войскі кайзераўскай Германіі пачалі наступленне і акупацыю цэнтральнай і ўсходняй Беларусі; |
| 21 лютага 1918 г. – | войскі кайзераўскай Германіі занялі г. Мінск. Акупацыя доўжылася да 10 снежня 1918 г.; |

| | |
|---|---|
| 21 лютага 1918 г. – | стварэнне Народнага сакратарыята Беларусі; выданне Выканаўчым камітэтам Рады Ўсебеларускага з’езда *Першай Устаўной граматы да народаў Беларусі*; |
| 1 сакавіка 1918 г. – | акупацыя г. Гомеля войскамі кайзераўскай Германіі. Акупацыя доўжылася да 14 студзеня 1919 г.; |
| 1 сакавіка 1918 г. – | пачатак выдання газеты «Дзянніца», першага савецкага перыядычнага выдання на беларускай мове, орган Беларускага нацыянальнага камісарыята; |
| 21 лютага 1918 г. – | войскі кайзераўскай Германіі занялі г. Мінск. Акупацыя доўжылася да 10 снежня 1918 г.; |
| 3 сакавіка 1918 г. – | Брэсцкі мірны дагавор, падзел тэрыторыі Беларусі паміж савецкай Расіяй і Германіяй; |
| 9 сакавіка 1918 г. – | выданне Выканаўчым камітэтам Рады Ўсебеларускага з’езда *Другой Устаўной граматы*, абвяшчэнне *Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР);* |
| 15 сакавіка 1918 г. – | IV Надзвычайны Ўсерасійскі з’езд саветаў ратыфікаваў Брэсцкі мір; |
| 18 сакавіка 1918 г. – | перайменаванне Рады Ўсебеларускага з’езда ў Раду БНР, прыняцце Статута Рады, зацвярджэнне Першай і Другой Устаўных грамат Рады БНР; |
| 25 сакавіка 1918 г. – | выданне Радай БНР *Трэцяй Устаўной граматы, абвяшчэнне незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі*; |
| 25 красавіка 1918 г. – | частка Рады БНР па ініцыятыве Рамана Скірмунта тэлеграму імператару Германіі Вільгельму II з просьбай аб дапамозе ва ўмацаванні дзяржаўнай незалежнасці; |

| | |
|---|---|
| 1–3 кастрычніка 1918 г. – | I з’езд Камуністычнай партыі Літвы і Заходняй Беларусі ў г. Вільні. Утварэнне Камуністычнай партыі Літвы і Заходняй Беларусі (дзейнічала да пачатку сакавіка 1919 г.); |
| 11 лістапада 1918 г. – | кайзераўская Германія заявіла пра сваю капітуляцыю ў вайне; |
| 13 лістапада 1918 г. – | Цэнтральны выканаўчы камітэт (ЦВК) РСФСР прыняў Дэкрэт аб ануляванні Брэсцкага мірнага дагавора; |
| 10 снежня 1918 г. – | нямецкія войскі пакінулі г. Мінск; |
| 30–31 снежня 1918 г. – | VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б) у г. Смаленску. Прыняцце рэзалюцыі пра неабходнасць абвяшчэння Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі; |
| 1918–1919 гг. – | дзейнасць у г. Маскве Беларускага навукова-культурнага таварыства (БНКТ), створанага пры садзейнічанні Беларускага нацыянальнага камісарыята. Актыўныя члены: Я. Л. Дыла, У. І. Пічэта, М. К. Любаўскі, Ф. Ф. Турук, М. А. Янчук і інш.; |
| 1918–1980 гг. – | жыццё і дзейнасць Пятра Міронавіча Машэрава, першага сакратара ЦК КПБ у 1965–1980 гг.; |
| 1 студзеня 1919 г. – | абвяшчэнне *Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі* ў г. Смаленску (ўтварэнне БССР). Утварэнне Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада на чале з З. Жылуновічам. Апублікаванне Маніфеста Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі; |
| 5 студзеня 1919 г. – | г. Мінск – сталіца БССР (пераезд савецкага ўрада з г. Смаленска ў г. Мінск); |

| | |
|---|---|
| 16 студзеня 1919 г. – | пастанова ЦК РКП(б) аб далучэнні да РСФСР Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў Беларусі і ўтварэнні Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі; |
| студзень 1919 г. – | стварэнне Народнага камісарыята асветы БССР; |
| 2–3 лютага 1919 г. – | Першы Ўсебеларускі з'езд саветаў Беларусі. Прыняцце Канстытуцыі Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі. Зацвярджэнне герба рэспублікі. Прыняцце рашэння аб утварэнні Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі; |
| 3 лютага 1919 г. – | прыняцце *першай Канстытуцыі Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ)* першым Усебеларускім з'ездам саветаў Беларусі; |
| люты 1919 – кастрычнік 1920 гг. – | польска-савецкая вайна; |
| 27 лютага 1919 г. – | сумеснае пасяджэнне ЦВК Літоўскай ССР і ЦВК Беларускай ССР. *Стварэнне Літоўска-Беларускай ССР* (ЛітБел); |
| 24–29 сакавіка 1919 г. – | антысавецкі мяцеж у г. Гомелі на чале з эсэрам М. А. Стракапытавым; |
| красавік 1919 г. – | аднавіў работу Горы-Горацкі земляробчы інстытут; |
| 1 чэрвеня 1919 г. – | дагавор аб ваенна-палітычным саюзе савецкіх рэспублік; |
| ліпень 1919 г. – | у сувязі з польскай акупацыяй Літоўска-Беларуская ССР фактычна спыніла сваё існаванне; |
| 8 жніўня 1919 – 11 ліпеня 1920 гг. – | акупацыя г. Мінска польскімі войскамі; |

| | |
|---|---|
| восень 1919 г. – | уся тэрыторыя Літоўска-Беларускай ССР занята польскімі войскамі. Мяжа ўстанавілася па лініі Дзісна–Лепель–Барысаў–Бабруйск і далей па рацэ Бярэзіне; |
| 1919 – сакавік 1921 гг. – | усходнія рэгіёны Беларусі перажывалі палітыку «ваеннага камунізму»; |
| красавік – кастрычнік 1920 г. – | савецка-польская вайна, частка польска-савецкай вайны 1919–1920 гг. Скончылася паражэннем Чырвонай Арміі пад камандаваннем М. М. Тухачэўскага 17 жніўня 1920 г. у бітве пад г. Варшавай («цуд на Віслe»), пасля чаго пачалося агульнае адступленне Чырвонай Арміі; |
| 1 лютага 1920 г. – | пачатак выдання газеты «Савецкая Беларусь»; |
| 11 ліпеня 1920 г. – | заняцце г. Мінска войскамі савецкай Расіі; |
| 12 ліпеня 1920 г. – | падпісанне ў г. Маскве дагавора паміж РСФСР і Літвой. Быў заключаны ў час савецка-польскай вайны 1920 г. У выніку юрыдычна ліквідавана ЛітБел. Была адзначана дзяржаўная граніца паміж РСФСР і Літвой, згодна з якой частка тэрыторыі Беларусі з гарадамі Гродна, Шчучын, Ашмяны, Смаргонь, Браслаў, Ліда, Паставы, а таксама Віленскі край з г. Вільняй, былі прызнаны часткай Літвы; |
| 31 ліпеня 1920 г. – | *другое абвяшчэнне БССР*. Прыняцце «Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі» (ССРБ); |
| – | колькасць насельніцтва ССРБ склала 1 млн. 544 тыс. чалавек; |

| | |
|---|---|
| 1920–1937 гг. – | дзейнасць тэатральнай трупы У. І. Галубка (з 1926 г. – Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр, з 1932 г. – Трэці Беларусі дзяржаўны тэатр). Дзейнічаў да 1937 г.; |
| 14 верасня 1920 г. – | адкрыццё ў г. Мінску Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра (з 1926 г. – БДТ-1, 1944 г. – імя Янкі Купалы, з 1955 г. – акадэмічны, з 1992 г. – Нацыянальны тэатр Беларусі); |
| 24–27 верасня 1920 г. – | у г. Мінску прайшоў першы з’езд камсамола Беларусі; |
| 12 кастрычніка 1920 г. – | у г. Рызе падпісаны прэлімінарны (папярэдні) мірны дагавор паміж савецкай Расіяй і Украінай, з аднаго боку, і Польшчай – з другога; |
| 27 лістапада – 28 снежня 1920 г. – | Слуцкае антысавецкае паўстанне; |
| лістапад 1920 г. – | адкрыццё ў г. Мінску Беларускага аддзялення Дзяржаўнага выдавецтва РСФСР (са студзеня 1921 г. – Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, з 1963 г. – выдавецтва «Беларусь»); |
| лістапад 1920 г. – | паход 20-тысячнай арміі генерала С. Булак–Балаховіча на Палессе. Чырвоная Армія, несучы значныя страты, пакінула Петрыкаў, Мазыр, Калінкавічы; |
| 11 снежня 1920 г. – | стварэнне ў Беларусі Надзвычайнай камісіі па ліквідацыі непісьменнасці; |
| снежань 1920 г. – | прыняцце плана дзяржаўнай электрыфікацыі Расіі (ГОЭЛРО); |
| 1920–1924 гг. – | Беларуская ССР складалася з 6 паветаў Мінскай губерні. Паветы дзяліліся на воласці. |

# IV. Беларусь у міжваенны перыяд (1921–1939 гг.).

| | |
|---|---|
| 16 студзеня 1921 г. – | апублікаванне дагавора аб ваенным і гаспадарчым саюзе паміж РСФСР і БССР (прадугледжваўся адзіны бюджэт, падатковая сістэма і інш.); |
| пачатак 1921 г. – | колькасць насельніцтва Беларусі склала 6 млн. 700 тыс. чалавек; |
| люты–сакавік 1921 г. – | антыбальшавіцкае выступленне ў крэпасці Кранштадт («Кранштацкі мяцеж»); |
| 8–16 сакавіка 1921 г. – | X з'езд РКП(б), бальшавікі пачалі праводзіць *«новую эканамічную палітыку»* (НЭП); |
| 18 сакавіка 1921 г. – | Рыжскі мірны дагавор паміж РСФСР і УССР, з аднаго боку, і Польшчай – з другога. Заходняя Беларусь адышла да Польшчы (II Рэчы Паспалітай); |
| 18 сакавіка 1921 – 17 верасня 1939 гг. – | час знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе II Рэчы Паспалітай; |
| 21 сакавіка 1921 г. – | прынята Канстытуцыя, якая замацавала рэспубліканскі лад у II Рэчы Паспалітай; |
| 7–12мая 1921 г. – | I з'езд прафсаюзаў Беларускай ССР, |
| 11 ліпеня 1921 г. – | адкрыццё ў г. Мінску Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (пачаў працаваць з 30 кастрычніка 1921 г.); |
| лета 1921 г. – | стварэнне ў Заходняй Беларусі Цэнтральнага беларускага паўстанцкага камітэта на чале з У. Пракулевічам; |
| 1 снежня 1921 – 2 снежня 1936 гг. – | дзейнасць у Заходняй Беларусі Таварыства беларускай школы (ТБШ); |
| 1921 г. – | Антон Луцкевіч заснаваў у г. Вільні Беларускі музей імя Івана Луцкевіча; |

| | |
|---|---|
| 30 студзеня 1922 г. – | у г. Мінску заснаваны *Інстытут беларускай культуры* (Інбелкульт); |
| 1 сакавіка 1922 г. – | утварэнне Дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення (ДПУ) пры ЦВК БССР (на базе скасаванай Надзвычайнай камісіі Беларускай ССР); |
| 10 ліпеня 1922 г. – | ў г. Мінску на Мінскім епархіяльным з’ездзе абвешчана аўтакефальная Беларуская праваслаўная царква на чале з мітрапалітам Рускай праваслаўнай царквы Мельхіседэкам (М. Л. Паеўскім); |
| 6 кастрычніка 1922 г. – | ЦК РКП(б) прыняў рэзалюцыю аб узаемаадносінах РСФСР з незалежнымі савецкімі рэспублікамі, дзе прызнаў неабходным аб’яднанне іх у Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР); |
| 14–18 снежня 1922 г. – | IV Усебеларускі з’езд Саветаў у г. Мінску адобрыў ідэю ўтварэння СССР; |
| 30 снежня 1922 г. – | I Усесаюзны з’езд Саветаў у г. Маскве, падпісанне *Дэкларацыі* і *Дагавора аб утварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР);* |
| 1922 г. – | дзейнасць на Беласточчыне і Гродзеншчыне Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі (БРА) – правага крыла партыі эсэраў; |
| 1922 г. – | Янка Купала напісаў п’есу «Тутэйшыя»; |
| 1922–1924 гг. – | правядзенне ў СССР грашовай рэформы. Увядзенне чырвонца; |
| 23 мая 1923 г. – | прыняты дэкрэт ЦВК БССР «Аб адзіным сельскагаспадарчым падатку»; |

| | |
|---|---|
| 11 ліпеня 1923 г. – | у сувязі з трэцяй гадавінай вызвалення г. Мінска ад польскіх інтэрвентаў была прынята *пастанова аб амністыі* ўсім беларускім палітычным і культурным дзеячам, членам беларускіх нацыянальных урадаў і палітычных партый, якія не прымалі актыўнага ўдзелу ва ўзброенай барацьбе з савецкай уладай; |
| 17 ліпеня 1923 г. – | прыняты Закон аб камасацыі (ліквідацыі цераспалосіцы) сялянскіх гаспадарак у Польшчы (Заходняя Беларусь); |
| кастрычнік 1923 – жнівень 1938 гг. – | час дзейнасці Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ ) – састаўной часткі Камуністычнай партыі Польшчы; |
| 28 лістапада 1923 г. – | утварэнне літаратурнага аб'яднання «Маладняк»; |
| 1923 г. – | Якуб Колас завяршыў напісанне паэмы «Новая зямля»; |
| студзень 1924 г. – | на канферэнцыі ў г. Вільні створаны Камуністычны саюз моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ). Дзейнасць арганізацыі спынілася ў 1938 г. у выніку беспадстаўнага роспуску Камінтэрнам КПП, КПЗБ і КПЗУ; |
| 3 сакавіка 1924 г. – | *першае ўзбуйненне БССР*: вяртанне ў склад Беларусі ад РСФСР пятнаццаці паветаў Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў, у якіх пераважала беларускае насельніцтва |
| 8 красавіка 1924 г. – | стварэнне Беларускай ваеннай акругі (БВА). Праіснавала да 1992 г.; |
| 15 ліпеня 1924 г. – | Пастанова II сесіі ЦВК БССР «Аб практычных мерапрыемствах па правядзенню нацыянальнай палітыкі», абвяшчэнне палітыкі беларусізацыі; |

| | |
|---|---|
| ліпень 1924 г. – пачатак 1929 г. – | ажыццяўленне ў БССР *палітыкі беларусізацыі*; |
| 8 жніўня 1924 г. – | увядзенне новага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу БССР на акругі, раёны і сельсаветы; |
| 1924 г. – | Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р) заявіла аб сваім «самараспадзе»; |
| 24 чэрвеня 1925 – 21 сакавіка 1927 гг. – | час дзейнасці ў Заходняй Беларусі *Беларускай сялянска-работніцкай грамады* (БСРГ) – масавай легальнай рэвалюцыйна-дэмакратычнай нацыянальна-вызваленчай арганізацыі; |
| 12–16 кастрычніка 1925 г. – | ІІ Усебеларуская (Берлінская) палітычная канферэнцыя абʼявіла аб роспуску ўрада БНР, прызнанні г. Мінска адзіным цэнтрам беларускага палітычнага і культурнага руху; |
| 18–31 снежня 1925 г. – | XIV зʼезд ВКП(б), *прыняцце курсу на індустрыялізацыю* краіны; |
| 1925 г. – | увядзенне войскаў Рэчы Паспалітай у Заходнюю Беларусь; |
| 1925 г. – | прыняцце ў Польшчы закона аб зямельнай рэформе, які прадугледжваў парцэляцыю, камасацыю і асадніцтва; |
| 10 чэрвеня 1925 г. – | пастанова СНК БССР аб прысваенні Янку Купалу звання народнага паэта Беларусі; |
| 7 красавіка 1926 г. – | Пастанова ЦВК і СНК БССР аб увядзенні ў Беларусі ўсеагульнай абавязковай пачатковай адукацыі дзяцей ва ўзросце ад васьмі да адзінаццаці гадоў; |

| | |
|---|---|
| май 1926 г. – | дзяржаўны пераварот у Польшчы, усталяванне ваеннай дыктатуры на чале з Ю. Пілсудскім, пачатак правядзення палітыкі «санацыі» (аздараўлення) у Польшчы; |
| 18 кастрычніка 1926 г. – | пастанова СНК БССР аб прысваенні Якубу Коласу звання народнага паэта Беларусі; |
| кастрычнік 1926 – красавік 1949 гг. – | дзейнасць у г. Мінску Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР; |
| 14–19 лістапада 1926 г. – | акадэмічная канферэнцыя па рэформе беларускага правапісу і азбукі. Склікана Інстытутам беларускай культуры. Павінна была прадэманстраваць адзінства паміж КП(б)Б, заходнебеларускім нацыянальным рухам і беларускай палітычнай эміграцыяй; |
| 6 снежня 1926 г. – | *другое ўзбуйненне* БССР: перадача ад РСФСР у склад БССР Рэчыцкага і Гомельскага паветаў; |
| 17 снежня 1926 г. – | усесаюзны перапіс насельніцтва – у Беларусі пражывала 4 мільёны 983 тысячы чалавек; |
| 1926 г. – | адкрыццё ў г. Віцебску Другога беларускага дзяржаўнага тэатра (БДТ-2, з 1944 г. – тэатр імя Якуба Коласа, з 1997 г. – акадэмічны, з 1993 г. – нацыянальны); |
| 3 лютага 1927 г. – | расстрэл у Заходняй Беларусі польскімі ўладамі дэманстрацыі працоўных у мястэчку Косава; |
| 11 красавіка 1927 г. – | прыняцце *другой Канстытуцыі Беларускай ССР* на VIII Усебеларускім з’ездзе Саветаў. Абвяшчала поўную роўнасць беларускай, яўрэйскай, рускай і польскай моў, але аддавала перавагу беларускай мове ў зносінах паміж дзяржаўнымі, прафесійнымі і грамадскімі ўстановамі і арганізацыямі. Дзейнічала да 1937 г.; |

| | |
|---|---|
| 11 ліпеня 1927 г. – | пачатак будаўніцтва Асінаўскай электрастанцыі – БелДРЭС (на Асінаўскім тарфяным масіве пад Оршай); |
| снежань 1927 – 30 жніўня 1930 гг. – | дзейнасць у Заходняй Беларусі рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыі «Змаганне»; |
| снежань 1927 г. – | XV з'езд ВКП(б), *прынязце курсу на калектывізацыю*; |
| 23 лютага – 22 мая 1928 г. – | суд у г. Вільні над 56 дзеячамі Беларускай сялянска-работніцкай грамады, арганізаваны ўладамі Польшчы («працэс пяцідзесяці шасці»); |
| 26 лютага 1928 г. – | стварэнне ў г. Мінску Камітэта абароны Беларускай сялянска-работніцкай грамады ў Заходняй Беларусі на чале з Янкам Купалам; |
| 17 красавіка – 28 мая 1928 г. – | суд у г. Беластоку (Заходняя Беларусь) над 133 дзеячамі КПЗБ, КСМЗБ і левых прафсаюзаў, арганізаваны ўладамі Польшчы («працэс ста трыццаці трох»); |
| 25 чэрвеня – 25 ліпеня 1928 г. – | I з'езд Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ); |
| 1928–1932 гг. – | першы пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР; |
| 1928 г. – | у г. Ленінградзе адкрылася кінастудыя мастацкіх фільмаў «Савецкая Беларусь», быў створаны першы беларускі мастацкі фільм «Лясная быль», рэжысёр Ю. В. Тарыч; |
| 1 студзеня 1929 г. – | рэарганізацыя Інбелкульта ў Беларускую акадэмію навук; |
| 13 кастрычніка 1929 г. – | у г. Мінску адкрыты трамвайны рух; |
| 1929–1930 гг. – | першая хваля сталінскіх рэпрэсій у БССР супраць нацыянал-дэмакратаў (нацдэмаў); |
| 1929 г. – | пачатак суцэльнай калектывізацыі ў БССР; |

| | |
|---|---|
| 1929 г. – | пачатак дзейнасці ў г. Койданаве (з 1932 г. – г. Дзяржынск) машына-трактарнай станцыі (МТС) – першай у БССР; |
| красавік 1930 г. – | у г. Гомелі ўведзены ў дзеянне завод сельскагаспадарчага машынабудавання («Гомсельмаш»); |
| вясна 1930 – 1931 гг. – | правядзенне беспадстаўных рэпрэсій супраць беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі, арышты членаў сфальсіфікаванай ДПУ арганізацыі «Саюз вызвалення Беларусі»; |
| 1930 г. – | увядзенне зменаў у адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел БССР – ліквідацыя акруг. Падзел ішоў толькі на раёны і сельсаветы; |
| 1930 г. – | беларускі кінематограф стаў гукавым; |
| 1931–1932 гг. – | выступленні сялян в. Баранава і іншых вёсак Гродзенскага павета супраць палітыкі камасацыі (хутарызацыі), якая праводзілася польскімі ўладамі; |
| 17 красавіка 1932 г. – | арганізацыя ў г. Мінску Цэнтральнага батанічнага сада Акадэміі навук БССР; |
| 2 жніўня 1932 г. – | увядзенне ўсеагульнай сямігадовай адукацыі; |
| жнівень 1932 г. – | пастанова ЦВК і СНК СССР «Аб ахове маёмасці дзяржаўных прадпрыемстваў і кааперацыі і ўмацаванні грамадскай уласнасці», якая стала падставай для арыштаў і рэпрэсій за самыя нязначныя ўчынкі; |
| кастрычнік 1932 – люты 1933 гг. – | забастоўка рабочых і сялян у Белавежскай пушчы (Заходняя Беларусь); |
| 15 лістапада 1932 г. – | адкрыццё ў г. Мінску Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі (з 1992 г. – Беларуская акадэмія музыкі); |
| снежань 1932 г. – | адкрыццё ў БССР першай транспартнай авіялініі Мінск–Глуск–Парычы–Мазыр; |

| | |
|---|---|
| 1932 г. – | падпісанне пакта аб ненападзенні паміж СССР і Польшчай; |
| 1932–1933 гг. – | увядзенне ў СССР і БССР пашпартнага рэжыму; |
| 25 мая 1933 г. – | адкрыццё ў г. Мінску Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета (з 1940 г. – Вялікі, з 1964 г. – Акадэмічны, з 1994 г. – Нацыянальны); |
| 1 чэрвеня 1933 г. – | адкрыццё ў г. Мінску Беларускага інстытута народнай гаспадаркі (з 1991 г. – Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт); |
| 1 ліпеня 1933 г. – | адкрыццё ў г. Мінску Беларускага політэхнічнага інстытута (з 1992 г. – Беларуская політэхнічная акадэмія); |
| 26 жніўня 1933 г. – | пастанова СНК БССР «Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапісу»; |
| жнівень 1933 г. – | выступленне сялян Кобрынскага павета супраць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту польскіх улад (Заходняя Беларусь); |
| 7 лістапада 1933 г. – | завяршэнне будаўніцтва Дома ўраду ў г. Мінску; |
| 7 лістапада 1933 г. – | адкрыццё аэрапорта ў г. Мінску; |
| 1933–1934 гг. – | масавы голад у збожжавых раёнах Расіі, Украіны і поўдня Беларусі; |
| 1933–1937 гг. – | другі пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР; |
| 1933–1934 гг. – | другая хваля сталінскіх рэпрэсій у Беларусі; |
| 1 мая 1934 г. – | грашовая рэформа ў Польшчы, увядзенне польскага злотага (да гэтага былі маркі); |
| 2 чэрвеня 1934 г. – | адкрыццё ў г. Мінску Рэспубліканскага стадыёна «Дынама»; |
| чэрвень 1934 г. – | I з’езд пісьменнікаў Беларусі ў г. Мінску; |

| | |
|---|---|
| чэрвень 1934 – верасень 1939 гг. – | існаванне канцэнтрацыйнага лагера ў г. Бяроза-Картузская (Заходняя Беларусь); |
| 10 ліпеня 1934 г. – | пастанова ЦВК СССР аб утварэнні пазасудовага органа – «асобай нарады» з мэтай ажыццяўлення рэпрэсіўнай палітыкі супраць насельніцтва краіны; |
| 15 ліпеня 1934 г. – | пераўтварэнне Дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення (ДПУ) БССР ва ўпраўленне дзяржбяспекі Народнага камісарыята ўнутраных спраў (НКУС) БССР; |
| 1934 г. – | у г. Гомелі пабудаваны першы ў БССР шматпавярховы жылы дом; |
| 1934–1937 гг. – | узвядзенне ў г. Мінску будынку Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР (архітэктар У. Лангбард); |
| 1934–1939 гг. – | узвядзенне ў г. Мінску будынку Дома Чырвонай Арміі (архітэктар У. Лангбард); |
| 23 красавіка 1935 г. – | уступленне ў дзеянне новай Канстытуцыі Рэчы Паспалітай, усталяванне ў краіне аўтарытарнага рэжыму; |
| жнівень 1935 – верасень 1939 гг. – | паўстанне нарачанскіх рыбакоў (Заходняя Беларусь); |
| 1 кастрычніка 1935 г. – | адмена ў СССР картачнай сістэмы забеспячэння насельніцтва прадуктамі харчавання; |
| 15 сакавіка 1935 г. – | пастанова ЦВК СССР аб узнагароджанні Беларускай ССР ордэнам Леніна за поспехі ў галіне сельскай гаспадаркі і прамысловасці; |
| 1935–1939 гг. – | узвядзенне ў г. Мінску будынку галоўнага корпуса Акадэміі навук БССР (архітэктар У. Лангбард); |
| 1 студзеня 1936 г. – | адмена ў СССР картачнай сістэмы забеспячэння насельніцтва прамысловымі таварамі; |

| | |
|---|---|
| сакавік 1936 г. – | «Працэс 16-ці» – суд над пісьменнікамі і журналістамі Заходняй Беларусі ў г. Вільні; |
| 1936–1938 гг. – | хваля масавых рэпрэсій у Беларускай ССР; |
| 1936 г. – | польскія ўлады забаранілі дзейнасць Таварыства беларускай школы; |
| 19 лютага 1937 г. – | прыняцце *трэцяй Канстытуцыі Беларускай ССР* XII Надзвычайным Усебеларускім з'ездам Саветаў. Поўнасцю адпавядала Канстытуцыі СССР 1936 г. Дзейнічала да 1978 г.; |
| сярэдзіна 1937 – ліпень 1938 гг. – | арышты па справе так званага «аб'яднанага антысавецкага падполля» у Беларусі – арыштавана 2570 чалавек; |
| 1937– пачатак 1941 гг. – | масавыя расстрэлы мірнага насельніцтва органамі НКУС ва ўрочышчы Курапаты пад г. Мінскам; |
| ліпень – верасень 1937 г. – | ліквідацыя прыдуманай НКУС БССР «шпіёнска-паўстанцкай арганізацыі» «Беларуская аўтакефальная царква»; |
| 1937 г. – | адкрыццё ў г. Мінску Беларускай дзяржаўнай філармоніі; |
| 15 студзеня 1938 г. – | увядзенне новага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу БССР: вобласці, раёны і сельсаветы. У БССР створаны першыя вобласці: Віцебская, Гомельская, Мінская, Магілёўская, Палеская; |
| 16 жніўня 1938 г. – | роспуск рашэннем Прэзідыума Выканкама Камінтэрна КПП, КПЗБ і КПЗУ; |
| 6–9 снежня 1938 г. – | заснаванне Саюза мастакоў Беларусі на I з'ездзе мастакоў БССР; |
| 1938–1941 гг. – | трэці пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР. |

## V. Беларусь у гады Другой Сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў.

| | |
|---|---|
| 17 студзеня 1939 г. – | Усесаюзны перапіс насельніцтва. У БССР пражывала 5 мільёнаў 567 тысяч 976 чалавек; |
| 23 жніўня 1939 г. – | у г. Маскве падпісаны Дагавор аб ненападзенні паміж СССР і Германіяй і сакрэтныя пратаколы да яго аб падзеле Еўропы на сферы ўплыву («Пакт Молатаў – Рыбентроп»); |
| 1 верасня 1939 г. – | нападзенне фашысцкай Германіі на Польшчу – пачатак Другой сусветнай вайны; |
| 17–25 верасня 1939 г. – | паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь; |
| 23 верасня 1939 г. – | сумесны парад савецкіх і нямецкіх войскаў у г. Брэсце; |
| 28 верасня 1939 г. – | заключэнне Дагавора аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй; |
| 1 кастрычніка 1939 г. – | Пастанова Палітбюро ЦК ВКП(б) «Пытанні Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі» – выбары ў Народны сход; |
| 28–30 кастрычніка 1939 г. – | у г. Беластоку адбыўся Народны Сход Заходняй Беларусі. Была прынята Дэкларацыя аб дзяржаўнай уладзе і аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР; |
| 2 лістапада 1939 г. – | Вярхоўны Савет СССР прыняў Закон аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад СССР і аб’яднанні з БССР; |
| 8 лістапада 1939 г. – | адкрыццё ў г. Мінску Дзяржаўнай мастацкай галерэі БССР; |

| | |
|---|---|
| 14 лістапада 1939 г. – | Вярхоўны Савет БССР прыняў закон аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад Беларускай Савецкай Сацыялістычнай рэспублікі; |
| 10 кастрычніка 1939 г. – | савецка-літоўскі дагавор «*Аб перадачы Літоўскай Рэспубліцы горада Вільні і Віленскай вобласці* і аб узаемадапамозе паміж Савецкім Саюзам і Літвой». Віленшчына (тэр. 7129 км$^2$, насельніцтва 457 тыс. чалавек) адлучалася ад Заходняй Беларусі і перадавалася Літве; |
| 30 кастрычніка 1939 г. – | 12 сакавіка 1940 гг. – савецка-фінская вайна; |
| 5 снежня 1939 г. – | на далучанай да БССР тэрыторыі Заходняй Беларусі створаны вобласці: Баранавіцкая, Беластоцкая, Брэсцкая, Вілейская, Пінская. Усяго ў БССР стала 10 абласцей; |
| 14 снежня 1939 г. – | Ліга Нацый выключыла Савецкі Саюз з ліку сваіх членаў; |
| 1939 г. – | пасля ўваходжання Заходняй Беларусі ў склад БССР колькасць насельніцтва краіны склала 10 мільёнаў 300 тысяч чалавек; |
| ліпень 1939 г. – | 2-я сесія Вярхоўнага Савета БССР прыняла рашэнне аб змене назвы сталіцы Беларусі з г. Менск на г. Мінск; |
| жнівень 1940 г. – | пасля рэканструкцыі здадзены ў эксплуатацыю Дняпроўска-Бугскі канал; |
| 6 лістапада 1940 г. – | указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб перадачы Літве Свянцянскага раёна і часткі тэрыторый Відзаўскага, Гадуцішкаўскага, Астравецкага, Воранаўскага і Радунскага раёнаў Беларускай ССР, а таксама курорта Друскенікі; |

| | |
|---|---|
| 22 чэрвеня 1941 г. – | нападзенне фашысцкай Германіі на СССР, пачатак Вялікай Айчыннай вайны; |
| 22 чэрвеня – канец ліпеня 1941 г. – | гераічная абарона гарнізона Брэсцкай крэпасці (штаб абароны ўзначалілі капітан І. М. Зубачоў і палкавы камісар Я. М. Фамін); |
| 25 чэрвеня 1941 г. – | урад Беларусі пераехаў з г. Мінска ў г. Магілёў; |
| 26 чэрвеня 1941 г. – | утварэнне пінскага партызанскага атрада «Камарова» пад камандаваннем В. З. Каржа; |
| 26 чэрвеня 1941 г. – | подзвіг экіпажа М. Ф. Гастэла, які накіраваў свой падбіты самалёт на скопішча варожай тэхнікі на дарозе Маладзечна–Радашковічы; |
| 27 чэрвеня – 15 ліпеня 1941 г. – | абарона г. Полацка; |
| 28 чэрвеня 1941 г. – | нямецкімі акупантамі захоплены г. Мінск і г. Бабруйск; |
| 30 чэрвеня 1941 г. – | пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб утварэнні Дзяржаўнага Камітэта Абароны» на чале з І. В. Сталіным. Дзейнічаў да 4 верасня 1945 г.; |
| чэрвень 1941 г. – 3 ліпеня 1944 гг. – | дзейнасць Мінскага камуністычнага патрыятычнага падполля (арганізатары – І. Матусевіч, І. Казінец); |
| 1 ліпеня 1941 г. – | дырэктыва ЦК КП(б)Б №2 «Аб разгортванні партызанскай барацьбы ў тыле ворага»; |
| 3–26 ліпеня 1941 г. – | абарона г. Магілёва часцямі Чырвонай Арміі і апалчэнцамі (вызначыўся палкоўнік С. Ф. Куцепаў). Упершыню з пачатку вайны ўдалося прыпыніць наступленне немцаў; |
| 9 ліпеня 1941 г. – | у Суражскім раёне Віцебскай вобласці ў ліку першых створаны партызанскі атрад пад кіраўніцтвам М. П. Шмырова (бацькі Міная); |

| | |
|---|---|
| 13 ліпеня –<br>17 жніўня 1941 г. – | Рагачоўскі–Жлобінскі контрудар 1941 г. Аперацыя 21-й арміі – контрудар па нямецка-фашысцкім войскам на Бабруйскім накірунку, вызваленне ад немцаў Жлобіна і Рагачова. Толькі 14 жніўня немцы прарвалі абарону і выйшлі ў тыл савецкіх частак, якія з баямі выходзілі з акружэння ў накірунку г. Гомеля. Сваімі дзеяннямі войскі 21-й арміі скоўвалі да 15 дывізій ворага, затрымліваючы яго прасоўванне на ўсход; |
| 14 ліпеня 1941 г. – | пад г. Оршай упершыню нанесла ўдар батарэя рэактыўных установак («кацюш») пад камандаваннем капітана І. А. Флёрава; |
| 21 ліпеня 1941 г. –<br>3 ліпеня 1944 гг. – | дзейнасць Мінскага падпольнага абкама КП(б)Б; |
| пачатак ліпеня<br>1941 г. – | утварэнне партызанскага атрада «Чырвоны Кастрычнік» пад кіраўніцтвам Ц. П. Бумажкова і Ф. І. Паўлоўскага (Акцябрскі раён, Палескай вобласці); |
| ліпень – жнівень<br>1941 г. – | карная аперацыя нямецка-фашысцкіх акупантаў «Прыпяцкія балоты» (Брэсцкая, Пінская, Палеская, Мінская вобласці); |
| 6 жніўня 1941 г. – | указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні Ц. П. Бумажкову і Ф. І. Паўлоўскаму звання Героя Савецкага Саюза – першым з партызан у Вялікую Айчынную вайну; |
| 19 жніўня 1941 г. – | акупацыя нямецка-фашысцкімі захопнікамі г. Гомеля; |
| 22 жніўня 1941 г. – | акупацыя нямецка-фашысцкімі захопнікамі г. Мазыра; |
| жнівень 1941 г. – | заключэнне ваеннага дагавора паміж СССР і Лонданскім эміграцкім урадам Польшчы; |

| | |
|---|---|
| канец жніўня 1941 г. – | поўная акупацыя тэрыторыі Беларусі нямецка-фашысцкімі захопнікамі; |
| 1 верасня 1941 г. – 22 верасня 1943 г. – | камісарам генеральнай акругі Беларусь з'яўляўся Вільгельм Кубэ. Забіты ў ноч на 22 верасня 1943 г. у выніку выбуху міны ва ўласнай кватэры ў г. Мінску; |
| 22 кастрычніка 1941 г. – | утварэнне на акупіраванай тэрыторыі Беларусі «Беларускай народнай самапомачы» (БНС); |
| студзень–люты 1942 г. – | *утварэнне першай партызанскай зоны* ў Акцябрскім раёне Палескай вобласці; |
| люты 1942 г. – | утварэнне Арміі Краёвай (АК) – падпольнай ваеннай арганізацыі, якая дзейнічала ў 1942–1945 гг. на акупіраванай фашысцкай Германіяй тэрыторыі Польшчы, Беларусі, Украіны і Літвы. Падпарадкоўвалася польскаму эміграцыйнаму ўраду ў г. Лондане. Пасля разрыву ў красавіку 1943 г. адносін паміж СССР і польскім эміграцыйным урадам савецкімі ўладамі стала трактавацца як антысавецкая, фашысцкая структура. АК распушчана 9 студзеня 1945 г. лонданскім эміграцыйным урадам; |
| 10 лютага – 28 верасня 1942 г. – | існаванне Віцебскіх (Суражскіх) варот – 40-кіламетровага пралому ў лініі фронту на стыку груп нямецкіх армій «Поўнач» і «Цэнтр»; |
| сакавік 1942 г. – | партызанскі баявы рэйд па тэрыторыі Любанскага, Жыткавіцкага, Ленінскага, Старобінскага, Чырвонаслабодскага і Слуцкага раёнаў; |
| 12 мая 1942 г. – | зацвярджэнне ЦК КП(б)Б і Прэзідыумам Вярхоўнага Савета БССР тэксту «Прысягі беларускага партызана»; |

| | |
|---|---|
| 18 мая 1942 г. – | выхад першага нумара газеты «Звязда» – органа мінскага падполля; |
| 30 мая 1942 г. – | утварэнне *Цэнтральнага штаба партызанскага руху (ЦШПР)* у Маскве. Начальнік штаба П. К. Панамарэнка; |
| 28 чэрвеня 1942 г. – | у г. Маскве трагічна загінуў народны паэт Беларусі Янка Купала; |
| жнівень – верасень 1942 г. – | карная аперацыя нямецка-фашысцкіх акупантаў «Балотная ліхаманка» супраць партызан і мірнага насельніцтва Віцебскай, Мінскай і Брэсцкай абласцей; |
| 9 верасня 1942 г. – | утварэнне *Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР)*. Кіраўнік штаба – П. З. Калінін; |
| кастрычнік 1942 г. – | карная аперацыя нямецка-фашысцкіх акупантаў «Карлсбад» супраць партызан і мірнага насельніцтва Круглянскага, Аршанскага, Талачынскага і Шклоўскага раёнаў; |
| 16 снежня 1942 г. – | подзвіг І. Філідовіча, селяніна Дзятлаўскага раёна, які паўтарыў подзвіг І. Сусаніна. (Такі ж подзвіг здзейсніў І. Цуба, жыхар вёскі Навіны Слуцкага павета); |
| снежань 1942 г. – | карная аперацыя нямецка-фашысцкіх акупантаў «Альтона» супраць партызан і мірнага насельніцтва Ляхавіцкага, Ганцавіцкага і Целяханскага раёнаў; |
| снежань 1942 г. – | утварэнне Барысава-Бягомльскай партызанскай зоны, дзейнасць партызанскай брыгады «Жалязняк»; |
| снежань 1942 – студзень 1943 гг. – | карная аперацыя нямецка-фашысцкіх акупантаў «Зімовы лес» супраць партызан і мірнага насельніцтва ў трыкутніку чыгунак Віцебск–Невель–Полацк; |

| | |
|---|---|
| 22 сакавіка 1943 г. – | нямецка-фашысцкія захопнікі разам з паліцэйскімі фарміраваннямі спалілі ўсіх жыхароў вёскі Хатынь каля г. Лагойска; |
| 20 мая – 21 чэрвеня 1943 г. – | карная аперацыя «Котбус» нямецка-фашысцкіх акупантаў супраць партызан і мясцовага насельніцтва ў Бягомльскім, Лепельскі, Пляшчанскім і Халопеніцкім раёнах; |
| 22 чэрвеня 1943 г. – ліпень 1944 г. – | дзейнасць у Беларусі антысавецкай маладзёжнай арганізацыі «Саюз беларускай моладзі» (СБМ); |
| 6 ліпеня 1943 г. – | А. К. Гаравец, ураджэнец Віцебскай вобласці, у паветраным баі збіў 9 самалётаў праціўніка; |
| 30 ліпеня 1943 г. – | Асіповіцкая дыверсія партызан і падпольшчыкаў – на чыгуначнай станцыі Асіповічы былі спалены 4 воінскіх эшалоны ворага, у тым ліку і з танкамі «Тыгр»; |
| 3 жніўня – сярэдзіна верасня 1943 г. – | першы этап «рэйкавай вайны» беларускіх партызан на чыгуначных камунікацыях ворага; |
| 7 жніўня – 2 кастрычніка 1943 г. – | Смаленская аперацыя, пачатак вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў; |
| 14 верасня 1943 г. – | арганізацыя Дняпроўскай ваеннай флатыліі; |
| 19 верасня – пачатак лістапада 1943 г. – | другі этап «рэйкавай вайны» – аперацыя «Канцэрт»; |
| 22 верасня 1943 г. – | мінскія падпольшчыкі арганізавалі дыверсію супраць генеральнага камісара рэйхскамісарыята «Беларусь» гаўляйтэра Вільгельма Кубэ, якая прывяла да смерці апошняга. Новым генеральным камісарам стаў былы начальнік СС і паліцыі Беларусі групенфюрар СС К. фон Готберг; |

| | |
|---|---|
| 23 верасня 1943 г. – | пачатак вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, вызваленне першага раённага цэнтра Беларусі – г. Камарына; |
| 26 лістапада 1943 г. – | вызваленне ад нямецка-фашысцкай акупацыі першага абласнога цэнтра Беларусі – г. Гомеля; |
| лістапад – снежань 1943 г. – | Гомельска-Рэчыцкая аперацыя і ўтварэнне Рудабельскіх «варот» – 10-кіламетровага пралому ў лініі фронту паміж в. Азарычы і г. п. Парычы; |
| восень 1943 г. – | пачатак аднаўлення прамысловасці і іншых галін эканомікі на вызваленай ад ворага тэрыторыі ўсходняй Беларусі; |
| снежань 1943 г. – | утварэнне на акупіраванай нямецка-фашысцкімі захопнікамі тэрыторыі Беларускай Цэнтральнай Рады (БЦР) на чале з Р. Астроўскім; |
| 1943 г. – | пачатак аднаўлення эканомікі пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі ад фашысцкай акупацыі; |
| 17 лютага 1944 г. – | утварэнне 1-га Беларускага фронту пад камандаваннем генерала арміі К. К. Ракасоўскага; |
| 23 лютага 1944 г. – | загад аб стварэнні Беларускай краёвай абароны (БКА); |
| 24 сакавіка 1944 г. – | прыняцце закона аб утварэнні саюзна-рэспубліканскага Народнага камісарыята замежных спраў Беларускай ССР; |
| 24 красавіка 1944 г. – | утварэнне 2-га Беларускага фронту пад камандаваннем генерал-палкоўніка Г. Ф. Захарава; |
| – | утварэнне 3-га Беларускага фронту пад камандаваннем генерал-палкоўніка І. Д. Чарняхоўскага; |

| | |
|---|---|
| – | утварэнне 1-га Прыбалтыйскага фронту пад камандаваннем генерала арміі І. Х. Баграмяна; |
| 20 чэрвеня – ліпень 1944 г. – | трэці этап «рэйкавай вайны» беларускіх партызан на чыгуначных камунікацыях ворага; |
| 23 чэрвеня – 28 ліпеня 1944 г. – | аперацыя «Баграціён» – кодавая назва стратэгічнай наступальнай аперацыі Чырвонай Арміі па вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну; |
| 26 чэрвеня 1944 г. – | вызваленне ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў г. Віцебска; |
| 27 чэрвеня 1944 г. – | Другі Ўсебеларускі з'езд (кангрэс) у акупаваным немцамі г. Мінску; |
| 3 ліпеня 1944 г. – | вызваленне ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў г. Мінска |
| 16 ліпеня 1944 г. – | парад партызан у г. Мінску, прысвечаны вызваленню сталіцы Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў; |
| – | вызваленне ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў г. Гродна; |
| 17 ліпеня 1944 г. – | «парад ганьбы» – у г. Маскве па вул. Горкага былі праведзены калоны нямецкіх ваеннапалонных, якія былі захоплены пад час баёў у «Мінскім катле»; |
| 18 ліпеня 1944 г. – | пераезд урада БССР з г. Гомеля ў г. Мінск; |
| 28 ліпеня 1944 г. – | вызваленне ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў г. Брэста; завяршэнне вызвалення тэрыторыі Беларусі. |
| 27 красавіка 1945 г. – | Беларуская ССР прынята ў склад дзяржаўзаснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных нацый (ААН); |
| 8 мая 1945 г. – | Германія падпісала акт аб поўнай і безумоўнай капітуляцыі; |

| | |
|---|---|
| 9 мая 1945 г. – | Дзень Перамогі над фашысцкай Германіяй; |
| 26 чэрвеня 1945 г. – | дэлегацыя БССР разам з іншымі краінамі-заснавальніцамі падпісала Статут Арганізацыі Аб’яднаных Нацый |
| 16 жніўня 1945 г. – | *Дагавор аб савецка-польскай дзяржаўнай граніцы паміж СССР і Польшчай*. Граніца была ўстаноўлена ў адпаведнасці з рашэннямі Ялцінскай канферэнцыі ўздоўж «лініі Керзана». Паводле дагавора на карысць Польшчы адыходзілі тэрыторыі з г. Гайнаўка, Белавежа і 17 раёнаў Беластоцкай вобласці з г. Беластокам і 3 раёны Брэсцкай вобласці. Дагавор парушаў палажэнні Канстытуцыі СССР 1936 г. і Канстытуцыі БССР 1937 г., якія патрабавалі згоды саюзнай рэспублікі на змяненне яе граніц; |
| 2 верасня 1945 г. – | завяршэнне Другой сусветнай вайны – падпісанне Японіяй акта аб безагаворачнай капітуляцыі; |
| 1945 г. – | у выніку вайны і злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў беларускі народ страціў звыш паловы нацыянальнага багацця. Былі спалены і зруйнаваны 209 гарадоў і гарадскіх пасёлкаў, 9200 вёсак, разбурана 10 338 заводаў і фабрык, знішчана 96% электрычных магутнасцяў. |

# ЗМЕСТ


Раздзел 1. Грамадска-палітычнае і эканамічнае развіццё Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. .... 3

1. Змены ў становішчы беларускага насельніцтва пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі .... 3
2. Беларусь у вайне 1812 г. .... 7
3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў першай палове XIX ст. Крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы .... 11
4. Грамадска-палітычны рух на землях Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. .... 18

Раздзел 2. Канфесійныя адносіны, адукацыя, навука і культура Беларусі ў канцы XVIII – сярэдзіне XIX ст. .... 26

1. Канфесійныя адносіны ў канцы XVIII – сярэдзіне XIX ст. .... 26
2. Культурнае развіццё. Змены ў сістэме адукацыі. Навука .... 28
3. Літаратура і мастацтва .... 32
4. Тэатр і музыка .... 36
5. Архітэктура .... 38

Раздзел 3. Беларусь у перыяд станаўлення буржуазнага грамадства (другая палова XIX ст.) .... 42

1. Сялянская рэформа 1861 г. .... 42
2. Асаблівасці дзяржаўных ліберальных рэформ 1860–1870-х гг. у Беларусі. .... 48
3. Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы Беларусі ў пасляpэформенны перыяд. .... 50
4. Прамысловасць Беларусі ў другой палове XIX ст. Шляхі зносін. Гандаль .... 52

Раздзел 4. Нацыянальна-вызваленчы рух на беларускіх землях у другой палове XIX ст. Формы сацыяльнай барацьбы. Палітычныя партыі і рухі. .... 59

1. Нацыянальна-вызваленчае паўстанне 1863–1864 гг. пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага .... 59
2. Дзейнасць народнікаў .... 65

3. Формы сацыяльнай барацьбы. Сялянскі і рабочы рух ................66
4. Палітычныя партыі і рухі ................................................................70
5. Палітыка царскіх уладаў пасля паўстання 1863–1864 гг. .............71

Раздзел 5. Адукацыя, навука і культура Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Умовы і асаблівасці фарміравання беларускай нацыі ..............................76

1. Змены ў сістэме адукацыі ў другой палове XIX ст. Школьная рэформа 1864 г. ..........................................................76
2. Навука. Пашырэнне беларусазнаўства.........................................78
3. Новая беларуская літаратура.......................................................80
4. Мастацтва і архітэктура...............................................................82
5. Тэатр і музыка. ..............................................................................89
6. Умовы і асаблівасці фарміравання беларускай нацыі ..................92

Раздзел 6. Беларусь у гады рэвалюцыі 1905–1907 гг. і Першай сусветнай вайны ................................................96

1. Палітычная сітуацыя ў Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. і Беларусь. .......................96
2. Сельская гаспадарка і прамысловасць Беларусі ў пачатку XX ст. Сталыпінская аграрная рэформа.......................101
3. Беларускі нацыянальна-вызваленчы і культурны рух у пачатку XX ст. ..............................................................................104
4. Беларусь у гады Першай сусветнай вайны .................................106

Раздзел 7. Беларусь у 1917–1920 гг. Утварэнне беларускай дзяржаўнасці.........................................................113

1. Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя і Беларусь ....................................................................................113
2. Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. і беларускі нацыянальны рух..............................................................................116
3. Брэсцкі мір. Абвяшчэнне БНР ......................................................118
4. Утварэнне БССР і ЛітБел ССР .....................................................120
5. Палітыка «ваеннага камунізму»....................................................122
6. Беларусь у перыяд савецка-польскай вайны 1919–1920 гг. Другое абвяшчэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ) ...............................................................................123

Раздзел 8. Савецкая Беларусь у міжваенны перыяд (1921–1939 гг.) ... 130
1. Рыжскі мір і Беларусь ... 130
2. Новая эканамічная палітыка (НЭП) і беларусізацыя ў БССР ... 133
3. БССР у перыяд індустрыялізацыі і калектывізацыі. ... 139
4. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у канцы 1920-х – 1930-я гг. ... 145
Раздзел 9. Заходняя Беларусь у міжваенны перыяд (1921–1939 гг.) ... 153
1. Заходняя Беларусь пасля Рыжскага міру (1921 – пачатак 1930-х гг.) ... 153
2. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі ... 158
3. Беларускае пытанне ў Заходняй Беларусі ў 1930-я гг. ... 160
4. Беларуская культура ў Заходняй Беларусі ... 161
5. Пачатак Другой сусветнай вайны. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР ... 167
Раздзел 10. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945 гг.) ... 172
1. Беларусь напярэдадні і ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны ... 172
2. Нямецкі акупацыйны рэжым ... 175
3. Партызанская і падпольная барацьба супраць захопнікаў ... 178
4. Вызваленне Беларусі. Аперацыя «Баграціён» ... 181
5. Пасляваеннае аднаўленне эканомікі. Беларусь – краіна-заснавальніца Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН) ... 183

ТАБЛІЦЫ НАЙВАЖНЕЙШЫХ ДАТ

I. Беларусь на зыходзе феадалізму: канец XVIII – сярэдзіна XIX ст. ... 191
II. Усталяванне капіталізму на беларускіх землях: другая палова XIX – пачатак XX ст. ... 204
III. Кастрычніцкая рэвалюцыя. Стварэнне беларускай дзяржаўнасці (1917–1920 гг.) ... 223
IV. Беларусь у міжваенны перыяд (1921–1939 гг.). ... 230
V. Беларусь у гады Другой Сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. ... 240